ARCHE Зьмест № 7-8’06

1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE :: Галоўная
3. Віталь Сіліцкі. Памятаць, што дыктатуры руйнуюцца
4. Павел Усаў. Расія, сацыял-дэмакратыя і «праект Казулін».
5. Пётра Рудкоўскі. Зьмены ў беларускім Каталіцкім касьцёле.
6. Том Карозерс. Аўтакраты даюць адпор
7. Віталь Сіліцкі. Расстрэльная сістэма
8. Ян Максімюк. З бліжэйшых пластоў забыцьця
9. Мікалай Ількевіч. Таямніца кіраўскага арышту Антона Адамовіча 1937 году
10. Пэтар Блажак. Тыпалёгіі апазыцыі і супраціву камуністычнаму рэжыму
11. Мілан Отагал. Праграмная арыентацыя дысыдэнцтва 1969-1989 гадоў
12. Яраслаў Цугра. Каталіцкая царква і супраціў нармалізацыйнаму рэжыму
13. Любаш Вэсэлы. Андэграўнд і Хартыя-77
14. Рудольф Вэвада. Мараўская мэтраполія перад падзеньнем камуністычнага рэжыму
15. Олдржых Тума. Антырэжымныя дэманстрацыі ў Празе
16. Павал Жачак. «Баявая зброя» Дзяржаўнай бясьпекі.
17. Пётра Рудкоўскі. Наколькі навуковы сацыялягічны праект Дуркгайма-Кацука?
18. Андрэй Хадановіч. Оптыка. Новыя вершы
19. Зьміцер Смалякоў. Мысленне інтэлектуальных пенсіянераў
20. Павал Абрамовіч. Хлопчык і Давыд-Гарадок

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 7-8 (47-48) - 2006**

[image]

[image]

[image]

7-8[image]-[image]**2006**

аналітыка • крытыка • эсэістыка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image] [image]

З ь м е с т

C o n t e n t s

АНАЛІТЫКА

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Памятаць, што дыктатуры руйнуюцца
ПАВЕЛ УСАЎ Расія, сацыял-дэмакратыя і «праект Казулін»
ПЁТРА РУДКОЎСКІ Зьмены ў беларускім Каталіцкім Касьцёле
ТОМ КАРОЗЭРС Аўтакраты даюць адпор

КРЫТЫКА

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Расстрэльная сістэма

ЭСЭІСТЫКА

ЯН МАКСІМЮК З бліжэйшых пластоў забыцьця

ГІСТОРЫЯ

МІКАЛАЙ ІЛЬКЕВІЧ Таямніца кіраўскага арышту Антона Адамовіча 1937 году
ПЭТАР БЛАЖАК Тыпалёгіі апазыцыі і супраціву

камуністычнаму рэжыму.
Агляд канцэпцый і рамкі дасьледаваньня
МІЛАН ОТАГАЛ Праграмная арыентацыя дысыдэнцтва 1969–1989 гадоў
ЯРАСЛАЎ ЦУГРА Каталіцкая Царква і супраціў нармалізацыйнаму рэжыму ў Чэхаславаччыне
ЛЮБАШ ВЭСЭЛЫ Андэграўнд і Хартыя-77 ў Празе
РУДОЛЬФ ВЭВАДА Мараўская мэтраполія перад падзеньнем камуністычнага рэжыму. Да разьвіцьця палітычнай сытуацыі ў брненскім рэгіёне напрыканцы васьмідзясятых гадоў
ОЛДРЖЫХ ТУМА Антырэжымныя дэманстрацыі
ПАВАЛ ЖАЧАК «Баявая зброя» Дзяржаўнай бясьпекі. Супрацоўнікі Дзяржбясьпекі ў дырэктывах па агентурна-апэратыўнай працы 1947–1989 гадоў

ПАЛЕМІКА

ПЁТРА РУДКОЎСКІ Наколькі навуковы сацыялягічны праект Дуркгайма–Кацука?

ЛІТАРАТУРА

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ Оптыка. Новыя вершы

РЭЦЭНЗІІ

ЗМІЦЕР СМАЛЯКОЎ Мысленне інтэлектуальных пенсіянераў
ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Хлопчык і Давыд-гарадок

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 7-8 (47-48) - 2006
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне [**mk**], Абнаўленьне [**czyk**]
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/11/26
[image]

Powered by phpBB © 2001, 2005 phpBB Group

[illegible]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 7-8 (47-48) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

7-8 [image] [image]2006

"ды Зыбаты • "крытыка • эсэістыка • **аналітыка** • палеміка • гісторыя

[image] [image] [image]

Віталь Сіліцкі Памятаць, што дыктатуры руйнуюцца

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ

палітоляг, стваральнік і апякун дзьвюхмоўнага, ангельска-беларускага блогу belarus.tolblogs.org, прысьвечанага беларускаму жыцьцю.

---

1. Чым больш часу аддзяляе нас ад памятных сакавіцкіх падзеяў, тым менш застаецца адзнакаў эмацыянальнага ўздыму і аптымізму, які выклікала Плошча Каліноўскага. У тыя дні многім здавалася, што мы сапраўды сталі сведкамі пачатку новага адліку ў гісторыі краіны, новай старонкі барацьбы за свабоду і дэмакратыі, пачатку рэвалюцыі духа. Рэчаіснасць, аднак, пачынае прыносіць куды больш песімістычныя сведчанні. Замест пачатку, Беларусь відавочна вяртаецца ў сонны, апатычны стан, з якога яго толькі ненадоўга вывела перадвыбарная кампанія і падзеі, якія насталі за ёй.

Відавочны спад грамадзянскай актыўнасці. Некалькі тыдняў пасля сакавіка на запале, на куражы, на энтузіязме яшчэ праводзіліся акцыі, у першую чаргу вядомыя флэш-мобы. Як толькі ўлады адладзілі механізм прадухілення новых, дагэтуль неартадаксальных формаў пратэсту, актыўныя грамадскія дзеянні спыніліся. Спыніліся, зазначым, нават раней, чым хтосьці паспеў прызначыць іх «арганізатара і натхняльніка» ў выглядзе флэшмоб-цэнтру. Уладзе спатрэбілася менш часу і высілкаў на прэвентыўныя дзеянні, чым яе апанентам нават на

рэфлексію. Спробы абудзіць балоты, такія, як галадоўка маладафронтаўцаў, патанулі ў інфармацыйным вакууме. У выніку, палітычнай апазіцыі і незалежнаму грамадству ізноў не ўдалося пазбегнуць паслявыбарнай апатыі – яе прыход толькі адцягнуўся на некалькі тыдняў.

Спад грамадзянскай актыўнасці знаходзіць сваё адлюстраванне і ў адноўленым інфармацыйным вакууме вакол падзеяў у Беларусі. Колькасць паведамленняў з краіны ў глабальных электронных медыях і ў інтэрнет-прасторы зноў наблізілася да мізэрнага перадсакавіцкага ўзроўню. Рэпрэсіі ізноў адбываюцца ў цішы.

Гэтаксама не ўдалося пазбегнуць крызісных тэндэнцый унутры палітычнай апазіцыі. Не вельмі гучна, але ўсё ж такі пачаўся разбор палётаў з нагоды хто і дзе быў і як сабе вёў падчас сакавіцкіх падзеяў. Аб расколе кааліцыі дэмакратычных сілаў не заяўлена, але яго праявы відавочныя. Абвастрылася барацьба за лідэрства і ставіцца пад сумнеў статус лідэра апазіцыі (больш дакладна – яе былога адзінага кандыдата). Некаторыя сілы само аб'яднанне публічна лічаць памылкай. Ідэя аб стварэнні агульнанацыянальнага дэмакратычнага руху амаль пахаваная: нават калі ён паўстане, хутчэй за ўсё гэта будзе яшчэ адна апазіцыйная структура, якая будзе ўцягнутая ў бясконцыя кааліцыйныя перамовы.

Самае галоўнае, пытанне «што далей» дагэтуль застаецца адкрытым. Стратэгічныя мэты дэмакратычных сілаў так і не былі вызначаныя, а спробы іх дэкларацыі гучалі даволі агульна (узгадаем тэзу пра «аблогу аўтарытарнай фартэцыі»), з розных бакоў і часцяком уступалі ў супярэчнасць адна з другой. Калі не вызначаныя мэты, няма і больш-менш рэальнага плану дзеянняў па яго дасягненню.

Нельга сказаць, што ўзровень апатыі і праз сто дзён пасля плошчы параўнальны з тым, што было ў 2001 г., што грамадзянскі чын на плошчы Каліноўскага не пакінуў спадчыны, і што апазіцыя зусім нічога не робіць. Не, не ўсё так дрэнна. Ёсць і працягваюцца добрыя праявы салідарнасці і ўзаемадапамогі ахвярам рэпрэсіяў. Ёсць імкненне палітычных лідэраў далей працаваць з людзьмі, ездзіць па рэгіёнах. Ёсць

дробныя прыватныя ініцыятывы, якія ажыццяўляюцца без аглядкі на апазіцыйных лідэраў. Няма скандалаў, падобнага пяцігадовай даўніны грантавага, які б дэмаралізаваў бы апазіцыю на некалькі гадоў наперад. Аднак, няма ліхтара ў канцы тунелю, няхай самага хісткага і слабенькага. Няма кропкі на гарызонце, якую бачылі б партыйныя і беспартыйныя, арганізаваныя і неарганізаваныя, працуючыя ў рэале і ў віртуале, тыя, хто жыве ў Менску, у рэгіёнах і за мяжой. Няма нават маленькай, хай і не зусім рэальнай, але структурызаванай надзеі. Без гэтага, дэмакратычны супраціў асуджаны выключна на сумбурныя, раз'яднаныя, і ўсё менш выніковыя дзеянні адзінак ці маленькіх групаў.

У цэлым, пачуццё безнадзейнасці пачынае вяртацца ў свядомасць самых зацятых аптымістаў. Чым яно, аднак, выклікана: непрафесійнымі дзеяннямі апазіцыі ці нашым уласным завышаным і неапраўданым аптымізмам па сакавіцкіх падзеях? Ці ёсць адсутнасць перспектывы, стратэгіі, плана дзеянняў адзнакай інтэлектуальнага высільвання прыхільнікаў пераменаў, іх лідэраў, аналітыкаў, альбо наступствам таго, што адказаў на гэтыя пытанні аб'ектыўна не існуе? Ці магчыма ўвогуле планаванне стратэгіі ва ўмовах, калі адсутнічае неабходная для змястоўных дзеянняў ступень свабоды?

Аналізуючы падзеі і дзеянні, мы часцяком забываемся даць адэкватную ацэнку тых умоваў, у якіх існуюць палітычныя і сацыяльныя акторы і грамадства ў цэлым. Спасылка на «кантэкст» не ёсць спробай апраўдаць чыюсьці бяздзейнасць, палітычны непрафесіяналізм ці недальнабачнасць. Аднак, зразумець, куды рушым, і, як казаў класік, «што рабіць» немагчыма без яснага ўсведамлення, дзе мы знаходзімся цяпер. Інакш любыя планы і стратэгіі зноў пераўтворацца ў практыкаванне ў палітычным летуценніцтве – чаго ў найноўшай гісторыі Беларусі было ўжо багата.

2. Апазіцыю па сакавіцкіх падзеях часцяком абвінавачвалі ў тым, што яна наогул прымала ўдзел у бессэнсоўнай працэдуры; што яна не прадбачыла выбуху грамадзянскага пратэсту пасля выбараў, і як след, не падрыхтавалася да яго; што асобныя яе

лідэры недастаткова актыўна падтрымлівалі плошчу і нават самаўхіліліся пад час падзеяў; і нарэшце, што яны не здолелі выкарыстаць патэнцыял народнага энтузіязму і дамагчыся якога-ніякога палітычнага выніку.

Адкінем адразу абвінавачванні ва ўдзеле ў «бессэнсоўнай» выбарчай працэдуры, нават калі яна такой і была. У выбарах (гэтых, як і наступных, калі дажывём) удзельнічаць неабходна хаця б таму, што менавіта яна прыцягваюць увагу грамадскасці да палітычных падзеяў і робяцца сігналам да мабілізацыі для дэмакратычных актывістаў і таму што плошча Каліноўскага паўстала менавіта 19 сакавіка 2006 года, а не ў любы іншы дзень. Аднак давайце паспрабуем яшчэ раз аглянуцца назад і ўсвядоміць, чым насамрэч былі сакавіцкія падзеі.

Па-першае, на мой погляд, выбары і паслявыбарныя акцыі паказалі і азначылі (для тых, хто сумняваўся) межы ўздзеяння як палітычных, так і грамадскіх апанентаў улады. Гэтыя межы можна пазначыць як «дэмакратычная субкультура». Валянцін Акудовіч неяк ахарактарызаваў гэтае іншае, паралельнае грамадства (ці нават паралельную нацыю), як «архіпелаг Беларусь». Значнасць сакавіцкіх падзеяў у тым, што дзякуючы выбуху грамадзянскай актыўнасці і выкарыстанню сучасных інфармацыйных тэхналогій гэты архіпелаг у нейкай ступені сцягнуўся, згуртаваўся, аформіўся гарызантальнымі сувязямі, пачаў пераўтварацца, калі можна так сказаць, у гета. Але гэтае гета было вельмі эфектыўна злакалізавана ўладамі, каб яго настроі і працэсы, якія адбываюцца ў ім, не перакінуліся на астатнюю тэрыторыю беларускага грамадства.

Па-другое, пытанне аб уладзе падчас палітычнай кампаніі 2006 г. не стаяла ані да яе пачатку, ані ў яе працягу, ані ў яе канцы. Па гэта самой прычыне размаўляць аб «праваленай рэвалюцыі» бессэнсоўна. Апазіцыя і яе прыхільнікі цудоўна ўсведамлялі, што сцэнар «выбары + вулічныя пратэсты» (скапіяваны з «памаранчавай» і іншых рэвалюцыяў) недастатковы для вырашэння пытання аб уладзе. Непасрэдны ўдзел у перадвыбарнай кампаніі дазволіў нават самым зацятым ідэалістам рэальна ацаніць як грамадскія настроі, так і ступень прыгатаванасці ўлады для адбіцця даволі няхітрай,

нешматлікай і прадказальнай атакі. Дамагчыся большага апазіцыя не здолела не толькі з прычын адсутнасці крэатыўнага падыходу і некрытычнай адаптацыі «памаранчавага» сцэнару (хаця факт гэтай нездольнасці адмаўляць нельга), а таму, што паламаць лукашэнкаўскі сцэнар апазіцыя магла б толькі тады, калі б а) заклікала грамадзян пакласці галовы на алтар дэмакратыі і б) калі б грамадзяне на гэта адгукнуліся. Пра сапраўды рэвалюцыйны сцэнар спрабаваў разважаць хіба толькі аналітык Уладзімір Мацкевіч (гл. яго распрацоўку «Стратэгія-2006»), але яго аналітыка ўтрымлівала збольшага план мірных, але радыкальных дзеянняў без сур'ёзнага разважання на тэму, як стварыць рэвалюцыйную сітуацыю ў грамадстве. Больш таго, радыкалізацыя актыўнай часткі апазіцыі (напр., выкананне патрабаванняў некаторых гарачых галоваў «ісці на прэзідэнцкую рэзідэнцыю») прывяло б толькі да непатрэбных ахвяраў і пахавала б любую надзею на адраджэнне альтэрнатыўнай грамадскай і палітычнай дзейнасці на доўгія гады. Ва ўмовах, калі адсутнічае нават мінімальная магчымасць палітычнай перамогі, весці людзей на магчымую смерць не ёсць паказнікам палітычнай мужнасці таго ці іншага палітыка. Апошняе, дарэчы, з'яўляецца маёй ацэнкай паводзінаў падчас сакавіцкіх падзеяў кандыдата Аляксандра Казуліна, якога некаторыя аналітыкі прадстаўляюць як больш эфектыўнага і вартага даверу лідэра, чым Мілінкевіча (і пры гэтым забываюць, што акурат Казулін заклікаў плошчу разысціся). Відавочна, што Казулін радыкалізаваўся падчас кампаніі толькі тады і настолькі, наколькі гэта служыла яго самарэкламе. Аддамо даніну яго асабістай мужнасці і мужнасці тых, хто пайшоў за ім, але ўсё ж выкажам сумнеў у тым, што весці бездапаможных людзей у бязлюднае месца, пад мост і пад паўлічэнкаўскія шыхты было дзеяннем адказнага палітыка.

Па-трэцяе, сакавіцкі чын на плошчы Каліноўскага, ня гледзячы на тое, што ён быў спрычынены перадвыбарнымі падзеямі і ўдзелам апазіцыі ў выбарах, быў не палітычным, а хутчэй дысідэнцкім пратэстам. Ён не дамагаўся канкрэтных мэтаў (якія ніхто канкрэтна і паслядоўна не пазначыў), а хутчэй быў сродкам захавання пачуцця ўласнай годнасці прадстаўнікамі дэмакратычнай субкультуры. (Аб гэтым пачуцці выразна

выказаўся, напрыклад, Юры Чавусаў у артыкуле папярэднім нумары «ARCHE», прыгадаўшы ганебнае, у чымсьці трагікамічнае заканчэнне кампаніі Уладзіміра Ганчарыка ў 2001 г. і рашучасць дэмакратычных актывістаў не дапусціць паўтарэння гэтай ганьбы праз пяць год).

Я пагаджуся з Юрыем Чавусавым, што грамадзянская супольнасць у пэўнай эйфарыі пераацаніла ў паслясакавіцкі перыяд значнасць і ўплыў сваіх безумоўна гераічных дзеянняў. Аднак абвінавачваць лідэраў апазіцыі ў тым, што яны не падтрымалі (дзеяннямі, аб адсутнасці маральнай, эмацыйнай падтрымкі гаворыць нельга) парыў плошчы таксама можна толькі ўмоўна. І не таму што «электаральныя» дзеянні апазіцыі не адпавядалі «рэвалюцыйнаму» сцэнару плошчы, а таму, што і дзеянні плошчы зусім не дацягвалі да таго, што магло б у беларускіх умовах спарадзіць рэвалюцыю. Чын на супраціву быў скапіяваны акурат з памаранчавага сцэнару (які спалучаў электаральны і рэвалюцыйны элементы і мог ажыццявіцца толькі тады, калі барацьба за ўладу не несла фізічнай пагрозы яе ўдзельнікам), і ён меў даць пэўны вынік, толькі тады, калі б у выніку выбарчай кампаніі апазіцыя б выставіла ўласныя прэтэнзіі на ўладу. Без гэтага пратэст на плошчы Каліноўскага быў ужо амаль самадастатковай з'явай: ён быў барацьбой не за ўладу, а за асабісты гонар, не палітычнай, а дысідэнцкай, не рацыянальнай, а ірацыянальнай, эмацыянальнай дзеяй, спантанным чынам, у якога наўрад ці мог быў быць сцэнар і ў рамках якога маглі б быць дасягнутыя канкрэтныя вынікі.

Менавіта гэтая ірацыянальнасць, спантаннасць і выклікала нашае захапленне, стварыла легенду змагання, якая застанецца нашай палітычнай і культурнай спадчынай. Аднак сам факт ірацыянальных дзеянняў пацвярджае, што палітычнага выніку на той момант дамагчыся было немагчыма. Вынік мог быць толькі ідэалагічны, маральны, інфармацыйны, эмацыянальны. Плошча яго часткова дамаглася, няздольнасць арганізаванай апазіцыі дапамагчы пашырыць яго ёсць бадай тым, у чым яе сапраўды можна папракнуць. У любым выпадку, дысідэнцкія дзеянні звычайна не паддаюцца ацэнкам рацыянальнага палітычнага мыслення, іх наступствамі з'яўляецца пашырэнне паралельнага грамадства, альтэрнатыўнай духоўнай і

інтэлектуальнай прасторы, а не вырашэнне пытання аб уладзе. Па меры выгасання эмацыянальнага ўздыму гэтая прастора непазбежна пераходзіць у больш латэнтны, замаскаваны для вонкавага вока стан. Вось, збольшага, і прычыны паслясакавіцкай апатыі.

3. Ці пераадолець можна гэтую апатыю? Ці магчыма ўвогуле ў цяперашняй Беларусі змястоўная палітычная дзейнасць? Апазіцыйная палітычная сіла звычайна канцэнтруецца на двух накірунках дзейнасці. Першы – гэта барацьба за ўладу. Другі – гэта прасоўванне і папулярызацыя ў грамадстве палітычнай альтэрнатывы, што ў сваю чаргу надае апазіцыі сацыяльны рэсурс, які і робіць магчымым барацьбу за ўладу. У нашым грамадстве гэты попыт абмяжоўваецца не толькі страхам пабудаванай і ўдасканаленай за дванаццаць гадоў рэпрэсіўнай машыны. Рэжым Лукашэнкі здолеў дасягнуць пэўнай раўнавагі паміж самім сабой і грамадствам, з аднаго боку, «падагнаўшы» яго пад свае лякалы, з іншага, заклаўшы, калі так можна сказаць, светапогляд і палітычную культуру сярэднестатыстычнага беларуса ў свой уласны падмурак. Дасягненне такой раўнавагі адлюстроўваецца ў дзвюх тэндэнцыях грамадскага жыцця, якія сталі асабліва заўважнымі апошнім часам.

Адна такая тэндэнцыя – гэта карпаратызацыя грамадства. Дзяржава ўсталявала і прадыктавала грамадзяніну пэўны даволі ясны і зразумелы алгарытм узаемадзеяння і аформіла яго адмысловымі інстытуцыянальнымі рамкамі (такімі, як прэзідэнцкая вертыкаль, кантрактная сістэма, сістэма размеркавання студэнтаў і г.д. і т.п.) Яна выпрацавала сістэму ўзаемаабмену (сацыяльнага кантракту), якая выразна тлумачыць, што і як трэба рабіць для задавальнення сваіх матэрыяльных і сацыяльных патрэбаў. Яна выпрацавала механізмы сацыяльнай мабільнасці. Усе гэтыя інстытуты, механізмы і алгарытмы цалкам кантралююцца самой дзяржавай. Як вынік, чалавек мусіць выбудоўваць свае жыццёвыя і кар'ерныя планы, прымаць рашэнні (куды пайсці вучыцца ці рабіць, як выплаціць крэдыт на жыллё і г.д.) у поўнай адпаведнасцю з існуючымі правіламі гульні.

Наступствам падобнай карпаратызацыі з’яўляецца тое, што жаданне чагосьці большага, чым «чарка і скварка» (прэстыжная праца, добры заробак, ліцэнзія на канцэртную дзейнасць, ці магчымасць займацца бізнесам, напрыклад), можа рэалізавацца толькі пры ўмове не проста прымання правілаў гульні, а актыўнага садзеяння ў іх падтрымцы і мацаванні. Такім чынам, дзяржава вярбуе да сябе на службу цэлы сацыяльны пласт, які ў іншых умовах, пры існаванні шырокіх зонаў персанальнай і грамадскай аўтаноміі і легітымных магчымасцяў для незалежнай дзейнасці і творчасці, стваралі б сацыяльную базу прыхільнікаў пераменаў. Нагадаю, што сярод тых, хто стаяў у чорных шэрагу спецназу альбо ствараў вядомыя сюжэты на БТ падчас сакавіцкіх падзеяў, большасць складалі даволі маладыя людзі.

Другая тэндэнцыя – гэта віртуалізацыя светапогляду і светаадчування. Каментуючы падзеі на Кастрычніцкай плошчы, адна мая знаёмая – моладзевая актывістка – падзялілася такім меркаваннем: уся дзея, казала яна, нагадвала Матрыцу. Вось мы тут, бунтуем, мітынгуем, а выйдзі на суседнюю вуліцу – і нічога не нагадвае, што зусім побач штосьці адбываецца. Людзі сабе ходзяць па крамах, п’юць піва, гуляюць пад ручку... Іншымі словамі, тое, што адбываецца ў рэальным жыцці, гэта яшчэ зусім не рэчаіснасць, так сказаць. Дзеля гэтага яна мусіць патрапіць у тэлевізар. Віртуалізацыя – з’ява абсалютна лагічная для атамізаванага грамадства, у якім, да таго ж, усе істотныя медыі кантралююцца зверху (выключэнне стварае пакуль што інтэрнэт, і менавіта дзякуючы яму дэмакратычная субкультура здолела аформіцца і захавацца). Але яна мае вельмі сумныя для шукальнікаў палітычных альтэрнатываў наступствы. Віртуальная рэчаіснасць адкладваецца ў галовах у якасці міфаў і фобій, яна мацуе ўжо існуючыя сістэмы стэрэатыпаў і каштоўнасцяў, і як вынік – шмат хто пры канфлікце «віртуала» з «рэалам» проста адмаўляецца ўспрымаць апошні. Пазнавальна і сумна было чытаць на інтэрнэт-часопісах пра досвед адной маладой актывісткі, студэнткі і безумоўна добрага чалавека, якая, трапіўшы ў шпіталь і ўступіўшы ў спрэчку з бабулькамі ў сваёй палаце, пачула пра сабе шмат чаго, звязанага з прастытуцыяй і наркаманіяй. Хаця перад бабкамі быў жывы і відавочна прыстойны чалавек...

Карпаратызацыя падвышае кошты як актыўнай, так і пасіўнай альтэрнатыўнай палітычнай і сацыяльнай актыўнасці (да пасіўнай можна аднесці нават чытанне апазіцыйнага вэб-сайту на працоўным месцы, што можа прывесці да вельмі сур'ёзных наступстваў). Вырвацца за межы лукашэнкаўскай сістэмы могуць дазволіць сабе зусім нямногія. Чалавек не толькі прыстасоўваецца да сістэмы, ён робіцца яе ўдзельнікам. Магчыма, я памыляюся, але за дванаццаць год лукашэнкаўшчыны я не памятаю такой гатоўнасці канфармістаў прымаць удзел у палітычных рэпрэсіях, і такога масавага пераўтварэння «кухоннай апазіцыі» ў канфармістаў. Віртуалізацыя надзвычайна ўскладняе камунікацыю тых, хто існуе ў падкантрольным грамадстве і тых, хто вырываецца ў паралельнае, тымі, хто мае доступ да альтэрнатыўных крыніцаў інфармацыі і тымі, хто не, тымі, хто яшчэ не страціў здольнасцяў да крытычнага ўспрымання інфармацыі і тымі, хто ўспрымае прапаганду як дадзенае. Зноўку магчымая памылка, але такое істэрычнае стаўленне зацятых лукашыстаў да апанентаў улады цягам апошніх выбараў і асабліва ў паслявыбарны перыяд назіралася, бадай, упершыню.

Кумулятыўны эфект карпаратызацыі і віртуалізацыі палягае ў тым, што любыя альтэрнатыўныя палітычныя і грамадскія дзеянні абмежаваныя межамі сацыяльнай і інфармацыйнай рэзервацыі. Пытанні палітычнай стратэгіі, тэхналогій, мэсіджу, выбару кандыдатаў, і нават кааліцыйнага будавання другасныя, пакуль альтэрнатыўная палітычная дзейнасць вядзецца ў межах рэзервацыі.

Калісьці, некалі гадоў таму, калі палітычны клімат у краіне быў нашмат менш рэпрэсіўным а канструкцыя рэжыму (у тым ліку пабудова яго адносінаў з грамадствам) менш жорсткай, існаванне ў рэзервацыі альбо праца з больш шырокай аўдыторыяй, «з электаратам», было пытаннем выбару для палітычных апанентаў. Часцяком аўтар гэтых радкоў сам крытыкаваў апазіцыю за тое, што яна свядома замыкалася ў паралельным грамадстве. Сёння магчымасць выбару ўжо не пакінутая. Болей таго, відавочна, што адміністрацыйны і інфармацыйны кантроль дзяржавы над грамадствам у бліжэйшы час яшчэ больш узмацніцца. А значыць, межы

рэзервацыі яшчэ больш звузяцца.

4. Валерка Булгакаў нядаўна вельмі трапна вызначыў, чаму ва ўмовах «карпаратыўнай дзяржавы» дагэтуль дазваляецца фармальнае існаванне палітычнай апазіцыі:

Чым больш я назіраю за паводзінамі нашай улады, тым больш я пераконваюся ў тым, што апазыцыю Лукашэнка дазваляе толькі дзеля таго, каб у Беларусі ўсё было, як у людзей. Апазыцыя -- гэта зьява, якая яшчэ нейкім чынам збліжае нас з суседнімі краінамі Ўсходняй Эўропы. Ня будзе апазыцыі -- і Беларусь відавочна ператворыцца ў сярэднеазіяцкую дзяржаву.

Аднак палітычная апазіцыя пакуль што існуе, а магчымасцяў займацца палітычнай дзейнасцю амаль не засталося. Інстытуцыянальны стан беларускай апазіцыі фактычна не змяніўся з тых часоў, калі паўсталі палітычныя суб'екты – з больш лагодных, плюралістычных часоў. Атрымалася, што форма цалкам не адпавядае жыццю. Падзелы на палітычныя партыі, звады паміж лідэрамі, спробы вызначыць «свой электарат», падзяліць яго на «правы і левы», падобныя да рэфлексаў у чалавека, у якога нядаўна ампутавалі ці нагу ці руку. У іх дадзеная канечнасць нейкі час працягвае «балець»: іншымі словамі, адчуванне ёсць, матэрыяльнага аб'екта няма.

У новых умовах патрэбна было б нейкае пераасэнсаванне сваіх мэтаў і задачаў, а таксама і змены інстытуцыянальных рамках сваёй дзейнасці, рэканструкцыя іх пад новыя рэаліі, якія не зводзяцца да барацьбы за ўплыў той ці іншай партыі ці партыйнай ідэалогіі. Праблема ў тым, што зрабіць гэта амаль немагчыма. Практычна нерэальна, напрыклад, зарэгістраваць новую арганізацыю, партыю, рух, кааліцыю, а стварыць незарэгістраваную – значыць рызыкаваць трыма гадамі ў турме нават перад тым, як пачнеш актыўную дзейнасць. Я не ўпэўнены, што гэта было задумкай улады, калі прымаліся вядомыя артыкулы крымінальнага кодэксу, але відавочна, што наступствы, хай і не прадбачаныя, для яе вельмі і вельмі спрыяльныя. Падзел на мноства партый і іншых структураў

робіць, напрыклад, малавыніковай ратацыю не апраўдаўшых сабе апазіцыйных кадраў, нават калі на змену прыходзяць больш жвавыя, сучасныя, ініцыятыўныя лідэры. Пераемнікі ветэранаў у першую чаргу бачаць сабе як лідэры тых жа самых партыйных структураў. Іх уплыў у апазіцыйнай палітыцы, у рэзервацыі, залежыць у першую чаргу ад уплыву менавіта ў гэтых структурах. Такім чынам, паколькі рэформа апазіцыі прывядзе да яе поўнай крыміналізацыі, застой у яе шэрагаў непазбежны.

Інстытуцыянальны застой непазбежна выклікае і дэфіцыт ідэяў. Давайце паглядзім, якія накірункі далейшай дзейнасці прапануюць апазіцыйныя структуры, у прыватнасці, Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы (з падачы БНФ) і Аб'яднаная грамадзянская партыя разам з камуністамі. Нагадаем, што менавіта нязгода наконт плану далейшых дзеянняў нядаўна прывяла да першых адзнакаў расколу ў апазіцыйнай кааліцыі. Першыя бачаць шлях у наладжванні масавых акцыяў з мэтай патрабавання новых выбараў. Другія прапануюць збор подпісаў за адмену кантрактнай сістэмы, за дэлегітымізацыю прэзідэнцкіх выбараў, правядзенне кампаніі «Салідарнасць у імя Свабоды», а таксама падрыхтоўку да мясцовых выбараў. На жаль, гэтыя два розныя планы дзеянняў маюць паміж сабой багата супольнага.

Па-першае, можна зазначыць відавочны дэфіцыт рэпертуару і як вынік – няздольнасць вынесці ўрокі з папярэдніх беспаспяховых кампаній падобнага кшталту. Адныя прапануюць вяртанне да мітынговай дэмакратыі, іншыя бачаць шлях у хаджэнні ў народ і зборах подпісаў.

Па-другое, такое адчуванне, што прапануецца гонка за з'ехаўшым цягніком, асабліва што тычыцца дэлегітымізацыі адбытых выбараў. Выбары можна дэлегітымізаваць толькі тады, калі яны адбываюцца, а не праз некалькі месяцаў, калі грамадства ўжо амаль забылася, што яны наогул адбыліся. Калі пачаць сёння, то дэлегітымізаваць можна хіба што выбары 2011 года.

Па-трэцяе, і той і іншы планы як быццам бы маюць на ўвазе, што на Плошчы Каліноўскага яшчэ стаіць намётавае мястэчка,

што сярод дэмакратычных актывістаў існуе маральны і псіхалагічны ўздым, які падштурхне іх на масавыя акцыі. Мітынговая кампанія патрабуе пэўнага стану напружанасці ў грамадстве, які мусіць узнікнуць менавіта ў дачыненні пытання выбараў (з-за якога людзі тэарэтычна мусяць выйсці на вуліцы).

Па-чацвёртае, відавочная адсутнасць стратэгічнага планавання. Зразумела, што мітынгі плануюцца, каб завастрыць увагу грамадства на парушэнні падчас выбарчага працэсу, што адмену кантрактнай сістэмы будуць патрабаваць, каб атаясаміць відавочна непапулярную меру уладаў. Аднак гэта толькі адзінкавыя акцыі, і не зразумела, які ў іх мусіць быць працяг, што рабіць пасля таго, як мітынгі будуць разагнаныя, а подпісы сабраныя.

Па-пятае, маштабныя палітычныя задачы, аб якіх кажуць лідэры, мусяць рэалізавацца нашмат больш магутнымі палітычнымі, фінансавымі, інфармацыйнымі і арганізацыйнымі рэсурсамі, чым тыя, якія сёння маюцца ў распараджэнні ў апазіцыі. Самае галоўнае, што спробы правядзення падобных акцыяў рабіліся і ў мінулым, а іх вынікі былі даволі несуцяшальнымі.

5. Аднак, праблема нашмат шырэйшая, чым крызіс жанру ў апазіцыі. Ва ўмовах немагчымасці кантралявання базавых працэсаў, што адбываюцца ў дзяржаве і грамадстве, палітычная апазіцыя робіцца закладніцай абставінаў, мусіць, пры самых сваіх актыўных дзеяннях, спадзявацца на цуд, на форс-мажор, ці на натуральны ход падзеяў, які можа заняць балюча шмат часу. Яна не можа даць аніякіх гарантыяў, што самыя эфектыўныя індывідуальныя і калектыўныя дзеянні прынясуць плён, што яны не будуць ануляваныя прэвентыўнымі дзеяннямі ўлады. Разам з хвастом мінулых няўдачаў гэта ператварае безнадзейнасць у руціну: паразы, няўдачы пачынаюць успрымацца як дадзенае.

У варунках, калі безнадзейнасць руцінізаваная, калі актыўныя незалежныя дзеянні трапляюць пад артыкулы Крымінальнага кодэксу, калі ўлада загадзя мае адказ амаль на любыя выклікі з

боку апанентаў, адзіная сіла, якая застаецца непадкантрольнай і непераадольнай для ўлады, гэта сіла бяссільных. Захаванне надзеі на палітычны прарыў у будучым залежыць ад таго, ці будзе працяг у рэвалюцыі духу, чый пачатак мы пабачылі на плошчы Каліноўскага. Падтрыманне і пашырэнне дысідэнцкай грамадскай актыўнасці ёсць неабходнай перадумовай для таго, каб у будучым узнікла сур'ёзная палітычная альтэрнатыва. Такая дзейнасць шмат у чым адрозніваецца ад палітычнай – яна больш індывідуальная і, калі так можна сказаць, дробнагрупавая, чым калектыўная і палітычная. Яна ладзіцца больш з уласнай ініцыятывы, чым па планах і стратэгіях. Яна, нарэшце, праводзіцца на свой страх і рызыку – гарантыяў абароны ад ціску, шантажу і рэпрэсіяў сёння даць ніхто не можа (іншая справа, што трэба ўсімі магчымасцямі пазбягаць непатрэбных ахвяраў і пасадак).

Арганізаваным можа быць хіба спрыянне і распаўсюджванне гэтай незалежнай і дэцэнтралізаванай актыўнасці. Сёння як ніколі патрэбнае пашырэнне незалежнай прасторы, тэрыторыі свабоды, пашырэнне і мацаванне дэмакратычнай субкультуры, калі хочаце – палітычнага гета. Пошук новых формаў «існавання ў свабодзе» ўжо вядзецца незалежнымі высілкамі – і пашырэнне ўплыву палітычнага інтэрнэту ёсць адной з відавочных праяваў. Зноў такі, гэтае пашырэнне перадусім залежыць ад індывідуальных высілкаў, ад здольнасці актывістаў камунікаваць са сваімі аднадумцамі, даносіць думкі і інфармацыю да іншых, ад іх здольнасці ўцягваць новых людзей часам у самыя простыя формы грамадзянскай актыўнасці. Арганізаваная палітычныя і грамадскія структуры мусяць стаць своеасаблівымі рэсурснымі цэнтрамі (даруйце за гэта зацёртае і кантраверсійнае вызначэнне), якія аказваюць мінімальную тэхнічную і інтэлектуальную дапамогу такім дробным высілкам, ад якіх сёння залежыць многае.

Тэрыторыя свабоды патрабуе лепшай камунікацыі паміж яе насельнікамі – менавіта тады дысідэнцкі рух мае перспектыву калісьці пераўтварыцца ў палітычную сілу. Досвед мінулага паказвае, што гэтага часцяком можна дасягнуць, не зацыкліваючыся на палітыцы. Летні адпачынак, заўзятарства, краязнаўчыя экскурсіі, любая іншая непалітызаваная і

дэбюракратызаваная форма аб'яднання аднадумцаў (апошняе – дэбюракратызацыя – сёння асабліва важна, каб зменшыць пагрозу крымінальнага пераследу) можа быць нашмат больш плённай, чым любыя заклікі далучыцца да наступнай палітычнай кампаніі.

Тэрыторыя свабоды не здольная выжыць без салідарнасці і ўзаемадапамогі. Паўтаруся, што гарантыяў ад пераследу ці як мінімум банальных жыццёвых непрыемнасцяў сёння актыўнаму грамадзяніну не можа даць ніхто. Зменшыць кошт існавання ў паралельным грамадстве можна толькі супольнымі высілкамі ўсіх яго сяброў. Самая простая дапамога тым, хто трапляе пад дзяржаўны каток ці іх сем'ям, ахвяраванне невялікіх грошай ці часу, каб памагчы ў побытавых пытаннях. Маральная падтрымка сёння значыць больш, чым ніколі. Тое ж самае тычыцца і больш шырокага грамадства. Трэба навучыцца рэагаваць на любы канфлікт ці напружанасць, заступацца за любога пакрыўджанага, наладжваць кантакты з любымі аўтаномнымі асяродкамі, перапісаць талмуды сваіх праграмаў у некалькі радкоў канкрэтных і зразумелых прапановаў і патрабаванняў, наогул, усімі сіламі паказваць, што палітычныя змены будуць асабістай перамогай кожнага.

Наладжванне камунікацый з падкантрольным уладзе грамадствам, па-за рамкамі дэмакратычнай субкультуры, немагчыма без інфармацыйнага прарыву. Гэты прарыў сёння можа ажыццявіцца толькі звонку. Арганізацыя незалежнага тэлевізійнага і радыёвяшчання на Беларусь абмяркоўваецца і мусоліцца ўжо які год, але гара кожны раз параджае мыш. Відавочна, што пытанне ніколі не было да канца прапрацаванае, не хапае арыгінальных ідэяў, грунтоўных даследаванняў, новага бачання таго, якія формы, які фармат вонкавых электронных медыяў можа быць найбольш эфектыўным. Любы новы тэндэр з боку ЕЗ альбо іншай структуры становіцца аб'ектам паддывановай канкурэнцыі паміж асобнымі групамі журналістаў. У той жа час імкліва ўзнікаюць новыя формы падачы інфармацыі (інтэрнэт-TV, падкастынг і г.д.), якія яшчэ малазадейнічаныя і ў якіх можа быць магутны патэнцыял у будучым. Існуючая на сёння палітычная апазіцыя валодае інструментамі, каб як мінімум

паспрабаваць арганізаваць гэты масіўны інфармацыйны прарыў звонку. Болей за тое, я лічу гэта галоўнай яе задачай на бліжэйшы перыяд – у рэшце рэшт, без інфармацыі аб палітычнай дзейнасці казаць не даводзіцца. Трэба памятаць, аднак, што патрэбна менавіта інфармацыя для грамадзянаў, а не трыбуна для таго ці іншага палітыка ці працоўнае месца для таго ці іншага «свайго» журналіста.

6. Быць дысідэнтам ва ўмовах карпаратыўнай дзяржавы ўсё ж параўнальна лёгка. Цяжка з псіхалагічнага пункту гледжання, але ў той жа час не цісне неабходнасць дасягнення выніку. Стратэгія будуецца з шэрагу дробных справаў. Можна проста займацца тым, чым займаешся – пісаць артыкулы, друкаваць кнігі і часопісы, рабіць інтэрнэт-сайты, размаўляць з людзьмі... Руцінізаваная безнадзейнасць апраўдвае паўсядзённасць. Палітычнай апазіцыі нашмат складаней. Патрэбны мэты, патрэбны вынікі. Патрэбна свядомая рызыка, больш высокі ўзровень самаахвярнасці, патрэбныя здольнасці, каб пераканаць іншых ісці на ахвяры, амаль нічога не абяцаючы ўзамен. Спіс аб'ектыўных прычынаў, па якіх палітычная апазіцыйная дзейнасць сёння можа быць малаэфектыўнай, даволі доўгі – шмат чаго ўжо было пералічана вышэй у гэтым артыкуле. Але рэчаіснасць для палітычнай апазіцыі такая, што калі яна змірыцца з аб'ектыўнымі прычынамі, то яна канчаткова пераўтварыцца ў частку грамадскага, дысідэнцкага асяродка ў паралельным грамадстве. Але апошняе па азначэнню можа існаваць без лідэраў і начальнікаў. Лідэры і начальнікі патрэбныя тады, калі з'яўляецца мэта, перспектыва.

Пры ўсіх сваіх недахопах існаванне арганізаванай апазіцыі дапамагае захоўваць надзею ў тым, што палітычны прарыў магчымы. У гэтым яе, калі хочаце, сацыяльная значнасць. Але апазіцыя можа быць запатрабаваная грамадствам толькі як пратаганіст пераменаў, а не як праваднік партыйных інтарэсаў і ідэалогіяў. Партыйным актывістам і ідэолагам ужо даўно пара ўсвядоміць, што правы і левы, ліберальны і кансерватыўны электараты ў Беларусі з'явяцца толькі тады, калі адродзіцца публічная палітыка. Прасоўванне асобных ідэалогій, праграмаў, лідэраў толькі паглыбляе адчужэнне паміж

апазіцыяй і незалежным грамадствам. Калі застаюцца палітычныя партыі, неабходна любымі высілкамі захаваць аб'яднаўчыя інстытуты, такія, як кааліцыю і кангрэс дэмакратычных сілаў.

Палітычныя лідэры мусяць усвядоміць, што падпарадкаваць грамадзянскую актыўнасць у сённяшніх умовах практычна немагчыма. Дысідэнтам амаль не патрэбныя рэгістрацыя, афіцыйныя офісы і шмат чаго іншага, яны могуць існаваць больш гнутка і дэцэнтралізавана. Калі ўзнікне канкурэнцыя паміж апазіцыяй і грамадскім сектарам, першая непазбежна прайграе. Наадварот, існаванне палітычнай апазіцыі сёння хутчэй апраўдваецца тым, якія паслугі яна можа аказаць незалежнаму грамадству, якое падрыхтоўвае для яе сацыяльную глебу. У рэшце рэшт, тое, чым палітыкі мусяць займацца ў бліжэйшы час – гэта таксама збольшага грамадская, а не палітычная дзейнасць.

Мяжа паміж грамадзянскай супольнасцю і палітычнай апазіцыяй, паміж тым, што адзін блогер вызначыў як «іерархія» і «сетка», у масавай свядомасці адсутнічае. Любыя дзеянні па высвятленню адносінаў, любыя адкрытыя канфлікты, звязаныя з барацьбой за лідэрства, сёння дыскрэдытуюць увесь дэмакратычны рух. Таму скліканне новага Кангрэсу дэмакратычных сілаў, перагляд раскладу сілаў унутры кааліцыі, вызначэнне новых лідэраў мэтазгодныя толькі тады, калі ўсе ўдзельнікі аб'яднання будуць гатовыя прызнаць яго вынікі без скандалаў, узаемных абвінавачванняў, кулуарнай барацьбы і абструкцыі.

Падзеі на плошчы Каліноўскага засведчылі мабілізацыйны патэнцыял ілюзіі. Бессэнсоўныя выбары ў рэшце рэшт мелі пэўны сэнс, калі нехта захоўваў хай сабе наіўную надзею на тое, што яны могуць штосьці змяніць. У гэтым і палягае сэнс удзелу апазіцыі ў выбарах. Аднак, трэба памятаваць, што ўдзел у выбарах мае сэнс толькі тады, калі кожная кампанія – мясцовая ці парламенцкая – з'яўляюцца падрыхтоўкай да паўстання новай плошчы Каліноўскага падчас заканчэння кампаніі прэзідэнцкай. Таксама паўтаруся, што дэлегітымізаваць можна толькі наступныя выбары, а не тыя,

што ўжо адбыліся. Грамадства аб'ектыўна прызнала перамогу Лукашэнкі ў 2006. Таму працаваць варта на тое, каб гэтае прызнанне было апошнім.

Аднак рэалізацыя буйных палітычных стратэгіяў ва ўмовах татальнага кантролю, актыўных прэвентыўных дзеянняў улады і існаванні ў рэзервацыі маларэальна. «Крызісу ўлады», аб неабходнасці паглыблення якога апошнім часам апавядаў спадар Мілінкевіч, пакуль насамрэч не назіраецца. Наадварот, улада выйшла з апошніх палітычных падзеяў больш скансалідаванай, больш, чым раней, павязаная кругавой парукай, яшчэ мацней усведаміўшы свой магчымы лёс у тым выпадку, калі наступяць палітычныя змены. Яе крызіс магчымы толькі тады, калі аслабнуць інстытуты «карпаратыўнай дзяржавы» – іншымі словамі, калі рэсурсы, неабходныя для падтрымання адміністрацыйнага і эканамічнага кантролю над грамадствам і лаяльнасці ўласнага бюракратычнага і адміністрацыйнага апарату выгаснуць альбо радыкальна зменшацца. З іншага боку, такі крызіс малаверагодны, пакуль грамадская думка фармуецца ва ўмовах віртуальнай рэчаіснасці, іншымі словамі -- без прарыву інфармацыйнай блакады. Менавіта тады ўзнікне попыт на палітычную альтэрнатыву, а палітычная апазіцыя атрымае магчымасць вырвацца з рэзервацыі. Аднак неабходныя памеры дэзарганізацыі ўсёй лукашэнкаўскай сістэмы такія, што яны наўрад ці могуць быць спрычыненыя дзеяннямі апанентаў.

Гэтая дэзарганізацыя хутчэй магчымая альбо пры ўдзеле экзагенных чыннікаў (эканамічных, знешніх, сацыяльных), г. зн. тых, якія сама сістэма няздольная кантраляваць, альбо з прычыны ўнутранай дэзарганізацыі сістэмы, якая вынікала б з працэсаў ці дзеянняў, што дзеяцца ў рамках яе самой. Сваімі высілкамі апазіцыя дэзарганізаваць яе няздольная. Яна здольная, аднак, прадбачыць ці спрагназаваць магчымыя сцэнары яе дэзарганізацыі і выпрацаваць план дзеянняў на выпадак, калі гэтыя сцэнары адбудуцца ў рэчаіснасці. Яна мусіць быць прыгатаваная да магчымага крызісу ўлады не толькі ў арганізацыйным аспекце (планаванне дзеянняў) але і ў ідэалагічным. Досвед паказвае, што крызіс пераўтвараецца ў палітычныя магчымасці толькі для таго, хто здольны

інтэрпрэтаваць яго прычыны і навязаць гэтую інтэрпрэтацыю грамадству.

У любым выпадку, дэмакратычная апазіцыя і незалежнае грамадства пакуль застаюцца закладнікамі руцінізаванай безнадзейнасці. Варыянт таго, што дэмакратычны супраціў у бліжэйшы час будзе магчымы выключна ў дысідэнцкіх формах, выключаць нельга. Фактарам падтрымання надзеі ў такіх варунках можа стаць толькі нашая перакананасць у тым, што індывідуальны супраціў – гэта самае галоўнае ў такіх абставінах, што ён непазбежна прынясе плён, што канструкцыя карпаратыўнай дзяржавы нявечная. Дысідэнт усё ж такі мае адну перавагу, якую не здольныя адняць ніякія рэпрэсіі – ён бачыў і ведае, як руйнуюцца дыктатуры.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 7-8 (47-48) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/15
[image]

[redacted]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 7-8 (47-48) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

7-8[image]а

аналітыка

[image]2006

"ды Зыбары • "крытыка • эсэістыка • **аналітыка** • палеміка • гісторыя

[image] [image] [image] **ПАВЕЛ УСАЎ**

Павел Усаў Расія, сацыял-дэмакратыя і «праект Казулін»

Нягледзячы на пагаршэнне палітычнай сітуацыі, апошні год быў шчодры на новыя твары і інтрыгі. Тыя, хто ў будучым будзе пісаць пра сённяшнія падзеі, будуць мець значна больш інфармацыі і магчымасцяў, бо сёння некаторым палітычным працэсам, дзеянням і рашэнням цяжка даць аб’ектыўную ацэнку. Шматлікія і процілеглыя меркаванні асабліва часта гучаць у сувязі з дзейнасцю Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі БСДП (Г) і яе кіраўніка А. Казуліна. Падчас іх аналізу мы будзем абапірацца на агульнадаступныя крыніцы інфармацыі: інтэрв’ю, публічныя выступленні палітыкаў, факты і каментары да іх.

Палітыка можа здзіўляць сваёй непрадказальнасцю і, на першы погляд, нелагічнасцю дзеянняў, якія хтосьці чыніць. Але ад пачатку трэба разумець, што якое заўгодна палітычнае дзеянне абапіраецца на два базавыя фактары – інтарэс і мэтазгоднасць. Інтарэс і мэтазгоднасць могуць складацца з грошай, улады, гарантый бяспекі і амбіцый і г. д. Для дасягнення гэтых каштоўнасцяў той ці іншы чалавек прыходзіць у палітыку і чыніць неабходныя для гэтага дзеянні: уступае ў саюзы, шукае

падтрымку і інш.

Прыход у палітыку А. Казуліна і дзеянні БСДП (Г) на працягу 2005–2006 гадоў выклікалі вострую крытыку і неадназначнае стаўленне з боку палітычных аналітыкаў і лідэраў апазіцыйнага руху. Дзяржаўныя СМІ таксама падкрэслівалі дэструкцыйную ролю партыі А. Казуліна на фоне агульных намаганняў і спробаў аб'яднаць апазіцыйныя сілы і гуляць на адным полі. «По сути, – пісаў рэдактар «Советской Белоруссии» Павел Якубовіч, – Козулин ослабил т. н. «демократическую оппозицию», внеся в процесс присущий ему невероятный бонапартизм и склонность к отчаянному шоу»[1]. А вось як ацэньвала дзеянні А. Казуліна група палітолагаў з «Цэнтра палітычнай адукацыі»:

1. Пакуль Казулін з'яўляецца старшынёй БСДП (Грамада), адсутнічае імавернасць аб'яднання рэсурсаў і электарату ўсіх апазіцыйных арганізацый. Захоўваецца раскол апазіцыі.

2. Казулін выконвае ролю дастаткова эфектыўнага інструмента інфармацыйнай вайны супраць як найбольш небяспечнага праціўніка Лукашэнкі – Мілінкевіча і яго аб'яднання, так і супраць усёй апазіцыі ў цэлым. Прычым ён выконвае гэтую ролю, выкарыстоўваючы інфармацыйныя рэсурсы самой апазіцыі.

3. Прысутнасць Казуліна ў палітыцы яшчэ больш абмяжоўвае магчымасці апазіцыі арганізоўваць масавыя акцыі пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў прэзідэнцкіх выбараў. Тым самым павышаецца імавернасць, што падзеі ў сакавіку 2006 года будуць адбывацца ў адпаведнасці са сцэнаром Лукашэнкі[2].

Безумоўна, для ўлады быў выгадны сцэнар, які прадугледжваў двух альбо больш апазіцыйных кандыдатаў, што ва ўмовах інфармацыйнага вакууму, агульнай слабасці апазіцыйных сілаў

зводзіла б намаганні канкурэнтаў Лукашэнкі на нішто. З'яўленне А. Казуліна, няхай нават як самастойнага гульца, адпавядала стратэгіі расколу электаральнага поля апазіцыі і садзейнічала:

1) узрастанню супярэчнасцяў і канфліктаў паміж двума апазіцыйнымі лагерамі;

2) правакаванню інфармацыйнай вайны паміж сабою;

3) размыванню вобраза дэмакратычнай альтэрнатывы Лукашэнку і звужэнню інфармацыйнага поля альтэрнатыўных кандыдатаў, асабліва ў рэгіёнах;

4) фармаванню двух цэнтраў прыняцця рашэнняў і дэзарыентацыі выбарнікаў, што жадалі галасаваць і дзейнічаць супраць улады;

5) адсутнасці адзінства апазіцыі (а БСДП (Г), незалежна ад жадання А. Казуліна трымаць дыстанцыю да апазіцыі, была апазіцыйнай партыяй) нават у вачах іх прыхільнікаў, канструявала вобраз беларускай апазіцыі, як няздатнай змагацца дзеля супольнай мэты, што памяншала ў людзей жаданне бараніць свой выбар.

Ужо пасля гэтых высноў у нашым аналізе можна было б ставіць кропку, бо дзеянні БСДП (Г) супярэчылі агульнаму плану дэмакратычных сілаў. Аднак палітыка цікавая менавіта тым, што ў ёй важныя таксама глыбінныя працэсы, якія прыводзяць да тых ці іншых рашэнняў і дзеянняў.

У канцы 2004 – пачатку 2005 года Беларуская сацыял-

дэмакратычная партыя (Народная Грамада), якую ўзначальваў Мікола Статкевіч, перажывала цяжкі ўнутраны крызіс. Нарастаў унутрыпартыйны канфлікт паміж старшынёй і яго намеснікамі. На IX пазачарговым з'ездзе БСДП (НГ) 15 студзеня 2005 года М. Статкевіч і шэраг іншых сяброў партыі былі выключаны з яе. Пасля гэтага з'езда ў краіне намінальна дзейнічалі тры сацыял-дэмакратычныя партыі: БСДП (НГ) – М. Статкевіча, БСДП (НГ) – выбранага на тым жа IX з'ездзе А. Ляўковіча (пазней, на патрабаванне Мін'юста, з назвы партыі прынялі слова «Народная»), і БСДГ, якую ўзначальваў С. Шушкевіч.

Паралельна з працэсам рэарганізацыі партыйных шэрагаў ішоў працэс аб'яднання дзвюх сацыял-дэмакратычных партыяў – БСДП (Г) і БСДГ. Згодна з першымі дамоўленасцямі, узначаліць партыю павінна была асоба, якая дагэтуль не ўваходзіла ў склад кіраўніцтва партый-папярэдніц. Адным з прэтэндэнтаў на гэтую пасаду быў генерал Фралоў. Але... у працэсе працяглых перамоваў выбар паў на А. Казуліна (як ажыццяўляўся гэты пошук і ці знайшла партыя Казуліна ці Казулін партыю, для нас пакуль застаецца таямніцай).

19 сакавіка 2005 года адбылося аб'яднанне БСДП (Г) і БСДГ шляхам уваходжання сяброў БСДГ у склад БСДП (Г). Старшынёй партыі быў абраны А. Казулін[3], які да гэтага часу не меў ніякага дачынення ні да публічнай палітыкі, ні да сацыял-дэмакратыі.

Казулін прыйшоў у палітыку нечакана. Валодаючы ўменнямі адміністратара і педагога, ён, тым не менш, быў далёкі ад разумення палітычнай рэчаіснасці, якая яго атачала. На момант яго прыходу ў партыю ў ёй існавалі тры канкурэнтныя між сабой групы: А. Ляўковіча, У. Нісцюка, А. Караля. Найбольш уплывовай сярод іх была група У. Нісцюка.

Для таго, каб праясніць гэтую сітуацыю, варта зразумець, хто і якую карысць ад гэтага палітычнага сімбіёзу мог атрымаць. Дапусцім, што А. Казулін быў поўны энергіі, моцы і жадання

змагацца за тое, каб змяніць сітуацыю ў краіне. Дзеля гэтага яму патрэбна абаперціся на палітычную структуру, якая б яго падтрымала. І ён знаходзіць яе ў сацыял-дэмакратычнай партыі. Згодна з логікай палітычных працэсаў, якія адбываюцца ў краіне, будучы даволі вядомай фігурай, А. Казулін уяўляў рэальную пагрозу для А. Лукашэнкі. Тым не менш, улада дазволіла ісці яму на выбары. З гэтага можна зрабіць выснову, што альбо А. Казулін быў ад пачатку несамастойнай фігурай, альбо структура, у якую ён прыйшоў, была пад кантролем. Верагоднасць таго, што партыя, як і некаторыя іншыя апазіцыйныя арганізацыі, знаходзіцца пад кантролем, існавала. Спецслужбам нічога не перашкаджала перавесці калі не партыю, то некаторых функцыянераў БСДП (Г), у катэгорыю «канструктыўная апазіцыя». Ужо на ІХ з'ездзе партыі У. Нісцюк «рэзка крытыкаваў тактыку лабавых атак на ўладу, сцвярджаючы, што сацыял-дэмакратыя – мастацтва кампрамісу»[4].

З аднаго боку, амбітнасць А. Казуліна, яго памкненні да ўлады і славы, самаўпэўненасць – рысы характару, праз якія ім можна было вельмі эфектыўна маніпуляваць. З другога боку, фінансавыя інтарэсы кіраўніцтва партыі таксама стваралі спрыяльныя ўмовы для вонкавага ўздзеяння як з боку беларускіх уладаў, так і з боку Масквы. Пры гэтым А. Казулін сапраўды мог быць сумленным чалавекам, але палітычна блізарукім і абмежаваным. Для ўлады постаць А. Казуліна і пазіцыя БСДП (Г) была выгаднай у любым выпадку, бо яна дзейнічала як незалежная сіла, ідучы асобнай калонай.

Ільвіная доля крытыкі, накіраванай супраць А. Казуліна, звязана з яго нежаданнем працаваць у межах «дэмакратычнай кааліцыі». Аднак прычыну гэтага нежадання трэба шукаць у пазіцыі БСДП (Г), якая аформілася яшчэ задоўга да паяўлення новага старшыні.

Стаўленне БСДП (Народная Грамада) да ідэі сумеснай дзейнасці аб'яднанай апазіцыі, а пазней да Кааліцыі «5+» і «Дзесяткі» было заўсёды супярэчлівае. Доўгі час М. Статкевіч

рабіў усё магчымае, каб на базе БСДП (НГ) стварыць альтэрнатыўную сілу, адмежаваўшыся і ад апазіцыі, і ад улады. У 2000 годзе БСДП (НГ) адмовілася ад удзелу ў байкоце парламенцкіх выбараў. У 2004 годзе партыя Статкевіча адмовілася падтрымаць стратэгію Кааліцыі «5+» і зноў пайшла асобнай калонай на парламенцкія выбары. На VIII з'ездзе БСДП (НГ), які прайшоў вясною 2004 года, было заяўлена, што М. Статкевіч будзе балатавацца як кандыдат у прэзідэнты ад партыі на выбарах 2006 года.

Такім чынам, ідэя «трэцяй сілы» і асобнай калоны існавала ў партыі заўсёды, а не з'явілася разам з А. Казуліным. Аб тым, што партыя не збіраецца змяняць палітычнае крэда, У. Нісцюк заявіў, калі А. Казулін толькі ўваходзіў на палітычную сцэну. Так на пытанне карэспандэнта «Комсомольской правды», ці будзе партыя вылучаць А. Казуліна на ролю адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў альбо партыя будзе прасоўваць яго самастойна, ён адказаў:

Наш кандидат будет абсолютно самостоятелен. Мы не ставим цель участвовать в большом базаре. При этом мы будем консультироваться с другими партиями.

У прыняцці такога рашэння кіраўніцтва партыі магло зыходзіць з наступных меркаванняў.

1. З прычыны таго, што БСДП (НГ) не ўдзельнічала ў працы кааліцыі дагэтуль, то вядома, што, уключыўшыся ў працу пасля зменаў у партыі, яна не мела б шанцаў атрымаць важкія пазіцыі ў «пяцёрцы» і ўплываць на працэс прыняцця рашэнняў.

2. Ранейшыя супярэчнасці ў партыі і непаразуменні падчас аб'яднання прывялі да вострага канфлікту паміж кіраўніцтвам

БСДП (Г), з аднаго боку, і М. Статкевічам, С. Шушкевічам, з іншага, і нежаданнем апошніх бачыць А. Казуліна і яго партыю ў складзе кааліцыі.

3. Асцярожнае, калі не сказаць халоднае, стаўленне да А. Казуліна з боку большасці ўдзельнікаў кааліцыйнага руху зводзіла на нішто яго шанцы быць абраным адзіным кандыдатам ад дэмакратычных сілаў.

4. Кіраўніцтва БСДП (Г) добра разумела, што ўнутры самой кааліцыі няма адзінства і што гэта хутка можа прывесці да яе палітычнага банкруцтва, а гэта азначае, што А. Казулін застанецца адзінай палітычнай фігурай, з якой Захаду давядзецца лічыцца.

Пазіцыя крытыкі дэмакратычнай кааліцыі ў сітуацыі, калі вынік выбараў практычна вядомы, вельмі выгадная. Дыстанцуючыся ад лідэраў апазіцыі, а значыцца і ад паразы на выбарах, Казулін меркаваў выйсці на палітычную сцэну як новы лідэр, які не звязаны са старой апазіцыяй. Вакол яго фігуры маглі пачаць канцэнтравацца палітычныя колы, таксама і з дэмакратычнай кааліцыі, якія не жадалі бачыць А. Мілінкевіча лідэрам дэмсілаў. (Не дзіўна, што паміж БСДП (Г), ПКБ і АГП на працягу астатніх месяцаў вядуцца перамовы аб стварэнні новага саюзу.)

Тым не менш, падобныя планы, якія, на першы погляд, адпавядалі інтарэсам партыі, маглі быць выкарыстаны як беларускай уладай, так і Расіяй. Адразу пасля прыходу А. Казуліна ў палітыку да яго сталі ставіцца як да пратэжэ Масквы. Ведаючы, наколькі Расія зацікаўлена ў тым, каб захаваць Беларусь у арбіце сваіх палітычных уплываў, можна дапусціць, што ў Крамлі былі выпрацаваныя некалькі варыянтаў уплыву на беларускую сітуацыю. З аднаго боку, падтрымка рэжыму Лукашэнкі, з другога – стварэнне кіраванай з Расіі палітычнай структуры апазіцыйнага кшталту. Таму выглядае лагічна, што ў асобе амбітнага Казуліна і яго каманды расійцы атрымалі добрую магчымасць разгарнуць сваю

антырэвалюцыйную кампанію, накіраваную супраць А. Мілінкевіча і аб'яднанай апазіцыі, якую падтрымліваў Захад. У палітычнай рыторыцы А. Казулін вельмі часта ўвага акцэнтавалася на тым, што А. Мілінкевіч быў празаходнім палітыкам, у адрозненне ад яго самога:

Не секрет, что проект «единого» – проамериканский и прозападный. Я же выступаю за сбалансированную политику Беларуси, как с Россией, так и с Европой и Америкой. За мной не маячит тень Госдепартамента США. Я не нарываюсь на снятие с дистанции путем досрочной агитации и пропаганды, тиражированием огромного количества печатной продукции[5].

Зразумела, што падобных заяў недастаткова, каб казаць аб сувязі А. Казуліна і кіраўніцтва партыі з расійскім істэблішментам. Недастаткова для такіх высноў і канстатацыі цесных кантактаў Казуліна з Ганчарыкам, Лявонавым і іншымі дзеячамі, якія з'ехалі ў Расію, як і факту працы ў рэгіянальных штабах партыі расійскіх палітычных тэхнолагаў ці кансультантаў.

На працягу сваёй палітычнай кампаніі А. Казулін стала апеляваў да Расіі:

В нормальной политике никогда не бывает одновекторного подхода. Во всех странах принято иметь дело с разными силами, поскольку ситуация имеет свойство время от времени меняться. Российская элита хочет знать реальное положение дел в нашей стране, причем не только по официальным отчетам[6].

[5] Адказы на пытанні наведнікаў сайту радыё «Свабода». 13.01.2006. kozylin.com.

[6] Томашевская О. Золотой мост между Россией и западом // Минск, «Время новостей». kozylin.com.

[7] Романчева И. Оппозиция просит поддержки. kozylin.com.

[8] Беседа с И. Козулиной и И. Рынкевичем на радио «Эхо Москвы».

[9] Беседа с И. Козулиной и И. Рынкевичем на радио «Эхо Москвы».

[10] Адказы на пытанні наведнікаў сайту радыё «Свабода». kozylin.com.

[11] kozylin.com.

[12] echo.msk.ru. 13.03.2006.

А. Казулін добра разумеў, што Крэмль не будзе змяняць свайго стаўлення да Лукашэнкі, пакуль не атрымае палітычных і эканамічных гарантый ад таго палітыка, які прэтэндуе стаць новым кіраўніком краіны. На адной з канферэнцый у пачатку сакавіка 2006 года ён заявіў, што гатовы, калі стане прэзідэнтам краіны, выканаць усе дамоўленасці, дадзеныя Расіі беларускім бокам за ўвесь папярэдні перыяд:

Вся оппозиция смотрит только на Запад, никто не сотрудничает с российской политической элитой... Сегодня появился политик, который любит Россию... Россия устала от непредсказуемости Лукашенко. Лукашенко торгуется, как цыган. Он никогда не выполнит взятых обязательств… Я гарантирую преемственность власти. Все государственные обязательства и договоры будут выполняться. При президенте Козулине все, что подписано и даже просто скреплено пожатием руки, будет выполняться[7].

З гэтых выказванняў вынікае, што А. Казулін калі ўжо не працаваў, то быў гатовы працаваць з Масквой. Аб тым, што нейкія перамовы вяліся, сведчаць словы жонкі А. Казуліна, якая прыехала ў Маскву па падтрымку для арыштаванага мужа. У інтэрв'ю журналісту радыё «Эхо Москвы» Ірына Казуліна заявіла наступнае:

О нем не говорит ни Запад, ни Восток. Притом, что Александр во время и предвыборной кампании и ранее у него было много контактов с российскими, с российской элитой, с властными структурами. Но, тем не менее, сейчас, когда он попал в тюрьму, есть такое выражение, человека кинули.

На ўдакладняльнае пытанне вядучага яна, быццам бы спалохаўшыся, дадала:

Вы знаете, дело в том, что я человек не политический, и когда Александр шел в политику, мы договорились, что в политику идет он, а я ему лишь помогаю, где это нужно будет, где нужно будет помочь. Т. е. это во время предвыборной кампании, естественно, я помогала ему, потому что понимаю эти вещи. Но так вникать во все тонкости, этого не было, поэтому я не могу сейчас называть фамилии людей, с которыми он общался.

***Журналіст «Эха Москвы»**: Но общался?*

***І. Казуліна**: Общался, без сомнения.*

***Журналіст «Эха Москвы»**: Я, собственно, почему спрашиваю, общался, да?*

***І. Казуліна**: Конечно, общался*

[8].

Яшчэ больш шчырым быў адвакат А. Казуліна І. Рынкевіч, які падчас гутаркі на тым жа радыё сказаў:

Но извините, если, допустим, Козулин долго шел с лейблом, что кандидат сначала власти, а потом проект Кремля, в этом смысле мы здесь в Москве, чтобы понимали люди также, россияне, что если пророссийский политик, по некоторым оценкам, теряет или не получает ту поддержку, которую мы ждали от России, это плохо. Друзьями разбрасываться нельзя[9].

Паспрабуем прааналізаваць магчымасць падобнай супрацы і тую карысць, якую магла б мець Расія ад праекту «Казулін». Аказваючы непасрэдную ці ўскосную падтрымку А. Казуліну, Расія магла гуляць як супраць апазіцыі, так і супраць афіцыйных уладаў. І ў выпадку перамогі А. Казуліна, і ў выпадку яго пройгрышу сама Расія нічога не губляла.

Напярэдадні выбараў і апазіцыя, і ўлада адчувалі нейкую пагрозу з боку Казуліна. Таму, як зазначыў сам спадар прафесар, яго «мачыла» і ўлада, і апазіцыя, а ён, у сваю чаргу, змагаўся супраць усіх іх.

Гуляючы з А. Казуліным, Крэмль мог ставіць перад сабой наступныя мэты.

1. Зрабіць процівагу амерыканскаму праекту і разам з гэтым апрацаваць новыя метады і PR-тэхналогіі дзеля кіравання рэвалюцыйнымі сітуацыямі, аслабіўшы пратэстны электарат, увёўшы на перадвыбарнае палітычнае поле трэцяга гульца.

2. Не дапусціць выхаду людзей на вуліцу ці хаця б аслабіць і дыскрэдытаваць саму ідэю Плошчы і рэвалюцыі ў Беларусі. З самага пачатку сваёй палітычнай кар'еры А. Казулін выступаў як праціўнік рэвалюцыі:

Моя священная цель – спасти республику от крови и революции...[10] *Белорусская земля слишком обильно была полита кровью за последние столетия. Поэтому я категорический противник, чтобы она была пролита в настоящее время. Кто будет отвечать за загубленные жизни?.. Я сын своего белорусского народа, и я не позволю пролить никому хоть каплю крови и пожертвовать хоть одной жизнью белоруса...* [11] *Что касается «джинсовой» революции. Мне смешно про это слушать.*

В Белоруссии, ну, «голубая» революция или «джинсовая» просто невозможна.[12]

3. Не дапусціць дэстабілізацыі абстаноўкі ў краіне, а ў выпадку, калі людзі ўсё ж такі выйдуць на плошчу і будуць гатовы да радыкальных дзеянняў, стварыць два цэнтрабежныя лагеры і раскалоць натоўп на некалькі частак. Дэзарыентацыя прысутных на плошчы людзей дазволіла б, з аднаго боку, аслабіць сацыяльны напор, а з другога – дала б мажлівасць падрыхтавацца ўладам для захадаў у адказ. Напрыклад, у гэтую схему ўпісваюцца дзеянні А. Казуліна 20–25 сакавіка, намаганні ўзяць кіраваньне працэсамі на плошчы ў свае рукі, заклікі да моладзі згарнуць намётавы лагер, абвінавачанне А. Мілінкевіча ў парушэнні нейкіх дамоўленасцяў, паход у кірунку Акрэсціна. Гэты варыянт мог таксама ўпісвацца ў сцэнар, распрацаваны і беларускімі спецслужбамі.

4. Кантраляваць палітычную сітуацыю ў Беларусі ў выпадку, калі б рэвалюцыя займела поспех і да ўлады прыйшлі б новыя сілы. Будучы на плошчы і прымаючы актыўны ўдзел у палітычных акцыях, А. Казулін мог бы прэтэндаваць на адно з ключавых месцаў у новым урадзе, што дазволіла б Расіі трымаць новую ўладу ў сферы свайго ўплыву і не згубіць Беларусь як геапалітычнага саюзніка.

5. Прадэманстраваць А. Лукашэнку, што Расія мае кандыдатуру, якой яна можа ў любы момант замяніць дзейнага прэзідэнта краіны. Магчыма, таму выступы і дзеянні А. Казуліна былі скандальнымі і рэзкімі адносна А. Лукашэнкі, а рэакцыя апошняга вельмі жорсткай. Можна прыпусціць, што Расія гуляла як супраць Захаду, так і супраць Лукашэнкі, трымаючы яго ў напружанасці і невядомасці.

У гэтым выпадку А. Казулін мог стаць разменнай манетай. Расія, атрымліваючы ад А. Лукашэнкі за аказаную падтрымку абяцаныя прадпрыемствы і «трубу», «здае» Казуліна і закрывае

вочы на рэпрэсіі супраць яго.

Масква магла «раскручваць» А. Казуліна і з прыцэлам на доўгатэрміновую перспектыву. Ва ўмовах магчымай сацыяльна-гаспадарчай нестабільнасці, выкліканай зменай цэнаў на газ, палітычнага канфлікту А. Казулін можа стаць вельмі прыдатнай кандыдатурай на пасаду беларускага прэзідэнта. Прыйшоўшы да ўлады і абапіраючыся на стары наменклатурны апарат, ён мог бы адцясніць апазіцыю ад улады і не дазволіць Беларусі змяніць геапалітычныя прыярытэты.

Калі выгады для Расіі відавочныя, то што мог атрымаць А. Казулін ад такой супрацы? Адказ вельмі просты: магчымасць задаволіць свае амбіцыі. Яму магла быць абяцана палітычная падтрымка і ўлада, а таксама грошы.

Канчаючы аналіз кампаніі БСДП (Г) і яе лідэра ў прэзідэнцкіх выбарах 2006 года, мы не ставім кропкі. У бліжэйшы час нас чакаюць новыя інтрыгі, новыя палітычныя акторы і рашэнні, якія толькі на першы погляд здадуцца нечаканымі.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 7-8 (47-48) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/22
[image]

[illegible]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 7-8 (47-48) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

7-8 [image] [image]2006

"[illegible]" • "крытыка • эсэістыка • **аналітыка** • палеміка • гісторыя

[image] [image] [image] **ПЁТРА РУДКОЎСКІ**

Пётра Рудкоўскі Зьмены ў беларускім Каталіцкім касьцёле

Ecclesia semper reformanda.

S. Augustinus[1]

«Кардынал Казімер Сьвёнтак перастае быць галавой беларускага Каталіцкага касьцёлу» – гэтая навіна вось ужо ад паловы чэрвеня жыва абмяркоўваецца ня толькі

каталікамі, але і ўсёй беларускай грамадзкасьцю. Што зьменіцца ў сувязі з гэтым, а калі зьменіцца, дык у якім кірунку? Хто стане новым пастырам Менска-Магілёўскай дыяцэзіі і чаго чакаць ад новага старшыні Канфэрэнцыі каталіцкіх біскупаў Беларусі (ККББ), біскупа Аляксандра Кашкевіча? Якое значэньне мае ўсё гэта для беларускага грамадзтва і беларускага каталіцызму ў прыватнасьці?

Насамперш трэба заўважыць, што зьмены ў герархічных

структурах беларускага Касьцёлу зьяўляюцца часткай больш маштабных рэформаў, запачаткаваных апостальскай сталіцай у часе пантыфікату Бэнэдыкта XVI. Сярод найбольш значных кадравых зьменаў трэба адзначыць зьяўленьне на пасадзе дзяржаўнага сакратара Ватыкану кард. Тарчызіё Бэртонэ (на месца кард. Анджэла Садана), а таксама кард. Джавані Ляёлы на пасадзе старшыні Папскай камісіі ў справах Ватыканскай дзяржавы і старшыні губэрнатарату гэтае ж дзяржавы (на месца паляка кард. Эдмунда Шокі). Зьмены адбыліся таксама ў Польшчы. Ужо год таму памяняўся Кракаўскі мэтрапаліт, а сёлета на пэнсію адыходзіць галава Варшаўскае мэтраполіі Юзаф Глемб. Няма, бадай, сэнсу, дашуквацца якойсьці асаблівай «палітычнай лініі» ўва ўсіх гэтых зьменах; яны прадыктаваныя, хутчэй за ўсё, звычайным жаданьнем зрабіць касьцельныя інстытуты больш функцыянальнымі і больш эканомнымі (што выяўляецца, напрыклад, у захадах дзеля зьмяншэньня колькасьці пасадаў у Рымскай курыі).
Тое самае і ў выпадку зьменаў у беларускім Касьцёле. Сыход на пэнсію 91-гадовага кардынала мае простае і банальнае вытлумачэньне: у такім узросьце зацяжка кіраваць архідыяцэзіяй, выконваючы пры гэтым абавязкі старшыні ККББ. Патрэбны сьвежыя сілы, новыя ідэі і новыя ініцыятывы. Якія аспэкты рэлігійнага жыцьця беларускіх каталікоў патрабуюць гэтай «навізны» і «сьвежасьці»?
Перадусім неабходна распрацаваць канцэпцыю падтрымкі «нізавых» ініцыятываў і супрацоўніцтва зь імі. Нельга сказаць, што дагэтуль нізавыя ініцыятывы не падтрымліваліся: такія выдавецкія праекты, як «Ave Maria», «Наша Вера», «Дыялог» альбо культурна-музычныя, як «Магутны Божа», атрымалі бласлаўленьне і дзейсную падтрымку з боку беларускіх герархаў. Тым ня менш, часьцяком даваў аб сабе знаць, на жаль, «дух падазронасьці», які выявіўся і ў дачыненьні да харызматычнай «Супольнасьці Яна Хрысьціцеля», і ў дачыненьні да «Зьвязу маладых каталікоў», і ў дачыненьні да некаторых спробаў ладзіць спатканьні каталіцкай інтэлігенцыі на мясцовым узроўні. Нешматлікія ініцыятывы інтэлігенцыі гуртавацца пад апекай якогась сьвятара зазвычай сустракаліся з насьцярогай і непрыхільнасьцю з боку вышэйшых духоўных уладаў. Адносна «Зьвязу маладых каталікоў» Казімер Сьвёнтак выдаў даволі суровае распараджэньне, у якім забараняў

сьвятарам і вернікам падтрымліваць якія-кольвечы кантакты з гэтай арганізацыяй, а «Супольнасьць Яна Хрысьціцеля» наагул адкалолася ад Каталіцкага касьцёлу, галоўным чынам з-за адсутнасьці кампэтэнтнага душпастыра, які здолеў бы ўмела пакіраваць гэтым рэлігійным рухам. Кардынал Казімер Сьвёнтак, пры ўсіх яго вялікіх заслугах і асабістай харызьме, заставаўся абмежаваны канцэпцыяй «парафіяльнага» каталіцызму і традыцыйных формаў рэлігійнасьці.
Другім выклікам – у значнай ступені зьвязаным зь першым – ёсьць праблема культурнай і інтэлектуальнай замкнёнасьці каталіцкага клеру. Ніжэйшае духавенства бытуе ў грамадзтве нібы асобнае саслоўе. Ксяндзы не належаць ані да «простага люду», ані да інтэлігенцыі, яны аддаюць перавагу сустрэчам у сваім асяродзьдзі, апэруюць клерыкальным ідыялектам і маюць завышанае адчуваньне ўласнай выключнасьці. Гэты «комплекс выключнасьці» і ёсьць галоўным фактарам культурнай ізаляванасьці духавенства. «Комплекс выключнасьці» часьцяком спалучаецца з «комплексам непаўнавартасьці», спароджаным адсутнасьцю дастатковага інтэлектуальнага патэнцыялу, каб весьці зьмястоўную размову з інтэлігенцыяй. Настаўнікі, лекары ды і проста інтэлігентная моладзь, зь якімі ксяндзы маюць дачыненьне штодзённа, ставяць часам цяжкія пытаньні, якія немагчыма «збыць» стандартнымі адказамі. І ксяндзы часьцяком папросту пазьбягаюць размоваў з інтэлігенцыяй на рэлігійныя тэмы, паколькі ў працэсе гэтых размоваў, бывае, выяўляецца, што сьвецкія людзі больш адукаваныя ў багаслоўскіх пытаньнях, лепш ведаюць Біблію і прэзэнтуюць вышэйшую інтэлектуальную культуру. У пропаведзях ксяндзоў дамінуе загадна-дыдактычная мова, якая адштурхоўвае кожнага ўдумлівага чалавека.
«Комплекс выключнасьці» замацаваны векавой традыцыяй стаўленьня да сьвятара як да «сьвятой асобы». Сьвятары прывыклі функцыянаваць у грамадзтве па-за і па-над крытыкай, як нехта, каго можна толькі хваліць, нельга ацэньваць і, барані Бог, папікаць. Яны страшэнна абураюцца, калі прадстаўнік ДАІ пакарае іх за парушэньне хуткасьці, не разумеюць, як можа старшыня калгасу адмовіць ім у выдзяленьні такога ўчастку зямлі і ў такім памеры, у якім яны хочуць, і глыбока абражаюцца, калі пачуюць з боку парафіянаў якуюсь крытычную заўвагу. Гэтая мэнтальнасьць найбольш устойлівая

на Гарадзеншчыне, меней у цэнтральных рэгіёнах краіны, а яшчэ меней на ўсходзе. На захадзе Беларусі, дзе сілай традыцыі ў касьцёлах пераважна не бракуе вернікаў, сьвятары адчуваюць сябе цалкам самаўпэўнена, і таму часьцей там можна спаткаць ксяндза з «сындромам сьвятой каровы». Ува ўсходніх рэгіёнах, дзе парафіі часам складаюцца з пары дзясяткаў чалавек, сьвятары здаюцца больш «ачалавечанымі» і больш натуральна паводзяць сябе зь людзьмі. А людзі, у сваю чаргу, не баяцца, калі трэба, скрытыкаваць «сьвятога чалавека» альбо намякнуць на тое, што замала працуе.

З нэгатыўнымі праявамі «комплексу выключнасьці» каталіцкіх сьвятароў меў магчымасьць сутыкнуцца сам кардынал. Ён падчас аднаго зь візытаў у Гарадзенскую сэмінарыю расказваў сэмінарыстам, як, будучы ўжо кардыналам, прыехаў па нейкай справе да аднаго сьвятара. Паколькі быў апрануты звычайна, гаспадыня, якая адчыніла яму дзьверы, успрыняла яго як звыклага дзядулю. «Ксёндз цяпер сьнедае», – заявіла яна яму. «Ну, дык добра, я пачакаю», – адказаў кардынал. Праходзіць пятнаццаць хвілінаў, дваццаць, паўгадзіны – ксёндз увесь час «сьнедае». Урэшце праз сорак хвілінаў чуецца з-за дзьвярэй грэблівы голас: «Хто там?» «Я», – адказвае кардынал.

Праблема грэблівага стаўленьня сьвятароў да людзей, трактаваньне іх «звысоку» неаднойчы абмяркоўвалася беларускімі герархамі. Але звыклых напамінаў і заклікаў да сьвятароў недастаткова, бо гэтая праблема даволі глыбокая: яна грунтуецца на пэўным этасе, які ў маральнай літаратуры акрэсьліваецца наймем «фарысэйства». А зьмяніць гэты заганны этас можна перадусім шляхам стымуляваньня інтэграцыі духавенства ў шырэйшы культурны кантэкст, разьвіваньня ў ім здольнасьці да жывога дыялёгу і ўменьня выслухоўваць і прымаць крытыку. Зьмена этасу, канечне ж, не адбываецца шляхам пастановаў і распараджэньняў зьверху, аднак тое, што «верх» можа і павінен рабіць, гэта выйсьці насустрач тым сьвятарам і клерыкам, якія прэзэнтуюць этас культурнай адкрытасьці і маглі б зьдзейсьніць адыход ад фарысэйства на карысьць этасу Хрыста, які характарызаваўся адкрытасьцю як да простых людзей, так і гатовасьцю размаўляць з адукаванымі людзьмі. Дагэтуль, аднак, «адкрытыя» сьвятары і клерыкі ўспрымаліся з падазрэньнем, а канцэпцыя «парафіяльнага» каталіцызму прадугледжвала ня

столькі інтэграцыю сьвятароў у культурны кантэкст, колькі іх максымальную лаяльнасьць да духоўных уладаў ды здольнасьць гарантаваньня лаяльнасьці з боку вернікаў. Чарговым выклікам ёсьць экумэнізм і сацыяльнае навучаньне. Зноў жа, нельга не заўважыць шэрагу важных крокаў, зробленых беларускай герархіяй у гэтай сфэры. Сярод значных экумэнічных падзеяў варта адзначыць правядзеньне супольнымі намаганьнямі Праваслаўнай і Каталіцкай цэркваў міжнароднай канфэрэнцыі «Хрысьціянства і ўзаемапранікальнае суседзтва духоўных каштоўнасьцяў у Эўрапейскай супольнасьці» ў сьнежні 2004 году альбо міжнародны экумэнічны фэстываль «Магутны Божа», які рэгулярна штогод ладзіцца ў Магілёве з 1992 году. Былі таксама выдадзены важныя дакумэнты на тэму сацыяльнае этыкі, як, напрыклад, зварот кардынала Сьвёнтка да сьвятароў і вернікаў у сувязі з тэрарыстычным актам у Бэслане, пастырскі ліст ККББ аб каштоўнасьці жыцьця чалавека альбо ліст ККББ з нагоды 15-годзьдзя аднаўленьня структуры Каталіцкага касьцёлу ў Беларусі. У першым дакумэнце зьявіўся выразны напамін пра існаваньне правоў чалавека, у другім – пра непрымальнасьць такіх практык, як кланаваньне чалавека ці прадукаваньне чалавечых эмбрыёнаў у якасьці «запчастак», а ў трэцім біскупы даволі рэзка асудзілі савецкі рэжым, «які пасьлядоўна і бескампрамісна рэалізоўваў сваю атэістычна-матэрыялістычную праграму (...) пры адсутнасьці ўмяшальніцтва Захаду».

Тым ня менш, як экумэнізм, так і сацыяльнае навучаньне праводзіліся Каталіцкім касьцёлам непасьлядоўна і, можна сказаць, неяк нелягічна. Шэраг важных экумэнічных праектаў, ініцыяваных або падтрыманых Касьцёлам, дзіўным чынам суправаджаецца нямым маўчаньнем перад абліччам яўна несправядлівага перасьледу беларускіх пратэстантаў або праваслаўнай аўтакефаліі. А сацыяльнае навучаньне, калі і ёсьць, дык характарызуецца экскурсам у іншую часа-прастору: біскупы крытыкуюць альбо мінулую эпоху, альбо дзеяньні, якія мелі месца далёка ад Беларусі. Тое, што адбываецца *тут* і *цяпер*, як бы не кранае маральнага пачуцьця беларускіх біскупаў.

Чацьвёртым выклікам для беларускага Касьцёлу ёсьць неабходнасьць выпрацаваць больш ясную канцэпцыю

ўжываньня польскай, беларускай ды расейскай моваў у касьцёлах. Казімер Сьвёнтак, хоць з паходжаньня паляк і хоць так і не навучыўся гаварыць па-беларуску, то ўсё ж вядомы нам як прыхільнік беларускамоўя ў літургіі. Менавіта ён даволі пасьлядоўна супрацьпастаўляўся як русіфікацыйным тэндэнцыям у Касьцёле, так і агрэсіўна-палянізацыйным. Гэта ён у свой час катэгарычна забараніў прыносіць на ўрачыстасьці польскія сьцягі, чым выклікаў крайне непрыхільнае стаўленьне да сябе графа Прушынскага, а сярод беларускай інтэлігенцыі здабыў нават рэпутацыю «абаронцы беларушчыны». Тым ня менш, у маштабе ўсяе Беларусі надалей у гэтым пляне няма «яснасьці». Прыхільнасьць Сьвёнтка да беларускамоўя ў нейкім сэнсе кампэнсавалася непрыхільнасьцю да яго духоўных уладаў Гарадзеншчыны. Там у большасьці касьцёлаў надалей няма беларускай імшы, дзяцей надалей прымушаюць зубрыць польскамоўныя катэхізмы, сэмінарыя надалей польскамоўная, дарма, што попыт на польскую мову абумоўлены ня столькі нацыянальнай сьведамасьцю тамтэйшых каталікоў, колькі *адсутнасьцю* якой-кольвечы культурнай сьведамасьці. Нарэшце, пятым выклікам ёсьць акрэсьленьне ролі ордэнаў у місіі мясцовага Каталіцкага касьцёлу. Казімер Сьвёнтак з пэўнай насьцярогай спаглядаў на ордэны і манаскія супольнасьці. Гэта ў нечым зразумелая пастава: ордэны, асабліва тыя, якія надзелены «правам экзэмпцыі» (выключаны з-пад юрысдыкцыі біскупаў і падпарадкаваны непасрэдна папу рымскаму), характарызуюцца большай самастойнасьцю і часам могуць дазволіць сабе больш сьмелыя паводзіны ў адносінах да мясцовага біскупа. Адначасна ж манаскі рух адпачатна надаваў асаблівы калярыт хрысьціянству, уводзіў у яго моманты спантаннасьці, разнастайнасьці і надаваў Касьцёлу характар «сямейнай супольнасьці». Таму аднаўленьне манаства ў Беларусі паспрыяла б таксама «адухаўленьню» тутэйшага хрысьціянства, надало б яму больш сьвежасьці і зьмяніла б выгляд касьцельнай інстытуцыі зь бюракратычна-юрыдычнага на братэрска-супольнасны.

Сьпіс «выклікаў» можна было б доўжыць, ён не абмяжоўваецца гэтымі пяцьцю пералічанымі, але яны здаюцца найбольш значнымі ў нашым кантэксьце. Чаго можна чакаць у сувязі са зьменамі, якія адбыліся ў беларускай герархіі? Ці адыход Сьвёнтка на пэнсію адкрые магчымасьці больш эфэктыўна

выконваць названыя заданьні, ці наадварот, пасьля яго адыходу місія Касьцёлу ў гэтым пляне будзе яшчэ больш занядбаная? Зьяўленьне Аляксандра Кашкевіча на пасадзе старшыні ККББ і Антонія Дзям'янкі ў якасьці выканаўцы абавязкаў апостальскага адміністратара Менска-Магілёўскай архідыяцэзіі асаблівых станоўчых зьменаў, бадай, не прарочыць. Біскуп Кашкевіч – гэта чалавек вельмі рэлігійны, аддадзены малітве, ветлівы ў непасрэдным кантакце і неблагі дыплямат. Аднак ён выхаваўся ў духу віленскага польскага традыцыяналізму, галоўным складнікам якога ёсьць пераканаьне, што вернасьць каталіцкай веры немагчыма аддзяліць ад вернасьці «польскім караням». Немалаважна і тое, што Кашкевіч працаваў у Вільні якраз у час найбольшага ўздыму літоўскага нацыяналізму і антыпольскіх настрояў, а гэта ўзмацніла ў ім і да таго моцныя польска-традыцыяналісцкія пераканаьні. Такім чынам, старшыня ККББ будзе, хутчэй за ўсё, хаўрусьнікам прапольскіх і традыцыяналісцкіх тэндэнцыяў у беларускім Касьцёле.
Антоні Дзям'янка – гэта чалавек дзейны і практычны. Ён паказаў сябе як выдатны пробашч у Навагрудку, падбаў пра тое, каб рэстаўраваць найстарэйшую ў Беларусі каталіцкую сьвятыню ў мястэчку Ўсялюб, быў нядрэнным рэктарам у Вышэйшай духоўнай сэмінарыі ў Горадні. Адначасна ж гэты «цьвёрды» чалавек характарызуецца адсутнасьцю цьвёрдай пазыцыі ў грамадзка-культурных пытаньнях. Ён ведае беларускую мову, але ніколі не дазволіць сабе «саграшыць» выкарыстаньнем гэтае мовы ў клерыкальным асяродзьдзі, цікавіцца грамадзка-палітычным жыцьцём краіны, але ня здольны да самастойнай ацэнкі беларускіх рэаліяў, ён можа запрапанаваць былому вязьню Акрэсьціна чытаць малітву падчас пантыфікальнай імшы, але сам у канчатковым пляне застаецца верны пераканаьню, што Мілінкевіч – гэта марыянэтка Амэрыкі.
Таму наўрад ці прыходзіцца чакаць якіх-кольвечы станоўчых зьменаў ад беларускіх біскупаў у новай канфігурацыі. Скептычна ацэньваю пэрспэктывы выйсьця насустрач першым чатыром выклікам (падтрымка нізавых ініцыятываў, пераадоленьне культурнай замкнёнасьці каталіцкага духавенства, актуалізацыя сацыяльнага навучаньня і адыход ад польскага традыцыяналізму на Гарадзеншчыне). Паляпшэньня можна чакаць толькі ў пятым пункце. Здаецца, што Антоні

Дзям'янка зьяўляецца прыхільнікам аднаўленьня манастваў Беларусі, а Кашкевіч, хутчэй за ўсё, падтрымае яго ў гэтым. Пры ўсім гэтым варта памятаць, што новы расклад сілаў у беларускім япіскапаце мае пераходны характар. Антоні Дзям'янка выконвае абавязкі галавы Менска-Магілёўскай архідыяцэзіі толькі *ad nutum*, г. зн. да часу прызначэньня на гэтую пасаду кагосьці, хто атрымае званьне арцыбіскупа і будзе сталым пастырам архідыяцэзіі, пасада старшыні ККББ, якую цяпер заняў Кашкевіч, – кадэнцыйная (кадэнцыйнасьць трохгадовая з магчымасьцю пераабраньня). У будучым (цяжка сказаць, наколькі блізкім ці аддаленым) трэба чакаць зьяўленьня кагосьці новага ў беларускім япіскапаце. Беручы пад увагу, што пантыфікат Бэнэдыкта XVI нясе з сабой рэдукцыю польскага элемэнту ў касьцельных структурах (хоць гэту рэдукцыю нельга ўспрымаць як адмыслова заплянаваную акцыю, яна хутчэй «спадарожны эфэкт» рэформаў), можна спадзявацца, што новым біскупам будзе не паляк. Магчыма, будзе ім якісь дастойны чалавек сярод сёньняшніх беларускіх ксяндзоў.

Наколькі ўсё гэта паўплывае на аднаўленьне і рэформу ў беларускім Касьцёле, пакуль цяжка сказаць. Цяпер вядома толькі тое, што Аўгустынава сэнтэнцыя – *ecclesia semper reformanda* – у беларускім кантэксьце надзвычай актуальная

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

№ 7-8 (47-48) - 2006

[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/22

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 7-8 (47-48) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

7-8 [image] [image] 2006

"ростыбарыя • "крытыка • эсэістыка • **аналітыка** • палеміка • гісторыя

[image] [image] [image] **ТОМ КАРОЗЕРС**

Том Карозерс Аўтакраты даюць адпор

У студзені 2006 года прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін падпісаў контраверсійны закон, які прадугледжвае павелічэнне кантролю над дзеючымі ў краіне расійскімі і замежнымі недзяржаўнымі арганізацыямі (НДА). У адпаведнасці з ім усе НДА

павінны
загадзя
інфармаваць
урад пра
кожны
запланаваны
імі праект.
Дакумент
дэманструе
яшчэ адну
прымету
засмучальнага
працэсу –
паступовага
вяртання
краіны да
аўтарытарызму.

Гэты закон сведчыць таксама пра не менш трывожную, але нашмат больш шырокую тэндэнцыю. Пасля двух дзесяцігоддзяў няўхільнага распаўсюджвання праграм пабудовы дэмакратыі на ўсім свеце ўсё больш урадаў пачынаюць падаўляць такога роду намаганні ў сваіх краінах. Трымальнікі ўлады (некаторыя з іх займаюць выбарныя пасады) цяпер адкрыта асуджаюць дапамогу заходніх дэмакратый як нелегітымнае палітычнае ўмяшанне. Заходнія НДА высылаюцца ці пераследуюцца, мясцовым арганізацыям забараняюць карыстацца сродкамі замежных фондаў альбо іх караюць за атрыманне дапамогі. Ад гэтага супраціўлення, якое набірае абароты, яшчэ можна толькі чакаць перарастання ў сістэматычную ці арганізаваную кампанію. Але прыхільнікі такой палітыкі яўна вучацца адзін у аднаго і абменьваюцца вопытам.
Каталізатарам падобнага супраціўлення, несумненна, сталіся нядаўнія «каляровыя» рэвалюцыі ў Грузіі, Украіне і Кіргізіі, а таксама шырока распаўсюджаныя падазрэнні ў тым, што асноўную закулісную ролю ў ініцыяванні гэтых рэвалюцый адыгралі амерыканскія арганізацыі, такія, як Нацыянальны дэмакратычны інстытут (National Democratic Institute, NDI), Міжнародны рэспубліканскі інстытут (International Republican Institute, IRI), «Дом свабоды» (Freedom House) і інстытут

«Адкрытае грамадства» (Open Society Institute). Палітыкі ад Кітая да Зімбабвэ, імкнучыся апраўдаць новыя абмежаванні на атрыманне заходняй дапамогі няўрадавымі арганізацыямі і апазіцыйнымі групамі, адкрыта спасылаюцца на сваю занепакоенасць тым, што такія падзеі могуць перакінуцца на іх краіны. Аднак гаворка ідзе пра з'явы намнога больш шырокага плана, чым проста боязь «аранжавага».

Тактыка пашырэння дэмакратыі, узятая на ўзбраенне прэзідэнтам Джорджам Бушам-малодшым як адзін з цэнтральных кірункаў знешняй палітыкі Белага дома, відавочна, спрыяла росту трывогі на ўсім свеце. Некаторыя аўтакратычныя ўрады дамагліся значнай заходняй падтрымкі, сцвярджаючы, што процідзеянне распаўсюджванню заходняй дэмакратыі з'яўляецца не пратэстам супраць дэмакрытыі як такой, а процістаяннем амерыканскаму ўмяшанню. Больш таго, пастаянна парушаючы законнасць у сябе ў краіне і за мяжой, адміністрацыя Джорджа Буша нанесла такі ўдар па глабальным вобразе ЗША як сімвале дэмакратыі і правоў чалавека, што легітымнасць справы распаўсюджвання дэмакратыі знізілася яшчэ больш.

Прычыны, што прывялі да такога процістаяння, не адназначныя, і рэакцыя на гэты пратэст таксама павінна быць шматбаковая. Каб інстытуты, якія займаюцца прасоўваннем дэмакратыі, працавалі ў наступным дзесяцігоддзі гэтак жа эфектыўна, як і ў папярэднім, ім варта ўсвядоміць, наколькі змяніліся міжнародныя абставіны, у якіх ім належыць дзейнічаць. А гэта азначае пераасэнсаваць тыя ці іншыя метады. Бушава адміністрацыя таксама павінна паглядзець у твар некаторым непрыемным фактам – напрыклад, зразумець, як прэзідэнцкая «праграма развіцця свабоды» ўспрымаецца на ўсім свеце, і сур'ёзна заняцца ўмацаваннем даверу.

ПРОСТА ГАВОРАЦЬ «НЕ»

Найбольш
сістэматычнае
і магутнае
супрацiўленне
зыходзіць з
пуцінскай
Расіі.
Прыняцце

новага
закона аб
НДА – гэта
ўсяго адзін з
серыі
захадаў,
ажыццёўленых
Масквой
апошнім
часам з
мэтай
абмежаваць
колькасць і
дзейнасць
арганізацый,
занятых у
сферы
прасоўвання
дэмакратыі.
Крытыку
Крамля за
вывады,
зробленыя
па выніках
маніторынгу
выбараў у
Расіі і
суседніх
краінах,
зведала
таксама
Арганізацыя
па бяспецы і
супрацоўніцтве
ў Еўропе
(АБСЕ).
Некалькі
амерыканскіх
арганізацый,
закліканых

распаўсюджваць
дэмакратыю,
зазналі
нязначныя,
але яўныя
нападкі з
боку
расійскіх
уладаў.
Урад Пуціна
бэсціць
расійскія
НДА, што
працуюць у
галіне
правоў
чалавека
альбо па
іншых
казытлівых
у
палітычным
плане
пытаннях, за
атрыманне
сродкаў з-за
мяжы, а
высокія
расійскія
чыны
асудзілі
замежную
дапамогу
дэмакратыі
як
падрыўную і
антырасійскую
дзейнасць.
Прэзідэнт
Пуцін

таксама
папярэджвае
сваіх
калегаў –
лідэраў
аўтакратычных
рэжымаў у
сумежных
краінах –
пра
небяспекі,
якімі
пагражае
дазвол
ажыццяўляць
такую
дапамогу.
Расія пачала
фармаваць у
гэтай галіне
ўласны
патэнцыял,
накіроўваючы
на выбары
наглядальнікаў
і палітычных
кансультантаў.
Прыхільнікі
Пуціна
характарызуюць
ягоную
кампанію
супраць
інстытутаў,
што
пашыраюць
дэмакратыю,
як
неабходную
меру

бяспекі: бо ЗША ж нібыта імкнуцца абкружыць Расію празаходнімі ўрадамі і падарваць яе палітычны рэжым.

Расія – не адзіная краіна, якая дае адпор заходняму прасоўванню дэмакратыі; падобнае зрабілася звычайнай рэччу на постсавецкай прасторы. Прэзідэнт Узбекістана Іслам Карымаў згортвае як большасць заходніх праграм, так і работу большай часткі мясцовых прадэмакратычных структур: у 2005 годзе спынена дзейнасць больш як 60 % узбекскіх НДА. Падкантрольныя дзяржаве сродкі масавай інфармацыі абвінавачваюць ЗША ў тым, што апошнія падрываюць суверэнітэт Узбекістана, выкарыстоўваючы дэмакратызацыю ў якасці траянскага каня. Тым часам у Беларусі прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка таксама забараніў атрыманне большай часткі дапамогі, што аказваецца звонку з палітычных матываў, і бязлітасна падаўляе дзейнасць апазіцыі і незалежнай грамадзянскай супольнасці. Спачатку Лукашэнка паставіў усё замежнае фінансаванне мясцовых НДА пад дзяржаўны кантроль, а ў 2003 годзе і зусім забараніў у Беларусі атрыманне замежнай падтрымкі любой дзейнасці, звязанай з палітыкай ці адукацыяй.
У красавіку 2005 года ўрад Таджыкістана абвясціў новыя правілы, якія абавязваюць замежныя арганізацыі і пасольствы інфармаваць улады, перш чым наладжваць якія-небудзь кантакты з мясцовымі палітычнымі партыямі, НДА ці СМІ. Таджыкскія газеты, падкантрольныя дзяржаве, абвінавацілі Злучаныя Штаты ў злачыннай падтрымцы ўкраінскіх і кіргізскіх актывістаў ды пахвалілі Беларусь за яе супрацоўленне ўмяшанню з боку Захаду. Прэзідэнт суседняга Казахстана Нурсултан Назарбаеў увёў строгія абмежаванні на

супрацоўніцтва паміж замежнымі арганізацыямі і казахстанскімі палітычнымі партыямі. У адным са сваіх выступленняў ён далучыўся да рэгіянальнага хору галасоў, якія перасцерагалі замежныя НДА ад спробаў дэстабілізаваць сітуацыю ў постсавецкіх краінах.

Дэмакратычнае садзейнічанне сустракае супраціўленне і за межамі былога Савецкага Саюза. Адзін з яго актыўных удзельнікаў – Кітай. У красавіку 2005 года кітайская газета «Жэньмінь жыбао» заклеймавала «дэмакратычны наступ» Злучаных Штатаў на дзяржавы – колішнія рэспублікі Савецкага Саюза і на іншыя краіны як своекарыслівую, гвалтоўную і амаральную авантуру. Паводле паведамленняў, у маі мінулага года Камуністычная партыя Кітая намеціла шэраг мераў супраць намаганняў ЗША і Еўропы па прасоўванні «каляровых» рэвалюцый у КНР і суседніх з ёй дзяржавах. Пекін адклаў прыняцце новага закона, які б змякчыў правілы функцыянавання НДА і ўзмацніў кантроль над рознымі мясцовымі арганізацыямі, што атрымліваюць фінансавую дапамогу звонку. Гэтыя крокі закранулі і праваабарончую групу, якая карыстаецца падтрымкай Нацыянальнага фонду за дэмакратыю (National Endowment for Democracy, NED) – недзяржаўнай структуры, што спансуецца ўрадам ЗША і заклікана падтрымліваць дэмакратыю на ўсім свеце. Пекін таксама робіць больш жорсткімі абмежаванні для замежных СМІ: ён нарошчвае стварэнне перашкод замежнаму радыёвяшчанню і адмяніў раней прынятае рашэнне аб выданні ў краіне замежных газет. Падобныя абмежаванні ўвялі і ўрады іншых дзяржаў Азіі: напрыклад, у Непале пасля 15 гадоў адноснай адкрытасці ўрад нядаўна зацвердзіў новыя правілы, якія рэзка абмяжоўваюць дзейнасць для спрыяння дэмакратыі. Тая самая тэндэнцыя прасочваецца і ў Афрыцы. Прэзідэнт Зімбабвэ Роберт Мугабэ выслаў з краіны ўсе заходнія НДА і спыніў дзейнасць многіх мясцовых арганізацый, якія атрымлівалі замежную дапамогу, пад маркай таго, што праз гэтыя групы заходнія «каланіяльныя гаспадары» вядуць сваю падрыўную работу. У снежні 2004 года парламент Зімбабвэ прыняў закон, які забараняе мясцовым НДА атрымліваць дапамогу звонку. Мугабэ яго яшчэ не падпісаў, але працягвае свае выступленні супраць нібыта рэальнага ўмяшання Захаду. Напярэдадні агульнанацыянальных выбараў у маі 2005 года з

Эфіопіі былі высланы прадстаўнікі IRI, NDI і Міжнароднага фонду выбарчых сістэм (International Foundation for Election Systems, IFES). Прэм'ер-міністр Мелес Зенаўі заявіў па эфіопскім тэлебачанні, што «пасля выбараў у краіне не адбудзецца ні «ружовай», ні «зялёнай», ні якой-небудзь іншай «каляровай» рэвалюцыі». А ў Эрытрэі ўрад увёў летась новы закон, згодна з якім мясцовым НДА забаронена займацца якой-небудзь іншай дзейнасцю, апроч аказання матэрыяльнай дапамогі, і перакрываюцца каналы атрымання імі вонкавага фінансавання. У жніўні Асмара (сталіца Эрытрэі) звярнулася да Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці з просьбай спыніць яго работу. Улады заявілі пра сваю занепакоенасць тым, што агенцтва нацэлена сярод іншага на садзейнічанне ўдзелу грамадзянаў у эканамічным і палітычным жыцці.

У Паўднёвай Амерыцы прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес перыядычна рэзка крытыкуе Злучаныя Штаты, сцвярджаючы, што пашырэнне дэмакратыі – частка амерыканскай кампаніі па адхіленні яго ад улады. Чавес абвінавачвае такія арганізацыі, як NED і IRI, у падтрымцы венесуэльскай апазіцыі і выступае з пагрозамі на адрас многіх мясцовых НДА, якія фінансуюцца з-за мяжы. Як і Пуцін, Чавес не здавольваецца тым, што блакуе атрыманне амерыканскай дапамогі ў сябе ў краіне. Буйныя сумы нафтадолараў ён выкарыстоўвае для падтрымкі антыамерыканскіх партый і кандыдатаў у Балівіі, Перу, Эквадоры і іншых краінах, спадзеючыся на экспансію таго, што ён называе «баліварыянскай рэвалюцыяй».

Чавес – гэта крайні прыклад, але насцярожанасць у сувязі з распаўсюджваннем дэмакратыі Вашынгтонам расце ва ўсім рэгіёне, які багаты на антыамерыканскія настроі і знаходзіцца пад усё большым уплывам урадаў левага кірунку. Праявай росту скептыцызму сталася леташняя адмова Арганізацыі амерыканскіх дзяржаў прыняць прапанову ЗША аб заснаванні новага рэгіянальнага механізму маніторынгу за выкананнем урадамі дэмакратычных нормаў.

БАЧЫЦЬ СВЕТ У АРАНЖАВЫМ КОЛЕРЫ

У чым жа
прычына
гэтага
глабальнага
супраціўлення

пашырэнню
дэмакратыі?
Нядаўнія
рэвалюцыі ў
Грузіі,
Украіне і
Кіргізіі,
безумоўна,
мелі вялікае
значэнне.
Драматычныя
ўзбурэнні
там
прадэманстравалі,
што могуць
зрабіць
шырокія
масы
простых
грамадзянаў,
якія адважна
аб'ядналіся
дзеля
дэмакратыі.
Але, па
меры таго як
множыліся
паведамленні
пра
падтрымку
Злучанымі
Штатамі
найважнейшых
грамадзянскіх
і палітычных
арганізацый
у гэтых
краінах,
«каляровыя»
рэвалюцыі

абумовілі
ўзнікненне
ідэі аб тым,
што ценявой
рухальнай
сілай
падобных
падзей
таксама
з'яўляюцца
ЗША.

Магчыма, асцярогі з нагоды таго, што дапамога ў распаўсюджванні дэмакратыі ёсць не чым іншым, як зброяй Вашынгтона, абвастрыліся акурат у сувязі з «каляровымі» рэвалюцыямі, але слушней успрымаць іх як кульмінацыю больш працяглай тэндэнцыі. У эпоху шпаркай дэмакратычнай экспансіі канца 1980-х – пачатку 1990-х гадоў, калі пашырэнне дэмакратыі ўпершыню сталася прыкметнай з'явай, актывістам гэтага працэсу даводзілася працаваць альбо ў аўтарытарных грамадствах, цалкам закрытых для распаўсюджвання дэмакратыі, альбо ў краінах, што перажывалі пачатковы этап дэмакратызацыі. У другім выпадку дзверы часцей за ўсё былі шырока расчынены. З цягам часу многія з краін, што сталі на шлях дэмакратызацыі, эвалюцыянавалі ў іншы, прамежкавы тып – паўаўтарытарную дзяржаву, які атрымаў пашырэнне ў дзяржавах – былых рэспубліках СССР, на Балканах, на Блізкім Усходзе і ў Афрыцы на поўдзень ад Сахары.
Для гэтых рэжымаў характэрна адмысловае палітычнае балансаванне. Лідэры даюць грамадзянам сваіх краін столькі палітычных свабод, колькі дастаткова, каб зарабіць сабе пэўны палітычны капітал і набыць легітымнасць у якасці рэфарматараў. Як правіла, гэта азначае рэгулярнае правядзенне выбараў і дазвол стварыць некалькі апазіцыйных партый, шэраг незалежных грамадзянскіх арганізацый і адну-дзве незалежныя газеты. Але гэтыя рэжымы працягваюць досыць моцна ўтрымліваць рычагі ўлады, каб не ўзнікалі ніякія сур'ёзныя пагрозы іх кіраванню.
Ва ўмовах такой паўаўтарытарнай палітыкі многія прадэмакратычныя арганізацыі адчулі сябе загнанымі ў тупік. З

часам, аднак, адны з самых дасведчаных групаў – NDI, IRI, IFES, Freedom House – навучыліся ўжываць больш эфектыўныя падыходы. Яны валодалі вопытам раней праведзеных паспяховых кампаній, такіх, як дапамога праціўнікам генерала Аўгуста Піначэта на чылійскім плебісцыце ў 1988 годзе ці падтрымка апазіцыі сандзінісцкаму праўленню на выбарах у Нікарагуа ў 1990-м. НДА абралі тактыку тэхнічнага і арганізацыйнага садзейнічання на месцах шырокаму колу грамадзянскіх і палітычных арганізацый, якія разам працуюць для таго, каб кінуць выклік сваім урадам на выбарах.
Гэтая дапамога мела на мэце ўзмацніць мясцовыя арганізацыі некалькімі ўзаемадапаўняльнымі спосабамі. Па-першае, НДА дапамагалі дамагчыся незалежнага маніторынгу на выбарах, у тым ліку паралельнага падліку галасоў, дзеля таго каб грамадзяне маглі, прынамсі, даведацца пра сапраўдныя вынікі галасавання. Па-другое, яны забяспечвалі падтрымку незалежным грамадзянскім групам, уключаючы новыя дынамічныя студэнцкія арганізацыі, якія маглі б спрыяць шырокаму грамадзянскаму ўдзелу ў выбарчым працэсе. Па-трэцяе, яны навучалі палітыкаў з апазіцыйных партый, часам давалі ім абсталяванне ці аказвалі іншую матэрыяльную дапамогу, каб садзейнічаць эфектыўнаму правядзенню кампаній. НДА таксама падтрымлівалі сумесную работу апазіцыйных партый і стварэнне шырокіх кааліцый.
Гэтая тактыка была ўвасоблена ў жыццё ў канцы 1990-х гадоў: спачатку (не цалкам) супраць прэзідэнта Славакіі Уладзіміра Мечыяра і прэзідэнта Харватыі Франьё Туджмана, а затым (у больш поўным аб'ёме) супраць прэзідэнта Сербіі Слабадана Мілошавіча. Амерыканскія і еўрапейскія прадэмакратычныя арганізацыі разгарнулі ўмела скаардынаваную і шчодра прафінансаваную (ад 60 да 100 млн долараў) кампанію, каб дапамагчы сербскім грамадзянскім і палітычным групам пры дапамозе выбараў адхіліць ад улады Мілошавіча, які ўжо знаходзіўся пад ціскам эканамічных санкцый і дыпламатычных карных мераў Захаду. Калі пачаліся выбары-2000, усе элементы склаліся ў адзінае цэлае: з заходняй дапамогай сербскія грамадзянскія арганізацыі пераканалі шырокія масы простых грамадзянаў падтрымаць перамены і ўдзельнічаць у выбарчым працэсе. Апазіцыйныя партыі дзейнічалі больш паспяхова, чым раней; незалежны маніторынг перашкодзіў спробам

Мілошавіча адмовіцца прызнаць вынікі выбараў. Дзеля гэтага аўтакратычнага лідэра адхілілі ад улады ў ходзе ў цэлым мірнай «электаральнай рэвалюцыі».

З тых часоў заходнія арганізацыі ўжывалі падобную тактыку (хоць нідзе больш яна не фінансавалася настолькі шчодра і не падмацоўвалася такім магутным дыпламатычным ціскам) у Азербайджане, Беларусі, Грузіі, Кіргізіі і Украіне, за што іх часта абвінавачвалі ў незаконным палітычным умяшанні. У адказ яны звяртаюць увагу на тое, што дзейнічаюць не ўпотай, а адкрыта; мэты ж заключаюцца не ў дасягненні канкрэтных вынікаў галасавання, а ў забеспячэнні правядзення дастаткова свабодных і сумленных выбараў. На думку НДА, знешняя дапамога неабходна, каб ураўнаважыць шанцы кандыдатаў і стварыць гарантыі супраць маніпулявання выбарным працэсам з боку ўладаў.

Ісціна, аднак, заключаецца ў тым, што, хоць большасць заходніх актывістаў, якія змагаюцца за пашырэнне дэмакратыі, магчыма, на самай справе зацікаўлены перш за ўсё ў правядзенні сумленных і свабодных выбараў, часцяком яны спадзяюцца, што іх намаганні павысяць імавернасць адхілення аўтакратаў ад улады. Матывы дзеянняў урадавых ведамстваў ЗША, якія фінансуюць многія інстытуты, што займаюцца распаўсюджваннем дэмакратыі (але не кіруюць імі непасрэдна), такія ж складаныя – ад прынцыповых меркаванняў да прагматычных у залежнасці ад канкрэтнай краіны і адказных асоб. Не дзіва, што гэтыя тонкасці не зразумелыя тым, на каго якраз і накіраваны іхнія намаганні. Аўтакраты схільны разглядаць такую дзейнасць як узгодненыя кампаніі па адхіленні іх ад улады, кампаніі, якія падахвочваюцца ці, прынамсі, падтрымліваюцца ўсёмагутнымі заходнімі ўрадамі, асабліва амерыканскім.

БЕСПАДСТАЎНЫЯ СТРАХІ?

Тлумачачы
прычыны
процідзеяння
прадэмакратычным
захадам,
лідэры
аўтакратычных
рэжымаў

рэгулярна
спасылаюцца
на сваю
заклапочанасць
замежным
уплывам і
пагрозай
нестабільнасці.
Узнікае
натуральнае
пытанне: ці
сапраўды
гэтыя
аўтакраты
баяцца, што
адносна
сціплыя
заходнія
праграмы
навучання
дэмакратыі і
фінансавая
дапамога
часцяком
слабым
грамадзянскім
і
палітычным
арганізацыям
падарве іх
уладу, ці
такія
асцярогі –
толькі
зручнае
апраўданне
рэпрэсіўных
захадаў, што
ўчыняюцца?
Адказ на

гэтае
пытанне
залежыць ад
канкрэтнай
краіны.

Для некаторых дзяржаў, асабліва большых, такіх, як Расія і Кітай, слушным з'яўляецца, бадай, другое. Кіраўніцтва ў Маскве і ўлады ў Пекіне моцна ўтрымліваюць стырно ўлады і не маюць сур'ёзнай апазіцыі. Наступ Крамля на садзейнічанне Захаду ў пашырэнні дэмакратыі – гэта хутчэй спосаб падаць расіянам пераход да аўтарытарнага праўлення як меру, накіраваную на абарону нацыянальнай бяспекі. У Маскве, магчыма, былі напалоханы ўкраінскай аранжавай рэвалюцыяй 2004 года, але там у большай ступені асцерагаліся страты ўплыву ў суседніх дзяржавах, чым палітычнага мяцяжу ў Расіі. Больш таго, зганьбіўшы аранжавую рэвалюцыю як вынік «падкопаў» ЗША, Пуцін змог паказаць у пазітыўным ключы тое, што на самай справе аказалася адным з яго самых страшных вонкавапалітычных пралікаў, а менавіта падтрымку прайгралага боку на ўкраінскіх выбарах. Дакладна гэтаксама спасылкі кітайскага кіраўніцтва на «каляровыя» рэвалюцыі, хутчэй за ўсё, не больш чым зручнае тлумачэнне матываў пашырэння кампаніі супраць лібералізацыі, якая праводзіцца ўжо некалькі гадоў.
У іншых выпадках, асабліва калі гаворка ідзе пра малыя, слабейшыя краіны, рэальныя асцярогі, мабыць, і праўда існуюць. Жупел спрытных амерыканскіх агентаў, якія цішком рыхтуюць рэвалюцыі, здаецца, сапраўды наводзіць жах на некаторых уплывовых палітычных лідэраў, нават нягледзячы на тое, што на самай справе заходняя дапамога ў пашырэнні дэмакратыі не такая ўжо і вялікая. Хоць сёлета Вашынгтон, як чакаецца, патраціць больш за мільярд долараў на праграмы пашырэння дэмакратыі, сродкі размяркоўваюцца паміж больш чым 50 краінамі і выкарыстоўваюцца па шырокім спектры напрамкаў, у тым ліку для рэалізацыі праграм у галіне ўдасканальвання работы судоў і садзейнічання ўрадавым намаганням дзеля дэцэнтралізацыі. Як і ўсе віды замежнай падтрымкі палітычным, эканамічным і сацыяльным рэформам, такая дапамога зусім не чароўны эліксір. Яна можа спрыяць

умацаванню існых грамадзянскіх арганізацый і апазіцыйных партый. Але яна не здольна стварыць такія інстытуты там, дзе іх няма, або ўмацаваць іх, калі яны прынцыпова слабыя. Нават у выпадку з Сербіяй (а гэта высокая планка з пункту гледжання інтэнсіўнасці і маштабу праграм дэмакратычных перамен) дапамога звонку адыграла толькі другарадную ролю, падтрымаўшы мужных і ўмелых кіраўнікоў мясцовых актывістаў. І тыя самыя віды дапамогі дагэтуль аказваліся значна менш эфектыўнымі ў такіх краінах, як, напрыклад, Беларусь, дзе палітычная апазіцыя і грамадзянская супольнасць адносна слабыя, а рэжым вельмі моцны.

Тым не менш вельмі шмат хто ў свеце (не толькі аўтакраты, якія адчуваюць пагрозу свайму праўленню) скептычна ставяцца да замежнай дапамогі ў галіне дэмакратыі. Яны мяркуюць, што калі Злучаныя Штаты вырашаць сфармаваць палітычны ландшафт у адносна слабых краінах, то ім гэта ўдасца. У многіх дзяржавах цяперашняя напорыстая хваля дэмакратычнай дапамогі выклікае ў памяці тайныя аперацыі ЗША часу халоднай вайны. Тады Вашынгтон сапраўды спрабаваў, і часта паспяхова, паўплываць на зыход выбараў ці скінуць законныя ўрады.

Негатыўнае ўражанне ўзмацняецца тым, што некаторыя заходнія НДА альбо з прычыны пыхі, альбо з жадання пераканаць сваіх спонсараў ва ўласнай значнасці схільны перабольшваць сваю ролю ў палітычных падзеях, тады як у сапраўднасці яны мала паўплывалі на сітуацыю. Матэрыялы, што з'яўляюцца ў заходніх СМІ, час ад часу падаюць амерыканскія праграмы распаўсюджвання дэмакратыі як асноўны фактар пераходу пэўных краін да дэмакратыі. Гэтыя публікацыі таксама робяць унёсак у фармаванне падобных скажоных уяўленняў.

МАЯК ДЛЯ НАРОДАЎ СВЕТУ ПАЦЬМЯНЕЎ?

Супраціўленне
дэмакратычнаму
ўздзеянню
можна
расцаніць як
рэакцыю
недэмакратычных
урадаў на

ўсё больш
настойлівую
форму
аказання
такой
дапамогі.
Але ёсць і
іншая
крыніца, з
якой яно
нараджаецца
і жывіцца.
Гэта і ўсё
большая
занепакоенасць
грамадскасці
ў сувязі з
самой ідэяй
распаўсюджвання
дэмакратыі,
і настроі,
якія за
апошнія
некалькі
гадоў
ахапілі
колішні
Савецкі
Саюз,
Заходнюю
Еўропу,
Блізкі Усход
і іншыя
рэгіёны.
Вялікая
доля
адказнасці
за гэтыя
настроі
ляжыць на

прэзідэнту
Бушу, які
імкнецца
распаўсюдзіць
дэмакратыю
ў
адпаведнасці
са сваімі
ўяўленнямі.

Прынятае ў Вашынгтоне паняцце «пашырэнне дэмакратыі» пачало разглядацца ў іншых краінах не як адлюстраванне амерыканскіх памкненняў прынцыповага характару, а як больш добрапрыстойны сінонім тэрміна «змена рэжыму», які азначае ўстараненне «праблемных» урадаў шляхам ужывання ваеннай сілы ці іншымі сродкамі. Больш таго, паколькі ідэя пашырэння дэмакратыі была выкарыстана Белым домам як галоўнае абгрунтаванне ўступлення ў Ірак, яе пачалі непасрэдна асацыяваць з амерыканскай інтэрвенцыяй і акупацыяй. Адміністрацыя Буша дала зразумець, што зацікаўлена ў скіданні іншых замежных рэжымаў, якія пагражаюць бяспецы Злучаных Штатаў, у прыватнасці ў Іране і Сірыі, і гэты факт паказаў задачы прэзідэнта Буша ў сферы пашырэння свабоды ў яшчэ больш пагрозлівым і варожым святле. Справядлівасць такога вываду пацвярджаецца тым, што, калі Буш і ягоныя галоўныя дарадцы пералічваюць «фарпосты тыраніі», у іх ліку нязменна аказваюцца ўрады, недружалюбна настроеныя да ЗША. У той жа час дружалюбныя, але не менш рэпрэсіўныя рэжымы, у прыватнасці ў Саудаўскай Аравіі, не згадваюцца. У выніку многія дзяржавы, як аўтакратычныя, так і дэмакратычныя, пачалі асцерагацца ўсяго комплексу амерыканскіх праграм пабудовы дэмакратыі, нават калі ў мінулым тыя не выклікалі спрэчак і пярэчанняў. Урады, што прагнулі заблакаваць гэтыя праграмы ў сваіх уласных інтарэсах, атрымалі магчымасць падаць свае крокі як апраўданае супраціўленне агрэсіўнаму ўмяшанню ЗША. І чым больш прэзідэнт Буш гаворыць пра распаўсюджванне дэмакратыі як пра сваю асабістую задачу, тым лягчэй лідэрам дэспатычных дзяржаў ачарняць гэтую ідэю, гуляючы на надзвычайна нізкім узроўні папулярнасці амерыканскага

лідэра за мяжой.
Бушава адміністрацыя яшчэ больш падарвала пазіцыі змагароў за дэмакратыю сваімі крокамі, якія кідаюць цень на Злучаныя Штаты як сімвал дэмакратыі і абароны правоў чалавека. Пры тым што амерыканскі прэзідэнт неаднаразова заяўляў аб адданасці мэтам свабоды, сам ён наносіў адзін удар за другім па амерыканскіх дэмакратычных прынцыпах і нормах. Прыкладамі таму служаць катаванні зняволеных і затрыманых на аб'ектах ЗША ў Іраку і Афганістане; сотні людзей, якія ўтрымліваюцца на амерыканскай базе Гуантанама (Куба) у становішчы прававой няпэўнасці; выдача арыштантаў – замежных грамадзянаў (часам таемна выкрадзеных за мяжой) у краіны, пра якія вядома, што там практыкуюцца катаванні; стварэнне сеткі тайных амерыканскіх турмаў за мяжой; праслухоўванне без санкцый спецыяльнага суда на тэрыторыі ЗША і дзівоснае леташняе супраціўленне Белага дома прыняццю закона, які забараняе жорсткае, негуманнае і зневажальнае абыходжанне з любым зняволеным, што знаходзіцца ў амерыканскай турме. Усе гэтыя дзеянні, разам узятыя, нанеслі адчувальны ўдар па прэстыжы Амерыкі ў свеце. Гэты факт, які з усёй яснасцю і горыччу ўсведамляе кожны, хто хоць бы нядоўгі час праводзіць за мяжой, здаецца, не вядомы ці не прыносіць неспакою прэзідэнту Бушу і яго атачэнню (за выключэннем, бадай што, дзяржсакратара Кандалізы Райс). Аднак шкода, нанесеная рэпутацыі ЗША дзеяннямі цяперашняй адміністрацыі, палегчыла замежным аўтакратам задачу барацьбы супраць распаўсюджвання дэмакратыі, узброіўшы іх простым пытаннем: «Ці можа дзяржава, якая катуе людзей за мяжой і парушае правы чалавека ў сябе дома, указваць іншым краінам, як

АСЦЯРОЖНА ДАВАЦЬ АДПОР

Такім
чынам, якой
жа павінна
быць
рэакцыя
Злучаных
Штатаў? На
гэтае
пытанне

ёсць два
адказы,
гэтак жа як
у самой
праблемы
ёсць два
ўзаемазвязаныя,
але розныя
аспекты –
захады
некаторых
урадаў з
мэтай
спыніць
дэмакратычнае
садзейнічанне
і рост
недаверу на
ўсім свеце
да
распаўсюджвання
дэмакратыі
ў цэлым.

Што да першага аспекту, то Вашынгтон павінен уважліва адсочваць захады, якія робяцца іншымі ўрадамі з мэтай перашкодзіць аказанню дапамогі ў галіне развіцця дэмакратыі, а таксама выпрацаваць паслядоўны, які б улічваў усе нюансы, спосаб выказвання нездаволенасці такімі захадамі і па магчымасці дабівацца іх адмены. Нядаўна Бушавай адміністрацыі ўдалося пераканаць Пуціна змякчыць некаторыя палажэнні расійскага закона аб НДА. Белы дом досыць паспяхова справіўся з гэтай задачай, але яго намаганні, тым не менш, уяўлялі сабой хутчэй аднаразовыя дзеянні, чым частку сістэмнага плана рашэння больш агульнай праблемы. Барацьба з кампаніямі, накіраванымі супраць прасоўвання дэмакратыі, патрабуе тонкага, дыпламатычнага падыходу. Калі ў адных абставінах вынікаў можна дамагчыся публічнымі заявамі ці даючы жорсткі адпор, дык у іншых выпадках такая лінія толькі падбухторыць нацыяналістычныя настроі і

акажацца контрпрадукцыйнай. Адказныя асобы ў ЗША павінны быць разважлівымі ў сваіх чаканнях, якія датычацца адпаведных дзеянняў замежных урадаў, а вырашыць, што менавіта з'яўляецца разумным, не заўсёды лёгка. Дэмакратычную палітычную практыку рэгулююць адносна выразныя міжнародныя нормы, зафіксаваныя ў цэлым шэрагу шматбаковых і рэгіянальных пагадненняў. Але няма ўсталяванага зводу нормаў, што датычаць прымальных формаў удзелу ў працэсе дэмакратызацыі за мяжой. На самай справе розніца паміж разумнымі і неразумнымі абмежаваннямі на замежную палітычную дапамогу застаецца надзвычай невыразнай. Просты ціск на іншыя ўрады з тым, каб вымусіць іх кіравацца амерыканскімі ці іншымі заходнімі стандартамі, не прынясе чаканага плёну. Рамкі наяўных агульных стандартаў, як правіла, занадта вузкія, каб заходнія праваднікі дэмакратыі маглі ўплываць на замежныя ўрады ў той меры, у якой яны імкнуцца. Ці заахвочваў бы Вашынгтон прысутнасць на амерыканскіх выбарах замежных арганізацый (асабліва тых, што фінансуюцца ўплывовым, магчыма, варожым урадам), якія забяспечваюць і падтрымліваюць правядзенне кампаній дзеля адукацыі выбаршчыкаў? Ці вітаў бы ён аказанне матэрыяльнай дапамогі амерыканскім палітычным партыям і навучанне іх членаў, паралельны падлік галасоў і дадатковыя намаганні для мабілізацыі сваіх грамадзянаў?

Каб пазбегнуць абвінавачанняў за ўжыванне гэтага двайнога стандарту, амерыканцам варта падкрэсліваць два моманты (і шчыра верыць у іх). Па-першае, яны павінны ўказваць на тое, што пашырэнне дэмакратыі – справа не толькі Злучаных Штатаў, як гэта пастаянна падкрэслівае прэзідэнт Буш. У супольнасць актыўных змагароў за дэмакратыю ўваходзяць, поруч з міжнароднымі аб'яднаннямі, многія дзяржавы сталай дэмакратыі. Амерыканскія арганізацыі звычайна працуюць поплеч ці сумесна з еўрапейскімі і міжнароднымі, такімі, як АБСЕ і Праграма развіцця ААН. Па-другое, яны павінны падкрэсліваць, што сутнасць настойлівага садзейнічання дэмакратыі заключаецца ў тым, каб дапамагаць (ці ствараць стымул) урадам, якія парушаюць дэмакратычныя нормы, прытрымліваецца іх, а не ў тым, каб фармаваць у краіне ўмовы, якія дазваляюць іншай дзяржаве кантраляваць палітычныя працэсы, што адбываюцца ў гэтай краіне.

Але незалежна ад таго, наколькі паспяхова праваднікі дэмакратыі адстойваюць сваю рацыю, шмат хто ў краінах – аб'ектах дапамогі будзе сумнявацца ў легітымнасці іх дзеянняў. Тыя, хто заняты прасоўваннем дэмакратыі, магчыма, лічаць, што парушэнне дэмакратычных прынцыпаў абмяжоўвае права краіны спасылацца на свой суверэнітэт, з тым каб перашкодзіць знадворнаму ўздзеянню. Не выключана, што такая ідэя заваёўвае папулярнасць у краінах сталай дэмакратыі. Аднак яна наўрад ці атрымае шырокую падтрымку ў краінах, што сталі на шлях развіцця, і посткамуністычных, дзе суверэнітэт дбайна абараняецца ўрадамі ўсіх палітычных масцей.
Такім чынам, заходнія абаронцы дэмакратыі стаяць перад цяжкім выбарам, які ім яшчэ належыць сфармуляваць ці адкрыта абмеркаваць. Ці варта ім і надалей праводзіць мэтанакіраваныя мудрагелістыя кампаніі для падтрымкі апазіцыі дэспатычным правіцелям іншых дзяржаў? Альбо яны павінны стрымаць імпэт, каб не выклікаць рэакцыю ў адказ, здольную прывесці да таго, што іх дзейнасць акажацца цалкам заблакаванай ва ўсё большай колькасці краін? Пытанне зводзіцца да таго, як найлепшым чынам забяспечыць максімальна шырокі ахоп і эфектыўнасць садзейнічання.

ВЯРТАННЕ ДА СВЯТЛА

Магчымасці
адміністрацыі
Буша
зменшыць
шырокую
нездаволенасць
канцэпцыяй
прасоўвання
дэмакратыі
вельмі
абмежаваныя.
Цесна
асацыяваць
гэтую ідэю з
амерыканскай
інтэрвенцыяй
людзі
будуць аж

да канца
прэзідэнцкага
тэрміну
Джорджа
Буша. Больш
таго, нават
калі ў
найбліжэйшыя
некалькі
гадоў у
Іраку
ўсталюецца
адносна
стабільны,
мірны і
дэмакратычны
рэжым,
Вашынгтону
не варта
спадзявацца,
што гэта
зменіць
глыбока
ўкарэненае
ўяўленне
пра
нелегітымнасць
і
непажаданасць
ужывання
сілы ў мэтах
распаўсюджвання
дэмакратыі.
Бушава
каманда і
большая
частка
міжнароднай
супольнасці
прынцыпова

разышліся ў
думках па
гэтым
пытанні, і
гэтае
разыходжанне
будзе і
надалей
аказваць
сур'ёзнае
адмоўнае
ўздзеянне
на
стаўленне
многіх
людзей да
прэзідэнцкай
«праграмы
развіцця
свабоды».

Прэзідэнт Буш, аднак, можа вярнуць у вядомай ступені давер да сябе, калі прадэманструе, што для яго распаўсюджванне дэмакратыі сапраўды справа прынцыпу, а не проста зручны сродак апраўдаць ужыванне супраць недружалюбных урадаў ваеннай сілы ці іншай тактыкі змены рэжыму. Гэта не азначае, што трэба засяродзіцца выключна на высокіх ідэалах і ігнараваць практычныя інтарэсы. Але неабходна хоць бы нейкая крыха паслядоўнасці ў дзеяннях. У сваёй другой інаўгурацыйнай прамове Буш, здаецца, прызнаў гэта, абвясціўшы пра намер адмовіцца ад няўдалай практыкі падтрымкі аўтакратычных рэжымаў, якія служылі інтарэсам ЗША ў сферы эканомікі і бяспекі. Заявіўшы, што рэпрэсіўнае грамадства спараджае экстрэмізм, здольны ператварыцца ў антызаходні тэрарызм, ён паабяцаў адстойваць свабоду ўсюды. Але пакуль Буш гэтага абяцання не выканаў. З нагоды сітуацыі ў найбольш значных краінах – Расіі, Кітаі, Пакістане і Саудаўскай Аравіі – адміністрацыя рабіла даволі мяккія (у найлепшым выпадку) заявы пра неабходнасць правядзення там палітычных рэформаў. Адначасова Белы дом працягваў па-

старому весці справы ў гэтых краінах. Тое самае можна сказаць пра адносіны ЗША з Егіптам, Казахстанам і Азербайджанам. На адбытых там мінулай восенню выбарах балатаваліся праамерыканскія палітыкі-аўтакраты (Хосні Мубарак і Нурсултан Назарбаеў на прэзідэнцкіх выбарах у Егіпце і Казахстане адпаведна, партыя Ільхама Аліева на парламенцкіх у Азербайджане). Да гонару Бушавай адміністрацыі, яна дала зразумець усім тром, што пажадана правядзенне свабодных і сумленных выбараў. Але ўрэшце і егіпецкі, і казахстанскі, і азербайджанскі лідэры разыгралі тыповую партыю дружалюбных тыранаў, якія зведваюць нязначны ціск з боку амерыканцаў, нездаволеных іхнімі недэмакратычнымі паводзінамі. Усе трое пайшлі на некалькі сціплых пазітыўных зменаў у самым пачатку выбарчага працэсу, але затым – на апошнім, вырашальным этапе выбараў – нанеслі скрышальны ўдар па апазіцыйных групах, падраблялі бюлетэні і рабілі іншыя захады для забеспячэння сваёй безумоўнай перамогі. Сутыкнуўшыся з такой тактыкай, Бушава адміністрацыя таксама вярнулася да старога сцэнара: залішне расхвальвала нязначныя поспехі і прымяншала буйныя паразы. З тых часоў амерыканскія дзеячы рэдка згадваюць пра тыя падзеі публічна. Здаецца, што ўсім тром прэзідэнтам не давядзецца плаціць колькі-небудзь значную цану за свае паводзіны, якія супярэчылі дэмакратычным прынцыпам.

Вядома, нерэальна чакаць, што ўсе крокі Вашынгтона на шляху прасоўвання дэмакратыі будуць абсалютна паслядоўныя. Але прэзідэнт Буш, які, рызыкуючы сваёй рэпутацыяй, заявіў, што барацьба з тэрарызмам патрабуе адмаўлення ад выгадных сувязяў з дружалюбнымі тыранамі, павінен зрабіць нешта, каб выканаць сваё абяцанне. Відавочна, што рэзкае згортванне адносін з важнымі для ЗША ўрадамі немагчымае і непажаданае. Але калі амерыканскае кіраўніцтва амаль ніяк не рэагуе на фальсіфікацыю вынікаў галасавання, гэта толькі падмацоўвае пашыранае меркаванне пра яго крывадушнасць. Бушава адміністрацыя магла б умацаваць свой статус дэмакратычнай дзяржавы, навёўшы парадак ва ўласных справах. У гэтым плане нанесены ўрон таксама наўрад ці будзе адноўлены ў найбліжэйшы час: такія дзеянні, як катаванні затрыманых іракцаў амерыканскімі салдатамі, не сатруцца з памяці замежных наглядальнікаў. Але адміністрацыя можа і

павінна выправіць становішча. Якія захады ў бок карэкцыі варта зрабіць – досыць відавочна. Гэта шэраг мераў, пачынаючы з канчатковай адмовы ад жорсткага абыходжання са зняволенымі і затрыманымі ў турмах за межамі ЗША і канчаючы раскрыццём інфармацыі пра сакрэтныя месцы зняволення, пра выдачу людзей замежным дзяржавам, пра незаконныя выкраданні і несанкцыянаваныя праслухоўванні на тэрыторыі ЗША. Кожная краіна, сутыкнуўшыся з пагрозай тэрарызму, імкнецца знайсці адпаведны баланс паміж бяспекай і павагай да грамадзянскіх свабод. Але калі Бушава адміністрацыя не ліквідуе яўнай супярэчнасці паміж уласнай упартай схільнасцю да парушэння правоў асобы дзеля барацьбы з тэрарызмам і спробамі ўнушыць іншым краінам, што свабода – гэта проціяддзе ад тэрарызму, то яе праграма пашырэння дэмакратыі так і застанецца на хісткім падмурку. А антыдэмакратычнае супраціўленне будзе тым часам нарастаць.

З англійскай пераклаў Сяргей Петрыкевіч

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/10/24

[image]

[illegible]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 7-8 (47-48) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]-[image]2006

[illegible] • **крытыка** • эсэістыка • аналітыка • палеміка • гісторыя

[image] [image] [image]

Віталь Сіліцкі

Расстрэльная сістэма

Алкаев, Олег. *Расстрельная команда.* – Москва: Партизан, 2006. Калі б тое, пра што пішацца ў кнізе Алега Алкаева, адбылося ў іншай краіне і стала вядома грамадству, яе хутчэй за ўсё спаткалі б магутныя сацыяльна-палітычныя землятрусы. Мы ж ведаем, якую ролю адыгралі вядомыя «касеты Мельнічэнкі», што раскрылі тайны забойства Гіі Гангадзэ, у падзенні рэжыму Кучмы ва Украіне. Зрэшты, бывае і па-іншаму. Дастаткова згадаць «брудныя войны» ў Лацінскай Амерыцы, тысячы ахвяр піначэтаўскага рэжыму і... натоўпы, што ў захапленні вітаюць свайго «ўратавальніка». Чалавечая псіхалогія – рэч вельмі прыдатная для «перакоўкі» ўладай, для зменаў у пэўных палітычных варунках да такой ступені, што перастае ўжо здзіўляць адсутнасць уласна чалавечнасці. На разгон намётавага лагера на пляцы Каліноўскага ў сакавіку 2006 г. частка нашых суайчыннікаў адрэагавала так, што, маўляў, «іх наогул пазабіваць трэба было». У 2001 г., калі на вуліцы Менска выйшлі маці і жонкі зніклых палітыкаў, некаторыя з нашых суродзічаў крычалі ў твар жанчынам, што «ім пенсію плацяць у доларах». Менавіта так: у краіне пераможнага рынкавага сацыялізму і ідэалогіі, што вучыць «працы не дзеля нажывы», пачак долараў цэніцца больш за чалавечае жыццё.

Зрэшты, здзіўляцца мы амаль развучыліся. Таму кніга Алкаева

ўжо не ўзрушыць і не ўразіць душы – яна ўспрымаецца больш як гістарычнае апавяданне. Як заўжды, прызвычаіліся... Хоць, можа, і не зусім. Дзякаваць Богу, з 2000 г. палітыкі і журналісты пакуль знікаць перасталі (не магу тут, аднак, не згадаць пра лёс Юрася Корбана, на якога чамусьці забыліся і палітыкі, і праваабаронцы – можа, сапраўды прызвычаліся?). Факты і падзеі, пра якія піша Алкаеў, былы загадчык менскай Валадаркі і па сумяшчальніцтве – кіраўнік групы, што прыводзіла ў выкананне смяротныя прысуды, а папросту кажучы – той самай «расстрэльнай каманды», – ужо не сенсацыя. Рапарты і дакументы, «злітыя» пяць гадоў таму Уладзіміру Ганчарыку, дагэтуль вісяць дзесьці ў Інтэрнэце. Як і справаздача камісіі ПАРЭ пад кіраўніцтвам Хрыстаса Пургурыдыса. Дарэчы, як і сама кніга: у кампутарны век цэнзура ўсё ж – цяжкая справа. Яе не тое што зусім няма – ёсць, і яшчэ як ёсць. Але на адно блакаванне альтэрнатыўных думак і непажаданай інфармацыі ў сённяшнім грамадстве спадзявацца ўжо не выпадае – гарантый ад прарываў, уцечак няма. А вось паспрабаваць змяніць нормы, зрабіць некаторыя рэчы не тое каб маральнымі, але прынамсі прымальнымі – гэта можна.

Што ж падштурхнула тады Алкаева напісаць гэтую кнігу? Версіі могуць быць самыя розныя. Відавочна, што адзін з уцягненых у самы гучны палітычны скандал у найноўшай гісторыі Беларусі мусіў растлумачыць некаторыя падрабязнасці ягонай уласнай ролі ў сумнавядомых падзеях. Нагадаем, што яго нават абвінавачвалі ў непасрэднай датычнасці да выкрадання і расправы над Ганчаром і іншымі. Цалкам магчыма і тое, што пасля некалькі гадоў жыцця ў цывілізаваным і вольным свеце ў чалавека змяняюцца ўяўленні пра нармальнае і прымальнае, і не выказацца пра тое, іншае, ужо далёкае жыццё ён не можа. Алег Алкаеў выконваў бадай што самую агідную працу, на якую можна асудзіць чалавека, – працу ката. Не яго ў гэтым віна, не яго нават бяда – усім вядома, як ставяцца ў нашым грамадстве да адмены смяротнага пакарання. Дарэчы, багата ў якіх дэмакратычных краінах становішча не моцна адрозніваецца: там забарона на «вышку» існуе толькі воляй палітычных элітаў. Тут няма нічога незвычайнага – сапраўды, вывучаючы справы шмат якіх нягоднікаў, хоцькі-няхоцькі задаешся пытаннем, ці маюць яны права на жыццё, і сваю

ўласную апазіцыю да найвышэйшай меры пачынаеш тлумачыць толькі тым, што верагоднасць судовай памылкі каштуе занадта дорага, каб рызыкаваць страціць смерцю хоць аднаго невінаватага. Але рэч не ў літасці да злодзеяў і не ў неабходнасці апраўдваць узаконеныя дзяржавай і ўхваленыя народам на рэферэндуме 1996 г. акты легітымнага забойства. Расстрэльная каманда, што базуецца на Валадарцы ў Менску, – гэта толькі вярхушка айсберга. Алкаеў даводзіць, што ў нас уся сістэма, а бадай і ўся краіна, ператварылася ў расстрэльную.

Расстрэльная сістэма пачынаецца з «расстрэльных» людзей – простых грамадзянаў, чыноўнікаў, палітычных лідэраў, для якіх чалавечае жыццё – каштоўнасць вельмі ўмоўная. Некаторыя партрэты вышэйшых палітычных асоб, пададзеныя Алкаевым, даволі банальныя. Зрэшты, мы ўсе ведаем, што *«нет спасенья от раба, который стал царём»*. Цары-рабы, аднак, спараджаюць сабе падобных – а тыя іншых, і гэтак далей, пакуль гэтая манархічна-халопская вертыкаль не працінае сваімі метастазамі літаральна ўсю краіну. На ўзроўні «блізка да цела» – гэта міністры (каб не падставіць часопіс, прозвішчы, па магчымасці, апускаю), для якіх крытэры баявой здольнасці падраздзяленняў – «абавязковая наяўнасць выказванняў міністра (штосьці накшталт цытатніка Мао), афармленых у выглядзе яго лекцый з плейбойскім партрэтам самога генерала ў крапавым берэце на мужнай галаве, што красавалася на вокладцы канспекта». На ніжэйшым узроўні – маёр унутраных войскаў, так бы мовіць, адзін з пачынальнікаў сумнавядомых эскадронаў, які, займаючыся «крышавальным» бізнэсам, зарваўся да такой ступені, што нават свае мусілі пасадзіць, каб прадухіліць уцечкі інфармацыі. Але нават на зоне той маёр не проста не адмаўляўся ад мінулых подзвігаў – прылюдна амаль бесперапынна балабоніў пра свой удзел у выкананні «любых загадаў» вышэйшага кіраўніцтва. Як сведчыць Алкаеў, пры разглядзе матэрыялаў яго справы складвалася ўражанне, што размова ідзе не пра забойства людзей, а пра шараговыя мерапрыемствы – настолькі звычайныя, што падрабязнасці нават не хаваліся. Так паводзяцца альбо вар'яты, альбо людзі, абсалютна ўпэўненыя ў беспакаранасці і дасведчаныя ў падобных справах.

Логіка стварэння расстрэльнай сістэмы нічым не розніцца ад уласна логікі яе «шрубкоў» – яна заснаваная на страху, што мяжуе з вар'яцтвам, поўнай беззаконнасці і беспакаранасці. Як сцвярджае Алкаеў, нават выносячы за дужкі дзеянні пэўных карных структур, само іх стварэнне і наданне адметных сілавых функцый не адпавядала дзейнаму заканадаўству. Папросту кажучы, вайсковыя фармаванні не маглі мець паліцэйскіх функцый.

Зусім магчыма, – працягвае ён, – *што некаторыя з баевікоў увогуле не трапілі б на службу ў органы ўнутраных справаў нават у якасці шарагоўцаў, калі б праходзілі паўнавартасны адбор і праверку, прадугледжаную для будучых супрацоўнікаў міліцыі. Пры ўсіх недахопах камплектавання, у міліцыю ўсё ж імкнуліся падбіраць здаровых і разумных. А ў войскі – здаровых і паслухмяных, а часам і толькі паслухмяных.*

Нішто так не спрыяла стварэнню карных структураў, як страх саміх уладаў, які старанна падагравaўся тымі, каму без гэтай паўсюднай атмасферы страху неяк і заробак няма за што плаціць. Агентура спецслужбаў, узрошчаная ў перыяд вострага дэфіцыту на шпіёнаў і дыверсантаў, проста збірала па свеце ўсялякія плёткі. Атрыманая такім чынам інфармацыя «творча» апрацоўвалася і набывала статус дакумента дзяржаўнай значнасці. У выніку вар'яцкія роздумы нейкага неда- ці перапіўшага дзядзькі Васі ператвараліся ў пэўных руках у шматстаронкавыя справаздачы і ўсёабдымныя планы аховы бяспекі дзяржавы ад ваенна-эканамічных дыверсій.

Аднак гэта ўсё рэчы сумныя, жудасныя, але вядомыя. Сапраўдную цікавасць у кнізе выклікае тое, дзеля чаго яна, магчыма, і стваралася. Па-першае, гэта тлумачэнні Алкаева, чаму ён, захавальнік «расстрэльнага пісталета», гэтак позна правёў паралель паміж незразумелымі «пазычэннямі» зброі і знікненнямі палітыкаў. Тут выплывае даволі вялікі шэраг несупадзенняў. Напрыклад, Алкаеў прызнаецца, што спрабаваў зліць інфармацыю некаторым асобам, якія потым вызначаліся як магчымыя фігуранты будучых гучных справаў. Што ж столькі часу гарантавала бяспеку Алкаева, якім чынам ён пратрымаўся да сярэдзіны 2001 г., а потым перабраўся ў

Берлін? Я не сцвярджаю, што Алкаеў кажа няпраўду, але ён відавочна нешта не дагаворвае – зрэшты, гэта і не дзіўна. А вось што відавочна, дык гэта жаданне Алкаева звесці рахункі з вядомай незалежнай журналісткай Ірынай Халіп. Нагадаем: яна калісьці наўпрост абвінаваціла Алкаева ў тым, што ён і ёсць сапраўдны забойца некаторых вядомых асобаў. І тут Алкаеў наносіць удар у адказ: паводле ягонай версіі, Халіп брала ўдзел у інфармацыйным прыкрыцці знікненняў, раскручваючы тэму Тамары Віннікавай, якую таксама пэўны час залічвалі да сумнага шэрагу ахвяр. Потым яна нечакана ўсплыла, прычым знайшла яе спадарыня Халіп у тым самым месцы (прынамсі, так сцвярджае Алкаеў), якое за пару тыдняў да таго згадваў кіраўнік дзяржавы.

Разборак на старонках кнігі сапраўды багата. Тут і характарыстыкі некаторых высокіх чыноў дзяржавы і сілавых структур, і намёкі на тое, што Алкаеў ведае нашмат больш, чым сказаў (напрыклад, пра карупцыю ў найвышэйшых эшалонах улады), і пагроза, што дакументальныя доказы датычнасці пэўных асобаў да лёсу вядомых апазіцыянераў захаваныя і рана ці позна ўсплывуць. Аднак пытанні да Алкаева застаюцца. Напрыклад, ці можна верыць таму, што калі Алкаеву ўпершыню загадалі выдаць расстрэльны пісталет, ён спярша падумаў, што яго запатрабавалі міліцэйскія чыны, каб на прыродзе пастраляць па бляшанках? А другі раз, асабліва калі грамадства (і, вядома, сілавыя структуры) скаланулі знікненні Ганчара і Красоўскага, калі толькі пра гэта і казалі? Ці можна сапраўды даць веры наіўнасці Алкаева, ці варта верыць, што ён – чалавек, які літаральна сядзеў на засакрэчанай, выбуховай інфармацыі – быў «далёкі ад палітыкі»?

Іншае пытанне: Алкаеў не хавае, што, нарэшце вызначыўшы пэўныя прычынна-выніковыя сувязі, ён спрабаваў «падкінуць» інфармацыю адпаведным органам. Як тады атрымалася, што яго не чапалі, а потым Алкаеў і зусім выслізнуў – знік з-пад носу ў Маскву, затым у Берлін? Чаму да яго не дакапаліся падчас кадравага ператрусу ў лістападзе 2000 г. і не чапалі, нават калі спецслужбы дакладна ведалі, што ў незалежнай прэсе неўзабаве з'явяцца выкрыцці з ягоным рапартам?

Алкаеў адказвае на ўсе гэтыя пытанні, але з адказаў нельга зрабіць адназначных высноў. Аднак яго версія выглядае досыць лагічнай, магчымай, праўдападобнай. Сапраўды, можна паверыць, што міліцэйскі чыноўнік да пары да часу не браў да галавы палітычных пытанняў. Цалкам верагодна, што ён пачаў капаць толькі тады, калі дацяміў, што ў яго руках – кампрамат, які можа каштаваць яму жыцця, альбо прынамсі што менавіта на яго, Алкаева, павесяць у гэтай справе ўсіх сабак. Вядома, што ў 1999–2000 гг. у сілавых структурах ішла паддывановая барацьба за ўладу, у якой пэўным асобам быў патрэбны кампрамат, што забяспечвала пэўную ступень свабоды яго носьбіту. Шмат пра што можна здагадацца. Напрыклад, з аповеду Алкаева вынікае, што адна з чатырох асобаў, якія найчасцей фігуруюць як магчымыя галоўныя дзеячы «гучных справаў», – яго міліцэйскі начальнік (Уладзімір Навумаў) – да знікненняў дачынення не мае. Менавіта праз яго ішла далей і інфармацыя, якой валодаў Алкаеў. Калі гэта так, то на пытанне, чаму Алкаева не кранулі (болей за тое, ён атрымаў камандзіроўку МУС... у Берлін!), напрошваецца лагічны адказ. Зрэшты, версіяў, адказаў і інтэрпрэтацый можна дадумаць і прывесці шмат...

Апошняя частка кнігі нагадвае ўжо не паказанні і нават не палітычны памфлет, а споведзь. Алкаеў малюе жудасці сваёй штодзённай працы на пасадзе кіраўніка «расстрэльнай каманды»: яму давялося прысутнічаць пры выкананні прысуду каля паўтары сотні асуджаных. Споведзь гэтая, напэўна, мае прабудзіць у чытача спачуванне да самога аўтара. Ёсць і спроба супрацьпаставіць забойства легітымнае, якое здзяйснялася паводле выраку суда, і забойства іншага кшталту – тое, якое, магчыма, спаткала некаторых вядомых людзей. Зноўку паўтаруся – абсмоктваць гэтую тэму не варта – у краіне, дзе супраць адмены смяротнага пакарання прагаласавала каля 80 % выбарцаў, нехта мусіць выконваць прысуд. Ды хоць я сам і супраць такога пакарання ў прынцыпе, жалю да падонкаў, якія пасля абвяшчэння прысуду ўпадалі ў прастрацыю і пачыналі паволі з'язджаць з глузду або ішлі на ўсялякія хітрыкі, каб вымаліць літаральна кожную хвіліну жыцця, неяк не паболела – хіба толькі да іх бацькоў і крэўных, якія таксама вымушаныя

прайсці праз гэтае маральнае пекла. Дадатковых аргументаў у дыскусію, напрыклад, пра мэтазгоднасць ці немэтазгоднасць адмены смяротнага пакарання гэтыя сцэны не дадаюць. Нашмат больш уразіла іншае – аповед Алкаева, як уплывае забойства, нават цалкам законнае і справядлівае (выносім за дужкі шостае прыказанне), на нармальных, адэкватных людзей – нават калі яны страцілі смерцю нелюдзя, што забіў дачку і ўнучку іх калегі па цэху, і былі цалкам прасякнутыя духам, як кажа Алкаеў, мянтоўскай салідарнасці. Нармальны чалавек і забойства – рэчы несумяшчальныя. Нармальны чалавек не можа хадзіць на выкананне прысуду, як у тэатр. Нармальны чалавек не будзе балабоніць пра свае «мокрыя справы» на зоне, як пра подзвігі.

Як бы хто ні ставіўся да асобы самога аўтара, але ён вынес свой, нават не палітычны, а клінічны прысуд «расстрэльнай сістэме».
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/10/24
[image]

[illegible]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 7-8 (47-48) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

Эсэістыка [image]-[image]2006

"ды з бацьку • "крытыка • **эсэістыка** • аналітыка • палеміка • гісторыя

[image] [image] [image]

Ян Максімюк З бліжэйшых пластоў забыцьця

ЯН МАКСІМЮК палітычны аналітык радыё «Свабода». Аўтар кнігі «Беларуская гімназія імя Янкі Купалы ў Заходняй Нямеччыне (1945–1950)» (Нью-Ёрк–Беласток: Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва, 1994).

1

Мой прадзед зваўся Лукіянам. Памёр у 1917-м. Гэты год разам зь ягоным імем і прозьвішчам запісаны на бэтонным крыжы на прыходзкіх могілках у Клейніках, у паўночна-ўсходняй Польшчы. Уласна кажучы, я ведаю пра яго ненашмат больш. Гэта значыць, нічога канкрэтнага, акрамя адной паўфантастычнай гісторыі, пачутай у дзяцінстве ад майго дзеда Івана.

Дык вось, за два гады да сьмерці прадзеда Лукіяна цар Мікалай вырашыў абараніць свой рускі праваслаўны люд на заходнім беразе Расейскай імпэрыі ад уяўнай жорсткасьці Нямеччыны ў вайне, якая пазьней набыла назву Першай сусьветнай. Паводле царскай прапаганды, германскія орды, надыходзячы, нібыта палілі ўсё ды забівалі кожнага, каго сустракалі па дарозе. Папы ў цэрквах казалі тое самае. І першымі далі прыклад сваім вернікам, пакуючы сваю царкоўную маёмасьць і зьяжджаючы на ўсход.

У 1915-м царскія ўлады перасялілі ўглыб імпэрыі блізу паўтара мільёна чалавек з заходніх ускраінаў Расеі. У шырокім пасе, які ахоплівaў Віленшчыну, Гарадзеншчыну, Беласточчыну і беларускае Палесьсе, засталіся толькі пакінутыя вёскі або папялішчы (бо царскія казакі па эвакуацыі спалілі шмат вёсак), а таксама цэрквы без крыжоў і іконаў. Засталіся таксама католікі і габрэі, якіх цар-бацюшка ня надта ахвотна бачыў у сэрцы свае імпэрыі.

Паводле расказу майго дзеда, дарогу ягонай сям'і на ўсход позьнім летам 1915 году перарэзалі нямецкія жаўнеры ў пікельгаўбах і загадалі вяртацца. Ня ведаю (ці, магчыма, не запомніў?), адкуль дакладна дзед вярнуўся ў нашу вёску Ляхі на Беласточчыне зь няўдалай выправы ў расейскую глыб. У кожным разе гэта не магло быць вельмі далёка ад нашага роднага дому.

Праваслаўны люд Беласточчыны ў 1915-м цягнуўся на ўсход на фурманках, якія, апроч цэлых сямей, мусілі зьмясьціць таксама самыя неабходныя рэчы, ня кажучы ўжо пра запасы сухароў. Мае продкі рушылі на ўсход аднымі з апошніх, таму, хутчэй за ўсё, былі яшчэ далёка да чыгуначных станцыяў у Слоніме або Баранавічах, адкуль шмат тагачасных уцекачоў ад кайзэраўскай Нямеччыны скіроўваліся цягніком ў далейшы шлях у Расею.

Немцы ў пікельгаўбах у 1915-м павярнулі нашу сям'ю дадому. *Zurück*. Цар Мікалай не хацеў пакідаць свайму праціўніку з Бэрліна нічога, акрамя спаленай зямлі, каб хутчэй выкурыць яго адтуль, калі б зьмянілася хада ваеннай кампаніі. За сто гадоў да гэтага такую пераможную тактыку выкарыстаў у дачыненьні да Напалеона Банапарта іншы цар, Аляксандар. А кайзэр Вільгельм, зразумела, жадаў, каб на здабытых тэрыторыях засталося як мага больш працоўных рук, якія маглі б забясьпечваць яго жаўнераў *Speck, Brot* і *Eier*. Людзі ў маёй вёсцы хутчэй не належалі да паліглётаў, але ўсе ведалі, што значаць нямецкія словы *Speck, Brot* і *Eier*. Ведалі таксама слова *zurück*. Немцы адышлі з нашых краёў у 1918 годзе, але зноў былі zurück у 1941-м. Гэтыя таксама патрабавалі *Speck, Brot* і *Eier*.

Дык вось, прадзед Лукіян вярнуўся зь сям'ёй у пакінутыя Ляхі. Вакол стаялі пустыя вёскі: Кленікі, Гукавічы, Кожына і Гародчына. Колькі чалавек вярнулася разам з прадзедам? Зь ім, напэўна, былі дзеці: Іван, Барыс, Васіль і Надзея. Аднак пра ягоную жонку, маю прабабку, у сямейнай памяці не засталося ніякіх сьлядоў. Хоць бы імя на магільным крыжы ў Кленіках. Час, калі я мог кагосьці пра яе спытацца, незваротна мінуў. Мой дзед Іван памёр у 1979-м, два яго браты і сястра таксама даўно не жывуць. На прадзеду Лукіяну (гэта значыць, на трэцім пакаленьні назад) абрываецца мая сямейная гісторыя. Кім была мая прабабка? Зь якой вёскі паходзіла? Яна зьнікла ў густым тумане сялянскага забыцьця.

Апошнія два гады свайго жыцьця, калі верыць дзедавым расказам, прадзед Лукіян правёў у неверагодным атачэньні зьдзічэлых палёў і пакінутых у буцьвеньні вёсак на Беласточчыне. Першыя суседзі пачалі вяртацца ў ахопленай рэвалюцыйным пажарам Расеі толькі ў 1918 годзе. Напэўна, Лукіян з сынамі штосьці там сеялі і садзілі, каб пракарміцца на гэтай пустэчы. Але са згадак майго дзеда Івана пра той час найбольш запомнілася прызнаньне, што ягоны бацька шмат разоў адпраўляўся разам зь ім у навакольныя бязьлюдныя вёскі, дзе абодва раскопвалі токі на чужых гумнах, шукаючы схаванага збожжа. Сяляне пакідалі родныя старонкі ў страху перад немцамі, але надалей разважалі як сяляне: адкуль возьмуць збожжа на сяўбу, калі вернуцца? І таму шмат хто зь іх прадбачліва схаваў крыху збожжа на сваіх сялібах, найчасьцей пад страхою на гумнах, прадугледжваючы будучае вяртаньне. Мой прадзед вярнуўся значна раней і вырашыў выкарыстаць запасы, якія належалі іншым. На сяўбу яму хапала ўласнага збожжа, а чужое прадаваў габрэям у Бельску. А потым купляў гарэлку і селядца ў іншых або тых жа габрэяў у Бельску. Гэткім чынам неяк жылося.

Фізычна са сваім прадзедам Лукіянам я сутыкнуўся ў студзені 1995-га, калі нечакана памёр мой бацька. Маці вырашыла, што бацьку трэба пахаваць на нашым сямейным месцы, гэта значыць каля яго бацькоў, Івана і Марыі, а таксама дзеда Лукіяна. Акрамя таго, мама заявіла мне і майму брату, што сама хоча па сьмерці спачываць каля мужа. Паколькі месца на

такое падвойнае пахаваньне сярод сямейных магілаў практычна не было, мама папрасіла далакопаў – гаспадароў з нашай вёскі – капаць у месцы, дзе ляжаў прадзед Лукіян. Мінула амаль восемдзесят гадоў зь ягонай сьмерці, таму, уласна кажучы, нічога ад яго не засталося, аргумэнтавала мама. Калі мы прыйшлі на могілкі з труною бацькі пасьля жалобнага набажэнства ў прыходзкай царкве ў Кленіках, на дне прастакутнага долу, выкапанага ў цьвёрдай, як бэтон, зямлі, бялелі дзьве ці тры косткі прадзеда Лукіяна. Адзіны намацальны сьлед, які застаўся ад яго ў гісторыі. Гэта абсалютна ў парадку, сказала мама. Прадзед Лукіян напэўна ня мае нічога супраць гэтага.

2

Пасьля Першай сусьветнай вайны мой дзед, не кранаючыся са свае вёскі, апынуўся ў іншай дзяржаве. Гэтая дзяржава называлася Польскай Рэччу Паспалітай і мела іншых чыноўнікаў, чым царская Расея. Гэта значыць, што дакумэнты ў гэтай новай дзяржаве пісаліся на іншай, не знаёмай дзеду і людзям зь ягонага прыходу мове. Дзед, які ганарыўся тым, што ў школе атрымаў царскі дыплём за добрыя вынікі ў чытаньні і пісаньні па-расейску і царкоўнаславянску, у новай дзяржаве стаў практычна непісьменным чалавекам.

Гэтую вымушаную непісьменнасьць у новай Польшчы мой дзед мусіў адчуваць значна больш балюча, чым падзеньне Расеі і смутны канец яе апошняга цара. Жыцьцё дзеда ў дваццатыя гады мінулага стагодзьдзя (з таго, што ён расказваў мне зімовымі вечарамі ў шасьцідзясятыя гады) – гэта доўгая чарада зацятых судовых працэсаў з суседзямі, сваякамі і сямейнікамі за зямлю. Я быў занадта малы, каб зразумець, чаго дакладна датычылі гэтыя справы, але ў дзедавых гісторыях вельмі часта сустракалася азначэньне «камасацыя зямель» (ліквідацыя цераспалосіцы. – **Заўв. перакл.**). Таму ў агульных рысах ішлося пра тое, каб узамен за шмат меншых кавалкаў поля ў розных месцах атрымаць большы ў адным месцы. А дзеля гэтага даводзілася мець справу з каморнікамі і адвакатамі з гораду, якія гаварылі і складалі дакумэнты на іншай, як наша, мове.

На такой мове гаварыў мой дзед, мой бацька, на якой мове гавару я? Мовазнаўцы залічылі б яе да так званай заходнепадляскай групы палескіх гаворак, якія ахопліваюць вялікую частку Берасьцейскай вобласьці ў Беларусі і Валынскай вобласьці ва Ўкраіне (беларуска-ўкраінскае Палесьсе), а таксама Падляшша ў Польшчы. Большасьць слоў у маёй мове сустракаецца як у беларускай, так і ўкраінскай мовах, а іх фанэтыка бліжэйшая да апошняй. Аднак ніхто ў нас не называе гэтай мовы ні беларускай, ні ўкраінскай. Гаварылася «па-свойму», або «па-нашаму», і гэтай назвы было абсалютна дастаткова для моўнай самаідэнтыфікацыі. Практычна аж да апошняга перапісу насельніцтва ў Польшчы ў 2002 годзе, калі сярод варыянтаў адказу на пытаньне пра мову, якой карыстаюцца дома, для нашай мовы ў анкетах перапісу не аказалася азначэньняў «наша» або «свая». Больш за 30 000 сярод блізу 45 000 заяўленых беларусаў на Беласточчыне акрэсьлілі «сваю» мову як беларускую. Каля паўтары тысячы чалавек назвалі яе ўкраінскай, часьцей за ўсё падаючы ўкраінскую нацыянальнасьць. Зразумела, што праўда была значна больш тонкая, чым гэтая афіцыйна-статыстычная клясыфікацыя.

Ня памятаю, каб дзед хоць раз у жыцьці сказаў нешта па-польску. Ён шмат калі меў для гэтага нагоду, паколькі адна зь ягоных дачок выйшла замуж за паляка, а адзін з сыноў ажаніўся з полькай. Дзеці ад гэтых шлюбаў (мае гарадзкія сваякі) гаварылі ўжо выключна па-польску, але дзед заўжды зьвяртаўся да іх «па-свойму», калі яны прыяжджалі да нас на вёску ў часе вакацыяў. Падазраю, што дзед гаварыць па-польску папросту не навучыўся дый ня меў ахвоты навучыцца. Дык як тады ён даў сабе рады ва ўсіх гэтых судовых працэсах за зямлю, якія зрэшты выйграў? Карыстаўся перакладчыкам? Пра гэта я ніколі не пытаўся. Чытаў ён няшмат, часьцей за ўсё расейскамоўны каляндар Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, а таксама Псалтыр на царкоўнаславянскай мове. Калі ў другой палове шасьцідзясятых гадоў мы пачалі выпісваць беларускі тыднёвік «Ніва», які выходзіў у Беластоку, дзед колькі разоў браў яго у рукі, але той яго не пераканаў, хоць там таксама пісалі кірыліцай. Польскіх тэкстаў, улучна зь лістамі ад дзяржаўнай

адміністрацыі, наагул не чытаў.

Мая бабка Марыя была асобай з шырэйшымі, чым у дзеда, даляглядамі. Яна ня толькі ўмела чытаць па-расейску і царкоўнаславянску, але магла таксама адгукнуцца па-польску да сваіх гарадзкіх унукаў. У адрозьненьне ад дзеда, ёй у 1915 годзе ўдалося выехаць углыб Расеі, адкуль яна прывезла ўспаміны пра цёплы прыём тамтэйшымі людзьмі праваслаўных уцекачоў зь Беласточчыны. Бабка Марыя была вельмі рэлігійнай асобай і належала да прыходзкай суполкі іншых падобных бабак. Калі мне споўнілася чатыры гады, яна пачала браць мяне на малітвы ў царкве ў Кленіках або на ўсяночныя чуйнаваньні пры памерлых, дзе чытала ўголас з тоўстых кніг. Калі заўважыла маю любоў да кніг, пачала вучыць мяне царкоўнаславянскім літарам і як складаць іх у словы ў Псалтыры. Царкоўнаславянская мова была маёй першай пісьмовай мовай, якой я пачаў вучыцца. Бабка, хутчэй за ўсё, бачыла ўва мне будучага папа. Акрамя таго, ва ўсёй ваколіцы яе ведалі як дасьведчаную павітуху. Я таксама прыйшоў на сьвет зь яе дапамогай.

Бабка і дзед жылі, калі можна так сказаць, у рэштках цывілізацыйнага выпрамяненьня дабальшавіцкай Расеі, згодна з праваслаўным календаром сьвятаў і пастоў. Я маю ўражаньне, што Польшча як айчына палякаў наагул іх мала хвалявала. Мы жылі на хутары (у акружэньні «камасаваных дзедам зямель») за няпоўны кілямэтар ад невялікай вёскі Ляхі, якая налічвала трыццаць дамоў. У навакольных вёсках жылі людзі такія, як мы, а палякаў было відаць рэдка, пераважна ў горадзе, а часьцей за ўсё ў Беластоку, дзе жылі дзьве бабіны дочкі, мае цёткі. Маё вясковае дзяцінства скончылася напрыканцы шасьцідзясятых гадоў. У 1969 годзе бабка памерла ад інфаркту падчас адведзінаў дачкі ў Беластоку, а я ў гэты час больш-менш выразна ўсьведаміў, што жыву ў краі, дзе людзі наагул карыстаюцца іншаю мовай, як наша, і што гэтыя людзі ходзяць у каталіцкія касьцёлы, а не ў праваслаўныя цэрквы, і што іх значна больш за нас. І што мы павінны асьцерагацца палякаў, бо яны ня вельмі любяць праваслаўных. Калі я быў у горадзе з мамай, я гаварыў зь ёю паціху, каб нас ніхто не пачуў. І мне было сапраўды няёмка, калі ў краме з адзеньнем мама

пачынала гаварыць са мною па-польску, бо не хацела, каб прадаўшчыцы пазналі, што мы зь вёскі. Але яны і так пра гэта ведалі. Я бачыў гэта па іхных пагардлівых мінах. Бо і яны былі зь вёскі, адно што ўмелі лепш маскавацца і мелі меншы акцэнт.

3

Беларусам чалавек не нараджаецца, беларусам чалавек становіцца. Так пра сучасны нацыянальны стан беларусаў у Рэспубліцы Беларусі сказаў філёзаф зь Менску Валянцін Акудовіч. Гэтае выслоўе адносіцца да беларусаў у Польшчы. Чалавек набывае беларускую сьвядомасьць не аўтаматычна, праз нараджэньне і кроўныя сувязі, хоць яны, зразумела, істотныя і складаюць у такім працэсе ўмову *sine qua non*, але празь сьвядомы інтэлектуальны высілак у сталым узросьце. Таму сапраўдных беларусаў так мала як у Рэспубліцы Беларусі, так і ў Польшчы.

Адразу пасьля Другой сусьветнай вайны тагачасная польская дзяржаўная адміністрацыя палічыла, што Беласточчыну, перадусім вясковую, насяляла каля 150 000 праваслаўных, а значыць, патэнцыйных беларусаў. Сёньня іх магло быць каля 250 000. Але перапіс 2002 году, які рэгістраваў нацыянальнасьць жыхароў, давёў, што беларусаў у Польшчы менш за 50 000. Таму прынамсі 200 000 праваслаўных душаў абмінуў згаданы нацыятворчы высілак. Іх паглынуў і асыміляваў польскі горад, хутчэй, незваротна. Большасьць зь іх ужо ня памятае свае роднае мовы. Сёньня на Беласточчыне практычна няма такіх людзей, як мой дзед Іван, якія ведалі б выключна «сваю» мову і не адчувалі б ніякага дыскамфорту з прычыны няведаньня польскай.

Ня ведаю, якую нацыянальнасьць заявіў бы мой дзед, калі б дажыў да перапісу насельніцтва ў 2002 годзе. Напэўна, не прызнаў бы сябе палякам ці расейцам. Але ці назваў бы сябе беларусам? Малапраўдападобна. Хутчэй за ўсё, сказаў бы пра сябе, што ён праваслаўны, так як шмат праваслаўных на Беласточчыне адказвае сёньня на пытаньне пра нацыянальнасьць. Бо вызнаньне для сялянаў – гэта штосьці

больш канкрэтнае, чым нацыянальнасьць: гэта ў царкву праваслаўныя ідуць хрысьціць сваіх дзяцей і ў царкву вязуць сваіх памерлых па апошнюю духоўную паслугу. А куды сяляне могуць пайсьці, каб сьцьвердзіць сваю беларускую нацыянальнасьць? Такой установы ў Польшчы няма. Раз так, дык, можа, нацыянальнасьць насамрэч не патрэбная для жыцьця, і ня варта ламаць сабе галавы над ёю? У прынцыпе, гэта дылема кожнага народу без сваіх установаў, ня толькі беларускай меншасьці на Беласточчыне з амаль выключна сялянскім радаводам.

У Польшчы паміж дзьвюма сусьветнымі войнамі жыло каля двух мільёнаў беларусаў. Пераважную большасьць зь іх складалі людзі накшталт майго дзеда, а менавіта, праваслаўныя сяляне, якія жылі ў перанаселеных вёсках і змагаліся за кожны кавалак зямлі, каб утрымаць свае сем'і. Палітычна і сацыяльна беларусы ў міжваеннай Польшчы былі грамадзянамі другой катэгорыі. Нешматлікія беларускія школы, якія ўзьніклі ў дваццатыя гады і маглі дапамагчы ў абуджэньні і ўмацаваньні беларускай нацыянальнай сьвядомасьці, былі ліквідаваныя польскай адміністрацыяй у трыццатыя гады. Тагачасны ўрад зрабіў стаўку на поўную асыміляцыю і палянізацыю беларусаў на ўсходніх крэсах польскай дзяржавы. У сваю чаргу эканамічная сытуацыя беларускіх сялянаў была непараўнальна горшаю, чым польскіх сялян, не кажучы ўжо пра польскіх асаднікаў, якія атрымалі найлепшыя землі на ўсходзе, як прызнаньне іх заслуг у вайне з савецкай Расеяй 1920 году, і мусілі падтрымліваць калянізацыйна-палянізацыную місію на крэсах.

Таму зусім ня дзіўна, што ў міжваеннай Польшчы беларусы, якія добра памяталі часы царскай Расеі, дзе іх трактавалі як паўнапраўных грамадзянаў, ніколі не прынялі польскай дзяржавы як сваёй. А настальгію па адносна заможнай Расеі і сум па лепшым лёсе перанесьлі на Савецкі Саюз, які праз Камуністычную партыю Заходняй Беларусі шырыў сярод іх прывабны міт пра дзяржаву дабрабыту і сацыяльнай роўнасьці, пабудаваную сялянамі і рабочымі тут жа за ўсходняй мяжой Польшчы. Гэтая мяжа практычна не прапускала ніякай аб'ектыўнай інфармацыі пра сапраўдны стан рэчаў у Савецкім

Саюзе. Калі ў верасьні 1939 году савецкія жаўнеры прыйшлі «вызваліць» сваіх беларускіх братоў з-пад панаваньня *панской Польши*, пачатковы энтузіязм беларусаў з нагоды зьмены дзяржаўнай прыналежнасьці вельмі хутка ператварыўся ў недавер і расчараваньне, якое, у сваю чаргу, замянілася на ціхую жуду.

4

У 1939 годзе мой дзед другі раз апынуўся ў новай дзяржаве і быў вымушаны прыняць іншае грамадзянства. Згодна з пактам Молатава–Рыбэнтропа, уся заходняя Беларусь разам зь вялікай часткаю Падляшша апынулася ў Савецкім Саюзе. Дзед стаў савецкім грамадзянінам, але гэтая зьмена, хутчэй за ўсё, не зрабіла значнага ўражаньня. У кожным разе, я ня памятаю, каб у сваіх расказах у шасьцідзясятыя-сямідзясятыя гады ён калі-небудзь падкрэсьліваў бы гэты факт, ня кажучы ўжо пра тое, каб ім ганарыўся. Затое пра новыя савецкія парадкі выказваўся з выразным асуджэньнем і нават пагардай. Гэта было зразумела. Да 1939 году дзед здолеў «камасаваць» у сваёй гаспадарцы каля дзесяці гектараў зямлі і належаў да самых заможных гаспадароў у вёсцы. Беручы аб'ектыўна, зямля была благая, напалову пясчаная і напалову падмоклая, але землі суседзяў не былі лепшыя. Саветы, натуральна, хацелі ўзяць дзеда разам з усім ягоным набыткам ў калгас, што, на яго думку, было найцяжэйшым злачынствам, якое ўвогуле можна было ўчыніць супраць гаспадара. Але спачатку заняліся гаспадарамі з большых навакольных вёсак і з калектывізацыяй дзеда не пасьпелі. Летам 1941 году прыйшлі немцы.

Затое другому майму дзеду, па мацярынскай лініі, не пашчасьціла. Ён таксама зваўся Іванам, але жыў у Кленіках. Дзеда клясыфікавалі як «кулака» і адразу пазбавілі зямлі і інвэнтара на карысьць новаўтворанага калгасу. Кленікі, якія мелі трыста гаспадарак, папросту былі для савецкай улады большым прыярытэтам, чым Ляхі са сваімі трыццацьцю дварамі. Перад нападам Нямеччыны на Савецкі Саюз НКВД пасьпела вывезьці дзеда Івана за Ўрал як «ворага народу» разам зь некалькімі іншымі гаспадарамі. Іх абвінавацілі ў

спробе сабатажу супраць савецкай улады на падставе даносу, падпісанага некалькімі калгаснымі актывістамі, якія перад вайною як беспрацоўныя ратаваліся ад голаду, працуючы ў гаспадароў, якіх цяпер здалі. Калі прыйшлі немцы, сваякі вывезеных за Ўрал указалі ім тых паклёпнікаў як камуністаў. Немцы іх адразу расстралялі. Некаторыя з вывезеных «ворагаў народу» вярнуліся ў Кленікі з-за Ўралу толькі па сьмерці Сталіна. Мой другі дзед ніколі адтуль не вярнуўся.

Немцы ў 1941 годзе далучылі Беласточчыну як т. зв. Беластоцкую акругу да Райху. Праўдападобна, тут адыгралі ролю гістарычныя меркаваньні: на мяжы XVIII–XIX стагодзьдзяў, пасьля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, Беласточчына да ўлучэньня ў Расею на працягу кароткага часу належала да Прусіі. Так у 1941-м мой дзед ужо трэці раз апынуўся ў новай дзяржаве, нікуды не кранаючыся са сваёй роднай вёскі. Зразумела, яго не прызналі паўнапраўным нямецкім грамадзянінам, але нейкі дакумэнт, які пацьвярджаў яго статус унтэрмэнша ў Райху, яму напэўна далі. На жаль, усе дзедавы паперы згарэлі ў 1944-м, таму тут мне застаецца толькі дапускаць і здагадвацца.

Немцы хацелі, каб дзед, як і іншыя ўнтэрмэншы зь ягонай вёскі, працаваў дзеля перамогі нямецкай зброі на ўсходнім фронце і аддаваў нямецкай дзяржаве амаль усё, што быў здольны стварыць на сваёй гаспадарцы. Ён ня меў права, напрыклад, закалоць сьвіньню для ўласнай сям'і. Гэтай забароны, як мне з гонарам расказваў, ён ні разу не ўшанаваў за ўсю акупацыю і паціху саліў сала для сваёй сям'і два разы штогоду, перад Вялікаднем і Раством. Ведаў пра гэта жандар з Кленікаў, які ад часу прыяжджаў на ровары да дзеда на хутар. Жандар недвухсэнсоўна даваў дзеду зразумець, што толькі ад яго добрай волі залежала, што дзед надалей жыў на хутары блізка ад лесу, бо згодна зь нямецкім распараджэньнем яго даўно трэба было перасяліць у вёску, каб яму не прыйшло на думку кантактаваць з партызанамі. Тады дзед прыносіў з каморы вялікую бутлю з самагонам і салёнае сала, якое бабка смажыла на патэльні, каб падтрымаць добрую волю жандара ў дачыненьні да нашага хутару. Дзед з жандарам пілі самагонку і елі падсмажанае сала, супольна парушаючы з тузін

прадпісаньняў і рэкамэндацыяў Вялікага Райху, за што жандар мог адразу атрымаць накіраваньне на ўсходні фронт, а дзед – зарабіць кулю ў лоб.

Жандар прыяжджаў да дзеда днём. Уначы на хутар прыходзілі партызаны з блізкага лесу. Уласна кажучы, я павінен напісаць «партызаны», але дзед называў іх злодзеямі і бандытамі. Было іх, здаецца, пяцёра: трое мясцовых камуністаў і двое з саветаў, якія трапілі ў нямецкае акружэньне ў 1941-м і схаваліся ў лясах Беласточчыны. Тыя партызаны, расказваў дзед, за ўсю вайну ня здолелі застрэліць нават кульгавага немца, якія са стрэльбай рэгулярна езьдзіў роварам празь іхні лес зь нейкай толькі яму вядомай мэтай, але затое не саромеліся рабаваць ежу і адзеньне ў мясцовых сялянаў. Каб выжыць, дзед мусіў і зь імі дзяліцца сакрэтнымі запасамі сала і самагонкі. Бабка праклінала «партызанаў» і пасылала іх да д'ябла, будучы ўпэўненай, што калісьці яны навядуць на нашу сям'ю няшчасьце. У чым, зрэшты, не памылілася. Дзед перад тымі камуністамі называў яе дурной бабай, чым, зразумела, ратаваў ёй жыцьцё, бо нападпітку партызаны былі гатовыя прыбіць бабку за поўную адсутнасьць савецкага патрыятызму і адмову падтрымліваць Савецкі Саюз у вайне з гітлераўскім агрэсарам.

Пра адзін акупацыйны эпізод дзед расказваў вельмі неахвотна. Праўду кажучы, першы раз я пачуў пра гэта ад бацькі. Зімою 1941–1942 гадоў на нашым хутары некалькі тыдняў хаваўся габрэй зь нейкай суседняй вёскі. Удзень ён ляжаў, зарыўшыся ў саломе ў нашай клуні, а вечарам на кароткі час прыходзіў у дом, дзе бабка яго карміла. Здаецца, ён быў краўцом і зваўся Шлёмам. Мой бацька, якому тады было дзесяць гадоў, у нейкі вечар пачуў прызнаньне п'янага ад дзедавай самагонкі Шлёмы, што той уласнаручна патапіў у палонцы ракі сына-падлетка, бо хлопец ад марозу голасна плакаў па начах і мог выдаць іхнае патаемнае месца.

Калі ўлетку 1944 году савецка-нямецкі фронт увайшоў на Беласточчыну і спыніўся за колькі кілямэтраў на ўсход ад нашай вёскі, аднае раніцы партызаны з пахмельля ад дзедавай самагонкі абудзіліся на гумне нашага суседа, які таксама жыў на хутары за вёскай. Так здарылася, што каля гумна зьявілася

нямецкая танкетка. Партызаны адкрылі па ёй агонь – магчыма, цалкам бяздумна ці ад п'янага пярэпалаху. А можа, і сьвядома, вырашыўшы нарэшце заслужыць тытул партызанаў, правёўшы нейкую баявую акцыю, і гэтак апраўдаць сваё існаваньне ў вачах блізкіх савецкіх войскаў. Немцы выклікалі на дапамогу яшчэ адну танкетку, і два браневікі абстралялі запальнымі снарадамі клуню нашага суседа. Двое партызанаў згарэлі ўсярэдзіне, астатнія загінулі, калі спрабавалі ўцячы.

У падобных сытуацыях немцы падчас вайны на ўсходзе трымаліся жорсткай працэдуры: вёска, дзе напалі на нямецкіх жаўнераў, ішла з дымам разам зь яе жыхарамі. Немцы сагналі ўсіх жыхароў нашае вёскі ў пералесак ля дзедавай сядзібы. Цяжка сказаць, чаму іх усё ж не забілі. Магчыма, з прычыны блізкага фронту яны ня мелі пад рукою адпаведных паліцэйскіх адзінак, якія руцінна займаліся падобнымі выпадкамі. Як бы там ні было, пасьля колькіх гадзінаў няўпэўненасьці немцы загадалі людзям хутка сабраць свае пажыткі і пакінуць вёску, якую потым дашчэнту спалілі. Гэта тады згарэў дыплём дзеда з царскай школы і судовыя дакумэнты, зь якіх можна было б узнавіць храналёгію ягоных змаганьняў за ўзбуйненьне гаспадаркі. Дзяды, хутчэй за ўсё, пасьпешна забралі толькі адзеньне і посуд, ня лічачы асабліва важным везьці з сабой паперы і дакумэнты. У сялянаў гісторыя і памяць заўжды прайграюць у сутычцы зь сёньняшнім днём і часовай неабходнасьцю.

У 1944-м мой дзед зноў вярнуўся ў Польшчу. Яму чацьвёрты раз далі грамадзянства, як аказалася, ужо трывала. Але цягам некалькіх паваенных гадоў становішча беларусаў на Беласточчыне не было цалкам зразумелым. Савецкія камісары праводзілі сярод праваслаўнага насельніцтва шырокамаштабную прапагандысцкую акцыю, падмаўляючы да выезду ў Савецкі Саюз. Аднак людзі ня мелі аніякай ахвоты выкарыстоўваць гэтую прапанову, скаштаваўшы калгаснага парадку ў 1939–1941 гады. Да таго ж Беласточчына была іх домам і айчынай. Хутчэй, дзяржавы былі на гэтай зямлі прыблудамі.

Саветам у іх перасяленчых намаганьнях у пэўнай ступені

дапамагло польскае антыкамуністычнае падпольле, якое паходзіла з Арміі Краёвай. У пачатку 1946-га аддзел гэтак званага ПАСу (Pogotowie Akcji Specjalnej) на чале з Рамуальдам Райсам (псэўданім «Буры») правёў рэйд па ўсходняй Беласточчыне, зьнішчыўшы некалькі беларускіх вёсак і забіўшы іх жыхароў – шмат зь іх спалілі жыўцом у замкнёных дамах. Мэтай гэтай «спэцыяльнай акцыі» было запалохваньне беларусаў на Беласточчыне і паскарэньне іх перасяленьня ў Савецкі Саюз. Каля 30 000 праваслаўных Беласточчыны ў страху за жыцьцё сваіх сямей зьехалі ў Савецкі Саюз пад канец саракавых гадоў. Гэта, між іншым, прывяло да таго, што нашы бацькі ўсё жыцьцё не давяралі палякам і католікам, нават калі тыя ўваходзілі ў сям'ю праз шлюб. Затое амаль без агаворак паверылі польскай камуністычнай уладзе, якая схапіла «Бурага» і асудзіла яго на сьмерць у 1948-м.

Камуністы ў Польшчы заваявалі сабе давер беларусаў ня толькі тым, што ліквідавалі нацыяналістычнае падпольле. Ня менш важнае было наданьне беларусам роўных з палякамі правоў сацыяльнай кар'еры ў новым ладзе. Гэта паспрыяла разраджэньню перанаселеных вёсак празь міграцыю ў гарады з прамысловымі прадпрыемствамі і ў выніку – ліквідацыі паўсюднай сярод беларусаў галечы. Коштам такой цывілізацыйнай кар'еры, часьцей за ўсё, была страта ўласнага нацыянальнага аблічча і палянізацыя ў гарадах, але шмат беларусаў у пяцідзясятыя, шасьцідзясятыя і нават сямідзясятыя гады згаджалася з гэтым, не жадаючы нават у думках вяртацца да спадчыны сваіх бацькоў і дзядоў. Толькі пакаленьне беларускіх студэнтаў, якія дасягнулі інтэлектуальнай сталасьці ў васьмідзясятыя гады, паглядзела на сваё паходжаньне як на пэўнага кшталту духоўную набілітацыю, а не ганебнае кляймо.

5

Аднак перш чым надышлі васьмідзясятыя гады з «Салідарнасьцю» і паўсюдным у Польшчы антыкамунізмам, які ахапіў таксама тагачаснае пакаленьне польскіх беларусаў ва ўнівэрсытэтах (маё пакаленьне), мы перажылі дваццаціпяцігадовы пэрыяд афіцыйнай беларушчыны,

прэзэнтаванай Беларускім грамадзка-культурным таварыствам (БГКТ) і беларускамоўным тыднёвікам «Ніва». Абедзьве гэтыя ўстановы былі ўтвораны ў Беластоку ў памятным 1956 годзе, на хвалі адлігі. І што хіба яшчэ больш істотнае для паваеннага лёсу польскіх беларусаў – улады дазволілі вывучаць беларускую мову больш чым 10 000 дзяцей у школах на Беласточчыне. Усё гэта было арганізавана, уласна кажучы, безь ніякага выразнага імпульсу з боку беларускага асяродзьдзя ў Польшчы. Чаму? Адзін з праўдападобных адказаў гучыць так: камуністы, ствараючы культурныя і асьветніцкія ўстановы для беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў у Польшчы, разьлічвалі на падобны крок Масквы ў дачыненьні да палякаў, якія жылі ў Беларусі, Літве і Ўкраіне. З другога боку, ствараючы арганізацыі нацыянальных меншасьцяў, улада ПНР гарантавала сабе эфэктыўны кантроль над імі (праз МУС і Службу бясьпекі), а таксама мела ў распараджэньні прыладу для інфільтрацыі беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў.

Беларускае аб'яднаньне студэнтаў (БАС), утворанае мною і маімі сябрамі зь Беласточчыны ў Варшаве ў 1981-м, было першай беларускай арганізацыяй у Народнай Польшчы, якая ўзьнікла з ініцыятывы саміх беларусаў і не кантралявалася спэцслужбамі. Тагачасныя камуністычныя ўлады не зарэгістравалі нашай арганізацыі, адсылаючы нас з нашымі пастулятамі разьвіцьця беларускай нацыянальнай сьвядомасьці да БГКТ. Мы пратрывалі да канца Народнай Рэспублікі як філія рэжымнага Саюзу польскіх студэнтаў, паколькі фармальная прыналежнасьць да гэтай арганізацыі ахоўвала маладых беларусаў ад занадта навязьлівых зачэпак Службы бясьпекі, а таксама дазваляла выкарыстоўваць унівэрсытэцкія датацыі на культурна-турыстычныя імпрэзы на Беласточчыне і на беларускія выдавецкія ініцыятывы. У 1989-м мы ўзялі ўдзел у памятных чэрвеньскіх выбарах. Два беларускія кандыдаты ў сойм і сэнат не перамаглі, але дасягнулі абяцальнага выніку, які даваў надзею на посьпех беларускай палітыкі на Беласточчыне ў будучым.

У парлямэнцкіх выбарах у 1991-м антыкамуністычны беларускі рух на Беласточчыне дасягнуў апагею свайго посьпеху і… панёс паразу. Маладым беларусам удалося выставіць сьпіс

кандыдатаў пад шыльдай Беларускага выбарчага камітэту, што было несумненна гістарычным дасягненьнем беларускай меншасьці ў паваеннай Польшчы. Аднак гэты сьпіс прапаў на выбарах, атрымліваючы ледзьве 4500 галасоў. Беларусы на Беласточчыне аддалі перавагу сацыял-дэмакратам, гэта значыць, посткамуністам, хутчэй за ўсё разьлічваючы на тое, што яны запаволяць балючыя рынкавыя рэформы, распачатыя ўрадам Тадэвуша Мазавецкага.

Аднак 1991 год я запомніў перш за ўсё дзякуючы двум знамянальным эпізодам з нашай выбарчай кампаніі. Падчас збору подпісаў у падтрымку сьпісу Беларускага выбарчага камітэту ў адной вёсцы я спаткаў жанчыну больш-менш майго ўзросту (мне было тады крыху болей за трыццаць гадоў), якая прыехала зь Беластоку наведаць сваіх бацькоў. Тое, што робіце, абсалютна ня мае сэнсу, сказала яна. Я не вучу свайго сына гаварыць па-свойму і не хаджу зь ім на могілкі сваіх дзядоў, бо не хачу ўскладняць яму жыцьцё ў Польшчы. Нашто яму хвалявацца, што ён не такі, як усе? Прыблізна такі быў сэнс яе слоў. Я выскачыў з гэтага дому як абвараны, здушыўшы ў сабе цяжкую лаянку. І помню горыч майго бацькі, які незадоўга да дня выбараў сказаў мне, што людзі з нашай вёскі ўвогуле не ідуць галасаваць, бо ня вераць, што галасаваньне можна нешта зьмяніць. Беларусы заўжды былі і будуць пародламі бяз голасу, дадаў. Тады я першы раз у жыцьці пачуў, што бацька называе нас беларусамі.

З польскай мовы пераклаў Антон Кузьміч

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 7-8 (47-48) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/10/24
[image]

[image] [image] [image]

МІКАЛАЙ ІЛЬКЕВІЧ
навуковы супрацоўнік мэмарыялу «Катынь», галоўны рэдактар часопісу «Годы» (Смаленск).

Мікалай Ількевіч
Таямніца кіраўскага арышту Антона Адамовіча 1937 году

Выпадак, пра які хачу апавесьці, безь перабольшваньня, унікальны. У маёй шматгадовай дасьледніцкай практыцы ў вывучэньні гісторыі палітычных рэпрэсіяў падобных прыкладаў ніколі раней не было.

У пратаколе допыту ёсьць наступныя біяграфічныя зьвесткі аб Антону Адамовічу, паведамленыя ім сьледчаму Церахаву, які яго дапытваў (у кнізе аб Адаму Бабарэку гэтыя зьвесткі не ўвайшлі): нарадзіўся ў Менску, месца жыхарства да арышту – г. Кіраў, вул. М. Гвардыі 68, выкладчык замежнай мовы, месца працы – сярэдняя школа № 10, адукацыя вышэйшая пэдагагічная, адносіны да вайсковай службы – тылапалчэнец, беларус, беспартыйны, нашпарта ня мае, нежанаты, бацька – Іваškевіч Аляксандар Паулавіч, 32 гады, маці – Іваškevіч Паўліна Паулаўна (Менск, вул. Гарбарная 31, кв. 1); з 1918 да 1930 г. жыў у Менску. Навучэнец сямігодкі № 2, пэдтэхнікуму і белдзяржуніверсытэту (л. д. 94, 97).

Палічае падрыхтоўку першай кнігі аб арышце Адама Бабарэкі ў Кіраве зьяўленьнем рэдкага магчымасьці працаваць у архівах управленьняў ФСБ РФ па Кіраўскай вобласьці і па Рэспубліцы Комі.

Вывучаючы кіраўскую крымінальную справу па абвінавачаньні Геналдзя Багдановіча, Адама Бабарэкі, Паўла Жайрыла, Сяргея Пушкіна і Зьмітра Дунька, я зьвярнуў увагу на пратакол допыту Антона Ёўстафьевіча Адамовіча, які быў аднаасобна абвінавачаным і сьведкам. Допыт праведзены 26 чэрвеня 1937 г.[1]

[1] Ількевич Н. Н. Адам Бабарека: арест – лагерь – смерть. Расправа со ссыльными белорусами в Кирове в 1937–1938 гг.: Документальный очерк. – Смоленск, Посох, 1999. С. 18–23, архив Управления ФСБ РФ по Кировской области (УФСБ РФ КО). Дело № СУ-5466, л. д. 94–99.

Зьдзіўленьне маё было цалкам натуральнае: чаму Антона Адамовіча дапытвалі яшчэ за месяц да арышту Адама Бабарэкі і Генадзя Багдановіча (арыштаваныя, адпаведна, 25 ліпеня ўвечары і 26 ліпеня; допыты А. Бабарэкі і Г. Багдановіча пачаліся 26 ліпеня і 27 ліпеня)? У гэтай крымінальнай справе няма ні пастановы аб абраньні меры ўтрыманьня і выстаўленьні абвінавачаньня Антону Адамовічу, ні ордэру на ператрус і арышт, ні пратаколу ператрусу, ні анкеты арыштаванага, ні даведкі на арышт і прыцягненьне да адказнасьці, ні санкцыі абласнога пракурора на абраньне меры стрыманьня і прыцягненьне да адказнасьці. Наагул няма аніякіх працэсуальных дакумэнтаў, датычных Антона Адамовіча. Акрамя, як ужо пазначалася, пратаколу ягонага допыту – рукапіснага, пазьней перадрукаванага на друкарскай машынцы (копія) у пяці асобніках.

Я зьвярнуўся ў архіў Упраўленьня ФСБ РФ па Кіраўскай вобласьці. Крымінальнай справы па абвінавачаньні Антона Адамовіча там няма, у іншых сьледчых справах А. Адамовіч у якасьці абвінавачанага ня значыцца. Не аказалася справы і ў архіве КДБ Рэспублікі Беларусі. Так, прынамсі, мне адказалі зь Менску. Усё гэта, натуральна, падагравала маю дасьледніцкую цікавасьць і падштурхоўвала да далейшых пошукаў.

Я ізноў зьвяртаюся ў архіў Упраўленьня ФСБ РФ па Кіраўскай вобласьці. На гэты раз знойдзена невялічкае аб'ёмам «Дело № 1378 По обвинению Адамович[а] Антона Евстафьевича 1937 года». У справе толькі 19 аркушаў, але няма ніводнага дакумэнту, які б указваў на выстаўленьне Антону Адамовічу якіх-кольвечы крымінальна-палітычных абвінавачаньняў.

Першы дакумэнт датаваны 25 траўня 1937 г.:

«У Т В Е Р Ж Д А Ю»
ЗАМ. НАЧ. УНКВД по КИРОВ. ОБЛАСТИ
Майор Государств. Безопасности:
/ У Ю К /
25 /V – 37 года.
П О С Т А Н О В Л Е Н И Е
гор. Киров, Мая «25» дня, 1937 года.

Я, Начальник 1 Отделения 4 Отдела УГБ НКВД по Кировской области – Мл. Лейтенант Государственной Безопасности СОЛОПОВ, рассмотрел материал на отбывающего ссылку в гор. Кирове АДАМОВИЧ[А] Антона Евстафеевича и учитывая, что согласно распоряжения НКВД СССР от 18 Мая 1937 года АДАМОВИЧ подлежит аресту и направлению его в г. МИНСК, БССР, а потому –

П О С Т А Н О В И Л:
АДАМОВИЧ[А] А. А. арестовать и направить спецконвоем в распоряжение НКВД БССР в гор. Минск.
Арест АДАМОВИЧ[А] согласован с прокурором Союза ССР.

НАЧ. 1 ОТДЕЛЕНИЯ 4 ОТДЕЛА УГБ
Мл. Лейтенант Госуд. Безопасности:
/СОЛОПОВ/

«СОГЛАСЕН»
ПОМ НАЧ УНКВД – НАЧ 4 ОТДЕЛА УГБ
Ст. Лейтенант Госуд. Безопасности:
/МУРАВЬЕВ/

2

Наступны дакумэнт складзены амаль празь месяц, 22 чэрвеня 1937 г.:

22 чэрвеня

П О С Т А Н О В Л Е Н И Е
О направлении арестованного АДАМОВИЧ[А] Антона Евстафьевича.
гор. Киров, Июня 22-го дня 1937 года.

Содержащийся в тюрьме г. Кирова, арестованный АДАМОВИЧ А. Е. распоряжением 4 Отдела ГУГБ НКВД СССР от 12 Мая 1937 года № 10639 – подлежит направлению в распоряжение 4-го Отдела УГБ НКВД БССР, а потому,
П О С Т А Н О В И Л:
АДАМОВИЧ[А] А. Е. направить очередным этапом в распоряжение 4-го Отдела УГБ НКВД БССР гор. Минск.

НАЧАЛЬНИК 1 ОТДЕЛЕНИЯ 4 ОТДЕЛА УГБ

2 Архіў УФСБ РФ КО. Дело № СУ-3533. Л. д. 4. Тут і далей захаваны правапіс арыгіналаў. На дакумэнце есьць адзнака: Получено. 27/VI-37 г.

Мл. Лейтенант Государств. Безопасности:

/С О Л О П О В/

«СОГЛАСЕН»
ПОМ. НАЧ. УНКВД – НАЧ. 4 ОТДЕЛА УГБ
Ст. Лейтенант Госуд. Безопасности:
/М У Р А В Ь Е В/

3

Толькі праз 32 дні пасьля арышту, 26 чэрвеня, Антон Адамовіч, пра што казалася напачатку, быў дапытаны апэратыўным упаўнаважаным 4-га аддзелу Ўпраўленьня дзяржаўнай бясьпекі малодшым лейтэнантам дзяржбясьпекі Церахавым. Дарэчы, 26 чэрвеня – дата нараджэньня Антона Адамовіча – яму ў той дзень споўнілася 28 гадоў. Пасьля допыту Антона Адамовіча было аддадзенае распараджэньне начальніку аддзелу працоўных пасяленьняў і месцаў зьняволеньня турмы аб этапаваньні арыштаванага ў Менск:

[3] Архив УФСБ РФ КО. Дело № СУ-3533. Л. д. 2.

НАЧАЛЬНИКУ ТЮРЬМЫ тов. УСИКОВУ. – г. Киров.
КОПИЯ: КОМАНДИРУ КОНВОЙНОГО ДИВИЗИОНА. – г. Киров.

Препровождаю копию постановления о направлении арестованного АДАМОВА (правільна – АДАМОВІЧА. – **М. І.**) Антона Евстафьевича – для исполнения.
Адамович[а] А. Е. с очередным этапом, отходящим 27/VI-37 г. направьте в г. Минск, в распоряжение 4-го отдела УГБ НКВД по Белорусской ССР.
В пути следования изолируйте Адамович[а] от уголовников.
Об исполнении сообщите.
ПРИЛОЖЕНИЕ: копия постановления.

НАЧ. 8 ОТД. УГБ НКВД К/О.
МЛ. ЛЕЙТЕН. ГОС. БЕЗОП. – /СВЕШНИКОВ/[4]

II

Тут самы час прыгадаць кнігу Антона Адамовіча «Творы», выдадзеную ў 2003 г. намаганьнямі Лявона Юрэвіча ў Нью-

[4] Тамсама. Л. д. 1. На дакумэнце ёсьць

Ёрку. У ёй, разам зь іншымі цікавымі матэрыяламі, апублікавана менская аўтабіяграфія Антона Адамовіча, датаваная 16 лістапада 1941 г.[5]. Напісаная ў акупаваным Менску, яна рэзка кантраставала зь ягонай кіраўскай споведзьдзю (сьнежань 1935 г.[6]), вядомай больш шырокаму колу дасьледнікаў, і была наскрозь прасякнутая цьвердай перакананасьцю, што архівы НКУС БССР цалкам зьнішчаныя альбо захопленыя немцамі. Аўтабіяграфія выклікае лёгка зразумелы недавер, а часам, пры чытаньні яе пэўных радкоў – трывалае непрыняцьце. Прынамсі, у мяне. Таму што лёгіка пабудовы тэксту вельмі ўражвае і імгненна разбураецца ня толькі пры дэталёвым супастаўленьні з дакладна вядомымі цяпер фактамі, але нават пры першым уважлівым азнаямленьні з дакумэнтам. Хаця, варта адзначыць, аўтабіяграфія 1941 г. па-свойму цікавая, і найперш як сьведчаньне той эпохі, у выніку сур'ёзнага і цалкам усьвядомленага выбару Антона Адамовіча, які крута зьмяніў хаду ўсяго свайго жыцьця.

Але ў 1998 г., калі я працаваў з архіўнымі крыніцамі з кіраўскага ўпраўленьня ФСБ, я такіх высноваў зрабіць ня мог, таму што з абедзьвюма аўтабіяграфіямі пазнаёміўся толькі ў 2005 г., як і большасьць маіх калегаў-дасьледнікаў.

III

Цяпер ізноў вернемся ў 1937 г.

1 ліпеня начальнік турмы г. Кірава далажыў кіраўніцтву аб выкананьні ўказаньняў:

Нач-ку 8 го отд УГБ УНКВД КО
мл. лейтенанту госбезопасности

Тюрьма НКВД гор. Кирова ставит Вас в известность, что Следственно З/К Адамович Антон Евстафьевич этопирован 27/VI-37 г гор Минск в распореж. нач-ка 4 го отд УГБ НКВД БССР.

/ Начальник тюрьмы
Начальник УРЧ[7]

Мальцеву К
верхнем
Получ. 26/
VI 37 г.
Мальцев.

5 Адамович А. Мой счёт им. Жизнеописание одного из «осчастливленных» большевистским «раем» // Адамовіч А. Творы. Нью-Ёрк, БІНіМ, 2003. С. 720–725.
6 Тамсама. С. 610–686.
7 Архив УФСБ РФ КО. Дело № СУ-3533. Л. л. 3. № 7560. На дакумэнце ёсьць адзнака: Т. Анисимову дайте карточку из оск. 13/VII.

Ці была перанакіраваная ў Менск сьледчая справа па абвінавачаньні Антона Адамовіча і ці заводзілася яна наагул, з дакумэнтаў няясна. Ёсьць толькі пазнака – на вокладцы справы, зь якой я знаёміўся: «Направ. г. Минск». Найверагодней, пазнака ўказвае, што сьледчая справа накіраваная ў Менск. Але запіс можна зразумець і так, што Антон Адамовіч накіраваны (то бок этапаваны) у Менск.

IV

Крыху больш чым праз два гады, калі ў Кіраве ўжо забылі на Антона Адамовіча і нават на крымінальную справу, паводле якой 15 лютага 1938 г. былі асуджаныя на 10 гадоў папраўча-працоўных лягераў Генадзь Багдановіч, Адам Бабарэка, Павел Жаўрыд, Сяргей Пушкін і Зьміцер Дунько, Менск раптам нагадаў пра сябе ашаламляльным дакумэнтам:

СОВЕРШЕННО СЕКРЕТНО.

НАЧ. УНКВД КИРОВСКОЙ ОБЛАСТИ
гор. К и р о в.

25-го мая 1938 г. (правільна – 1937. – **М. І.**) в г. Кирове был арестован отбывший срок наказания за антисоветскую деятельность белнацдем АДАМОВИЧ Антон Евстафьевич.
При обыске у АДАМОВИЧА был изъят воинский билет на его имя.
В 1938 г. АДАМОВИЧ из под стражи освобожден и проживает в г. Минске.
Просьба выслать во 2-й Отдел УГБ НКВД БССР воинский билет АДАМОВИЧА Антона Евстафьевича.

НАЧ 2 ОТДЕЛА УГБ НКВД БССР
КАПИТАН ГОСБЕЗОПАСНОСТИ /СЕРГЕЕВ/

НАЧ 3 ОТДЕЛЕНИЯ 2 ОТДЕЛА
ЛЕЙТЕНАНТ ГОС. БЕЗОПАСНОСТИ /ФЕДОРОВ/

5 августа 1939 г.

№ 4444/4
г. М и н с к[8]
Ёсьць і адказ з Кірава:

НАЧАЛЬНИКУ 2 ОТДЕЛА УГБ НКВД БССР
КАПИТАНУ ГОСУДАРСТВЕН. БЕЗОПАСНОСТИ –
тов. СЕРГЕЕВУ.
гор. Минск.

Сообщаем, что В/билета на имя АДАМОВИЧА Антона Евстафьевича у нас не имеется, кроме того при этапировании АДАМОВИЧА в Ваше распоряжение были все материалы обыска направлены с ним.

ПОМ. НАЧАЛЬНИКА 1 СПЕЦОТДЕЛА УНКВД К/ОБЛ.
МЛ. ЛЕЙТЕНАНТ ГОСБЕЗОПАСНОСТИ – (МАЛЬЦЕВ)

ОПЕРУПОЛНОМОЧЕН[Н]ЫЙ
СЕРЖАНТ ГОСБЕЗОПАСНОСТИ – (АНФИЛАТОВ)[9]

Неабходна зьвярнуць увагу, што ў дакумэнце ёсьць указаньне на нейкія сьледчыя матэрыялы, аднак, як і раней, нідзе ў сьвеце ці была заведзеная крымінальная справа па абвінавачаньні Антона Адамовіча.

[8] Архив УФСБ РФ КО. Дело № СУ-3533. Л. д. 5. У Кіраве дакумэнт атрыманы 13 жніўня 1939 г. На дакумэнце ёсьць адзнакі: Т Анфилатову Вышлите 13/8 Мальцев.

[9] Там жа. Л. д. 6. № 5-2-3285, 15 августа 1939 г.

V

Прамінула яшчэ чатыры гады. У траўні 1943 г. у Кіраў паступае тэрміновае распараджэньне, перададзенае па ўрадавым тэлефоне ад імя наркама ўнутраных справаў БССР (наркамат тады знаходзіўся ў эвакуацыі ў Маскве):

Принято по «ВЧ»
Из Москвы.
На Запрос Наркома внутренних дел БССР

Адамович Антон Евстафьевич 1909 г. рожд. <…>
Адамович в 1936 г. находился в административной ссылке в

гор. Кирове.
Необходимо срочно разыскать и выслать в НКВД СССР на имя наркома внутр. дел БССР <…> автобиографию Адамович[а], кроме того другие материалы за период его пребывания в ссылке в гор. Кирове.
О результатах срочно сообщить.

Передал – Гусев
16/V-43 г. Принял Устюжеников.

Комисар г/б т. Питовранов данную записку для исполнения приказал передать нач. 1 го спецотдела тов. Мальцеву.
Устюжеников[10]

Беларускія чэкісты ў той момант плянавалі неяк выкарыстоўваць Антона Адамовіча і кагосьці яшчэ зь вядомых гісторыкам асобаў, якія былі ў гэты пэрыяд у Менску і ўмяшце лініяй фронту, у сваіх мэтах – ці то з пазыцыяў менскага падпольля, ці то з пазыцыяў канкрэтнага партызанскага фармаваньня. Аднак пра гэта, я думаю, распавядуць калі-небудзь іншыя дасьледнікі, якія добра ведаюць дакументы Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь і архіву КДБ Рэспублікі Беларусь.

Адказ кіраўскіх чэкістаў у Маскву быў атрыманы 17 траўня:

Передать по «ВЧ»

г. МОСКВА НКВД СССР
(для НАРКОМА БССР)

На запрос по «ВЧ» от 16/V-43 года сообщаю что на АДАМОВИЧ[А] Антона Евстафьевича в УНКВД по Кировской области никаких материалов не имеется.

Начальник УНКВД по Кировской области
Полковник Государств. Безопасности
/УШАХИН/

– –

[10] Тамсама. Л. ад 7. На дакумэнце ёсьць адзнакі: Т. Мальцеву; Исполнено ТДБ Волкова В набл. сл. дело Адамовича 22/V-43 г.

Начальник 1 Спецотдела УНКВД КО
Капитан Государств. Безопасности. – /МАЛЬЦЕВ/
17 мая 1943 г.
гор. Киров[11]

VI

Праз адзінаццаць гадоў, у 1954 г., аб Антону Адамовічу прыгадалі кіраўскія чэкісты. Уласна, прыгадалі не пра яго самога – бо з 1937 г. зьмянілася цэлае пакаленьне супрацоўнікаў дзяржаўнай бясьпекі – а пра ягоную справу, доўгая адсутнасьць якой у Кіраве, у месцы арышту, прымусіла іх заняцца пошукам дакумэнтаў. І штуршком да гэтага стаў перагляд крымінальных справаў, які пачаўся праз год пасьля расстрэлу Лаўрэнція Берыі. Супрацоўнік Упраўленьня КДБ пры Савеце міністраў СССР па Кіраўскай вобласьці Платуноў 9 лістапада 1954 г. запрасіў у картатэках улікова-архіўнага аддзелу свайго ўпраўленьня і 1-га спэцаддзелу мясцовага ўпраўленьня МУС зьвесткі аб Антону Адамовічу. Платуноў атрымаў даведку наступнага зьместу:

[11] Архив УФСБ РФ КО. Дело № СУ-3533. Л. д. 8. Подобны сведения, по-видимому, были выкопированы из архивов Кировского (ст. л. 8; № 5-4525, 21 мая 1943 г.):

С П Р А В К А
Совершенно секретно.
1). 16/IV-37 г. Коллегией ОГПУ по ст 58-10-11, 4, 7 – УК выслать в г. Глазов на 5 лет.
2). 14/VII-38 г. Особым Совещ[анием] НКВД СССР срок продлен на 2 года.
3). 27/VI-39 г. Арестован и направлен этапом в гор. Минск в 4 отдел УГБ НКВД БССР при №5-6-1378.
Разыскивается 4-ым пр[авлением] МГБ СССР списком № 1 стр 11 как участник антисоветской орг[анизации] «Рада белорусской народной республики[»].
16/XI-54 г.[12]

[12] Архив УФСБ РФ КО. Дело № СУ-3533. Л. д. 18–18 об.

У сьнежні 1954 г. у Менск накіроўваецца службовы ліст з мэтай выяўленьня архіву, дзе захоўваюцца матэрыялы, зьвязаныя з арыштам у Кіраве Антона Адамовіча:

Совершенно секретно
экз. __
В СЕКРЕТАРИАТ НКВД СССР
(Для НКВД БССР)
г. Москва
На запрос тов. «ВЧ» от 16/V-43 года по вопросу высылки за отсутствием <...> АДАМОВИЧ[А] Антона Евстафьевича сообщаем, что в УНКВД по Кировской области указанных материалов не имеется.
Начальник 1 Спецотдела УНКВД КО
Капитан Государств. Безопасности. – /МАЛЬЦЕВ/

НАЧАЛЬНИКУ УЧЁТНО-АРХИВНОГО ОТДЕЛА КОМИТЕТА ГОСБЕЗОПАСНОСТИ ПРИ СОВЕТЕ МИНИСТРОВ БЕЛОРУССКОЙ ССР.
гор. М и н с к.

По распоряжению НКВД СССР, в мае 1937 года УНКВД Кировской области был арестован и затем этапирован в гор. Минск в распоряжение НКВД БССР АДАМОВИЧ Антон Евста[ф]ьевич, 1909 года рождения.
В связи с пересмотром архивов, просим сообщить результаты следствия по делу АДАМОВИЧА, выслав копию решения (определения, приговора или постановления о прекращении) – для приобщения к имеющемуся у нас наблюдательному делу на АДАМОВИЧА.

ЗАМ. НАЧАЛЬНИКА УЧЁТНО-АРХИВНОГО ОТДЕЛА УКГБ КИРОВСКОЙ ОБЛАСТИ – МАЙОР – (ФУФАЕВ)

ЗАМ. НАЧАЛЬНИКА ОТДЕЛЕНИЯ УАО УКГБ – КАПИТАН – (ЛОГИНОВ)

13

КДБ пры СМ БССР адрэагаваў апэратыўна наступным адказам.

Секретно
экз № __

13 Таксама. Л. д. 17. № 10/2/3118, 3 декабря 1954 г.

ЗАМ. НАЧАЛЬНИКА УЧЕТНО-АРХИВНОГО ОТДЕЛА УКГБ при СМ СОЮЗА ССР по КИРОВСКОЙ ОБЛАСТИ
майору – тов. ФУФАЕВУ
г. Киров

На № 10/2-3118 от 3 декабря 1954 года.

По учету I спецотдела МВД БССР проходит АДАМОВИЧ Антон Евстафьевич, арестован 24 июля 1930 года ПП ОГПУ по ст. 58-2, 58-II УК РСФСР и осужден 10 апреля 1931 г. судебной коллегией ОГПУ на 5 лет ИТЛ. Архивно-следственное дело хранится в учетно-архивном отделе КГБ при СМ СССР под №

553618. Он же арестован в 1937 году[.] Постановлением НКВД БССР от 26 июня 1938 года, дело прекращено. Архивно-следственного дела за 1937 год у нас не имеется и сведениями о местонахождении его не располагаем.

ЗАМ. НАЧАЛЬНИКА УЧЕТНО-АРХИВНОГО ОТДЕЛА КГБ
при СМ БССР – подполковник /КОБЕЛЯЦКИЙ/

НАЧАЛЬНИК 4 ОТДЕЛЕНИЯ
майор /ГЛАДЫШЕВ/[14]

Адзначу яшчэ раз, што 26 чэрвеня – дзень народзінаў Антона Адамовіча. Магчыма, гэта простая выпадковасьць, але мяркуючы паводле гэтага адказу зь Менску, пастанова НКУС БССР аб спыненьні справы Антона Адамовіча была зацьверджаная ў дзень ягонага 29-годзьдзя.

Цяпер з Кірава ідзе запыт у Маскву:

Совершенно секретно
экз. № 1

[14] Тамсама. Л. 16. № 4/4-6033, 21 декабря 1954 г. На дакумэнце ёсьць адзнака: 2 к запросу 27 XII.

НАЧАЛЬНИКУ 2 СЕКТОРА УЧЁТНО-АРХИВНОГО ОТДЕЛА КОМИТЕТА ГОСБЕЗОПАСНОСТИ ПРИ СОВЕТЕ МИНИСТРОВ СССР –
ПОЛКОВНИКУ ТОВ. К Р Я Ж Е В У.
гор. М о с к в а.

Просим Вашего указания о высылке нам копии постановления Коллегии ОГПУ от 10 апреля 1931 года и Особого Совещания НКВД СССР от 14 июля 1935 года по следственному делу на АДАМОВИЧ[А] Антона Евстафьевича, 1909 г. рождения, хранящемуся в Центральном архиве под № 553618.
Просим также проверить – не хранится ли у Вас следственное дело на АДАМОВИЧА А. Е. за 1937 год, которое было прекращено постановлением НКВД БССР от 26 июня 1938 года.
В положительном случае просьба выслать копию постановления [и] по этому делу.
Копии постановлений необходимы для приобщения к хранящемуся у нас контрольно-наблюдательному делу на

АДАМОВИЧА.

НАЧАЛЬНИК УПРАВЛЕНИЯ КОМИТЕТА ГОСБЕЗОПАСНОСТИ
ПРИ СОВЕТЕ МИНИСТРОВ СССР ПО КИРОВСКОЙ ОБЛ.
п о л к о в н и к – (СЫСОЕВ)

ЗАМ. НАЧ. УЧЁТНО-АРХИВНОГО ОТДЕЛА УКГБ –
м а й о р – (ФУФАЕВ)[15]

У канцы студзеня 1955 г. Масква вяртае запыт у Кіраўскае УКДБ і паведамляе:

СЕКРЕТНО

Зам. Нач. Учетно-архивного отдела УКГБ
при СМ СССР по Кировской обл.
тов. Фуфаеву
гор. Киров.

Возвращая Ваш запрос № 10/2-120 от 31 XII-1954 г. сообщаем, что архивно-следственное дело № 553618 по обвинению Адамович[а] А. Е. направлено 18-XI-1954 г. при № 16/21-553618 на постоянное хранение в КГБ Белорусской ССР. Арх[ивно-] след[ственного] дела за 1937 год на Адамович[а] А. Е. у нас не имеется[.]
ПРИЛОЖЕНИЕ: на 1 листе

Зам начальник[а] 2 сектора
п/полковник (Кирин)

/ Зам начальник[а] 2 отделения
п/полковник (Сосин)[16]

Кіраўскае Ўпраўленьне дзяржбясьпекі ізноў накіроўвае запыт у КДБ пры СМ БССР:

Копия
Секретно
Экз. № 2

НАЧАЛЬНИКУ УЧЕТНО-АРХИВНОГО ОТДЕЛА КГБ

[15] Архив УФСБ РФ по КО. Дело № СУ-3533. Л. д. 14, 15. № 10/2/120, 31 декабря 1954 г. На дакумэнце ёсьць адзнака: т. Тихомирову одновр. сообщите что прекр. дела за 1937 г у нас нет 25/I Сысоев.

[16] Там жа. Л. д. 13. № 16/10-16261-вх, 26 декабря 1955 г. На дакумэнце

ПРИ СМ БЕЛОРУССКОЙ ССР
Гор. М И Н С К

ёсьць адзнака: т Логинову 2/ 1955 г. Филиппов.

По сообщению Учетно-Архивного отдела КГБ при СМ БССР, 18 ноября 1954 года при № 16/21-553618 Вам для постоянного хранения из Центрального архива выслано архивно-следственное дело № 553618 по обвинению АДАМОВИЧ[А] Антона Евстафьевича, 1909 года рождения.

Прошу выслать копии постановлений Коллегии ОГПУ от 10 апреля 1931 года и Особого Совещания НКВД СССР от 14 июля 1938 года в отношении АДАМОВИЧА, а также копию постановления НКВД БССР о прекращении дела от 26 июня 1938 года для приобщения к хранящемуся у нас контрольно-наблюдательному делу на АДАМОВИЧА.

НАЧАЛЬНИК УЧЕТНО-АРХИВНОГО ОТДЕЛА УКГБ ПРИ СМ СССР ПО КИРОВСКОЙ ОБЛ.
полковник (ФИЛИППОВ)

НАЧАЛЬНИК 2 ОТДЕЛЕНИЯ УЧЕТНО-АРХИВНОГО ОТД. УКГБ ПРИ СМ СССР ПО КИРОВСК. ОБЛ.
капитан (ЛОГИНОВ)

17 Архив УФСБ РФ КО. Дело № СУ-3533. Л. д. 12; № 10/2/413, 5 февраля 1955 г.

18 Тамсама. Л. д. 11. № 4/4-821. 18 февраля 1955 г. На дакумэнце ёсьць адзнака: т. Логинову 24 II 55 г. Филиппов. Паводле сфальсыфікаваных у 1930–1931 гг. ГПУ БССР крымінальнай справы «Саюз Вызваленьня Беларусі» («СВБ») супраць беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі было арыштавана 108 дзеячаў навукі і культуры Беларусі. 90 чалавек Калегіяй АГПУ СССР у 1931 г. асуджаныя да розных тэрмінаў зьняволеньня ў выпраўленчых лягерах, астатнія – да высылкі (у тым ліку і Антон Адамовіч). У адносінах 18 чалавек сьледзтва было прыпынена. У 1956–1988 гг. усе асуджаныя паводле справы «СВБ» былі рэабілітаваныя дзеля адсутнасьці складу злачынства. Абсалютная большасьць з іх была расстраляная ў 1937–1938 гг. Пасьля рэабілітацыі іх справы былі вернутыя ў сем'і. Такім чынам, Адамовіч быў арыштаваны ў 1937 г., а не ў 1938 г., як ён пісаў у сваіх аўтабіяграфіях.

19 Архив УФСБ РФ КО. Дело № СУ-3533. Л. д. 10, 10 об.

20 Тамсама. Л. д. 10 об.

21 У архіве Ўпраўленьня ФСБ РФ па Кіраўскай вобласьці ёсьць яшчэ адзін дакумэнт – пратакол допыту Антона Адамовіча ў якасьці сьведкі па сьледчай справе, сфабрыкаванай УГБ УНКУС па Кіраўскім краю ў жніўні 1935 – лютым 1936 гг. Пра гэты пратакол допыту і пра самую крымінальную справу я ўжо пісаў, але больш дэталёва апавяду іншым разам.

Секретно
экз. №

НАЧАЛЬНИКУ УЧЕТНО-АРХИВНОГО ОТДЕЛА УКГБ при СМ СССР по КИРОВСКОЙ ОБЛАСТИ – ПОЛКОВНИКУ тов. ФИЛИППОВУ
гор. Киров

На № 10/2/413 от 5 февраля 1955 года.

В связи с тем, что архивно-следственное дело по обвинению АДАМОВИЧ[А] Антона Евстафьевича и других находится в прокуратуре БССР на рассмотрении по жалобе ЗЕНЮК[А] Петра Антоновича исполнить Ваш запрос по существу не представляется возможным.

ЗАМ. НАЧАЛЬНИКА УЧЕТНО-АРХИВНОГО ОТДЕЛА КГБ
при СМ БССР – подполковник /КОБЕЛЯЦКИЙ/

НАЧАЛЬНИК 4 ОТДЕЛЕНИЯ
майор /ГЛАДЫШЕВ/[18]

Празь пяць месяцаў кіраўскія чэкісты ізноў зьвяртаюцца ў КДБ пры СМ БССР:

Сов. секретно
экз. №1

ЗАМ. НАЧАЛЬНИКА УЧЁТНО-АРХИВНОГО ОТДЕЛА КОМИТЕТА ГОСБЕЗОПАСНОСТИ ПРИ СОВЕТЕ МИНИСТРОВ БЕЛОРУССКОЙ ССР –
ПОДПОЛКОВНИКУ ТОВ. КОБЕЛЯЦКОМУ.
гор. М и н с к.

На Ваш № 4/4-821 от 18. II-1955 года.

Просим исполнить наш № 10/2/413 от 5 февраля 1955 года, если архивное следственное дело по обвинению АДАМОВИЧА Антона Евстафьевича и других возвратилось из Прокуратуры БССР.

/ ЗАМ. НАЧАЛЬНИКА УЧЁТНО-АРХИВНОГО ОТДЕЛА УКГБ ПРИ СОВЕТЕ МИНИСТРОВ СССР ПО КИРОВСКОЙ ОБЛАСТИ –
м а й о р – (ФУФАЕВ)[19]

Аднак 8 жніўня 1955 г. гэты запыт быў вернуты ў Кіраў і ў сутнасьці без выкананьня, з папярэдняй адпіскай (на зваротным баку):

Справка

Архивно следственное дело на Зенюк[а], Адамович[а] и др. находится в прокуратуре БССР.

О/уполном УАО КГБ БССР
ст лт Новиков
2/VIII 55 г.[20]

Гэты апошні паводле храналёгіі дакумэнт, прысутны ў архіве Ўпраўленьня ФСБ РФ па Кіраўскай вобласьці, датычны Антона Адамовіча ў сувязі з гэтай гісторыяй[21]. Мяркуючы па ўсім, кіраўскія чэкісты асобай Антона Адамовіча ніколі больш не цікавіліся.

Пераклад з расейскай
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/11/07**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 7-8 (47-48) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

7-8 [image]-[image]2006

[image] [image] [image]

ПЭТАР БЛАЖАК

(Petr Blažek) – доктар філязофіі, выкладае на катэдры гісторыі Чэхіі філязофскага факультэту Карлавага ўнівэрсытэту.

Пэтар Блажак Тыпалёгіі апазыцыі і супраціву камуністычнаму рэжыму Агляд канцэпцыяў і рамкі дасьледаваньня

Спрэчкі пра маштаб, характар і значэньне розных формаў нязгоды з камуністычным рэжымам у Чэхаславаччыне часткова вынікаюць з блытаніны ў паняцьцях, якія гучаць у дыскусіях, – аўтары надаюць адным і тым жа тэрмінам (часьцей за ўсё гучаць паняцьці «трэці вызвольны рух», «апазыцыя» і «дысыдэнцтва») розныя значэньні. Адна з прычынаў гэткага стану – надзіва малая зацікаўленасьць чэскіх гісторыкаў тэарэтычнымі пытаньнямі ў вывучэньні гэтай тэмы. Пры тым першую тыпалёгію апазыцыі ў савецкім блёку заходнія палітолягі склалі яшчэ трыццаць гадоў таму, тая ж тэма ад пачатку 1990-х – прадмет адносна шырокай дыскусіі ў нямецкай і польскай гістарыяграфіі. Пасьля ўводнага агляду гэтых канцэпцыяў разгледзім, у якім кантэксьце ўжываюцца гэтыя тэрміны ў чэскай і славацкай гістарычнай літаратуры. У заключэньні згадаем некаторыя цікавыя пытаньні, што

прагучалі ў дыскусіях на гэтую тэму, і паспрабуем зьвярнуць увагу на межы дасьледаваньня існых падыходаў[1].

ТЫПАЛЁГІІ ЗАХОДНІХ ПАЛІТОЛЯГАЎ

Некаторыя заходнія саветолягі пачынаючы ўжо з 1960-х гадоў спрабавалі прыстасаваць і дапасаваць клясычны тэрмін «апазыцыя»[2] да ўмоваў усходнеэўрапейскіх камуністычных рэжымаў. У гэтай сувязі яны палемізавалі з поглядамі клясыкаў тэорыі таталітарызму Карла Ёахіма Фрыдрыха і Зьбігнева Бжазінскага і крытыкавалі статыстычны падыход да вывучэньня такой палітычнай сыстэмы[3]. Значны штуршок для канструяваньня тыпалёгіяў зрабіла таксама параўнальная клясыфікацыя аўтарытарных рэжымаў палітоляга Хуана Хасэ Лінсэ (Juan José Linze). Хоць згаданая дыскусія і не спарадзіла новых паліталягічных катэгорыяў (за выняткам паняцьця «дысыдэнцтва» ў розных мадыфікацыях), яна заўважна пашырыла сэмантычнае ўспрыняцьце тэрміну «апазыцыя» і зрабіла магчымым абстрагаваньне дыскусіі ад вузкага значэньня тэрміну, актуальнага для плюралістычных палітычных сыстэмаў, у якіх гэтую ролю граюць усяго толькі інстытуцыяналізаваныя дзеячы (перадусім сябры апазыцыйных палітычных партыяў і рухаў з прызнанай легальнай пазыцыяй)[4].

Відавочна, найвядомейшую тыпалёгію апазыцыі ў камуністычных рэжымах савецкага тыпу ў канцы 1960-х гадоў выпрацаваў канадзкі гісторык, палітоляг і славіст Гаралд Гордан Скілінг. Хаця ён не абмінуў нават верагоднай несыстэмнай скіраванасьці пад уплывам палітычнага паслабленьня ў некаторых дзяржавах савецкага блёку, у цэнтры ягонай увагі была патэнцыйная ўнутрысыстэмная апазыцыя і дыскусія аб рэпрэзэнтацыі інтарэсаў у монапартыйных сыстэмах савецкага тыпу. Скілінг зрабіў агульны падзел апазыцыйных формаў на чатыры асноўныя групы: інтэгральную (*integral*, якая дзейнічае нелегальна і абсалютна адмаўляе палітычную сыстэму), фракцыйную (*factional*, апазыцыю ў асяродзьдзі ўладнай эліты, якая імкнецца да канкрэтных пэрсанальных і палітычных пераменаў ва ўладнай герархіі), фундамэнтальную (*fundamental*, якая накіраваная на зьмену

альбо адмаўленьне існай палітычнай сыстэмы і стане асноваю будучага кіраўніцтва) і спэцыфічную (*specific*, ляяльную апазыцыю, якая імкнецца зьмяніць альбо паўплываць на грамадзкую палітыку крытыкаю ўсталяванай сыстэмы, прапаноўваючы розныя альтэрнатывы існым стасункам, і вызначае будучыя кірункі)5. Крыху адрозную тыпалёгію стварыў іншы саветоляг, Фрэдэрык Баргхурн (Frederick C. Barghoorn), які вылучыў тры асноўныя формы апазыцыі: фракцыйную (*factional*, якая азначаецца гэтаксама, як тая ж катэгорыя ў тыпалёгіі Скілінга), сэктарную (*sectoral*, якая дзейнічае ў асяродзьдзі палітызаваных суполак), падрыўную (*subversive*, апазыцыю, якая жадае радыкальных зьменаў альбо нават поўнага зьвяржэньня ўсталяванага ладу). Абапіраючыся на тыпалёгіі Скілінга і Баргхурна, у 1970-х гадах аналягічна мадыфікаванае разгалінаваньне апазыцыі абраў вугорскі палітоляг у выгнаньні Рудольф Л. Токеш (Rudolf L. Tökés).

На падставе поглядаў і абраных стратэгіяў ён вылучыў тры агульныя тыпы апазыцыйнай чыннасьці ў савецкім рэжыме: маральны (*moral-absolutist dissident*, перадусім нонканфармісцкія пісьменьніцкія суполкі), прагматычны (*instrumental-pragmatic*, частка ўладнай эліты, якая імкнецца да пэрсанальных палітычных зьменаў з мэтаю ўзмацніць свае пазыцыі) і радыкальны (*anatomic-militant*, групы, якія ўтвараюцца перадусім з рэлігійных ці нацыянальных матывацыяў і адмаўляюць камуністычны рэжым як гвалтоўна навязаны)6.

Як вынікае з прыведзеных тыпалёгіяў заходніх палітолягаў, іх увагу прыцягвала ў большай ступені савецкае асяродзьдзе. Аднак, як зазначыў цытаваны вышэй Г. Г. Скілінг, азначэньне апазыцыі і адрозьненьне яе асобных формаў цесна зьвязанае з кантэкстам асобных дзяржаваў і пэўнымі адцінкамі часу. Таму прыведзеныя паліталягічныя клясыфікацыі сфармуляваныя вельмі агульна і для апісаньня чэхаславацкай сытуацыі ня надта пасуюць. Іх галоўная праблематычнасьць вынікае таксама з таго факту, што тэарэтычныя мадэлі заходніх палітолягаў да самага пачатку 1990-х не маглі са зразумелых прычынаў абапірацца на вынікі гістарычнага досьледу архіўных крыніцаў. Зь іншага боку, яны сталіся штуршком для выпрацоўкі новай тэрміналёгіі і інтэрпрэтацыйнага падыходу,

каштоўнага асабліва для параўнальных дасьледаваньняў сытуацыі ў розных краінах савецкага блёку7.

[image]
Адзін з т. зв. «кватэрных сэмінараў». Справа — Вацлаў Гавал.

ТЫПАЛЁГІІ НЯМЕЦКІХ І ПОЛЬСКІХ ГІСТОРЫКАЎ

Натхняльным штуршком для стварэньня прыдатных тыпалёгіяў могуць стацца працы польскіх і нямецкіх гісторыкаў, якія тэарэтычным пытаньням надаюць больш увагі пераважна ад пачатку 1990-х гадоў, калі скончыўся гістарычны пэрыяд, які ёсьць прадметам іх досьледаў. У іх выкладках нязгода з рэжымам не засяроджваецца толькі на разглядзе часта нешматлікіх групаў, што праграмна і доўгатэрмінова выступаюць супраць рэжымнай палітыкі. Польскія і нямецкія аўтары апісваюць, апроч таго, самыя розныя формы грамадзкага супраціву8. Як зазначыў нямецкі эвангелічны сьвятар і гісторык Эргарт Нойбэрт (Ehrhart Neubert), аўтар падрабязнай манаграфіі пра ўсходненямецкую апазыцыю, у плашчыні агульных і вельмі шырока сфармуляваных паняцьцяў можа лёгка хавацца небясьпека, што за апазыцыю можа быць выдадзеная, напрыклад, спантанная сацыяльная непрыстасаванасьць9. Зь яго гледзішча меў значэньне толькі мэтавы і сьвядомы матываваны канфлікт з прадстаўнікамі ўлады, у рамках якога апанэнты рэжыму мусілі – калі хацелі мець посьпех – узважваць пэрспэктыўныя палітычныя рызыкі і магчымасьці, вызначаць сродкі і мэты. Толькі сьвядмы выбар палітычных стратэгіяў і тэмаў ствараў тыпы (палітычнага) супраціву рознага значэньня і эфэктыўнасьці10. З гледзішча Нойбэрта, некарэктна адрозьніваць супраціўнікаў рэжыму паводле маштабаў рэпрэсіяў, асабліва для 1950-х гадоў, калі мінімальнае адхіленьне ад патрабаваных грамадзкіх нормаў часта інтэрпрэтавалася як палітычны супраціў. Вялікая колькасьць асуджаных – гэта, без сумневу, прыкмета шырэйшага супраціву часткі насельніцтва, аднак, зь іншага боку, сярод палітычных вязьняў быў шэраг асобаў, якія насамрэч ня зьдзейсьнілі ніякага акту супраціву, а былі падстаўленыя ці асуджаныя як ахвяры правакацыяў. Падобныя

ўзаемасувязі можна прасачыць таксама сярод мноства людзей, што выехалі на Захад без таго, каб уступіць у адкрыты канфлікт з камуністычным рэжымам[11]. Галоўным аспэктам для ацэнкі значэньня апазыцыйнай актыўнасьці нямецкі гісторык назваў «адраджэньне права» і абраў такую тыпалягічную дыфэрэнцыяцыю, якая «ў меншай ступені выяўляе схільнасьць да палітычнай сілы, аднак у большай паказвае дыфэрэнцыяцыю ў выбары сродкаў і мэтаў, якія з гэтых сродкаў вынікаюць»: 1) апазыцыя (*Opposition*, якая была зьвязаная легальнымі дзеяньнямі і імкнулася да пасьлядоўнага напаўненьня існых законаў); 2) супраціў (*Widerstand*, які адступіў ад выбару легальных сродкаў і сваю легітымнасьць суадносіў з адмаўленьнем камуністычнага рэжыму); 3) пратэст (*Widerspruch*, аслабленая форма сьвядомага палітычнага супраціву, які крытыкаваў уладную партыю)[12].

Крыху адрозную тыпалёгію формаў нязгоды з камуністычным рэжымам стварыў Ілька-Саша Кавальчук. Дасьледчык вылучыў чатыры асноўныя тыпы супраціву ўсходненямецкаму рэжыму, якія, як ён тлумачыць, часта перакрыжоўваліся: 1) грамадзкае непаслушэнства (*Gesellschaftliche Verweigerung*); 2) сацыяльны пратэст (*Sozialer Protest*); 3) палітычнае дысыдэнцтва (*Politische Dissidenz*); 4) масавы пратэст (*Massenprotest*). Як апазыцыю (*Opposition*) Кавальчук выразна азначыў хіба палітычнае дысыдэнцтва, якое далей дыфэрэнцыяваў паводле палітычна-ідэалягічных і сацыяльна-культурных аспэктаў. Астатнія выпадкі ён азначыў як разнавіднасьці грамадзкага супраціву (>). Аўтар назваў спэцыфічнай ролю царквы, дзе ў канцы 1970-х гадоў сфармаваўся шырока дэфінаваны супраціў усходненямецкаму рэжыму[13]. Яшчэ больш дыфэрэнцыяваную тыпалёгію супраціву і апазыцыі ў НДР выбудаваў Губэртус Кнабэ. У сваёй тыпалёгіі ён не абмінуў катэгорыі апанэнтаў у складзе ўладнай партыі альбо «ціхі супраціў» часткі насельніцтва: 1) рэзыстанс (*Resistenz*); 2) партыйная крытыка (*partielle Kritik*); 3) сацыяльная крытыка (*Sozialen Kritik*); 4) пасіўны рэзыстанс (*passiven* >); 5) новы сацыяльны рух (*Neue Soziale Bewegungen*); 6) палітычны пратэст (*Politischen Protest*); 7) дысыдэнцтва (*Dissidenz*); 8) палітычная апазыцыя (*Politische Opposition*); 9) актыўны супраціў (*Aktiven* >); 10) паўстаньне (*Aufstand*)[14].

Тэрміналягічным пытаньням апісаньня нязгоды з камуністычным рэжымам надаюць значную ўвагу таксама польскія гісторыкі, якія гэтаксама, як іх нямецкія калегі, найчасьцей кажуць пра апазыцыю (*opozycja*) і супраціў (*opór*). Часта цытаванаю ёсьць дэфініцыя гісторыка Анджэя Фрышке, які пад тэрмінам «апазыцыя» разумее «ўсьвядомленую і сплянаваную арганізацыйную альбо інтэлектуальную дзейнасьць, на падставе акрэсьленай праграмы, мэтай якой было зьнішчэньне сыстэмы альбо яе рэфармаваньне ў кірунку абмежаваньня ўплыву партыі і аднаўленьня грамадзкай суб'ектыўнасьці». У яго інтэрпрэтацыі значэньне тэрміну «супраціў» шырэйшае, уключае ў сябе «разнародныя спантанныя, неарганізаваныя і некіраваныя праявы нязгоды з навязаным палітычным ладам»15. Асноўным крытэрам для яго, гэтаксама, як і ў згаданага нямецкага гісторыка Нойбэрта, ёсьць апазыцыя «праграмнасьць *versus* спантаннасьць» дзеяньняў апанэнтаў камуністычнага рэжыму. Некаторыя аўтары палемізавалі з прыведзенымі фармулёўкамі і іх ужываньнем стасоўна гісторыі паваеннай Польшчы. Катэгарычней ад усіх выказаўся гісторык Томаш Стшэмбаш, які рашуча аспрэчыў азначэньне Фрышке як «надзіва беднае» і асабліва крытыкаваў недастатковае разуменьне калегам паступовай зьмены камуністычнага рэжыму і няўвагу да ролі каталіцкага асяродзьдзя, якое Стшэмбаш лічыў падставовым для фармаваньня доўгатэрміновага супраціву вялікай часткі грамадзтва ўжо дзеля яго цалкам адрознай ад камуністычнай ідэалёгіі сьветапоглядаай арыентацыі. Адрозьненьне апазыцыі ад супраціву ў пэрыяд 1948–1980 гадоў ён адмаўляў як празьмернае завышэньне ролі «інтэлектуальных салёнаў» і заніжэньне значэньня «масавай пазыцыі» абароны традыцыяў і непрыняцьця палітычных кампрамісаў. На ягоную думку, для апазыцыі тыповымі ёсьць імкненьне здабыцьця ўлады альбо хаця б высілкі дзеля атрыманьня рэальнага ўплыву на палітычную рэчаіснасьць. Да ўзьнікненьня «Салідарнасьці» паводле гэтага крытэра можна разважаць пра апазыцыю што да кароткага паваеннага пэрыяду, калі яшчэ дзейнічалі легальныя палітычныя партыі і шматлікія нелегальныя кансьпіратыўныя арганізацыі. У сувязі са сваім досьведам у вывучэньні гісторыі савецкай акупацыі Польшчы ў 1939–1941 гадах ён прапанаваў ужываць для часоў ПНР тэрміны «маральны супраціў» (*sprzeciw/*

opór moralny), «кансьпіратыўная барацьба» (*walka konspiracyjna*) і «інстытуцыі супраціву» (*instytucje sprzeciwu*)16.

Наватарскія досьледы «грамадзкага супраціву» (*opór społeczny*) камуністычнаму рэжыму ў Польшчы апублікаваў уроцлаўскі гісторык Лукаш Камінскі. Згаданы тэрмін ён азначыў як «розныя неінстытуцыяналізаваныя і стыхійныя дзеяньні асобных людзей альбо сацыяльных групаў у палітычнай, грамадзкай альбо эканамічнай сфэрах, якія маюць аб'ектыўны альбо суб'ектыўны характар супраціву ўладзе»17. У іншым дасьледаваньні польскі гісторык паспрабаваў таксама вызначыць асноўныя рысы апазыцыйнай актыўнасьці ў эўрапейскай частцы савецкай імпэрыі. Найвыразьней яна была сфармавалася цягам двух пэрыядаў: упершыню ў часе ўсталяваньня савецкай мадэлі ў асобных дзяржавах (пасьля 1944–1945 гадоў), калі яна была сканцэнтраваная галоўным чынам у асяродзьдзі традыцыйных палітычных партыяў, а пасьля ліквідаваная маштабным тэрорам; у другі раз – у сярэдзіне 1970-х у сувязі з працэсам *detente* (паслабленьня міжнароднага напружаньня) і падпісаньнем Заключнага акту АБСЭ ў Хэльсынкі (1975 год), калі апазыцыйнасьць мела вельмі разнастайны характар (групы абаронцаў правоў чалавека; рух абаронцаў міру; экалягічныя, контракультурныя рухі; у некаторых краінах паступова ўзьніклі таксама недазволеныя палітычныя партыі). У той жа час масавая эскаляцыя розных формаў грамадзкага супраціву назіралася ў пэрыяды працяглых грамадзка-палітычных крызаў (Чэхаславаччына 1953 і 1968 гадоў; НДР 1953 году; Польшча 1956, 1968, 1970, 1976 і 1980 гадоў; Вугоршчына 1956 году; увесь савецкі блёк 1989 году). Да іх асноўных праяваў належалі страйкі; дэманстрацыі, вулічныя беспарадкі і мітынгі; чуткі і плёткі; палітычныя досьціпы; слуханьне замежных радыёстанцыяў; пісаньне надпісаў на сьценах; распаўсюд улётак і плякатаў; супраціў калектывізацыі вёсак; уцёкі з турмаў і лягераў; дэзэртэрства з войска; пакіданьне краіны; байкот і адмова ўдзельнічаць у выбарах; зьнішчэньне камуністычнай сымболікі і прапагандысцкіх матэрыялаў; супраціў з рэлігійных прычынаў. Зразумела, іх характар і колькасьць былі ў розных камуністычных краінах у розныя пэрыяды рознымі, у залежнасьці ад ступені камуністычнага таталітарызму ў пэўнай дзяржаве ў пэўны час

маглі зьявіцца праявы грамадзкага супраціву, якія часта болей нідзе і ніколі не атрымалі такой адназначнай ацэнкі (напрыклад, розныя формы супраціву ўнутры апарату ўлады, супраціў, які паўставаў у гаспадарчай сфэры ці ў сувязі з абаронай гістарычных, культурных ці рэлігійных традыцыяў ці грамадзкіх нормаў)18.

У польскім дыскурсе мала абмяркоўваецца роля т. зв. новых сацыяльных рухаў у дзяржавах савецкага блёку, тым часам як нямецкія аўтары зьвязваюць іх з апазыцыйнымі паводзінамі ў 1970-х і 1980-х гадах19. У сувязі з гэтым, вядома ж, можна пагадзіцца зь меркаваньнем Нойбэрта, што, нягледзячы на бясспрэчнае значэньне сацыяльна-гістарычнага фону, ягоны выбар як адзінага тыпалягічнага крытэру вядзе хутчэй да няяснасьцяў і памылак. Гэтаксама, як і ў выпадку царкоўных супольнасьцяў, ён ня ўгледжвае індывідуальны выбар і арыентацыю – у адпаведным асяродзьдзі паўставаў ня толькі супраціў, але часта і апартунізм ці нават наўпрост калябарацыя20. Гэты факт падкрэсьліў і, напрыклад, Падрэк Кені ў сувязі са значэньнем ролі «контракультуры» для фармаваньня апазыйных дзеячаў. У разгорнутым дасьледаваньні падзеньня камуністычных рэжымаў на абсягах Сярэдняй Эўропы (Чэхаславаччына, Польшча, НДР, Вугоршчына, Славенія і Ўкраіна) ён адрозьніваў пяць падставовых тыпаў апазыцыйнага руху, якія сваёй унівэрсальнасьцю – гэтаксама як тыпалёгія формаў грамадзкага супраціву Камінскага – добра прыдатныя, каб выйсьці за рамкі вывучэньня гісторыі апазыцыі ў камуністычнай Чэхаславаччыне: 1) рэформавае дысыдэнцтва ў шэрагах камуністычнай партыі; 2) грамадзянскае дысыдэнцтва; 3) апазыцыя, што паўстае з рэлігійнага асяродзьдзя; 4) апазыцыя, што паўстае з контракультуры; 5) нацыяналістычная антыкамуністычная апазыцыя. Адпаведна намерам сваёй манаграфіі амэрыканскі дасьледчык, які з 1980-х гадоў сыстэматычна займаецца польскай гісторыяй, таксама падкрэсьліў значэньне ўзьнікненьня прафсаюзнага руху «Салідарнасьць» для зьяўленьня апазыцыйных рухаў ва ўсім дасьледаваным рэгіёне цягам апошняга дзесяцігодзьдзя існаваньня савецкага блёку (Кені трапна кажа пра дзеяньне міту «Салідарнасьці»). Яшчэ адным істотным чыньнікам, што

вёў да падзеньня камуністычных рэжымаў, апроч халодай вайны, савецкіх рэформаў, эканамічнага каляпсу і апазыцыйнай актыўнасьці, Кені назваў таксама дзейнасьць новых апазыцыйных рухаў. Іх узьнікненьне стала магчымым дзякуючы традыцыі грамадзянскага дысыдэнцтва, зьмене пакаленьняў у сярэдзіне 1980-х, аслабленьню прывабнасьці камуністычнай ідэалёгіі і новым мабілізацыйным тэмам. Паводле Кені, гэтыя апазыцыйныя рухі ўяўлялі сабою самастойную тыпавую катэгорыю, іх удзельнікам гісторык даў агульную дэфініцыю «канкрэтнае пакаленьне»21.

[image]
Штогадовыя сустрэчы ля сьцяны Ленана былі адной з праяваў антырэжымнага супраціву моладзі ў 1980-х гг.
На фатаздымку — сустрэча на праскім востраве Кампа 08.12.1987 (фота: Любамір Котак).

ТЫПАЛЁГІІ ЧЭСКІХ І СЛАВАЦКІХ ГІСТОРЫКАЎ

У чэскім і славацкім дыскурсе тыпалягічным пытаньням дагэтуль належнай увагі нададзена не было22. Зь іншага боку, некаторыя гісторыкі, якія займаюцца рознымі формамі апазыцыі і супраціву камуністычнаму рэжыму ў Чэхаславаччыне (1948–1989 гады), імкнуліся вызначыць іх храналёгію. Галоўнаю вехаю называюць акупацыю ў жніўні 1968 году, часам – прыход Густава Гусака на пасаду кіраўніка Кампартыі Чэхаславакіі ў красавіку 1969 году. Для абодвух этапаў камуністычнага рэжыму (1948–1968/69 гады, 1968/69–1989 гады) гісторыкі вылучаюць розныя апазыцыйныя праявы і формы грамадзкага супраціву, падкрэсьліваецца таксама адрозная сытуацыя на чэскіх землях і ў Славаччыне, дзе галоўную ролю ў фармаваньні антыкамуністычнай думкі адыгралі апазыцыйна настроеныя каталіцкія актывісты23.

У сувязі зь першымі пасьлялютаўскімі гадамі (1948–1956/60), якім быў уласьцівы масавы тэрор супраць рэальных і ўяўных ворагаў камуністычнага рэжыму[24] , для азначэньня супрацькамуністычнага руху, дасьледзіны якога, на жаль, дагэтуль у зародкавым стане, ужываецца, пад уплывам былых

палітвязьняў, некалькі хібны тэрмін «трэці вызвольны рух». Наўпрост паказваючы сваёй назваю на частковую праграмную і пэрсанальную спадкаемнасьць з рэзыстансам у пэрыяд Першай сусьветнай вайны і нацысцкай акупацыі, тэрмін гэты звужае супраціў камуністычнаму рэжыму да прыхільнікаў традыцыяў першай рэспублікі. Яшчэ адной праблемай ёсьць цяжкасьць храналягічнага акрэсьленьня. Да таго ж, пад паняцьцем «вызвольны рух» звычайна разумеюць арганізаваны палітычны і ваенны супраціў прыгнятальнаму рэжыму, які пасьля студзеня 1948 году шырока не праявіўся. Ва ўмовах таталітарнага рэжыму, дзе грамадзтва апанаванае пры дапамозе разгорнутага рэпрэсіўнага апарату, стварэньня атмасфэры страху і шматлікай сеткі сакрэтных агентаў, вядома ж, зразумела, што выказваньне нязгоды з навязаным рэжымам набывала адрозныя і менш выбуховыя формы, для якіх можна ўжываць тэрмін «супраціў»25.

Гэтак жа недастаткова – за выняткам канца 1970-х гадоў – дасьледаваны пэрыяд 1956/60–1968/69, калі пад уплывам зьменаў у міжнароднай сытуацыі фармаваліся новыя праявы супраціву і зьяўляліся носьбіты апазыцыйных меркаваньняў, якія ўжо вельмі часта не адмаўлялі камуністычны рэжым цалкам, але, наадварот, хутчэй імкнуліся да яго рэфармаваньня. Пасьляжнівеньскі пэрыяд, які мы разгледзім падрабязьней, да гэтага часу стаўся тэмаю адзінай манаграфіі сынтэтычнага кшталту. Гісторык Мілан Отагал вылучае дзьве адрозныя формы, альбо храналягічныя этапы апазыцыйнага руху, якія адрозьніваюцца, на яго думку, як праграмнай арыентацыяй, так і часткова пэрсанальным складам. Пэрыяд пасьля 1968–1969 гадоў выразна адрозьніваўся ад папярэдняга этапу перадусім тым, што ніякай заўважнай апазыцыі ўнутры Кампартыі Чэхаславаччыны ўжо не паўстала. Да пачатку 1970-х гадоў акрыялая грамадзянская супольнасьць была ўжо заўважна больш памяркоўнаю, уключна з зародкам несыстэмных палітычных партыяў і рухаў, паміж якімі самую значную ролю ў адраджэньні актыўнасьці сацыяльнай дэмакратыі адыгралі КАН (Клюб ангажаваных непартыйцаў) і К-231 («Клюб-231») *(КАН – дэмакратычны палітычны рух, створаны ў 1968 г. у Чэхаславаччыне. Апроч «Клюбу-231», адзіная незалежная палітычная структура пэрыяду Праскай*

вясны. Плятформа антыкамуністычнай апазыцыі. 05.04.1968 КАН была дазволеная часовая дзейнасьць, афіцыйна спыненая 05.09.1968. К-231 – арганізацыя былых палітвязьняў камуністычнага рэжыму ў Чэхаславаччыне 1940–1960-х гадоў, створаная ў сакавіку 1968 году ў Празе. Назва ўтворaная ад закону дзеля абароны народнай дэмакратычнай рэспублікі арт. 231/1948 Sb. , на аснове якога большасьць гэтых палітвязьняў была асуджаная. – **Заўв. перакл.***)*. Раздробленае рэформавае крыло кампартыі было пасьля жнівеньскай акупацыі паступова выціснута з цэнтру ўлады на палітычную пэрыфэрыю. Масавыя чысткі ў Кампартыі Чэхаславаччыны, якая страціла больш за паўмільёна асобаў, пачаліся пасьля таго, як Густаў Гусак заняў найвышэйшую пасаду ў партыйнай пірамідзе. Яны радыкальна зьмянілі спэктар палітычна маргіналізаваных слаёў грамадзтва і вызначылі характар апазыцыйнага спэктру да другой паловы 1980-х гадоў. Паводле Мілана Отагала, найзаўважнейшую ролю з гэтай прычыны сыграла ў першай фазе «нармалізацыйнага» пэрыяду (1969–1972) «сацыялістычная апазыцыя», мэтай якой было перадусім вяртаньне да пасьлялютаўскай палітыкі і зьмяшчэньне антырэформавага кіраўніцтва Гусака. У другой фазе ключавое месца заняла «грамадзянская апазыцыя», для якой цытаваны гісторык ужывае сынонім «дысыдэнцтва». За вяху ён лічыць 1972 год, калі цягам «лета працэсаў» была асуджаная найвялікшая група супраціўнікаў рэжыму[26]. Галоўным крытэрам для клясыфікацыі ён выбірае «прысутнасьць *versus* адсутнасьць» палітычнай праграмы – апазыцыйным рухам у вузейшым, палітычным значэньні слова ён лічыць толькі першыя фазы, у той жа час для дысыдэнцтва, на ягоную думку, была ўласьцівая тыповая апалітычная стратэгія («апалітычная палітыка»), якая была засяроджаная на крытыцы невыкананьня камуністычнай уладаю міжнародных абавязальніцтваў у сфэры правоў чалавека, а пошукам канкрэтнай палітычнай праграмы ўжо не займалася[27].

У сярэдзне 1970-х гадоў паступова фармавалася «грамадзянская апазыцыя». Яна не была непасрэдным працягам традыцыі антыкамуністычнага супраціву пасьля лютаўскага пераваротy. Былыя палітвязьні 1950-х і 1960-х гадоў да яе – за некаторымі выняткамі перадусім з каталіцкага асяродзьдзя – не

далучыліся, збольшага яны сышлі ў прыватную сферу альбо эмігравалі. Галоўнай прычынаю быў недавер да дзеяньняў колішніх камуністычных функцыянэраў, якія значна паўплывалі на ўзьнікненьне Хартыі-77. Сваю ролю, несумнеўна, адыграў і недахоп узаемных кантактаў, сумневы ў сэнсоўнасьці адкрытых апазыцыйных дзеяньняў і боязь правакацыяў[28]. Супольнасьць Хартыі-77 выразна адрозьнівалася ад удзельнікаў «трэцяга вызвольнага руху» дэкляраваным прыняцьцем камуністычнай улады як патэнцыйнага партнэра для жаданага дыялёгу аб агульнаграмадзкіх праблемах. Новая сытуацыя ў 1970-х гадах выражалася ў мажлівасьці супрацоўніцтва айчынных і эмігранцкіх апазыцыйных групаў. Гісторыкі часта падкрэсьліваюць, што Хартыя-77 не азначалася яе паўнамоцнымі прадстаўнікамі як апазыцыйная сіла – галоўным матывам гэтай хутчэй абвешчанай, чым адчуванай пазыцыі былі боязь рэпрэсіяў, тагачасная «кампрамэтацыя» палітыкі, ідэйная неаднароднасьць і раздробленасьць апазыцыйнага дыскурсу[29]. Хартыя-77 пасьлядоўна грунтавала сваю легітымнасьць, гэтаксама, як і іншыя дысыдэнцкія рухі ў савецкім блёку, на міжнародных прававых абавязальніцтвах камуністычнага рэжыму. Палітоляг Міраслаў Новак у гэтым кантэксьце прапанаваў для такога тыпу апазыцыйных групаў тэрмін «нелегалізаваная апазыцыя»: «Я кажу стасоўна гэтых рэжымаў пра *нелегалізаваную* апазыцыю, але не пра нелегальную апазыцыю, паколькі прадстаўнікі некаторых такіх формаў апазыцыі, напрыклад, групаў, што змагаліся за правы чалавека, якой была ў нас Хартыя-77, абвяшчалі, што іх існаваньне і іх дзейнасьць легальныя, аднак урады яе легальнаю не прызнавалі»[30].

У чэскім і славацкім дыскурсе ў параўнаньні з польскай і нямецкай гістарычнай літаратураю значна часьцей ужываецца тэрмін «дысыдэнцтва». Адна з многіх прычынаў – згадваны пералом у выглядзе масавых чыстак у кампартыі на пачатку 1970-х, які ў суседніх дзяржавах савецкага блёку ў такім маштабе не адбываўся. Ва ўзьнікненьні новых апазыцыйных згрупаваньняў (канечне, амаль выключна на чэскіх землях) важка ўдзельнічала шматлікая маргіналізаваная інтэлектуальная праслойка, якая складалася пераважна з былых сяброў і прадстаўнікоў афіцыйных палітычных,

культурных і грамадзкіх арганізацыяў, што зь сярэдзіны 1950-х паступова схіляліся да рэфармісцкіх поглядаў. З гэтага гледзішча ў чэскім дыскурсе выкарыстоўваецца тэрмін «дысыдэнцтва», з 1960-х гадоў ужываны заходнімі журналістамі для азначэньня публічных крытыкаў савецкага рэжыму, законных па сутнасьці (слова *dissidens* літаральна значыць «адшчапленьне ад дзяржавы ці руху»)31. Пытаньне захоўваньня правоў чалавека альбо іх парушэньня было да таго ж нагэтулькі шырокаю тэмаю, што здолела аб'яднаць раздробленыя апазыцыйныя плыні рознай скіраванасьці і стварыць рух пратэсту з шырокім міжнародным рэзанансам. У параўнаньні з Польшчай і Вугоршчынай, і нават са Славаччынай, на чэскіх землях (таксама з прычыны рэпрэсіяў і як наступства маштабнай дыскрэдытацыйнай кампаніі ў СМІ цягам першых месяцаў 1977 году) для наступных пэрыядаў была ўласьцівая гегемонія гэтай апазыцыйнай плятформы, якая таксама стала адзінай вядомай у міжнародных маштабах. Тагачасны міжнародны розгалас Хартыі-77 ёсьць, відавочна, адной з прычынаў, чаму дагэтуль у гістарычных досьледах застаецца па-за ўвагаю іншая апазыцыйная чыннасьць (напрыклад, дзейнасьць розных царкоўных супольнасьцяў, чые сябры пратэставалі супраць абмежаваньня рэлігійных свабодаў, арганізоўвалі падпольныя тэалягічныя курсы, набажэнствы альбо публікавалі самвыдаты). Да таго ж, у 1987–1988 гадах апазыцыйны дыскурс наноў разнастаіўся, галоўным чынам у сувязі з генэрацыйнымі адрозьненьнямі, розным стаўленьнем да вулічных дэманстрацыяў і паступовым прарывам ізаляцыі «дысыдэнцкага гета». Нездарма адзін зь яго прадстаўнікоў Вацлаў Бэнда ў адным з рэтраспэктыўных інтэрвію гаварыў пра паступовую зьмену напрыканцы 1980-х гадоў «грамадзянскага дысыдэнцтва» на «дысыдэнцтва палітычнае»32.

У гэтай сувязі трэба дадаць, што ў чэскім і славацкім дыскурсе тэрмін «дысыдэнцтва» не зусім адназначны. Некаторыя аўтары, гэтаксама як цытаваны амэрыканскі гісторык Кені, ужываюць гэты тэрмін з рознымі канатацыямі і эпітэтамі, якія ўжо крыху адсоўваюць ці цалкам разбураюць першапачатковае значэньне гэтага слова. Браціслаўскі палітоляг Юрай Маруш'як кажа пра два дысыдэнцкія колы ў Славаччыне. З аднаго боку, «грамадзянскае дысыдэнцтва» (арыентаванае перадусім на

пытаньні правоў чалавека, колькасна маргінальнае, але створанае выбітнымі асобамі, зьвязанымі з праскім і брненскім апазыцыйнымі асяродкамі) і, з другога боку, у адрозьненьне ад чэскага дыскурсу, у Славаччыне значна большым і значэньнейшым было «хрысьціянскае дысыдэнцтва» («падпольная» царква ў Славаччыне спачатку дзейнічала толькі як непалітычная структура, але адзінкавыя асобы спарадзілі ў гэтым асяродзьдзі дзейнасьць хрысьціянска-дэмакратычнай скіраванасьці). Астатнія колы (напрыклад, групу вакол Аляксандра Дубчака, актывістаў вугорскай меншасьці, культурны андэграўнд ці экалягічны рух) дасьледчык да дысыдэнцтва адназначна ўжо не адносіць, паколькі, на ягоную думку, іх мэты не былі чыста палітычныя. У сваіх досьледах славацкі гісторык таксама прывёў базавую храналёгію ў разьвіцьці апазыцыйных плыняў у Славаччыне, якая часткова адрозьніваецца ад канцэпцыі Мілана Отагала. Інакш ім былі разьбітыя перадусім 1980-я гады. Ён вылучыў пэрыяд з 1983-га па 1987 год, які, на ягоную думку, вызначаўся «ўціскам дзейнасьці незалежных групаў». Галоўнай прычынай Юрай Маруш'як называе «атмасфэру прызнаньня немагчымасьці дасягнуць палітычных зьменаў» як рэакцыю на паразу польскай «Салідарнасьці», узрослую апатыю ў грамадзтве і пашырэньне рэпрэсіяў супраць апанэнтаў рэжыму33.

Цытаваны славацкі аўтар таксама згадаў ня надта вядомую прапанову былога прадстаўніка Хартыі-77 Пэтра Пітгарта разьмяжоўваць дысыдэнцтва пратэстнае і рэфлексійнае. Гэты падзел, аднак, цяжка прыстасаваць да канкрэтных умоваў і ацэнкі розных апазыцыйных актывістаў, бо шэраг асобаў можна залічыць у абедзьве плыні. У гэтай сувязі Юрай Маруш'як таксама наблізіў праблематычнае разуменьне тэрміну «дысыдэнцтва», якое праяўляецца ня толькі ў чэска-славацкім дыскурсе, але таксама і ў іншых посткамуністычных краінах. Адрозьненьні сталі відавочныя пры ўкладаньні «міжнароднага слоўніка дысыдэнтаў» у былым савецкім блёку, куратарам якога была варшаўская недзяржаўная арганізацыя «Карта». Паказальна, што падчас дэбатаў пра выбар пэрсаналіяў было дамоўлена азначаць тэрмін «дысыдэнт» у адносна шырокім значэньні, каб было магчыма ў адну дысыдэнцкую групу залічыць, напрыклад, падпісантаў Хатыі-77, актывістаў

«Салідарнасьці» і прадстаўнікоў крымскіх татараў: «Пад дысыдэнтамі ў гэтым разе разумеюцца людзі, якія актыўна выступалі супраць камуністычнай сыстэмы ў абарону правоў чалавека і падставовых дэмакратычных свабодаў, ініцыявалі апазыцыйную дзейнасьць, не схіляліся да гвалту, паважалі дэмакратычныя правілы ў недэмакратычным сьвеце, якім за іх дзейнасьць пагражалі рэпрэсіі, і якія дзейнічалі па-за афіцыйнымі ўладнымі структурамі»34.

Дагэтуль хутчэй на пэрыфэрыі зацікаўленьняў чэскіх і славацкіх гісторыкаў знаходзіцца сыстэматычны досьлед грамадзкага супраціву; некаторыя яго формы былі апісаныя збольшага пры вывучэньні крызавых пэрыядаў (1968–1969 і 1988–1989 гады)35. З гэтай шырокай тэмы згадайма хіба яго дзьве сумежныя плашчыні, паміж якімі адбываліся розныя праявы нязгоды. На вельмі сур'ёзнае пытаньне яшчэ некалькі гадоў таму зьвярнуў увагу гісторык Яраслаў Цугра, калі заклікаў да пошуку адказу на пытаньне ступені легальнасьці некаторых радыкальных формаў выступленьня супраць камуністычнай улады ў «нармалізацыйны» пэрыяд: «І сямідзясятыя гады маюць сваіх асуджаных «сабатажнікаў», «тэрарыстаў» і «шпегаў», і ацэньваць іх выпадкі часам гэтак жа складана, як справу братоў Машынаў. Наколькі можна ў «гісторыі апазыцыі» і яе карных санкцыяў абмінуць машыніста В. Б. ці тройцу славацкіх чыгуначнікаў, якія спрабавалі ў жнівеньскія дні перашкодзіць руху савецкіх войскаў «сабатажам» на лякаматыве? Як ацэньваць «тэрарыстаў», якія спрабавалі здабыць зброю ў акупаванай краіне? Як успрымаць «шпіянаж» у краіне, якую заняло чужое войска, а ўрад якой – гэта батлейка чужога ўраду? Не забывайма таксама, што гэты «шпіянаж» часта палягаў у інтэрвію замежным журналістам ці ў кантактах з замежнаю амбасадаю»36.

Свайго вывучэньня чакае таксама цяжка намацвальная тэма ўнутранай эміграцыі, якая ў дасьледаваны пэрыяд прэзэнтуе пэўную супрацьлегласьць згаданым выпадкам радыкальнага супраціву37. Са шматлікіх апублікаваных успамінаў вынікае, што ва ўнутраную эміграцыю занурылася значная частка былых палітвязьняў зь першых дваццаці гадоў камуністычнага рэжыму і іх сваякоў. Паказальна акрэсьліла сваё жыцьцё за

камуністычным рэжымам Здэна Машынава, чые браты сталі найзнакаміцейшым сымбалем адроджанага супраціву камуністычнай уладзе і якая сама стала аб'ектам шматгадовай цікавасьці КДБ: «Маё жыцьцё доўгія гады мела характар нейкай унутранай эміграцыі. Я цярпліва пераадольвала розныя ўціскі, засьцярогі і цкаваньні рэжыму, які мяне абсалютна беспадстаўна лічыў сваім ворагам, і ў той жа час кансьпіратыўна падтрымлівала сувязь са сваімі братамі за мяжою. Пры ўсім гэтым – як мільёны маіх тагачасных суграмадзянаў – я штодня рабіла сваю працу, адаптавалася да частковых пераменаў «сацыялістычнай рэчаіснасьці» і шукала чыста асабістай эмацыйнай стабільнасьці»[38]. З другога боку, паўстае пытаньне, наколькі гэтыя формы пасіўнага супраціву пераходзілі ў пасіўны канфармізм, бо *de facto* дапамагалі ўтрымліваць стабільнасьць рэжыму. Адным зь неспрыяльных наступстваў гэтых праяваў была вельмі пашыраная схільнасьць аддаваць перавагу індывідуальным і сямейным інтарэсам перад публічнымі, іншымі словамі, недавер жыхароў «майго-дому-маёй-крэпасьці» да людзей па-за іх колам[39].

[image]
У 1980-х гг. значную ролю ў апазыцыі пачала адыгрываць моладзь, якая прынесла з сабой новыя формы змаганьня. «Таварыства за весялейшую сучаснасьць» праславілася сваімі хэпэнінгамі. У адным зь іх узялі ўдзел (зьлева направа) Пэтар Плацак, Вацлаў Гавал, Іржы Грунтарад, Гана Марванава і Станіслаў Пэнц
(фота: Мілаш Фікейз).

ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ

Хаця чэскія і славацкія гісторыкі пашырылі дасьледаваньне супраціву камуністычнаму рэжыму ў 1968/69–1989 гадах на студэнцкія, культурныя, царкоўныя ці навуковыя асяродзьдзі (галоўным чынам, на пачатку і пры канцы згаданага пэрыяду), усё яшчэ бракуе падрабязьнейшага гістарычнага дасьледаваньня і сынтэтычнага кшталту меркаваньняў аб адмаўленчых рэакцыях розных слаёў грамадзтва на навязаную палітычную сыстэму, ня кажучы пра адсутнасьць неабходнага

параўнаньня з папярэднім этапам камуністычнага рэжыму (1948–1968/69), паваенным пэрыядам (1945–1948) і нацысцкай акупацыяй (1938–1945) або з антыаўстрыйскім рэзыстансам у пэрыяд Першай сусьветнай вайны (1914–1918). Адсутнасьць масавых публічных пратэстаў, якія, уласна, і акрэсьліваюць час другой паловы камуністычнага рэжыму (1968–1969 гады і 1988–1989 гады) – гэта, відавочна, адна з прычынаў, чаму тэме грамадзкага супраціву ў параўнаньні з польскім і нямецкім дыскурсам надаецца ўвага толькі пры дасьледаваньні сыстэмных крызаў камуністычнага рэжыму, і чаму выразна пераважаюць гістарычныя досьледы апазыцыі ў традыцыйным разуменьні паняцьця «дысыдэнцтва» (да таго ж толькі на ўзроўні знакамітых асобаў), якое, канечне, было сфармулявана яшчэ да 1989 году40.

Выбітную ролю пры дасьледаваньні, канечне, сыграў і той факт, што, нягледзячы на пэўнае паляпшэньне, дагэтуль – празь пятнаццаць гадоў пасьля падзеньня камуністычнага рэжыму – з розных прычынаў немагчыма сыстэматычна працаваць у дзяржаўных архівах, дзе захоўваюцца сотні кілямэтраў дакумэнтаў41. Зь іншага боку, з прыведзеных нямецкіх і польскіх прыкладаў ускрай відавочна, што немагчыма стварыць такую тыпалёгію, якая б вычарпальным чынам уключала ўсе праявы нязгоды з камуністычным рэжымам. Галоўная прычына, зь якой усё-ткі важна спрабаваць выбудоўваць такія тыпалёгіі – гэта, нягледзячы на агучаную вышэй скаргу што да навуковых магчымасьцяў, вялізнае мноства архіўных дакумэтаў, якія пасьля падзеньня камуністычнага рэжыму паступова робяцца даступнымі для гістарычнага дасьледаваньня. Ужо толькі гэты аб’ём патрабуе сыстэматычнага падыходу і дбайнага вызначэньня тэматыкі. Вядома ж, неабходна імкнуцца ахайна падыходзіць да кожнага факту дасьледаваньня, камбінаваць розныя тыпы крыніцаў і, наколькі гэта магчыма, ужываць і ўспаміны ўдзельнікаў падзеяў. Нялішне скарыстоўваць і кампаратыўныя мэтады, паколькі параўнаньне з сытуацыяй у іншых краінах савецкага блёку дазваляе больш дасканала зразумець і ўнівэрсальныя, і спэцыфічныя рысы падзеяў у Чэхаславаччыне.

Пераклала з чэскай Марыя Мартысевіч

[1] Тэкст паўстаў на аснове сьціслага агляду, зробленага аўтарам на кангрэсе чэскіх палітолягаў. Параўн. BLAŽEK, P.: Opozice a odpor: K typologii nesouhlasu s komunistickým režimem v Československu 1968–1989. In: DVOŘÁKOVÁ, V. – HEROUTOVÁ, A. (eds.): *II. kongres českých politologů*: Praha – Suchdol, 5–6.09.2003. Praha 2003, s. 261–270. [↑]

[2] У шырокім сэнсе паняцьце «апазыцыя» паходзіць ад лацінскага слова *opponere*, якое мае ў чэскім перакладзе два галоўныя значэньні: «класьці насупраць» і «супрацьстаўляць». Адзін з чэскіх слоўнікаў замежных словаў дае тры асноўныя сэмантычныя палі гэтага паняцьця: 1) супраціў, нязгода з уладаю, паноўнай асобаю, паноўнай думкаю, меркаваньнем і пад., як правіла, абвешчаны публічна; супраціў, лягічныя дачыненьні ўзаемавыключальных паняцьцяў альбо суджэньняў, моўная супрацьлегласьць; 2) частка парлямэнту, палітычнай партыі альбо іншай публічнай інстытуцыі, што стварае адпор другой частцы, якая мае перавагу і зьяўляецца паноўным складнікам; 3) супрацьлеглая пазыцыя, астранамічная пазыцыя нябеснага цела, калі паміж ім і Сонцам знаходзіцца Зямля такім чынам, што яны ўтвараюць адну лінію; анатамічная апазыцыя вялікага пальца – яго здольнасьць заняць пазыцыю насупраць астатніх пальцаў. (KLIMEŠ, L.: *Slovník cizích slov*. Praha 1981, s. 491.) [↑]

[3] Параўн. DVORAKOVÁ, V. – KUNC, J.: *O přechodech k demokracii*. Praha 1994, s. 41–44; BLONDEL, J.: *Systémy vlády*: Srovnávací studie. In: ŘÍCHOVÁ, B. – LISA, A.: Antologie světových politologů. Praha 1995, s. 145–167. [↑]

[4] KAMIŃSKI, Ł.: *Polacy wobec nowej rzeczywistości 1944–1948*. Toruń 2000, s. 6. Параўн. з дэфініцыяй тэрміну «апазыцыя» ў паліталягічнай літаратуры, дзе збольшага вядзецца пра апазыцыю ў дзьвюх асноўных плашчынях. Пад унівэрсальна сфармуляваным паняцьцем «апазыцыя» ў шырэйшым сэнсе разумеецца «якая-кольвек форма артыкуляцыі нязгоды з паноўнай палітыкай і/альбо палітычным рэжымам», а пад тым жа тэрмінам у вузейшым значэньні – «фармальныя палітычныя арганізацыі, мэтай якіх ёсьць здабыцьцё ўлады альбо

дасягненьне зьмены палітычнага рэжыму». KRAWCZYK, T.: Opozycja polityczna w państwach demokratycznych. In: CZAJOWSKI, A. – SOBKOWIAK, L. (eds.): *Studia z teorii polityki*. Tom III, Wrocław 2000, s. 132.

[5] SKILLING, H. G.: Opposition in Comunist East Europe. In: DAHL, R. A. (ed), *Regimes and Oppositions*. New Haven 1973, p. 90–94. Параўн.: SKILLING, H. G.: Background to the Study of Opposition in Communist Eastern Europe. In: SCHAPIRO, L. (ed.): *Political Opposition in one-party System*. London 1972. Пэтрушка Шустрава пераклала два са згаданых чатырох тыпаў «апазыцыі ў аднапартыйнай дзяржаве» з дапамогай іншых тэрмінаў: 1) інтэгральная («апазыцыя самой камуністычнай сыстэме, якая схавана альбо адкрыта выражала неляяльнасьць і ўжывала формы рэвалюцыйнай змовы альбо падпольнай дзейнасьці»); 2) базавая («крытычная апазыцыя ў ключавых палітычных пытаньнях, якая пры гэтым не адмаўляла сыстэмы як такой»); 3) фракцыйная («кіраваная асобнымі партыйнымі функцыянэрамі ў найвышэйшых органах партыі і ўлады, якія сумняваліся ў правільнасьці партыйнай лініі альбо імкнуліся здабыць уладу для сябе»); 4) спэцыфічная («апазыцыя канкрэтным захадам рэжыму, г. зн. нейкі від «ляяльнай апазыцыі», якая звычайна дзейнічала ў інтарэсах канкрэтных прафэсійных групаў, такіх як пісьменьнікі, праўнікі, эканамісты»). Параўн.: SKILLING, H. G.: *Československo – můj druhý domov*. Praha 2001, s. 251–252. [↑]

[6] TÖKÉS, R. L. (ed.): *Dissent in the USSR*: Politics, Ideology, and People. Baltimore – London 1975, p. 13–19. [↑]

[7] Параўн. STRMISKA, Z.: *Sociální systém a strukturální rozpory společností sovětského typu*: Projekt analýzy. Köln 1983. [↑]

[8] Надзіва шырокая, на першы погляд, дыскусія вакол тэрміналёгіі антыкамуністычнага супраціву ў нямецкім дыскурсе была зьвязаная са спрэчкамі наконт праяваў супраціву нацысцкаму рэжыму. Параўн.: KAMIŃSKI, Ł.: Ruch oporu, opozycja, opór społeczny. In: RUCHNIEWICZ, K. (ed.): *Powstanie czerwcowe v NRD w 1953 roku na tle innych wystąpień antykomunistycznych w krajach Europy Środkowo-Wschodniej*. Wrocław 2003, s. 14. [↑]

[9] Апошнім часам гэткія ж выключэньні з той самай прычыны сфармуляваў таксама польскі гісторык Анджэй Пачкоўскі, як канкрэтныя прыклады ён называў «праявы хуліганства» ці эканамічныя матывы часткі страйкоўцаў (якія часта пераважалі ў першай фазе рабочых хваляваньняў). PACZKOWSKI, A.: *Strajki, bunty, manifestacje jako «polska droga» przez socjalizm*. Poznań 2003, s. 12–13. [↑]

[10] Самаазначэньні апанэнтаў істотныя для выбудовы рэтраспэктыўнай візіі ў меншай ступені, чым гэта магло здавацца на першы погляд. Гэта ілюструецца ў тым ліку фактам, што тэрміны «незалежная ініцыятыва», «вольнае меркаваньне» ці «неафіцыйны рух за мір», ужываныя ў 1970-я і 1980-я гады апазыцыйнымі групамі ў шэрагу дзяржаваў савецкага блёку, служылі толькі дла самаўсьведамленьня і камунікацыі і пасьля падзеньня камуністычнага рэжыму амаль зьніклі з публічнага дыскурсу. Гэтаксама для верагоднай тыпалёгіі непрыдатна ўжываць фразэалёгію ўладнага апарату – у публічных кампаніях супраць рэальных і ўяўных непрыяцеляў імі найчасьцей ужываліся тэрміны «контрарэвалюцыянэры», «варожыя элемэнты», «антысацыялістычныя сілы», «ідэалягічныя дывэрсанты» ці «рэвізіяністы». NEUBERT, E.: *Geschichte der Opposition in der DDR 1949–1989*. Bonn 1997, s. 27. [↑]

[11] Зь іншага боку, трэба падкрэсьліць, што нямецкія гісторыкі шырока ўжывалі для ўсяго пэрыяду гісторыі НДР унутраныя тэрміны сакрэтнай палітычнай паліцыі, якая стварыла ў сваіх аналітычных дакумэнтах самыя разнастайныя тыпалёгіі апазыцыйных дзеячаў. Як пацьвяржае досьвед гісторыкаў іншых таталітарных і аўтарытарных рэжымаў, дакумэнты сакрэтнай палітычнай паліцыі таксама істотныя для параўнаньня візіі рэпрэсіўнага апарату на розных гістарычных этапах і дбайнай рэканструкцыі відаў апазыцыйнай чыннасьці, пра якія няма іншых зьвестак. Параўн.: ŽÁČEK, P.: *Boje o minulost*: Deset let vyrovnávání se s komunistickou minulostí – pokus o předběžnou bilanci. Brno 2000, s. 30–33. На маргінэсе зазначым, што ў рапартах для кіраўніцтва Кампартыі Чэхаславаччыны кіраўніцтва міністэрства ўнутраных справаў цягам цэлых 40 гадоў апісвала апанэнтаў рэжыму выключна «клясавым»

слоўнікам (напрыклад, «элемэнты», «унутраныя непрыяцелі», «антысацыялістычныя сілы»); калі ўжываўся ўласна тэрмін «апазыцыя», ён амаль заўсёды пісаўся ў дзьвюхкосьсі – як праява зьнявагі гэтага (сама)азначэньня. Пра застой «нармалізацыйнай» Чэхаславаччыны красамоўна сьведчыць факт, што згаданая рыторыка да самага лістапада 1989 году не зьмянілася. BLAŽEK, P.: Setkání představitelů československé a polské opozice na státních hranicích 1978–1989, In: HRODEK, D. (ed.): *Česká a polská historická tradice a její vztah k současnosti*: Pardubická konference (18–20 dubna 2002). FF UK, Praha 2003, s. 177–209. [↑]

[12] NEUBERT, E.: *Geschichte der Opposition*, s. 28–29. [↑]

[13] KOWALCZUK, I. S.: Von der Freiheit, Ich zu sagen: Widerständiges Verhalten in der DDR. In: Poppe, U. – ECKERT, R. – KOWALCZUK, I. S. (eds.): *Zwischen Selbstbehauptung und Anpassung*. Berlin 1995, s. 85–115; KOVALCZUK, I. S.: Przeciwstawne siły: opozycja (Opposition) i ruch oporu (>): Problemy pojęciowe i metodologiczne. In: KAMIŃSKI, Ł. (ed.): *Studia i materiały z dziejów opozycji i oporu społecznego*. Tom IV, Wrocław 2000, s. 122. Значэньне царкоўных супольнасьцяў для паступовага фармаваньня «новага» апазыцыйнага асяродзьдзя апісаў таксама Штэфан Воле ў манаграфіі пра апошняе дваццацігодзьдзе НДР: «З канца 1970-х гадоў паўставалі лябільныя трохкутнікавыя дачыненьні паміж царквою, дзяржавай і гэтым маленькім, але вельмі актыўным згрупаваньнем, якое займалася агульнымі пытаньнямі міру, навакольнага асяродзьдзя і правоў чалавека. Ніводны з партнэраў ня быў цалкам маналітным, і ўсе тры падлягалі параўнальнаму структурнаму ўнутранаму напружаньню, якое, аднак, стварыла складаную раўнавагу ў вонкавых дачыненьнях». WOLLE, S.: *Die heile Welt der Diktatur*: Alltag und Herrschaft in der DDR 1971–1989. Berlin 1998, s. 254. [↑]

[14] KNABE, H.: Was war die «DDR-Opposition»? Zur Typologie des politischen Widerspruch in Ostdeutschland. In: *Deutschland Archiv*, 1995, ą 2, s. 184–198. [↑]

[15] Анджэй Фрышке вызначыў тры галоўныя этапы фармаваньня апазыцыі і супраціву ў камуністычнай Польшчы:

1940-я, 1956–1980 гады і апошнюю дэкаду. Для першага пэрыяду ён ужывае тры катэгорыі апазыцыі, якія адрозьнівае паводле іх стаўленьня да камуністычнага рэжыму: асноўная (адмаўляла кампрамісныя дзеяньні, тыповай для яе была кансьпіратыўная дзейнасьць), прагматычная (пагадзілася на супрацоўніцтва з камуністамі, але лічылася з абмежаваньнем іх моцы) і пазытывісцкая (адмаўляла непасрэдную палітычную барацьбу, імкнулася да ўтрыманьня культурных і народных традыцыяў). FRISZKE, A.: *Opozycja polityczna 1945–1980*. FRISZKE, A.: Opozice a odpor v poválečných polských dějinách. In: Soudobé dějiny, roč. 4 (1997), č. 2, s. 265–291; FRISZKE, A.: Opozycja polityczna 1945–1980. Londyn 1994, s. 5; FRISZKE, A.: Opór społeczny w PLR 1956–1980: Tezy, uwagi, pytania. In: KAMIŃSKI, Ł. (ed.): *Studia i materiały z dziejów opozycji i oporu społecznego*. Tom IV, Wrocław 2000, s. 122. [↑]

[16] STRZEMBOSZ, T.: Polacy w PLR – sprzeciw, opozycja, opyr. In: *Studia polityczne*, № 11 (2000), s. 137–157, FRISZKE, A.: Opozice a odpor v poválečných dějinách Polska. In: *Soudobé dějiny*, roč. 4 (1997), č. 2, s. 266. Параўн.: KAMIŃSKI, Ł.: Ruch oporu, opozycja, opór społeczny, s. 15. [↑]

[17] Для пэрыяду 1944–1948 гадоў на аснове сацыяпсыхалягічнай тэрміінаёгіі ён таксама стварыў базавую тыпалёгію паводзінаў палякаў у дасьледаваны пэрыяд, якая вагалася перадусім паміж супрацівам (агрэсіяй), канфармізмам (ухіленьнем) і ангажаваньнем (успрыняцьцем). Параўн.: KAMIŃSKI, Ł.: *Polacy wobec nowej rzeczywistości*, s. 8, 251. [↑]

[18] Застаецца пытаньнем, наколькі ў сувязі з камуністычным рэжымам можна казаць пра розныя «прымітыўныя» формы грамадзкага супраціву, як Лукаш Камінскі азначаў (сьледам за ангельскім гісторыкам Эрыхам Гобсбаўмам, дасьледчыкам архаічных формаў сацыяльнага руху XIX і XX стагодзьдзяў) хуліганства, бандытызм, сэктанцтва ці алькагалізм. KAMIŃSKI, Ł.: Ruch oporu, opozycja, opór społeczny, s. 13–19. [↑]

[19] Сутнасьць сацыяльнага і культурнага асяродку як вызначальнага апісаў у гэтым кантэксьце, напрыклад, ужо згаданы Губэртус Кнабэ ў канцы 1980-х. Адным зь нямногіх аўтараў у чэскім дыскурсе, які задумваўся над існаваньнем

«вартай увагі» сумежнай плашчыні паміж заходнеэўрапейскай тэорыяй новых сацыяльных рухаў 1970-х і 1980-х і тутэйшым незалежным дысыдэнцкім мысьленьнем, г. зн. над тэмаю дыскусіяў нямецкіх гісторыкаў ужо напрыканцы 1980-х гадоў, быў гісторык Іржы Сук. У нядаўна выдадзенай манаграфіі пра «чэхаславацкую рэвалюцыю» ён назваў сваё назіраньне простай гіпотэзай, якую трэба будзе пацьвердзіць, асэнсаваць і адкласьці толькі пасьля падрабязнага вывучэньня. На аснове абраных сацыялягічных канцэптаў ён сфармуляваў некалькі цікавых пытаньняў: «Ці не падобны праект камунікатыўнай этыкі да праекту ўсеагульнага дыялёгу, які ўвасобіла Хартыя-77 і пераняў ад яе «Грамадзянскі форум»? Ці не адпавядае дзейнасьць Хартыі-77 (а значыцца, і ідэя «Грамадзянскага форуму» Гаўла) меркаваньню Мэлючы, што сучасныя сацыяльныя рухі будуць не палітычнымі акторамі, а кантралёрамі палітычнага працэсу, носьбітамі дэмакратызацыі штодзённага жыцьця? Ці параўнальная Хартыя-77 з ключавою характарыстыкаю Бюхлера, ці можам мы назваць Хартыю ня надта моцным, але выразным зародкам новых сацыяльных рухаў ва ўмовах таталітарнага рэжыму савецкага тыпу?» SUK, J.: *Labyrintem revoluce*: Aktéři, zápletky a křižovatky jedné politické krize. Praha 2003, s. 73. [↑]

[20] NEUBERT, E.: *Geschichte der Opposition*, s. 27. Параўн.: RAJEWSKI, A.: *Jidášův komplex*: Zraněná církev: Křesťané ve střední a východní Evropě mezi odporem a kolaborací. Praha 2002. [↑]

[21] KENNEY, P.: *A Carnival of Revolution*: Central Europe 1989. Princeton–Oxford 2002, p. 10–12. [↑]

[22] Параўн. з запісам унутранага сэмінару Інстытуту найноўшай гісторыі Акадэміі навук Чэскай Рэспублікі 11.02.2004, які быў прысьвечаны гэтай тэме: VILÍMEK, T.: *Typologie a nositelé opozice a odporu v NDR 1949–1989*; OTÁHAL, M.: *Opozice v českých zemích (1969–1989)*; BLAŽEK, P.: *Polská debata nad termíny opozice a odpor proti komunistickému režimu*. In: usd.cas.cz. [↑]

[23] Параўн.: BLAŽEK, P.: Výbor na obranu Ivana Polanského: Limity spolupráce českého a slovenského opozičního hnutí. In: KMEŤ, N. – MARUŠIAK, J. (eds.): *Slovensko a režim normalizácie*.

Prešov 2002, s. 215–221. [↑]

[24] У камуністычнай Чэхаславаччыне мелі месца дзьве вялікія хвалі вялікіх палітычных працэсаў: адна ў 1948–1954 гадах і другая на пачатку 1970-х. Абедзьве хвалі значна адрозьніваліся паводле ступені і формаў перасьледу: «Першая хваля адзначалася непараўнальна большай жорсткасьцю, да правакатыўнасьці адкрытаю незаконнасьцю і амаль усеагульным ужываньнем фізычнага гвалту. Пасьля 1969 году арганізатары працэсаў ужо баяліся ўжываць сьледчыя прыёмы ў такім маштабе і з такой жорсткасьцю. У 1970–1972 гады юстыцыя асудзіла за палітычную дзейнасьць 47 887 чалавек, тым часам як у 1948–1954 гадах амаль удвая больш, а менавіта 95 600 чалавек. Паміж гэтымі дзьвюма хвалямі (то бок у 1955–1969 гады) суды вынесьлі выракі больш як 57 749 абвінавачаным, рэабілітаваным пасьля паводле закону 1990 году». KAPLAN, K. – PALEČEK, P.: *Komunistický režim a politické procesy v Československu*. Brno 2001, s. 40. Гісторык Яраслаў Цугра, аднак, зьвярнуў увагу, што большасьць выракаў у 1970-х гадах тычылася параграфу 109 пра выезд з рэспублікі. Параўн.: CUHRA, J.: *Trestní represe odpůrců režimu v letech 1969–1972*. Praha 1997, s. 10. [↑]

[25] Зора Дворжакава мяркуе, што спачатку ў грамадзтве прысутнічалі поруч з паступова аслабелымі праграмнымі праявамі вызвольнай барацьбы (палітычныя і вайсковыя групы, інфармацыйная дзейнасьць, распаўсюд улётак, нелегальныя часопісы) таксама адносна пашыраныя пасіўныя формы адмаўленьня рэжыму (унутраная эміграцыя, захаваньне пабожнасьці альбо «сьвядомае непадпарадкаваньне таталітарнаму рэжыму»). Праўда, ейная выснова выглядае на праблематычную: «Такім чынам, дарэчна ўжываць як тэрмін «вызвольны рух» (odboj), так і тэрмін супраціў (odpor), каб выславіць цэлы спэктар фактаў, якія тут гучалі, так што няма прычыны скептычна ставіцца да тэрміну «камуністычны супраціў» як абагульняльнай назвы для ўсяго гэтага». Параўн.: DVOŘÁKOVÁ, Z.: Charakteristika třetího odboje. In: BABKA, L. – VEBER, V. (eds.): *Za svobodu a demokracii*: Třetí (protikomunistický) odboj. Hradec Králové 2002, s. 20–26. [↑]

[26] Самай непасрэднай прычынай гэтай хвалі рэпрэсіяў быў таксама ўпор шэрагу вядомых апанэнтаў рэжыму на праклямаваную легальнасьць дзеяньняў, што было тыповым, напрыклад, для многіх «забароненых» пісьменьнікаў да сярэдзіны 1970-х гадоў. Праўдападобна, што да гэтага падыходу прывёў і той факт, што датуль яны часта яшчэ захоўвалі надзею на магчымыя зьмены абставінаў. На маргінэсе дадамо, што ў тагачаснай эміграцкай публіцыстыцы (Здэнек Гейзлар) гучала невыпадковае спалучэньне «ляяльная апазыцыя». Параўн.: BLAŽEK, P.: Člen-korespondent ČSAV JU Dr. Jiří Hájek (1968–1976): Od komunistické strany k opozičnímu hnutí. In: KOSTLÁN, A. (ed.): *Věda v Československu v období normalizace (1970–1975)*. Praha 2002, s. 447–448. На маргінэсе зазначым яшчэ, што напачатку 1970-х было палітычна маргіналізаванае нэасталінісцкае крыло Кампартыі Чэхаславаччыны, калі магчыма так апісаць неаднародную групу непадатлівых прыхільнікаў камуністычнай дыктатуры, якія сустракаліся ў рэстарацыі «Чэхія» ў праскім раёне Лібэнь. Параўн.: MAŇÁK, J.: *Čistky v Komunistické straně Československa 1969–1970*. Praha 1997, s. 80. [↑]

[27] OTÁHAL, M.: *Normalizace 1969–1989*: Příspěvek ke stavu bádání. Praha 2002, s. 68–69; TUCKER, A.: *Fenomenologie a politika*: Od J. Patočky k V. Havlovi. Olomouc 1997; DAYOVÁ, B.: *Sametoví filozofové*. Brno 1999. Гісторык Мілан Отагал вылучыў для дакладнага супрацьпастаўленьня пераважнаму адмаўленьню палітычных разваг у асяродзьдзі Хартыі-77 «рэалістычную групу», зь якой у лістападзе 1989 году разьвілася першая палітычная партыя, утвораная па-за «Нацыянальным фронтам» – Чэхаславацкая дэмакратычная ініцыятыва (пазьней Лібэральна-дэмакратычная партыя). Яе ўплыў на грамадзтва, аднак, быў мінімальны, да таго ж прадстаўнікі Хартыі-77 стаялі ля калыскі палітычнай праграмы, якая патрабавала плюралізму палітычнай барацьбы, скасаваньня галоўнай ролі партыі ці адраджэньня прыватнага прадпрымальніцтва (у 1988 годзе – асноўныя пункты, абвешчаныя Рухам за грамадзянскую свабоду «Дэмакратыя для ўсіх», які ў адрозьненьне ад «Дэклярацыі Хартыі-77» знайшоў водгук таксама і ў Славаччыне). З гэтай прычыны для апошняга пэрыяду камуністычнага рэжыму дарэчна ўжываць тэрмін «палітычная апазыцыя», хоць яна і

была абцяжарана «антыпалітычнай» традыцыяй Хартыі-77 і да самага лістапада 1989 году ня здолела стварыць дзейснай рэпрэзэнтацыі. Ілюструе гэта факт, што яна ўжо мела ў сабе плюральныя зародкі будучага палітычнага спэктру і істотна спрычынілася да заснаваньня «Грамадзянскага форуму» і «Грамадзкасьці супраць гвалту». Да таго ж паступова фармавалася, гэтаксама, як і ў 1968 годзе, апазыцыйная плынь у культурным, навуковым і студэнцкім асяродзьдзі, прыкметы ажыўленьня таксама можна было прасачыць у сатэлітных палітычных партыях і рухах, асабліва ў Чэхаславацкай народнай партыі і Сацыялістычным саюзе моладзі. У той жа час застаецца пытаньнем, наколькі ўвогуле магчыма казаць у дачыненьні да канца 1980-х пра верагодную апазыцыйную плынь унутры ўладнай партыі (напрыклад, у Славаччыне). Параўн.: OTÁHAL, M.: *Opozice, moc, společnost 1969–1989*: Příspěvek k dějinám normalizace. Praha 1994; PREČAN, V.: Opětovné vynoření občanské společnosti: Nezávislé občanské aktivity v komunistickém Československu 70. a 80. let. In: *Česká a slovenská společnost v období normalizace 2003*: Liberecký seminář 2001. Bratislava 2003, s. 166–177. [↑]

[28] Наконт трэцяга вызвольнага руху параўн.: VEBER, V. – BABKA, L. (eds.): *Za svobodu a demokracii III*.: Třetí (protikomunistický) odboj. Hradec Králové 2002. Пэрсанальны працяг «новай хвалі» апазыцыі супраціўнікамі камуністычнага рэжыму з паваеннага пэрыяду быў найслабейшы ў НДР, што было, відавочна, абумоўлена значнай колькасьцю палітычных уцекачоў; наадварот, выразная спадкаемнасьць назіралася ў некаторых групаў у Польшчы, сымбалізавала яе і, напрыклад, жывая традыцыя супраціву Арміі краёвай. Параўн.: WEBER, H.: *Dějiny NDR*. Praha 2003, s. 281–282. [↑]

[29] Нездарма падпісант Хартыі Даніэл Кроўпа ахарактарызаваў Хартыю-77 як вельмі разнародную супольнасьць: «Сёньня людзі глядзяць на Хартыю як на нейкую маналітную структуру. Насампраўдзе гэта былі разрозьненыя групкі. З большасьцю рэформавых камуністаў Хартыі, так званым Е-клюбам, я пазнаёміўся пасьля рэвалюцыі. На нашае асяродзьдзе каталікоў і эвангелікаў моцна ўплывалі вязьні 1950-х гадоў, для мяне такімі асобамі былі а. Голуб, заўчасна памерлы Аця Мандл, а.

Дворжак і многія іншыя. Апальныя сьвятары мелі ў сабе іншую сьвятарнасьць, чым мы ведалі ад парафіяльных айцоў, што жылі, прывязаныя да сваіх парафіяў. Сьвятарства пакутнікаў, закранутае чалавецтвам, было для нас, маладых, вялізнай сілай. У 1970-х гадах афіцыйная царква была для мяне чымсьці, што сталася блізкім рэжыму, таму я ўнікаў яе». (KROUPA, D.: *Svoboda a řád (sváteční rozhovory)*. Praha 1996, s. 13–14.) [↑]

[30] NOVÁK, M.: Systémy politických stran a základní modely opozice. In: *Sociologický časopis*, roč. 31 (1997), č. 3, s. 307. Менавіта ў гэтым кантэксьце Іржы Пршыбань казаў аб прагматычных стратэгіях «антыкамуністычнага дысыдэнцтва», мэтай якога было агаліць сутнасьць (пост)таталітарнага рэжыму, паказваючы фармальны характар яго легальнасьці. PŘIBÁŇ, J.: *Disidenti práva*: O revolucích roku 1989, fikcích legality a soudobé verzi spolecenske smlouvy. Praha 2001, s. 214–223. Параўн.: HAVELKA, M.: «Nepolitická politika»: kontexty a tradice. In: *Sociologický časopis*, roč. 34 (1998), č. 4, s. 461–465; FIALA, P. – HOLZER, J. – MAREŠ, M. – PŠEJA, P.: *Komunismus v České republice*. Vývojové, systémové a ideové aspekty působení KSČM a dalších komunistických organizací v české politice. Brno 1999, s. 66.

[31] Параўн.: KMEŤ, N.: Disent. In: KMEŤ, N. – MARUŠIAK, J. (eds.): *Slovensko a režim normalizácie*. Prešov 2003, s. 280–287. [↑]

[32] JECHOVÁ, K.: *Lidé Charty 77*: Zpráva o biografickým výzkumu. Praha 2003, s. 144.

[33] MARUŠIAK, J.: Nezávislé iniciativy na Slovensku v rokoch normalizácie. In: PEŠEK, J. – SZOMOLÁNYI, S. (eds.): *November 1989 na Slovensku*: Súvislosti, predpoklady a dôsledky: Štúdie a úvahy. Bratislava 2000, s. 71. [↑]

[34] Тамсама, s. 55. [↑]

[35] PECKA, Jindřich: Proměny Pražského jara ve světle pramenů spontánní povahy. In: PECKA, Jindřich – PREČAN, Vilém (ed.): *Proměny Pražského jara 1968–1969*: Sborník studií a dokumentů o nekapitulantských postojích v československé veřejnosti. Praha–

Brno 1993, s. 39–66; PECKA, Jindřich: *Spontánní projevy Pražského jara 1968–1969*. Praha–Brno 1993; PLACÁK, P.: StB a «protizákonné písemnosti» v osmdesátých letech. In: *Securitas Imperii*, č. 1, Praha 1994, s. 32–59; TŮMA, Oldřich: *Zítra zase tady!* Protirežimní demonstrace v předlistopadové Praze jako politický a sociální fenomén. Praha 1994; BLAŽEK, P. – LAUBE, R. – POSPÍŠIL, F.: *Lennonova zeď v Praze*: Neformální shromáždění mládeže na Kampě 1980–1989. Praha 2003; ŠIMULČÍK, Ján: *Čas svitania*: Sviečková manifestácia – 25 marec 1988. Prešov 1998. [↑]

[36] CUHRA, J.: *Trestní represe odpůrců režimu*, s. 8. Дадамо яшчэ два пытаньні на гэтую тэму, адказы на якія патрабуюць падрабязнага і дбайнага вывучэньня акалічнасьцяў кожнага выпадку. Ці ёсьць праяваю гэтага тыпу супраціву таксама ўзброеныя ўгоны розных транспартных сродкаў пры спробе эміграцыі? Як інтэрпрэтаваць выбухі перад будынкамі арганізацыяў Кампартыі Чэхаславаччыны альбо ананімныя тэлефонныя званкі і пісьмовыя пагрозы партыйным функцыянэрам напрыканцы 1980-х? [↑]

[37] На думку сацыёляга Радзіма Марады, у пэрыяд «дзяржаўнага сацыялізму» праявы дыстанцыяваньня ад рэжыму набывалі, «як правіла, выгляд агульных культурных праяваў (вопратка, мастацкі густ, нонканфармісцкія спосабы бавіць вольны час), альбо яны былі абмежаваныя непублічнай прастораю (прыватныя размовы, палітычныя анэкдоты, зьмест хатняй бібліятэкі альбо, напрыклад, рэгулярнае слуханьне радыёстанцыяў «Свабодная Эўропа» ці «Голас Амэрыкі»)». Таксама публічнае выражэньне адыходу альбо апазыцыі набывала перадусім форму «культурна кадаванага паведамленьня, якое мела неадназначны палітычны статус». MARADA, R.: *Kultura protestu a politizace každodennosti*. Brno 2003, s. 24. [↑]

[38] MAŠÍNOVÁ, Z. – MARTIN, R.: *Čtyři české osudy*: Tragický úděl rodiny Mašínovy. Praha–Litomyšl 2001, s. 252. Яшчэ выразьней разуменьне ўнутранай эміграцыі сфармуляваў паэт і перакладчык Ян Забрана, чые бацькі правялі агулам дваццаць гадоў у камуністычных турмах. У 1966 годзе ён запісаў у свой дзёньнік: «Уступаць зь імі [з камуністычнаымі ўладамі] у

дыскусію (напрыклад, проста лаяць іх – што ніяк не мяняе стану рэчаў) – значыць прызнаць іх. Адзінае выйсьце свабоднага: не адказваць на пытаньні, на іх пытаньні, адзіная магчымасьць існаваньня: не існаваць супраць улады, але існаваць каля яе, паралельна зь ёю». Цытуецца паводле: PILAŘ, M.: *Underground*: Kapitoly o českém literárním undergroundu. Brno 2002, s. 8. [↑]

39 VANČURA, J.: Občan a totalitní stát. In: VANČURA, J. (ed.): *Proč jsme v listopadu vyšli do ulic*. Brno 1999, s. 94. Сацыёляг Іва Можны ўжо ў 1991 годзе апублікаваў эсэ, дзе тлумачыў хуткасьць і нечаканасьць падзеньня камуністычнага рэжыму акурат «сямейнымі прычынамі». Галоўнай прычынай было, паводле яго ўласнага цікавага, аднак некалькі спрошчанага меркаваньня, тое, што большая частка грамадзтва адмаўляла сваю эканамічную залежнасьць ад навязваньня сымбалічнага капіталу і бессэнсоўнай рытуалізацыі штодзённага жыцьця. Гісторыкі мусілі б паспрабаваць знайсьці таксама падыходы да дасьледаваньня гэтага пытаньня, якое належыць, паводле сваёй скіраванасьці, да сацыяльна-культурнай гісторыі. Параўн.: MOŽNÝ, I.: *Proč tak snadno…*: Některé rodinné důvody sametové revoluce. Praha 1999. [↑]

40 Увага згаданых гістарычных дасьледаваньняў да таго ж пасьлядоўна засяроджваецца амаль выключна на пасьлялютаўскім пэрыядзе, Праскай вясьне, пачатку т. зв. нармалізацыі, заснаваньні Хартыі-77 і канцы 1980-х гадоў. Чэскія і славацкія гісторыкі амаль цалкам абышлі ўвагай гісторыю эміграцкай апазыцыі, дзе дасьледаваньне часта ўскладненае недаступнасьцю архіўных дакумэнтаў. Пра крыху аднабаковую арыентацыю чэскіх гістарычных штудыяў апазыцыі і супраціву камуністычнаму рэжыму ў пэрыяд т. зв. нармалізацыі сьведчыць ужо сам факт, што адзіная важкая дыскусія чэскіх гісторыкаў тычылася інтэрпрэтацыі ўплыву Хартыі-77 на грамадзтва. Найвядомейшая палеміка адбылася паміж Міланам Отагалам і Вілемам Прэчанам; яе трапна ахарактарызаваў палітоляг Іржы Кунц: «Тое, што адрозьнівае абодвух галоўных гісторыкаў дысыдэнцтва – гэта пэрспэктыва. Прэчан кажа пра кантэкст эпохі і магчымасьці адкрыцьця нейкіх пераменаў з гледзішча антырэжымнага дысыдэнцтва.

Отагал з пэўнай дыстанцыі разглядае палітычныя межы такога тыпу адкрыцьця. […] Падсумоўваючы, магу дадаць да гэтай дыскусіі, што праблемаю застаецца цэлая сфэра палітыкі, якая з гледзішча клясычнага лібэралізму і клясычнага марксізму (і ў ленінскай традыцыі) праяўляецца толькі як сфэра сутыкненьня папярэдне створаных суб'ектаў. У першым выпадку гатовых і рацыянальных актывістаў, у другім выпадку – кампактных клясаў». KUNC, J.: *Stranické systémy v rekonstrukci*: Belgie, Itálie, Španělsko, Československo, Česká republika. Praha 2000, s. 187–188. [↑]

[41] Універсытэцкі гісторык, напрыклад, ня мае практычнай магчымасьці вывучаць інвэнтарныя сьпісы фондаў ці справаздачы асобных аддзелаў Міністэрства ўнутраных справаў у Архіве МУС ЧР. Прыняцьце папраўкі да артыкулу 140/1996 Sb «Аб адкрыцьці доступу да матэрыялаў, што паўсталі празь дзейнасьць былой Дзяржаўнай бясьпекі», які, несумнеўна, значна мяняе стан рэчаў у гэтай галіне, пакуль не прынесла істотных зьменаў. Гэтак жа і немагчымасьць вывучаць адначасова больш за пяць інвэнтарных адзінак з былога архіву ЦК КСЧ (які сёньня месьціцца ў Дзяржаўным цэнтральным архіве і збольшага неўпарадкаваны) не дае дасьледчыкам дастатковай прасторы для сыстэматычнага дасьледаваньня. Зь іншага боку, сытуацыя ў заходніх архівах яшчэ горшая, бо там дзейнічае мінімум трыццацігадовы тэрмін засакрэчваньня дакумэнтаў. Параўн.: CHURAŇ, M. a kol.: *Encyklopedie špionáže*: Ze zákulisí tajných služeb, zejména Státní bezpečnosti. Praha 2003, s. 10–11. [↑]

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/11/12**
[image]

[illegible]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 7-8 (47-48) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

гісторыя

гісторыя

[image]-[image]2006

"ды Э. бацу • "крытыка • эсэістыка • аналітыка • палеміка • **гісторыя**

[image] [image] [image]

Мілан Отагал Праграмная арыентацыя дысыдэнцтва 1969-1989 гадоў

МІЛАН ОТАГАЛ (Milan Otáhal) — доктар філязофіі, працуе ў Інстытуце найноўшай гісторыі АН Чэскай Рэспублікі.

Пераломным момантам у разьвіцьці камуністычнай сыстэмы ў Чэхаславакіі быў 1968 год, калі адбылася спроба структурнай рэформы сацыялізму савецкага тыпу. Скончылася яна беспасьпяхова. Пасьля ўмяшаньня войскаў пяці краінаў Варшаўскай дамовы 21 жніўня 1968 году надыходзіць новы этап т. зв. нармалізацыі, альбо рэальнага сацыялізму. Зьмянілася становішча ўсіх сілаў грамадзтва. Камуністычная партыя Чэхаславакіі зноў пераўтварылася ў бюракратычна-цэнтралістычную арганізацыю, якая зрабілася паслухмяным інструмэнтам Масквы. «Інструкцыя аб крызавым разьвіцьці партыі і грамадзтва», прынятая пасьля XIII зьезду, абвясьціла контрарэвалюцыйным ня толькі працэс адраджэньня, але і кожную будучую спробу рэформы сацыялізму. У адрозьненьне ад камуністычных партыяў Польшчы й Вугоршчыны, Кампартыя Чэхаславакіі, такім чынам, была няздольная рэагаваць на разьвіцьцё, асабліва пасьля прыходу Міхаіла Гарбачова. Не магла яна зрабіцца партнэрам і астатніх сілаў грамадзтва ў пераадоленьні крызы савецкай сыстэмы. Насельніцтва пасьля акупацыі ўпала ў дэпрэсію і пачало

страчваць веру ў сацыялізм наагул. Пасьля брутальнага задушэньня дэманстрацыі 21 жніўня 1969 году яно надоўга перастала граць ролю грамадзкага суб'екту. Зьмянілася і становішча апазыцыйных сілаў. Новае кіраўніцтва КПЧ на чале з Густавам Гусакам засяродзіла свае высілкі на тым, каб адхіліць ад улады і ўвогуле выключыць з грамадзкага жыцьця рэфарматараў і ўсіх тых, хто падтрымліваў працэс адраджэньня. Гэта рабілася з дапамогай так званых «праверак», падчас якіх з КПЧ было выгнана каля паўмільёна чальцоў, якія былі пакараныя і матэрыяльна. Так узьнік шматлікі пласт грамадзянаў, якія ня мелі роўных правоў з астатнімі. Напрыклад, іхныя дзеці не маглі вучыцца ці займаць пэўныя пасады, іхныя заробкі не павінныя былі перавышаць пэўную суму. Гэтая «партыя выгнаньнікаў» зрабілася патэнцыялам паўсталай апазыцыі, якая ў тых умовах магла дзейнічаць толькі нелегальна. З улікам пасіўнасьці грамадзянаў і адсутнасьці ў іх інтарэсу да грамадзкіх справаў, страху перад магчымым перасьледам і ў цэлым спрыяльнай сацыяльнай сытуацыі, у нас ня ўзьнік дый ня мог узьнікнуць масавы апазыцыйны рух. Апазыцыя была, такім чынам, у значнай ступені ізаляваная ад грамадзтва і засяродзілася перадусім на праграмнай сфэры.

Адной зь першых супраць надыходу нармалізацыі публічна выступіла група чальцоў КПЧ (напрыклад, Ян Тэсарж, Любамір Когаўт, Карал Кінцл) і беспартыйных (напрыклад, Вацлаў Гавал, Рудольф Батцек), якая 21 жніўня 1969 году выдала адозву, названую «Дзесяць пунктаў». Хоць аўтары дакумэнту і дыстанцыяваліся ад савецкай сыстэмы, але зусім не ад сацыялізму. Яны падтрымалі «Праграму дзеяньняў» і працэс адраджэньня, які лічылі сур'ёзнай спробай спалучэньня сацыялізму і дэмакратыі. Але яны не прызнавалі вядучай ролі КПЧ – яе становішча ў грамадзтве не павінна было забясьпечвацца законам, а давер грамадзянаў партыя мусіла атрымаць праз сваю дзейнасьць. Аўтары выказалі асьцярогу, што зноў, як і ў 1950-я гады, будзе парушацца законнасьць, таму яны лічылі важнай задачай забесьпячэньне правоў чалавека і грамадзяніна. Паспрыяць гэтаму мусіла ратыфікацыя міжнародных пактаў аб грамадзянскіх, эканамічных і культурных правох. Акцэнт на гэтых правох зьяўляецца ўласным унёскам і заслугай гэтай пэтыцыі.

Аўтары задумаліся і над пытаньнем, што рабіць у гэтай сытуацыі. Яны дыстанцыяваліся ад нелегальных мэтадаў барацьбы і падкрэсьлілі, што іх праграмай ня ёсьць адмаўленьне. Паколькі яны прыйшлі да высновы, што ў наяўных абставінах ня могуць дзейнічаць публічна, то заклікалі грамадзянаў, каб яны засяродзіліся на тых праблемах, на вырашэньне якіх яны маглі паўплываць, але якія тычыліся перадусім сфэры асабістага жыцьця. «І пры палітычнай несвабодзе, – пісалі яны, – разьвіты народ можа абараняцца тым, што практычнымі ўчынкамі непалітычнага характару будзе прасоўваць свой стыль жыцьця, сваю жыцьцёвую філязофію, свой характар»[1]. Яны маглі, напрыклад, паляпшаць сваё жытло, памнажаць і культываваць свае захапленьні і г. д. У гэтай канцэпцыі мы знаходзім некаторыя зародкі непалітычнай палітыкі, якая характарызавала дзейнасьць пэўнае часткі дысыдэнцтва ў пазьнейшы пэрыяд. Камуністычныя функцыянэры лічылі гэты выступ праявай свабоднае волі, чаго ў час аднаўленьня рэжыму не маглі стрываць. У дачыненьні да аўтараў былі прынятыя жорсткія захады. Лудзек Пахман, Ян Тэсарж і Рудольф Батцек былі арыштаваныя, але да суду справа не дайшла, і празь дзесяць месяцаў іх адпусьцілі.

У адрозьненьне ад гэтай адозвы, якая была выдадзеная адзіночкамі і адрасаваная заканадаўчымі партыйным органам, у апазыцыйным руху, які ўзьнікаў, дзейнічалі арганізаваныя групы, якія не прызнавалі новага кіраўніцтва партыі, і адрасатам іх праграмных адозваў былі самі грамадзяне. Гэтыя групы маглі дзейнічаць і дзейнічалі толькі нелегальна. Да першых належаў Рух рэвалюцыйнае моладзі (часам яго называюць таксама Рэвалюцыйнай сацыялістычнай партыяй Чэхаславакіі), створаны пад кіраўніцтвам Пэтра Ула студэнтамі філязофскага факультэту Карлавага ўнівэрсытэту Янам Фролікам, Эганам Ч’ерным, Пэтрушкай Шустравай ды іншымі. Гэты рух узьнік пад уплывам няўдалае студэнцкае забастоўкі ў лістападзе 1968 году. Спачатку ён дзейнічаў легальна, але паступова сышоў у падпольле. На праграму руху моцна паўплывалі «новыя левыя» на Захадзе і трацкізм. Яго ўдзельнікі лічылі цэнтралістычнай, бюракратычнай і аўтарытарнай ня толькі сталінскую сыстэму, але і працэс адраджэньня, пры якім

[1] PECKA, J. – PREČAN, V. (eds.): *Proměny pražského jara*: Sborník studií a dokumentů o nekapitulatských postopích v československé společnosti 1968–1969. Brno 1993, s. 288.

улада была ў руках сілавога бюракратычнага цэнтру, якім зьяўлялася Камуністычная партыя. Таму на парадку дня мусіла быць антыбюракратычная рэвалюцыя, мэтай якой было адабраць у бюракратыі яе палітычную і эканамічную ўладу і такім чынам зьнішчыць яе як сацыяльную клясу. Адначасова мусілі быць скасаваныя апоры ейнай улады, г. зн. дзяржаўны апарат, Народная міліцыя, Дзяржбясьпека, армія, і ўведзенае ўсеагульнае ўзбраеньне народу. Новая сыстэма павінна была грунтавацца на прынцыпе самакіраваньня. Органамі ўлады мусілі зрабіцца рады працаўнікоў – прычым як на працоўных месцах, так і ў населеных пунктах. Паводле меркаваньня ўдзельнікаў руху, антыбюракратычная рэвалюцыя не магла прайсьці ў Чэхаславакіі ізалявана, яна мусіла закрануць увесь савецкі блёк і суправаджацца антыімпэрыялістычнай барацьбой на Захадзе і рэвалюцыйнай барацьбой у краінах трэцяга сьвету. Вырашальную ролю ў гэтай барацьбе мела адыграць працоўная кляса, але важным складнікам рэвалюцыйнага руху павінныя былі таксама зрабіцца студэнты й моладзь.

Значэньне Руху рэвалюцыйнае моладзі не ў ягонай праграме, якая і ў 1968 годзе не зьвярнулася да грамадзянаў, а ў тым, што ён адмаўляў пасіўнае стаўленьне да грамадзкага жыцьця і не жадаў адступацца ад права ўплываць на грамадзкія падзеі. Удзельнікі Руху актыўна ўключыліся ў падрыхтоўку дэманстрацыі 21 жніўня 1969 году, падрыхтавалі няўдалую забастоўку супраць арыштаў палітычных апанэнтаў рэжыму. Сваёй дзейнасьцю яны даказалі, што толькі актыўны адпор можа запаволіць рэалізацыю т. зв. нармалізацыі. Гэта ж было і галоўнай прычынай, зь якой улада прыняла захады ў дачыненьні да гэтай арганізацыі. У сьнежні 1969 году яе ўдзельнікі былі арыштаваныя, а іх працэс быў першым палітычным парцэсам у Чэхаславакіі пасьля прыходу Густава Гусака. Гэтаму адпавядала і пакараньне: Пэтар Ул быў асуджаны на чатыры з паловай гады пазбаўленьня волі.

Адным са складнікаў апазыцыйнага руху, які знаходзіўся ў стадыі фармаваньня, была група былых сяброў Чэхаславацкай сацыялістычнай партыі ў Брне. Яны выступалі пад назвай Чэхаславацкага руху за дэмакратычны сацыялізм. Ягонымі прадстаўнікамі былі, апроч астатніх, Мілан Шылган, Яраслаў

Мэзьнік, Пэтар Вурм. Другі кірунак рэпрэзэнтавалі экс-камуністы, якія былі самай шматлікай часткай апазыцыі, аднак ня мелі адзінага меркаваньня наконт таго, як рэагаваць на наяўную сытуацыю. Галоўную пазыцыю сярод іх заняў Сацыялістычны рух чэхаславацкіх грамадзянаў, рэпрэзэнтаваны Яраславам Шабатам, Міланам Гюблам і Янам Тэсаржам. Абодва гэтыя кірункі прымыкалі да сацыялізму, але разумелі яго па-рознаму. Брненская група сфармулявала сваё ўяўленьне ў «Малой праграме дзеяньняў Чэхаславацкага руху за дэмакратычны сацыялізм», якая ўзьнікла ў сярэдзіне 1970-х гадоў. Сацыялізм яны разумелі нетрадыцыйна: як пэрманэнтнае імкненьне ўпарадкаваць грамадзкае жыцьцё такім чынам, каб стварыць аптымальную прастору для найпаўнейшага разьвіцьця асобы. Яны выказваліся за дэмакратыю ня толькі ў палітычнай, але і ў эканамічнай сфэры. Пагадзіліся з нацыяналізацыяй, але трымаліся прынцыпаў сумеснага прыняцьця рашэньняў і самакіраваньня на дзяржаўных прадпрыемствах. Дзяржава мусіла гарантаваць роўнасьць умоваў для ўсіх і сацыяльную абарону грамадзянаў. Яны таксама лічылі важным забесьпячэньне правоў і свабодаў грамадзянаў.

І экс-камуністы сфармулявалі свае ўяўленьні ў «Малой праграме дзеяньняў». У ёй яны далучыліся да працэсу адраджэньня, у якім пачаў спраўджвацца сэнс сацыялізму, г. зн. свабода і дэмакратыя. Пад сацыялізмам яны разумелі такую палітычную сыстэму, пры якой усе будуць роўныя. Ён павінен грунтавацца на грамадзкім і прадпрымальніцкім самакіраваньні. Экс-камуністы таксама падкрэсьлівалі значэньне правоў чалавека і грамадзяніна, якія лічылі неад'емнай часткай сацыялізму.

Прадстаўнікі абодвух гэтых кірункаў усьведамлялі, што для рэалізацыі праграмы неабходна стварыць сілу, якая б магла зрынуць рэжым нармалізацыі. Брненскія сацыялісты прыйшлі да высновы, што яго нельга перамагчы традыцыйнымі арганізацыйнымі структурамі, якімі былі палітычныя партыі. Гэта значыць, яны выключалі дасягненьне ўсенароднага адзінства – галоўнай умовы рэвалюцыйнага выступу, якую павінен быў увасабляць ідэалягічна і арганізацыйна

[2] Malý akční program Československého hnutí za demokratický socialismus. In: *Soudobé dějiny*, roč. 2 (1995), č. 2-3, s. 378-398.

[3] *Archiv ÚSD AV ČR*, sbírka Vl. Tesařová, Malý akční program Socialistického hnutí československých občanů.

нетрадыцыйны рух, так званы авангард, які б аб'яднаў «усе эмансыпаваныя прагрэсіўныя сілы, зацікаўленыя ў такім цесным супрацоўніцтве»[2]. У пляне палітычнай арыентацыі гэтыя групы павінныя былі спалучаць агульную сыстэму каштоўнасьцяў і актуальную праграму ў агульных рысах. Авангард ня мог быць часткай рэжыму, бо ягонай задачай было мэтанакіравана працаваць на падзеньне рэжыму.

Для экс-камуністаў асноўным пытаньнем таксама было стварэньне сілы, якая б магла зрынуць рэжым Гусака. Вырашальным у той пэрыяд было запаўненьне тае пустэчы, якая ўзьнікла пасьля распаду пасьлястудзеньскага руху, новай арганізацыйнай структурай, створанай патэнцыйным «авангардам апазыцыі», якая, на іх думку, улучала дзясяткі тысячаў грамадзянаў, якія хоць і маглі быць сацыяльнай базай руху, але не маглі ім кіраваць. Гэтую ролю мусіў узяць на сябе «авангард авангарду», гэта значыць нейкая галоўная група, што магло нагадваць ролю камуністычнае партыі, хаця ад прынцыпу вядучае ролі яны адмовіліся. І для экс-камуністаў асновай руху мусілі быць сацыялістычныя групы, але нават яны не выключалі магчымасьці супрацоўніцтва з інакш арыентаванымі. Акрамя таго, галоўнай сілай рэвалюцыйных пераменаў мусіла быць «маса прамысловых вытворцаў», і таму апазыцыйны рух павінен быў абараняць перадусім правы рабочых, г. зн. змагацца супраць зьніжэньня заробкаў і за прафсаюзную дэмакратыю, засяродзіцца на заснаваньні дэмакратычных органаў у форме радаў працаўнікоў і прасоўваць эканамічную рэформу[3]. Значэньне гэтага маніфэсту ў тым, што ён сфармуляваў стратэгію і тактыку сацыялістычнага руху, а таксама падкрэсьліў ды вызначыў канкрэтныя патрабаваньні, якія адпавядалі інтарэсам рабочых.

На «Малую праграму дзеяньняў Чэхаславацкага руху за дэмакратычны сацыялізм» адрэагавалі і астатнія групы экс-камуністаў. Частка зь іх адхіліла думку аб арганізаваным апазыцыйным руху і меркавала, што барацьба за аднаўленьне сацыялізму, з улікам міжнародных умоваў, будзе пасьпяховая ізноў у межах камуністычнай партыі, як гэта ўжо здарылася ў 1968 годзе. Другі кірунак лічыў сытуацыю зь міжнароднага пункту гледжаньня недастаткова сьпелай для стварэньня

[17] Dopis 40 signatářů Charty 77 k Mlynářovu zatčení. Charta 77, sv. 9 (1987), s. 8–10. Uzavřeno dne 6. 8. 1987.

Прынамсі частка «хартысцкага цэнтру» гэтыя зьмены і праблемы ўсьведамляла і імкнулася браць іх пад увагу. У студзені 1987 г., праз дзесяць гадоў пасьля заснаваньня Хартыі-77, ейныя паўнамоцныя прадстаўнікі падпісалі два дакумэнты, якія на новую сытуацыю рэагавалі. Маюцца на ўвазе «Слова да суграмадзянаў» і «Ліст да падпісантаў Хартыі-77». Калі ў сваёй папярэдняй дзесяцігадовай гісторыі Хартыя-77 зьвярталася да ўладнага рэжыму, то «Слова да суграмадзянаў» ёсьць яе першай спробай зьвярнуцца да ўсяго грамадзтва, заклікаць яго да пераадоленьня страху і актыўнага дзеяньня. «Ліст да падпісантаў», які падводзіць вынікі папярэдняга існаваньня Хартыі, зьвяртае ўвагу на праблемы ўзьнікненьня «актыўнага ядра» і «пасіўнай большасьці», на складанасьці камунікацыі зь няпраскімі падпісантамі, на «адсутнасьць якіх-кольвек цьвёрдых правілаў», на дакладней не акрэсьленую праблему «пакаленьняў» і некаторыя іншыя. Таксама дакумэнт згадвае дыскусію пра неабходнасьць увядзеньня «больш палітычнай праграмы» ці радыкальнага вяртаньня да ўстаноўчай дэклярацыі і «адыходу ад стракатай шкалы задачаў і функцыяў». Ліст прапануе трансфармацыю

«Канцэпцыя, мэты і праграмныя прынцыпы дэмакратычнага руху ў Чэхіі і Славакіі» // Хартыя 77 v dnešním světě. Dokumenty a svědectví. Sv. 1. Praha, 1989. S. 9–10; MANDLER, Jiří (red.). Dějiny Charty 77. Praha, 2007. S. 1–7.

[10] PAVLÍČEK, Václav. Proměny kritického myšlení. Charta 77 v letech 1977–1989. Praha, 2007. S. 7–10.

[11] DOSTÁL, Jiří. Charta 77 v mezinárodních souvislostech. Praha, 1997. S. 1–10.

[12] Гутарыць з Ерыкам Бабіцкім, Прага, 13.09.2003.

[13] KUČEROVÁ, Ivana. Vůle k moci. Lenka Procházková. Praha, 2004. S. 36–37.

[14] Гутарка з Ірэнай Сутанінай, Прага, 6.02.2004.

[15] Гутарка з Янам Чарнагурскім, Прага, 24.01.2004.

[16] Гутарка з Ірэнай Дарэнскай, Прага, 31.07.2003.

[17] Dopis 40 signatářů Charty 77 k Mlynářovu zatčení. Charta 77, sv. 9 (1987), s. 8–10. Uzavřeno dne 6. 8. 1987.

Прынамсі частка «хартысцкага цэнтру» гэтыя зьмены і праблемы ўсьведамляла і імкнулася браць іх пад увагу. У студзені 1987 г., праз дзесяць гадоў пасьля заснаваньня Хартыі-77, ейныя паўнамоцныя прадстаўнікі падпісалі два дакумэнты, якія на новую сытуацыю рэагавалі. Маюцца на ўвазе «Слова да суграмадзянаў» і «Ліст да падпісантаў Хартыі-77». Калі ў сваёй папярэдняй дзесяцігадовай гісторыі Хартыя-77 зьвярталася да ўладнага рэжыму, то «Слова да суграмадзянаў» ёсьць яе першай спробай зьвярнуцца да ўсяго грамадзтва, заклікаць яго да пераадоленьня страху і актыўнага дзеяньня. «Ліст да падпісантаў», які падводзіць вынікі папярэдняга існаваньня Хартыі, зьвяртае ўвагу на праблемы ўзьнікненьня «актыўнага ядра» і «пасіўнай большасьці», на складанасьці камунікацыі зь няпраскімі падпісантамі, на «адсутнасьць якіх-кольвек цьвёрдых правілаў», на дакладней не акрэсьленую праблему «пакаленьняў» і некаторыя іншыя. Таксама дакумэнт згадвае дыскусію пра неабходнасьць увядзеньня «больш палітычнай праграмы» ці радыкальнага вяртаньня да ўстаноўчай дэклярацыі і «адыходу ад стракатай шкалы задачаў і функцыяў». Ліст прапануе трансфармацыю

датулешняга невыразна акрэсьленага «калектыву паўнамоцных прадстаўнікоў» у «клюб паўнамоцных прадстаўнікоў», які б складаўся з былых паўнамоцных прадстаўнікоў і запрошаных гасьцей, і падтрымлівае ідэю заснаваньня Форуму Хартыі-77, які быў бы «шырока адкрыты для людзей і ініцыятываў»[11]. Аднак яшчэ да абнародаваньня абодвух дакумэнтаў сярод падпісантаў разгарэлася спрэчка, якая вылілася ў згаданы на пачатку «бунт маладых».

У адпаведнасьці з усталяваным звычаем, кожны паўнамоцны прадстаўнік Хартыі-77 прапаноўваў свайго пераемніка на наступны год. Так, Анна Шабатава на 1987 г. прапанавала Францішка Старка, які ўжо ўдзельнічаў у працы калектыву паўнамоцных прадстаўнікоў. Сваёй прапановай яна хацела разьняволіць напружаньне, якое панавала ўнутры Хартыі-77[12], аднак сярод значнай часткі яе падпісантаў яна выклікала вострую нязгоду: «У той час утварылася апазыцыя супраць мяне і андэграўнду ўвогуле. [Выданьне кнігі Яна Пэлца] «…а будзе горш» вяло да фармаваньня групы хартыстаў, для якіх мы былі непрымальныя. Адну частку ўтваралі «хартысцкія» камуністы, а другую ханжаскія каталікі. З гэтага ўзьнікла ці не сямічленная кааліцыя, члены якой дамовіліся аб тым, што калі Шабатава будзе настойваць на маім прызначэньні паўнамоцным прадстаўніком Хартыі, то яны пойдуць і на раскол. (…) Напрыклад, гэта былі Пэтрушка Шустрава і Вашак Бэнда ад каталікоў і група вакол Руды Сланскага ад экс-камуністаў»[13]. Паводле згадкі Рудольфа Сланскага, ядром спрэчкі быў не андэграўнд як такі, паколькі ягоная роля ў супраціве нармалізацыйнаму грамадзтву была несумнеўная і важкая (ён сам удзельнічаў у некаторых канцэртах «Пластыкаў»), а сама асоба Францішка Старка. Супраціўнікі абраньня яго паўнамоцным прадстаўніком баяліся, што жыцьцёвы стыль андэграўнду, які гэты рэдактар часопісу «Vokno» прэзэнтаваў, мог зрабіцца зачэпкай для дыскрэдытацыі Хартыі-77[14]. Урэшце новым паўнамоцным прадстаўніком замест Старка зрабіўся літаратурны крытык і перакладчык Ёзэф Вогрызак, які сярод дысыдэнтаў быў вядомы сваім выказваньнем, што «Хартыі ўжо час перастаць шамацець паперай, а трэба выйсьці насустрач грамадзянам»[15]. Аднак у асяродзьдзі андэграўнду непрыняцьце Францішка Старка ў

якасьці паўнамоцнага прадстаўніка выклікала вялікае незадавальненьне, якое яшчэ ўзмацніла ранейшыя пярэчаньні супраць залішняй лявацкасьці Хартыі[16]. Адкліканьне подпісу пад Хартыяй-77 Ладзіславам Цэрманам зь Лібэрца сталася для Старка імпульсам да напісаньня ліста, які стаў вядомы як «Ліст 40» і ў Хартыі выклікаў далейшыя вострыя канфлікты.

«Ліст 40», апублікаваны Пэтрам Улам у самвыдатаўскім пэрыёдыку «Інфармацыя пра Хартыю-77» (скарочана «Інфох») на пачатку жніўня, рэагуе на «Ліст да падпісантаў», крытыкуе існаваньне «звычаёвага права», якое «вяло да пэўнай ізаляцыі ня толькі «актыўнага ядра» ад астатніх падпісантаў, але і да пэўнай ізаляцыі Х[артыі]-77 ад значных групаў паводле інтарэсаў або веку ў нашай краіне»[17]. Таксама ліст закідае «актыўнаму ядру» недастатковую ўвагу вядомых прадстаўнікоў Хартыі-77 да маладой генэрацыі ўнутры і па-за Хартыяй-77 і патрабуе, каб задуманы Форум Хартыі-77 меў ня толькі дарадчы голас, але каб абапіраўся на «каардынаваны ўдзел падпісантаў не са сталіцы і падпісантаў «другой хвалі», г. зн. тых, якія далучаюцца ў гэтыя гады і якія амаль без выключэньня рэпрэзэнтуюць маладое пакаленьне. (…) Арганізацыйныя праблемы, з гэтым зьвязаныя, у значнай ступені здольныя вырашыць самі маладыя і новыя актывісты, але яны мусяць ведаць, што на працу і патрабаваньні Форуму будзе зьвернутая сур'ёзная практычная ўвага і будзе гарантавана, што для рэалізацыі ініцыятываў і патрабаваньняў Форуму ня будуць ставіцца тыя ці іншыя перашкоды з боку дагэтулешняга «актыўнага ядра»…»[18].

«Ліст 40» таксама высоўвае ідэю, «што маладыя самі маглі б стварыць нейкую новую інстанцыю, якая б рэфлектавала і іх інтарэсы». Ён заканчваецца заклікам: «Узяць за звычай актыўны ўдзел маладой генэрацыі ў працы Х-77 (з усімі наступствамі, якія з гэтага вынікаюць), на нашу думку, рэч, якая ня церпіць адкладаньня». Такім чынам, «Ліст 40» настойліва фармуляваў патрабаваньне генэрацыі маладых і няпраскіх падпісантаў, часта зьвязаных з андэграўндам, удзельнічаць у супольным прыманьні рашэньняў у Хартыі-77. Як аўтар «Ліста» падпісаны Францішак Старак, які ягоны зьмест узгадняў з Эганам Бонды і сам выбіраў асобаў, якім таксама прапанаваў яго падпісаць. Так

[18] Тамсама, с. 10.

да ліста далучылі свае подпісы, напрыклад, Пэтар Цыбулка, Мікалаш Хадзіма, Станіслаў Піташ, Ян Рампіх, Ярамір Шавэрда (адзіны народжаны да Другой сусьветнай вайны) або пазьнейшыя паўнамоцныя прадстаўнікі Хартыі Станіслаў Дэваты і Томаш Градзілак. Адным з падпісантаў павінен быў стаць таксама Пэтар Ул, аднак ягоны подпіс пад лістом урэшце не зьявіўся. Паводле ягоных словаў, тэкст ліста фармуляваў Эган Бонды, і ягонай мэтай было выклікаць у Хартыі раскол.

[image]
Збынек Фішар alias Эган Бонды, Кліма, Мао і Оскар, канец 1970-х гг.
(фота: Іржы Бэднарж).
Хоць меркаваньне Пэтра Ула знаходзіць пэўнае пацьверджаньне ў дакумэнце з 3-га сэктару I аддзелу X управы Корпусу нацыянальнай бясьпекі (КНБ) ад 17 кастрычніка 1987 г., справа была, відавочна, значна больш складаная. Бо ў «Справаздачы аб прэвэнтыўных захадах, праведзеных аддзелам чэхаславацкай контравыведкі» канкрэтна напісана: «Пры выкарыстаньні Д[аверанай асобы]-ОСКАР быў падрыхтаваны і рэалізаваны захад, мэтай якога было паглыбіць супярэчнасьці паміж асноўнай групай у Х[артыі]-77 з аднаго боку і маладымі й няпраскімі падпісантамі з другога боку. Д-ОСКАР у чэрвені 1987 г. быў зарыентаваны на распрацоўку матэрыялу, які б пасьля пашырэньня ў асяродзьдзі Х-77 быў здольны выклікаць палеміку. У ліпені месяцы тэкст Д-ОСКАРАМ быў падрыхтаваны і ў жніўні-87 распаўсюджваўся падпісантам Х-77 Францішкам СТАРКАМ. Пад гэтым лістом, падпісаным для грамадзкасьці Францішкам СТАРКАМ, паставілі свае подпісы 40 падпісантаў Х-77. Таму ў асяродку Х-77 гэты ліст вядомы як ліст сарака. (…) Пад лістом падпісаліся перадусім маладыя прыхільнікі руху андэграўнд і няпраскія падпісанты. Ліст значна абвастрыў стасункі ўнутры Х-77».
Даверанай асобай Дзяржбясьпекі Оскарам, які згадваецца ў тэксьце, быў Эган Бонды. Францішак Старак і многія іншыя здагадваліся, што падчас допытаў ён раскрываў асобныя таямніцы, аднак пра яго непасрэднае супрацоўніцтва з сакрэтнай паліцыяй яны ня ведалі. Магчымым тлумачэньнем гэтай супярэчнасьці, здаецца, можа быць тое, што альбо ён сам, альбо яго кіроўны орган вырашыў скарыстацца ініцыятывай

19 PALOUŠ, M.: Odpověď na dopis 40 signatářů Charty 77. In: *Informace o Chartě 77*, samizdat, roč. 7, č. 10 (1987), s. 3–7.
20 Vyjádření Luboše Vydry. In: *Informace o Chartě 77*, samizdat, roč. 7, č. 12 (1987), s. 7–8.
21 Гутарка аўтара з Аляксандрам Вондрам. Прага, 18.08.2003.
22 Фактычна, гэта ўжо быў другі Форум Хартыі 77, бо першы

адбыўся 10 сакавіка 1987 г. пры ўдзеле 16 чалавек. Адказ на публікацыю ліста ў «Інфоху» выклікала сярод падпісантаў *Хартыі-77* бурную дыскусію, якая доўжылася амаль год.

Адна з удзельніц дыскусіі, Любаш Выдра, пазней апісала ўплыў, які мела публікацыя ліста на ўнутранае жыццё Хартыі-77 (Ліст 40 зьмяніў бачаньне ня толькі самога сябе, але і іншых, ён стаў фактычна пачаткам новага этапу ў жыцьці Хартыі-77)[19]. Пасьля падпісаньня «Ліста 40» мы ўвадначас ператварыліся ў цікаваных. Асабліва людзі, якія ня маюць свайго ўласнага погляду і далучаюцца толькі да той ці іншай групы галоўных членаў «актыўнага ядра», выяўлялі найвялікшую зьедлівасьць і незадавальненьне. (…) Маўляў, вы ж і самі – людзі зь яснымі мэтамі – цудоўна ведаеце, наколькі той андэграўнд ненадзейны і як ад яго патыхае, хіба ж ня праўда?»[20]. Той самы нумар «Інфоху» прынёс навіну, паводле якой ад свайго подпісу пад «Лістом 40» у эмацыйных выразах дыстанцыяваўся Пэтар Тацёўн. Дыскусіі ўнутры Хартыі-77 былі ў той час такія вострыя, што паміж падпісантамі зьявілася боязь за ейны распад[21].

Францішак Старак з ініцыятывы Вацлава Гаўла зарганізаваў Форум Хартыі-77, які сабраўся 28 лістапада 1987 г. пры ўдзеле сямі дзясяткаў чалавек[22]. Ягонай тэмай, паводле паведамленьня, пазьней апублікаванага ў «Інфоху», была «дзейнасьць Хартыі і яе ўнутраныя праблемы»[23]. Бурнымі дэбатамі кіраваў Вацлаў Гавал, і іх вынікам было даручэньне Францішку Старку арганізоўваць форумы штодвамесяцы[24]. У спрэчцы, ці Хартыя мусіць склікаць грамадзкія мітынгі, урэшце перамог погляд больш радыкальнай маладзейшай генэрацыі, і паўнамоцным прадстаўнікам Яну Літаміскаму, Лібушы Шылганавай і Яну Вогрызку было даручана паведаміць адпаведным органам аб правядзеньні маніфэстацыі да дня правоў чалавека 10 сьнежня 1987 г. Хартыя-77 празь дзесяць гадоў сваёй дзейнасьці афіцыйна склікала першую дэманстрацыю, на якой, хоць тая і была забаронена тагачасным Раённым нацыянальным камітэтам, упершыню з 1969 г. сабраліся больш як тысяча чалавек, і гэта была колькасьць,

[19] Пасьля ліста 40 // *Хартыя-77*. Бюлетэнь 77, кастрычнік 1987, с. 12–16.

[20] Ліст 40 // *Інфоху*, № 4, 1988, с. 1–2.

[21] Адам Міхнік. Маці і яблык // *Хартыя-77* (Лістадзенні бюлетэні 1988 г.). Прыватныя ліхтары і фальшывыя сьвятло. Дакументы самвыдаву. Т. 6. Варшава, 2003. С. 19.

[22] Пратакол Форуму Хартыі-77 // Там жа. С. 31–36.

[23] Пісараўскі Я. Форум Хартыі-77 // Свабода, № 16, кастр. 1987, с. 2.

[24] Адам Міхнік. Маці і яблык // Там жа. С. 19.

якой арганізатары зусім не чакалі[25].

Вынікам Форуму было канстытуяваньне андэграўнду як адной з плыняў унутры Хартыі, чым і скончыўся «бунт маладых», які паспрыяў умацаваньню Хартыі-77, ейнай большай адкрытасьці і падтрымцы новых, больш палітычна скіраваных ініцыятываў і эфэктыўнейшых спосабаў супраціву камуністычнаму рэжыму.

З чэскай пераклаў Сяргей Сматрычэнка

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/11/12**
[image]

[image] [image] [image]

РУДОЛЬФ ВЭВАДА (Rudolf Vévoda) — доктар філязофіі, працуе ў Вышэйшай школе публіцыстыкі ў Празе.

Рудольф Вэвада

Мараўская мэтраполія перад падзеньнем камуністычнага рэжыму

Да нядаўняга часу гістарыяграфіі аб падзеньні камуністычнага рэжыму ў Чэхаславаччыне не хапала самастойнага даследаваньня. Гэтая тэма ўваходзіла ў кантэкст больш шырокіх тэмаў, напрыклад, гісторыі дысідэнцкага руху, гісторыі Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі (ЧССР) ці гісторыі Чэхаславацкай камуністычнай партыі (ЧКП). Толькі ў 2002 годзе выйшла манаграфія, якая ўпершыню прапанавала комплексны погляд на гэтую тэму[1]. Аўтар кнігі, Ян Пешэк, прааналізаваў падзеньні камуністычнага рэжыму ў Чэхіі, Славаччыне і Брно. Апошні горад ён разглядаў як прыклад рэгіёна, дзе ў 1989 годзе ўзьнікла моцная апазыцыя, якая ўзначаліла рэвалюцыю. Пешэк прааналізаваў, чаму ў Брно ўзьнікла моцная апазыцыя, і прыйшоў да высновы, што ў гэтым горадзе ўжо ў 1970-я гады існавала моцная дысідэнцкая супольнасьць, якая ў 1989 годзе ўзначаліла рэвалюцыю. Пешэк прааналізаваў, чаму ў Брно ўзьнікла моцная апазыцыя, і прыйшоў да высновы, што ў гэтым горадзе ўжо ў 1970-я гады існавала моцная дысідэнцкая супольнасьць, якая ў 1989 годзе ўзначаліла рэвалюцыю.

[1] Ранейшыя вынікі рэгіянальных гістарыяграфіі аб падзеньні камуністычнага рэжыму гл. ў: O. TÁHAL, M.: *Normalizace 1969–1989*: Příspěvek ke stavu bádání. Praha 2002, s. 86–88.

УВОДЗІНЫ

Калі Іржы Маген аднойчы ў адным сваім вершы залічыў Брно да тых гарадоў, «дзе магчымасьцяў усё яшчэ багата», то гэта ж адносіцца – наколькі я магу меркаваць з уласнага досьведу ды з эўрыстычнага дасьледаваньня ў брненскіх архівах – і да адмыслоўцаў па сучаснай гісторыі. Цалкам лягічна, што ранейшыя дасьледаваньні палітычнага, эканамічнага і

культурнага разьвіцьця апошніх дзесяцігодзьдзяў нашай гісторыі канцэнтруюцца на Празе – тут знаходзіўся ня толькі цэнтар палітычнай улады, але й апазыцыйнай дзейнасьці – аднак нельга замоўчваць, што паўсталы такім чынам вобраз мінулых падзеяў абавязкова застаецца няпоўным. Дасьледаваньне таго, што на прафэсійнай мове гісторыкаў завецца рэгіянальнай гісторыяй, можа ўнесьці сякія-такія карэктывы[1].

Становішча, якое ў нанесеных такім чынам каардынатах (цэнтар – рэгіён), займае другі паводле памераў горад рэспублікі, вызначаецца своеасаблівай амбівалентнасьцю: будучы «пэрыфэрыяй» у дачыненьні да Прагі, ён адначасова ёсьць адным (аднак са шмат якіх гледзішчаў найважнейшым) з рэгіянальных «цэнтраў» – цэнтрам былога Паўднёвамараўскага краю ды, адпаведна, усёй Маравіі. Адзін толькі пералік спэцыфічных брненскіх рысаў (у стасунку да Прагі) і мараўскіх (у стасунку да Чэхіі) мог бы быць выдадзены як самастойнае дасьледаваньне. Аднак гэта ня ёсьць амбіцыяй гэтага тэксту. Я ўсяго толькі хачу прапанаваць некалькі заўваг на тэму профілю й палітычнай стратэгіі колішніх моцных гэтага сьвету ў брненскім рэгіёне, а таксама разгледзець тое, што называлі «варожымі элемэнтамі» ды «сфэрай культуры».

Некалькі словаў пра базу першакрыніцаў. Асноўная частка рэгіянальнай дакумэнтацыі захоўваецца ў Мараўскім краявым архіве – я зыходжу асабліва з архіўных дакумэнтаў колішняга крайкаму КПЧ (краёвага камітэту Камуністычнай партыі Чэхаславакіі), інвэнтарызацыя якога была завершаная ў сярэдзіне дзевяностых гадоў ХХ стагодзьдзя, і з дакумэнтаў, дэпанаваных у архіве Ўнівэрсытэту імя Масарыка. Канечне ж, дзеля больш падрабязнага дасьледаваньня было неабходнае таксама вывучэньне дакумэнтаў гаркаму КПЧ, КНК (Краёвага нацыянальнага камітэту), ГНК (Гарадзкога нацыянальнага камітэту), партыяў-сатэлітаў з колішняга Нацыянальнага Фронту, дакумэнтацыі іншых брненскіх вышэйшых навучальных установаў ці гэтак званых творчых саюзаў. Нельга пакінуць убаку ні тагачаснага друку, ні афіцыйных мэдыяў наагул, крыніцаў самвыдату ды – last, but not least – асабістых сьведчаньняў. У сувязі з апошняй памянёнай крыніцай не

пярэчу, што мне паслужыла гэтаксама ўласная памяць: бо ў Брне я жыў ад нараджэньня і аж да лета 1989 году.

I

Галоснасьць і перабудова паставілі рэжым Гусака ў нялёгкую сытуацыю. Сваю легітымнасьць ён засноўваў на паразе «контрарэвалюцыі», а таму ня мог распачаць аніякіх карэнных рэфарматарскіх крокаў. Пераацэнка гісторыі, шматабяцальна пачатая ў Савецкім Саюзе, Польшчы й Вугоршчыне, у нашых умовах абавязкова азначала б зьняцьце забароны з такіх тэмаў, як 1968 год, а для групоўкі Гусака й Біляка гэта, канечне, было б адыходам да той кропкі, якую яна сама акрэсьлівала як «сьметнік гісторыі». Аднак рэжым быў таксама заснаваны на «міжнароднай дапамозе» ды на «непарушнай дружбе з Савецкім Саюзам», прычым у небывалай тады на меркі савецкага блёку ступені. Таму ад яго нельга было чакаць, што ён зможа адкрыта дыстанцыявацца ад М. С. Гарбачова й ягонай групы. Вынікам была шызафрэнічная сытуацыя: тагачасныя ўладары вэрбальна няцьвёрда падтрымлівалі тое, што *de facto* адмаўлялі. Альбо наадварот: асуджалі тое, чаму не былі ў сілах перашкодзіць. Сьведчаць пра гэта, напрыклад, рытуальныя танцы таго пэрыяду вакол такіх словаў, як «дэмакратызацыя» ці «дыялёг». Дыялёг – так, але ня з кожным. Дыялёг – не, калі ён не стаіць на базе сацыялізму й калі вядзе да «нігілістычных» высноваў. «У атмасфэры ўсеагульнага крытыцызму, – папярэджваў на пачатку траўня 1989 году Ян Фойцік на пленуме Брненскага крайкаму КПЧ, прысьвечаным пытаньням адукацыйнай палітыкі, – ва ўмовах, калі да ганебнага слупа ставяцца цэлыя пакаленьні за ўсё тое, што яны нібыта змарнавалі, такі дыялёг наперад асуджаны на правал. Ён ня толькі беспасьпяховы, але й шкадлівы. І такіх дыялёгаў мы не павінны арганізоўваць»[2].

Ваганьне ва ўчынках і страта «волі да ўлады» вызначалі лёс некаторых рэпрэзэнтантаў рэжыму. А ў палітыцы сярэдніх эшалёнаў партыйнага апарату, – краёвых і раённых камітэтаў КПЧ – пачаваў яшчэ адзін дадатковы матыў: дзеянічаць так, каб не выклікаць пяюбасьці ў вышэйшых партыйных органаў.

[2] *Moravský zemský archív v Brně*, ImKV KSČ sv. 64 (Plénа), Zápis ze zasedání ImKV KSČ 2.5.1989, s. 120.

[3] Напрыклад, у дыскусіі на пасяджэньні прэзыдыюму ЦК КПЧ 21.10.1988 Германа Якэша ў адказ на прапанову Адама Шафа і Грамадзянскай платформы ўключыць у праект праграмы КПЧ для ўсіх» (устаноўчы дакумэнт апазыцыйнага Руху за Грамадзянскую Свабоду), каб яна была крыху больш

КПЧ і дзяржаўнага кантролю. Праверкі праводзіліся ў 1986 годзе па 90 асноўных пытаннях дзейнасці КПЧ, ЦК КПЧ і ЦК КПЧ па 21 пытанні.

Кадравая работа была адным з асноўных напрамкаў дзейнасці ЦК КПЧ. Менавіта ў гэтай сферы, на думку кіраўніцтва партыі, можна было ўплываць на ключавыя працэсы ў грамадстве. Кадравая работа ў КПЧ была арганізавана ў адпаведнасці з прынцыпам намэнклатуры, г. зн. існавалі спецыяльныя партыйныя камісіі, якія ажыццяўлялі падбор і расстаноўку кадраў. Найбольш важнымі з іх былі камісіі ЦК КПЧ, абкамаў, акруговых і раённых партыйных камітэта

партыйных органаў, але й грамадзтва, паведамляла таксама пра важныя палітычныя, гаспадарчыя і сацыяльныя падзеі ў краі). «Палітычныя навіны» (гэтак званая «Ўлётка») і «Весьнік» – з красавіка 1989 году «Інфармацыйны весьнік» – не былі, у адрозьненьне ад «КУІ», «строга сакрэтныя» ды служылі ў якасьці інфармацыйнай службы для чалецкай базы КПЧ. Раз на месяц (г. зн. на кожным другім паседжаньні прэзыдыюму крайкаму КПЧ, якое зьбіралася кожныя два тыдні) сакратар крайкаму КПЧ Тручка выступаў з ацэнкай палітычна-эканамічнай сытуацыі ў краі за мінулы месяц. У выступленьні закраналася й сытуацыя ў сфэры бясьпекі ды – у другой палове васьмідзясятых гадоў усё часьцей і часьцей, а асабліва пасьля студзеня 1989 году ўжо з жалезнай рэгулярнасьцю – дзейнасьць «нелегальных структураў». Чалавекам, які адказваў за паступленьне інфармацыі «ў галіне барацьбы супраць унутранага ворага», быў сябар крайкаму КПЧ палкоўнік Ёзэф Шабань, які займаў пасаду кіраўніка КУ КНБ (Краёвай управы Корпусу нацыянальнай бясьпекі)[4]. Дагэтуль няма адказу на пытаньне, наколькі ДБ (Дзяржбясьпека) перасьледавала ўласную палітычную стратэгію, якая магла ўплываць на выбар і форму інфармацыі, перадаванай партыйным органам. У якасьці фільтру тут узаемадзейнічалі цэнтральныя ўстановы службы бясьпекі й партыі ў Празе – толькі прайшоўшы празь іх, некаторыя зьвесткі «дэбэшнага» характару ізноў вандравалі да краёвых і раённых органаў КПЧ.

Да пікавых момантаў партыйнага жыцьця ў краі належалі пленумы крайкаму КПЧ, якія звычайна склікаліся чатыры разы на год і прысьвячаліся ў першую чаргу эканамічнай сытуацыі. У 1989 годзе гэта былі пленумы 13.01, 13.04, 13.07 і 13.10. Акрамя таго, адбываліся і сэсіі крайкаму КПЧ, якія звычайна склікаліся чатыры разы на год і прысьвячаліся ў першую чаргу ідэалогіі, адукацыі і эканамічнае і сацыяльнае разьвіцьцё рэгіёну, адукацыі і навуцы. Пленумы крайкаму КПЧ, якія звычайна склікаліся чатыры разы на год і прысьвячаліся ў першую чаргу эканамічнай сытуацыі. У 1989 годзе гэта былі пленумы 13.01, 13.04, 13.07 і 13.10. Акрамя таго, адбываліся і сэсіі крайкаму КПЧ, якія звычайна склікаліся чатыры разы на год і прысьвячаліся ў першую чаргу ідэалогіі, адукацыі і эканамічнае і сацыяльнае разьвіцьцё рэгіёну, адукацыі і навуцы.

[4] Палкоўнік інжынэр Ёзэф Шабань (1934) з 01.01.1980 быў загадчыкам управы ДБ у Астраве, з 20.01.1988 начальнікам КУ КНБ у Брне, 13.01.1990 пераведзены ў рэзэрву для часова звольненых ад абавязкаў, а 30.06.1990 звольнены са службы ў КНБ. ŽÁČEK, P. (ed.): Organizace a řízení represe v CSSR: Operační štáby generála Lorence 1988–1989. *Ó: Securitas Imperii*, č. 4, Praha 1998, s. 227.

Надпарадкоўвалася чатырнаццаць галоўных сакратароў раённых камітэтаў КПЧ. Сярод іх – прынамсі з пункту гледжаньня становішча на Брненшчыне – важную ролю граў першы чалавек Брненскага гаркаму КПЧ Павал Пільны, які ўжо зь вясны 1989 году імкнуўся суцішаць усхваляваную ідэйную роўнядзь у гутарках са студэнтамі вышэйшых навучальных установаў.

Напрыканцы васьмідзясятых гадоў, а асабліва ў 1989 годзе, адбыліся значныя зьмены на міжнароднай сцэне, тон якім задавалі перамены ў савецкай палітыцы. Яны знайшлі свой выраз і ў самітах вышэйшых прадстаўнікоў абедзьвюх супэрдзяржаваў, а пасьля і ў перамовах пра раззбраеньне. Так як Савецкі Саюз пераставаў быць «імпэрыяй зла» для заходніх дзяржаваў, гэтаксама й сьцьверджаньні нашых тагачасных уладароў пра тое, што ён зьяўляецца «нашым узорам», гучалі ўсё менш праўдападобна. Спакою ім не дадавалі й падзеі ў Польшчы й Вугоршчыне. «Непарушная еднасьць братэрскіх сацыялістычных краінаў паволі рабілася чыстай фікцыяй. І на нашай глебе пачало ўзьнікаць вострае разьмежаваньне паміж людзьмі са «структураў» (напрыклад, мастакі) і палітычнай апазыцыяй. Некаторыя прадстаўнікі творчых саюзаў ці навукова-дасьледчых установаў пачалі выступаць з нонканфармісцкімі й крытычнымі поглядамі. Брно й Паўднёвамараўскі край ад рэшты рэспублікі (за выключэньнем Прагі) адрозьніваліся ў двух плянах: выразнай канцэнтрацыяй палітычнай апазыцыйнай дзейнасьці ды большай актыўнасьцю аднае з партыяў Нацыянальнага Фронту – Чэхаславацкай Народнай Партыі. Як жа на зьмену становішча рэагавалі найвышэйшыя функцыянэры краю?

II

Кіраўніцтва крайкаму КПЧ аддавала перавагу праверанай працэдуры: не рызыкаваць, дакладна выконваць дырэктывы й, галоўнае, у час пасылаць у адказ на іх справаздачу. Пра некампэтэнтнасьць Мілаша Якеша сярод брненскіх камуністычных функцыянэраў пачало адкрыта гаварыцца ажно пасьля яго падзеньня падчас лістападаўскіх падзеяў. Нават той, хто выказваў непакой з нагоды некаторых аспэктаў палітычнага разьвіцьця на міжнароднай і ўнутранай сцэне, адразу ж пасьля гэтага прызнаваўся ў адданасьці кіраўніцтву. Характэрным у гэтым пляне было выступленьне галоўнага сакратара райкаму КПЧ са Ждзяру-над-Сазавай Індржыха Матыяша на пленуме крайкаму КПЧ, які адбыўся 1 лютага 1989 году ў Брне. Матыяш зьвярнуў увагу, што «павялічваецца колькасьць таварышаў, якія баяцца за далейшае разьвіцьцё ў нашай партыі ды за лёс сацыялізму ў нас. Справа не датычыць недаверу цяперашняму

кіраўніцтву партыі. Сучаснае кіраўніцтва карыстаецца даверам»[5]. Такім чынам, нягледзячы на асьцярогі ў сувязі зь некаторымі аспэктамі разьвіцьця, атмасфэра характарызавалася пасіўнасьцю, чаканьнем рэкамэндацыяў зьверху ды адчуваньнем, крывадушным ці сапраўдным, што кіраўніцтва ў стане кантраляваць сытуацыю.

У сьвядомасьці краёвай камуністычнай верхавіны паступова пачаў пранікаць непакой у сувязі зь «нездаровымі тэндэнцыямі» й недахопам дысцыпліны ў нізавых арганізацыях КПЧ. Тады як для сярэдніх партыйных эшалёнаў – краёвых і раённых камітэтаў – была тыповай непахіснасьць і адданасьць кіраўніцтву, праблемы пачалі ўзьнікаць з чалецкай базай. Можна меркаваць, што апрача некаторых выключэньняў гаворка ішла пра рост абыякавасьці, а не пра абдуманы бунт. Крайкам КПЧ зь непакоем рэгістраваў колькаснае падзеньне чалецкай базы на некаторых важных прадпрыемствах і ў навучальных установах, незацікаўленасьць маладых людзей у сяброўстве ў ССМ (Саюз сацыялістычнай моладзі) і ў КПЧ ды нежаданьне некаторых базавых арганізацыяў своечасова рэагаваць на рэкамэндацыі з цэнтру. Бяльмом на воку функцыянэраў з крайкаму КПЧ было, напрыклад, нежаданьне некаторых базавых арганізацыяў накладаць партыйнае пакараньне аж да выключэньня з шэрагаў партыі на тых сяброў КПЧ, якія паслалі сваіх дзяцей вывучаць рэлігію[6]. Палітычнае кіраўніцтва, канечне, адначасова дэкляравала намер паступова паслабіць царкоўную палітыку (напрыклад, адбылося прызначэньне біскупаў на некаторыя катэдры, быў дазволены прыём паслушніц у некаторыя жаночыя манаскія ордэны і кангрэгацыі ды абмяркоўваўся дазвол дзейнасьці выбраных мужчынскіх ордэнаў)[7]. Інструкцыі краёвых органаў па памянёнай вышэй правіннасьці не забывалі, праўда, падкрэсьліваць, што заўсёды неабходна браць пад увагу мясцовыя ўмовы: дзе-нідзе базавыя арганізацыі КПЧ нешматлікія і яны маглі б яшчэ болей аслабіцца. У моцна рэлігійных раёнах, як, напрыклад, Годанін, Угерскае Градзішча ці Бржэцлаў, больш рашучыя дзеяньні маглі б выклікаць непрыемнае хваляваньне.

Прыкладаў зьмены стаўленьня насельніцтва да КПЧ можна

5 MZA, ImKV KSČ, G 593, sv. 204, 35. PKV KSČ, 5.1.0.1989.
6 Tamsama, sv. 344, DVZ 1980, š. 12, s. 11.
7 MZA, ImKV KSČ, sv. 201, ar. j. 358, s. 74.

знайсьці шмат. Справаздача інструктара Паўднёвамараўскага крайкаму КПЧ па Годанінскім райкаме КПЧ, напрыклад, падавала, што «маладыя сябры альбо кандыдаты выкарыстоўваюць стаўленьне партыі да сьветапогляду сваіх сяброў для спыненьня свайго сяброўства. На апошнім прэзыдыюме быў выпадак, калі кандыдатка прыводзіла такую прычыну, што хаця яна яшчэ й ня мае партнэра, але не хацела б, каб яе сяброўства было прычынай нязгоды з партнэрам. Гэта датычыць 4 сябровак з БА (базавай арганізацыі) «Марыша» з Рогатца і адной сяброўкі з БА КПЧ «Вкус» з Вэсэлі-над-Маравай»[8]. Пра выпадкі, калі маладыя людзі вярталі партыйныя білеты альбо спынялі кандыдацтва ў шэрагі КПЧ, паведамлялася са «Зброеўкі» ў Брне, са «Ждзясу» ў Ждзяры-над-Сазавай, з «ЧКД» («Чэска-мараўская-Кольбэн-Данек») у Бланску і з атамнай электрастанцыі ў Дукаванах[9].

Падобную тэндэнцыю можна было прасачыць і сярод мастакоў ды студэнтаў вышэйшых навучальных установаў. Калі ў іншых сацыяльных групах супраціў да сяброўства ў КПЧ быў праявай стыхійнай «свабоды ад страху», сярод інтэлектуалаў у большай меры справа датычыла сьвядомага і ўнутрана абгрунтаванага пратэсту супраць некаторых канкрэтных пачынаньняў уладнага цэнтру ды супраць яго агульнай палітычнай лініі. Гэта былі асабліва рэпрэсіўныя крокі апарату, напрыклад, жорсткія паліцэйскія акцыі падчас г. зв. тыдня Палаха, ці кампанія супраць падпісантаў «Ініцыятывы працаўнікоў культуры», альбо закліку «Некалькі сказаў», што вяло некаторых інтэлектуалаў да рашэньня ня мець у будучыні з гэтай партыяй нічога агульнага. Праз сваю нязгоду з палітыкай кіраўніцтва КПЧ улетку 1989 году вярнуў свой партбілет, напрыклад, рэжысэр і актор Ганацкага тэатру Арнашт Голдфлам[10], і падобныя матывы ўжо восеньню 1988 году прывялі слухача Акадэміі музычнага мастацтва імя Яначка Віта Зоўгара да напісаньня заявы аб выключэньні з шэрагаў кандыдатаў у КПЧ[11]. Праўда, сярод шараговых сяброў КПЧ былі й такія, хто сярод росту абыякавасьці ўсурэз прыняў словы аб перабудове й галоснасьці ды ня меў намеру сваю спрэчку з апаратам вырашыць адыходам з партыі, а спробай «адрадзіць» яе. Праўда, гэта напэўна не было масавай зьявай. Таму, безумоўна, можна лічыць рэдкай надзею, якая здарылася на актыве

[8] *MZA*, Jm KV KSČ, G 593, sv. 344, DVZ 1989, č. 12, s. 11.

[9] Тамсама, гл. 344, DVZ 1989, č. 6, s. 15; č. 9, s. 2; sv. 351, OŠV, ar. j. 171, Zápis z porady 10. 4. 1989; žë. 202, ar. j. 364.

Hodnocení politickoekonomické situace v Jihomoravském kraji za březen 1989, list 110.

[10] На імя Арнашта Голдфлама (1946) 27.9.1974 у 4-м аддзяленьні II аддзелу Брненскай управы ДБ была зарэгістраваная папка правяранай асобы пад псэўданімам Айзэнбэрг (рэгістрацыйны нумар 22.384). 25.10.1975 яго перавялі на агентурную папку, якую 14.3.1980 здалі ў архіў.

[11] Яго вынад крадзіўнікаў інструктаў ці старшыні ЦККН КПЧ Ўнівэрсытэтаў А. Н. Шуркін у Брне ў лютым 1989 году. На ім прыгучаў, як і асудзіў, у спэцыяльнай рэзалюцыі пратэст працаўнікоў культуры супраць студзеньскай акцыі паліцыі ў Празе й супраць арышту Вацлава Гаўла. «Лектар крайкаму КПЧ Блажэй Ондра (выкладаў марксізм на філязофскім факультэце вышэй памянёнага ўнівэрсытэту. – **Р. В.**) выступіў супраць: ён перасьцярог, каб не асуджаць таго, чаго яны ня ведаюць – ён сам за такую пазыцыю галасаваць ня будзе. Большасьць удзельнікаў актыву далучылася да яго пункту гледжаньня – нельга абвергнуць таго, што мы ня ведаем у падрабязнасьцях, пра што няма падрабязнай інфармацыі»[12].

І ў раёне Угерскае Градзішча зь некаторых базавых арганізацыяў наплывалі зьвесткі пра крыху нонканфармісцкія падыходы: напрыклад, што ў 1968 годзе мы апярэдзілі свой час альбо што да асуджэньня пэтыцыі «Некалькі сказаў» вымушаюць функцыянэры, каб утрымацца на сваіх пасадах[13]. «У Бланскім, Годанінскім, Трэбіцкім раёнах ды ў іншых месцах нават з боку актыву функцыянэраў зьявіліся неабдуманыя патрабаваньні, каб сродкі масавай інфармацыі падалі да агульнага ведама тэкст «Некалькіх сказаў»[14]. Падобныя падыходы былі, хутчэй, адзінкавымі і амаль заўсёды будзілі насьцярожаную ўвагу працаўнікоў абласнога партапарату. Пераважала насіўнасьць. Абласныя функцыянэры без энтузіязму паведамлялі, што ўсяго толькі 3658 базавых арганізацыяў КПЧ і органаў, аб'яднаных у Нацыянальным Фронце (гаворка вялася ўсяго пра 13,7 % агульнай колькасьці БА КПЧ у вобласьці), рэагавала спэцыяльнай рэзалюцыяй на заклік «Некалькі сказаў» і далучылася да «Звароту Прэзыдыюму ЦК КПЧ да 41-х угодкаў Пераможнага Лютага»[15]. Адным з мэтадаў змушэньня да лояльнасьці была карупцыя. Так, напрыклад, Бланскі райкаму КПЧ насьля нядалёкай спробы прымусіць базавыя арганізацыі з большай адвасьцю – шляхам асуджальных рэзалюцыяў – рэагаваць на заклік «Некалькі сказаў», вырашыў «рабіць супраць супрацоўнікаў, дзе маюцца найбольшыя праблемы, адпаведныя высновы. РК КПЧ узяў да ведама высновы – правядзеньне размоваў з тым, што гэта будзе ўлічана пры назначэньні прэміяльных».

[12] *MZA*, JmKV KSČ, sv. 201, ar. j. 362. Hodnocení politickoekonomické situace v Jihomoravském kraji za únor 1989, list 106.

[13] *MZA*, JmKV KSČ, sv. 344. DVZ 1989, č. 8, s. 13.

[14] *MZA*, JmKV KSČ, G 593, sv. 203. Hodnocení politickoekonomické situace v Jihomoravském kraji za měsíc červenec 1989, list 104.

[15] Тамсама.

[16] *MZA*, JmKV KSČ, G 593, sv. 344. DVZ 1989, č. 12, s. 6.

[17] Пра апазыцыю ў ЧНП тл. ОТАНАЛ, М.: Obrodný proud v Československé straně lidové. Ó: PERNES, J. (ed.): *Po stopách nedávné historie*: Sborník k 75. narozeninám doc. Karla Kaplana, Brno 2003, s. 267-279.

[18] *MZA*, JmKV KSČ, sv. 204, ar. j. 38. На Ёзэфа Бартанчыка (1943) 25.5.1971 у РА МУС у Крамнержыжы была зарэгістраваная агентурная папка пад псэўданімам Гаек (рэгістрацыйны нумар 15.201), якая ў красавіку 1988 году была здадзеная ў архіў. На Ёзэфа Бартанчыка (1943) у той самы пэрыяд была адкрытая сыгнальная папка пад псэўданімам Спонсар. Параўн.: CHURAŇ, M. a kol.: *Encyklopedie špionáže*: Ze zákulisí tajných služeb, zejména Státní bezpečnosti. Praha 2000, s. 18.

[19] *MZA*, JmKV KSČ, sv. 202, ar. j. 368. Hodnocení politickoekonomické situace v Jihomoravském kraji za květen 1989, list 71.

[20] *MZA*, JmKV KSČ, G 593, sv. 344. DVZ 1989, č. 8, s. 9.

[21] Брненскае біскупства было вакантным па сьмерці біскупа

III

Кіраўніцтва ЧНП ў 1972 г. // *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 202, arj. 364, sk. 8, s. 1–2.

[2] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[3] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[4] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[5] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[6] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[7] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[8] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[9] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[10] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[11] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[12] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[13] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[14] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[15] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[16] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[17] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[18] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[19] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[20] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[21] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[22] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[23] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[24] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[25] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[26] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[27] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[28] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[29] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[30] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[31] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[32] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[33] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[34] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[35] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[36] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[37] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[38] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[39] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

[40] *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 203, arj. 369, sk. 8, s. 1–2.

Царкоўнае жыццё ў Чэхаславакіі ў 1970–1980-я гг. // *MZA*, f. ÚV KSČ, sv. 202, arj. 364

Анежкі Пршэмыслоўны[22].

Самаўпэўненасьць і амбіцыі тут расьлі ў меру таго, як узмацняўся грамадзянскі кураж насельніцтва, прычым не без уплыву міжнародных падзеяў. У якасьці адной з крыніцаў натхненьня тут, несумнеўна, – разам з паступовым аднаўленьнем палітычнага плюралізму ў Вугоршчыне, – служыла тактыка Леха Валэнсы ў суседняй Польшчы ўлетку 1989 году; тады кароткі час разважалі пра магчымасьць стварэньня ўраду «Салідарнасьці» без удзелу польскіх камуністаў, але зь іх ранейшымі сатэлітамі-хаўрусьнікамі[23]. Праўда, ў нас бракавала масавага апазыцыйнага руху тыпу «Салідарнасьці»; таму прадстаўнікі адраджэнскай плыні ў ЧНП схіляліся да праблематычнай думкі, што адпаведным шляхам да правядзеньня палітычных рэформаў ёсьць выкарыстаньне сыстэмы Нацыянальнага Фронту ды ўзмацненьне значэньня яго некамуністычных элемэнтаў.

Як высьвятляецца, шмат хто зь сяброў абедзьвюх некамуністычных партыяў пачаў усьведамляць хісткасьць папярэдняй сыстэмы больш ясна, чым самі камуністы, ды рыхтаваўся да свайго гістарычнага шанцу. Асабліва сярод шараговых чальцоў шырылася адчуваньне, што набліжаецца момант, калі камуністам можна будзе вярнуць усе нанесеныя тымі крыўды. Памяншалася жаданьне й далей служыць псэўдадэмакратычным фонам камуністычнай уладзе. Так, напрыклад, сябры нядаўна заснаванай базавай арганізацыі ў Бошавіцах Вышкаўскага раёну нібыта не хавалі таго, што «камуністам ужо доўга было добра, і цяпер іх чарга»[24]. У вёсках Боржэціцы й Заечы на Бржэцлаўшчыне сябры ЧНП нават зьбіралі подпісы пад пэтыцыяй «Некалькі сказаў»; ускалыхнутую сытуацыю там мусілі ліквідаваць старшыні базавых арганізацыяў КПЧ разам з прадстаўнікамі мясцовых нацыянальных камітэтаў на супольным сходзе 29 жніўня 1989 году[25]. Падобным чынам на раённай канфэрэнцыі ЧНП адзін з прамоўцаў задумаўся над малой цікаўнасьцю грамадзтва да сваёй партыі, якая, на яго думку, «вынікае з таго, што ЧНП для грамадзтва ня мае карысьці – яна ёсьць васалам КПЧ»[26].

Паводле прыкладу ЧНП пачалося ажыўленьне – няхай сабе

павольней і з большымі цяжкасьцямі – і ў шэрагах колькасна слабейшай ЧСП (у Паўднёвамараўскай вобласьці яна мела ўсяго толькі 3303 сяброў)[27]. Яе друкаваны орган – газэта «Свабоднае слова» – зь вясны 1989 году імкнуўся да большай аб'ектыўнасьці, закранаў некаторыя тэмы-табу ды нагадваў імёны, якія нармалізацыйны рэжым асудзіў на забыцьцё (камуністы, напрыклад, крытыкавалі той факт, што газэта дазволіла апублікаваць размову з падпісанткай Хартыі-77 сьпявачкай Мартай Кубішавай)[28]. Незадавальненьне й роспач камуністычных функцыянэраў выклікалі й іншыя зьявы, сярод іх, напрыклад, той факт, што ЧСП пачала кампанію набору новых сяброў: «Яна накіравалася на павышэньне чалецкай базы за кошт шэрагаў гуманітарнай інтэлігенцыі. (…) Сацыялісты надаюць увагу экалёгіі, супрацоўніцтву з абаронцамі прыроды. З ініцыятывы БА ЧСП у Жыдлахавіцах, падтрыманай РК і КК ЧСП, напрыклад, у жыдлахавіцкім замкавым парку на каменным п'едэстале будзе ўстаноўленая арыгінальная мэмарыяльная дошка ў гонар візыту Т. Г. Масарыка»[29]. Раённы камітэт ЧСП у Годаніне нават выступіў з патрабаваньнем аднаўленьня помніка Масарыку. Скаргі на спробу сацыялістаў «праслаўляць асобу Масарыка заўсёды й любой цаной, уключна з раскруткай на старонках «Свабоднага слова»[30], прынамсі з пачатку восені сталіся важнай тэмай унутраных дакумэнтаў з паседжаньняў паўднёвамараўскага кіраўніцтва КПЧ. З шэрагаў ЧСП даносіліся й галасы, якія крытыкавалі павольныя тэмпы дэмакратызацыі (брненскі гарадзкі камітэт ЧСП). КК КПЧ імкнуўся такія тэндэнцыі выхопліваць і падаўляць альбо выкарыстоўваць дзеля навязваньня сваёй вэрсіі «перабудовы». Таму на паседжаньні прэзыдыюму КК КПЧ 14 верасьня 1989 году было вырашана распрацаваць дакумэнт, які б фармуляваў стратэгію дачыненьняў зь некамуністычнымі партыямі Нацыянальнага Фронту ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі[31]. У дачыненьні да «народнікаў» і сацыялістаў быў прапанаваны больш выразны ўдзел ва ўладзе й мацнейшае асьвятленьне ў сродках масавай інфармацыі, праўда, пры той умове, што яны не сыдуць з сацыялістычнага шляху. Адзін з пунктаў дакумэнту прапанаваў падтрымаць «асабліва тых функцыянэраў некамуністычных партыяў, якія атаясамліваюцца з сацыялізмам ды хочуць сумленна дзейнічаць дзеля яго далейшага разьвіцьця»[32]. Праўда, прыведзены дакумэнт быў ухвалены

ажно на паседжаньні прэзыдыюму КК КПЧ 30 лістапада 1989 году, то бок у пэрыяд, калі не было вялікай ахвоты пытаць у камуністаў, што ўжо можна, а што яшчэ не. Прэзыдыюм КК КПЧ таксама ў верасьні 1989 году вырашыў часьцей сустракацца з прадстаўнікамі абедзьвюх партыяў ды заклікаў да таго самага й падпарадкаваныя партыйныя органы (сустрэча кіраўніцтва краёвых камітэтаў усіх трох партыяў адбылася ў Брне 25 кастрычніка 1989 году)[33].

IV

З архіўных дакумэнтаў відаць гэтаксама занепакоенасьць галоўных функцыянэраў КПЧ падзеямі ў некаторых краінах савецкага блёку. Яны паступова пачалі ўсьведамляць, што палітычная лінія тагачаснага савецкага кіраўніцтва сваімі наступствамі паволі пачынае паварочвацца супраць іх. Аднак толькі ўмовы дэмакратыі дазволілі ім сказаць уголас тое, што да 17 лістапада 1989 году ніхто зь іх не адважваўся сказаць адкрыта: што палітыка групоўкі Гарбачова «была найбольшай да гэтага часу здрадай сацыялізму й рабочай клясе ў сусьветнай гісторыі»[34]. Нягледзячы на ідэалягічны вакабуляр, яны, у прынцыпе, маюць рацыю. У дапераваротны пэрыяд ім не заставалася нічога іншага, як выконваць вэрбальныя практыкаваньні, ад якіх кругам ішла галава, пра «ўласны шлях» і «неперайманьне чужых узораў». Адной з субстытуцыйных мэтаў іх крытыкі стаўся й нібыта павярхоўны й дэструктыўны стыль пісьма пэўнай часткі савецкага (дый, напэўна, польскага й вугорскага) друку, для якога яны прынялі пагардлівы выраз «пена». Толькі некаторыя «заслужаныя шараговыя члены партыі» маглі дазволіць сабе выказваньне, што падзеі ў СССР і КПСС нясуць у сабе пагрозу сацыялізму. Абаперціся можна было толькі на дружбу з Жыўкавым, Гонэкерам і Чаўшэску; праўда, на дзень паліцэйскай акцыі супраць маніфэстацыі студэнтаў на Народным праспэкце на сваёй пасадзе заставаўся толькі апошні сярод іх. Мілаш Якеш у Чэрвэным Градку і Ян Фойцік у Брне[35] зь непрыхаванай сымпатыяй дакладвалі пра прапанову Чаўшэску склікаць нараду генэральных і першых сакратароў камуністычных партыяў тых краінаў, дзе камуністы былі пры ўладзе. Чаўшэску абдумваў магчымасьць агульнай вайсковай акцыі супраць «контрарэвалюцыі». Міністар

нацыянальнай абароны Мілан Вацлавік за дзень да 17 лістапада пераконваў камісіі Фэдэральнага сходу, што армія гатовая, калі атрымае на гэта загад, правесьці «кітайскі варыянт» рашэньня палітычнай крызы[36]. «Адзінства сацыялістычнага лягеру» ўжо было ў мінулым.

На пачатку кастрычніка 1989 году кіраўніцтва КК КПЧ у Брне ўхваліла дырэктыву пад назвай «Галоўныя кірункі ідэалягічнай і масава-палітычнай працы ў паўднёвамараўскай партыйнай арганізацыі на 1990 год». Да абмеркаваньня яе прапанаваў сакратар краёвага камітэту Ян Наўраціл[37]. Брненскія камуністы лічылі неабходным «ва ўмовах, калі адбываецца парушэньне еднасьці сацыялістычных краінаў і калі кожная партыя нясе ўласную адказнасьць за лёсы сацыялізму ў сваёй краіне, тлумачыць непазьбежнасьць паглыбленьня ўсебаковага супрацоўніцтва й адзінства сацыялістычных дзяржаваў»[38]. Памянёная «ўласная адказнасьць» давала магчымасьць крытыкаваць суседзяў і хаўрусьнікаў. «Даўно ўжо час, – сьцьвярджаў Ян Фойцік на памянёным травеньскім пленуме Брненскага абласнога камітэту партыі, – выступіць супраць дэструкцыйнай плыні, якую шмат хто зь неадпаведных асобаў зьвязвае зь перабудовай і дэмакратызацыяй грамадзтва ды натхняецца ў гэтым прыкладамі з так званай пены ў Савецкім Саюзе, ВНР і ПНР»[39]. Галоўны сакратар краю Ўладзімер Герман – цытатай з прамовы Якеша – выказаў на пленуме КК КПЧ 27 верасьня 1989 году прычыны асьцярог: «Новым момантам сёньня ёсьць тое, што ім (г. зн. прадстаўнікам апазыцыі. – **Р. В.**) чыніцца падтрымка ня толькі з Захаду, але й зь некаторых сацыялістычных краінаў, асабліва з Польшчы й Вугоршчыны, прычым нават па афіцыйнай лініі»[40].

Настальгія па старых часах была немалой. «Нескаардынаваныя падыходы, – інфармаваў прэзыдыюм пра стан думак сярод камуністаў у сьнежні 1988 году сакратар краёвага камітэту Тручка, – выклікалі артыкулы, апублікаваныя ў «Спадарожніку» ды ў «Штотыднёвіку навінаў», гэтаксама як і паведамленьне ЧТА (Чэхаславацкае тэлеграфнае агенцтва) пра тое, што будуць зьнятыя мэмарыяльныя дошкі й адмененыя назвы школаў, вуліцаў, установаў і г. д., якія носяць імя Брэжнева й Чарненкі»[41].

Тады як выказваньне асьцярог з нагоды разьвіцьця падзеяў у Польшчы й Вугорыччыне (часам і ў Югаславіі, а рэгулярна з кастрычніка 1989 году і ў ГДР) сталася складовай часткай стандартнага рытуалу, сваю занепакоенасьць у сувязі з падзеямі ў Савецкім Саюзе звычайна агучвалі толькі «старэйшыя сябры партыі»[41]. Некаторыя зь іх былі нават здольныя праз «нэгатыўнае разьвіцьце падзеяў у СССР і КПСС» выйсьці з Саюзу і хаславацка савецкай дружбы (пацьвярджаюць гэта, напрыклад, паведамленьні зь мясцовай арганізацыі «Ждзяс» са Ждзяру над Сазавай). Праўда, «некаторыя пасьля праведзенай размовы зьмянілі пункт гледжаньня»[42]. Аднак адкрытае адмаўленьне М. С. Гарбачова ды яго палітычнага курсу не было зусім звычайнай справай нават сярод «старэйшых членаў». Толькі самыя цьвердалобыя мелі адвагу сьцьвярджаць, што «армія павінна будзе навесьці парадак, посьпех «мірнай палітыкі» палягае на тым, чаго Захад хацеў ужо раней», «за гэта асабіста адказны Гарбачоў», «ідзе на ланцужку ў Захаду, чаму ня ўзяў удзелу ў нахаваньні Кадара?»[43]. У прамовах найвышэйшых функцыянэраў падобныя ацэнкі міжнароднай сытуацыі ў ультраляўцкай пэрспэктывы гучалі ўжо ў аслабленай форме. Напрыклад, ва ўжо цытаваным выступе на пленуме крайкаму КПЧ Ян Фойцік свае заўвагі аб «вульгарным» разуменьні дэмакратызацыі адукацыі, якую нібыта нельга зводзіць да выбараў дырэктараў школаў, паказальна завяршыў словамі: «Дый думаю, што нам асабліва няма каго пераймаць, як тая малпа»[45].

V

Брно пасьля Прагі было другім паводле важнасьці цэнтрам палітычнай апазыцыі ў краіне ўжо ад пералому шасьцідзясятых і сямідзясятых гадоў. Сьпярша справа была асабліва ў спробе захаваць у сьвядомасьці грамадзкасьці рэфарматарскія памкненьні 1968 году[46]. Рэжым пасьпяхова ўмацоўваўся, дый міжнароднае становішча не змушала яго да карэктываў палітычнага курсу. Галоўныя дзейныя асобы бунту, сярод іх і некаторыя выключаныя камуністы, апынуліся ў турме (Яраслаў Шабата, Здэнек Пршыкрыл, Яраслаў Мэзьнік, Пэтар Вурм ды іншыя), а пасьля іх вяртаньня зь месцаў зьняволеньня каля сярэдзіны сямідзясятых гадоў перарваныя ніткі супрацоўніцтва

41 *MZA*, JmKV KSČ, sv. 201, ar. j. 358, PKV KSČ Brno, s. 74.
42 Тамсама, ar. j. 360, list 139.
43 *MZA*, JmKV KSČ, G 593, sv. 344, Důvěrné vnitrostranické informace (DVI) 1989, č. 5, s. 11.
44 *MZA*, JmKV KSČ, G 593, sv. 344, DVZ 1989, č. 9, s. 4.
45 *MZA*, JmKV KSČ, G 593, sv. 204, 35, PKV KSČ, 5.10.1989.
46 Па першай фазе палітычнай апазыцыі супраць «нармалізацыйнага» рэжыму параўн.: OTÁHAL, M.: První fáze opozice proti takzvané normalizaci. Ó: MANDLER, E. (ed.): *Dvě desetiletí před listopadem*, c. d., s. 11–33.
47 У справе апазыцыйнай дзейнасьці часткі членаў гарадзкой арганізацыі ЧСП у Брне (Мілан Шылган, Пэтар Вурм, Яраслаў Мэзьнік ды інш.) параўн.: PERNES, J.: *Od demokratického socialismu k demokracii*: Nekomunistická socialistická opozice v Brně v letech 1968–1972. Brno 1999.
48 Душан Славік (1922) знаходзіцца ў сьпісе супрацоўнікаў ДБ, надрукаваным рэдакцыяй «Нецэнзураванай газэты», «ідзе на ланцужку ў Захаду, чаму ня ўзяў удзелу ў нахаваньні Кадара?»[44]. У прамовах найвышэйшых функцыянэраў падобныя ацэнкі міжнароднай сытуацыі ў ультраляўцкай пэрспэктывы гучалі ўжо ў аслабленай форме. Напрыклад, ва ўжо цытаваным выступе на пленуме крайкаму КПЧ Ян Фойцік свае заўвагі аб «вульгарным» разуменьні дэмакратызацыі адукацыі, якую нібыта нельга зводзіць да выбараў дырэктараў школаў, паказальна завяршыў словамі: «Дый думаю, што нам асабліва няма каго пераймаць, як тая малпа»[45].
49 Да пытаньня аб дзейнасьці брненскай сэкцыі ЧЗМ параўн.: BLAŽEK, P.: Deite šanci míru! Pacifismus a neformální mírové aktivity mládeže v Československu 1980–1989. Ó: VANĚK, M. a kol.: *Ostrůvky svobody*: Kulturní a občanské aktivity mládeže v 80. letech v Československu. Praha 2002, str. 84.

зьвязваліся павольна і зь цяжкасьцю[47]. Самвыдат быў у сваіх пачатках, а палітычная апазыцыйная дзейнасьць уяўляла сабой дыскусіі ў вузкім коле сяброў. І пасьля ад'езду Мілана Кундэры ў эміграцыю ў Брне засталося некалькі «забароненых» пісьменьнікаў, зь іх некаторым – як Олдржыху Мікулашку, Яну Скацэлу ці Івану Кржыжу – паступова была дадзеная магчымасьць зноў публікавацца, тады як зь іншых – Здэнька Ротрэкла, Мілана Угдэ, Яна Трэфулкі ці Паўла Шванды – праклён ня быў зьняты да апошніх дзён рэжыму.

[image]

Адзін з галоўных прадстаўнікоў Хартыі-77 у Брне Яраслаў Шабата. Як «варожая асоба», ён атрымаў ад Дзяржбясьпекі мянушку «Правадыр».
Другая палова 1980-х гг.

Пачаткі Хартыі-77 у Брне былі складанымі, а ступень ізаляцыі, якой рэжыму ўдалося акружыць супрацьдзейных грамадзянаў, была значнай. Моцныя гэтага сьвету й надалей за «антыдзяржаўную дзейнасьць» прызначалі суровыя пакараньні, асабліва калі справа датычыла «рэцыдывістаў». Калі Хартыя-77 уступала ў другі дзясятак свайго існаваньня, шмат што ўжо было інакшым. У апошнія некалькі гадоў і месяцаў перад «аксамітнай рэвалюцыяй» у Брне разам з Хартыяй-77, да найбольш значных падпісантаў якой у мараўскай мэтраполіі належалі Пэтар Цыбулка, Іржы Мюлер, Пэтар Посьпіхал, Ян і Яраслаў Шабаты, Ян Шымса ці Мілан Угдэ, узьніклі й іншыя грамадзянскія ініцыятывы. Гэта былі, напрыклад, Рух за грамадзянскую свабоду (Павал Барша, Альбэрт Чэрны, Марцін Догнал, Мілан Елінэк, Бажэна Камаркава, Яраслаў Мэзьнік, Здэнек Ротрэкл, Душан Славік[48], Ян Шабата, Яраслаў Шабата, Ян Шымса, Мілан Угдэ, Ітка Угдэава, Вацлаў Умлаўф), Незалежнае згуртаваньне за мір (у краі да яго далучылася каля пяцідзесяці асобаў, найбольш актыўнымі сярод якіх былі Гана Голцнэрава ды Ўладзімер Выскачыл)[49], Таварыства сяброў ЗША (яно было заслугай Станіслава Дэватага, Паўла Юнгмана й Пэтра Барташа ды праводзіла сваю дзейнасьць перадусім у Готвальдаўскім раёне) і Таварыства імя Масарыка (Мілан

Елінэк, Душан Славік, Ян Шымса ды іншыя). Нельга недаацэньваць і той ролі, якую ў сьвеце «паралельнага полісу» гралі хрысьціяне абодвух галоўных веравызнаньняў – Ёзэф Адамэк і Радамір Малы ад каталікоў, а з шэрагаў эвангельскіх хрысьціянаў Бажэна Камаркава й Ян Шымса ды многія іншыя (спробу Аўгустына Наўраціла з Лутапэцняў Кромнержыскага раёну, аўтара вядомай пэтыцыі мараўскіх каталікоў, інстытуцыялізаваць хрысьціянскі рух праз заснаваньне Задзіночаньня хрысьціянскіх грамадзянаў «Мір на зямлі» перш за ўсё не ўхвалілі праскія актывісты). Свайго прадстаўніка ў Брне мелі й Польска-чэхаславацкая салідарнасьць ды Ўсходнеэўрапейскае інфармацыйнае агенцтва (УІА); гэтую ролю ў абодвух выпадках выконваў Пэтар Посьпіхал[50].

[image]
Мараўскія дысыдэнты паэт Здэнек Ротрэкл і пісьменьнік Людвік Вацулік.

Па Брне кружыла асноўная самвыдатаўская («Інфармацыя пра Хартыю-77», «Інфармацыя пра царкву», «Чадовэк і новыны») ды інш. Ужо эмігранцкая пэрыядычка, але зьявіўся й арыгінальны брненскі самвыдат. Часопіс «Есть меў» (Чэраваны, Чэраважна культурныя амоцыі (галоўную заслугу ў яго рэдагаваньні мелі Душан Скала й Яна Соўкупава), «Імпульс» выдавалі экс камуністы з клюбу «Адраджэньне» (Здэнек Пршыкрыл і іншыя); выходзіў таксама «Брненскі інфармацыйны бюлетэнь Незалежнага згуртаваньня за мір» і самоцыйнае культурна палітычнае рэвю, скарочана названае «То» (вышэй, праўда, усяго адзін нумар). Напрыканцы вясны 1988 году зьявіўся пробны, нулявы нумар студэнцкага «Рэвю-88»; няроўная барацьба яго рэдакцыі з палітычнай уладай прыцягвала да сябе ўвагу асабліва студэнтаў брненскіх вышэйшых навучальных установаў[51]. Сяляне пачалі выдаваць «Супольнасьць» (Радамір Малы ды іншыя), а цесныя сувязі з Брном былі і ў сялянскага пэрыядычнага выданьня з Аламоўцу «Велеград». Вялікую заслугу ў пашырэньні альтэрнатыўнай культуры – асабліва музычнага самвыдату – меў падпісант Хартыі-77 Пэтар Цыбулка. Сьвет апазыцыйнай палітычнай дзейнасьці й альтэрнатыўнай культуры пачаў уступаць у асяродзьдзе, куды раней ня меў доступу, перадусім у кола студэнцкай моладзі ды

[50] Аб дзейнасьці Польска-чэхаславацкай салідарнасьці і УІА параўн.: BLAŤEK, P.: Setkání pravdy s vítězstvím: československá a polská opozice na stránkách hraničních 1978–1989. V: HRODEK, D. (ed.): Česká a polská historická tradice a její vztah k současnosti: Pardubická konference (18.–20. duben 2002). FF UK, Praha 2003, s. 188–209.

[51] Параўн.: VÉVODA, P.: Brněnské studentstvo v poslední fázi totalitního režimu: Příběh Revue 88. O: TŮMA, O. (ed.): *Historické studie*: K sedmdesátinám Milana Otáhala. Praha 1998, s. 233–259.

творчай інтэлігенцыі.

Год 1989 быў багатым на новыя формы незалежнай дзейнасьці. Пачалі узьнікаць улёткавыя акцыі, удзел у якіх, напрыклад, браў Ярослаў Поньелка[52] ці брытанскі актывіст у падтрымку міру Дэвыд Варнэдэйл[53]. Улёткі зьвычайна зьвярталіся да выпадкаў зьняволеньня з палітычных матываў[54], заклікалі грамадзтва да удзелу ў акцыях пратэсту альбо выказваліся з нагоды актуальных экалягічных праблемаў, як, напрыклад, будова тэлевізійнага перадатчыка на Палаве, пляны пабудовы хуткаснай падземнай трамвайнай лініі і да т. п. Паслі падзелу у сувязі з так званым праскім ныдыем[55] Палаха у Брне таксама можна было спаткацца з заклікамі да публічных манэўстрацыяў, асабліва з нагоды паліцэйскіх розыскаў, як, напрыклад, 16 студзеня (гадавіна ўчынку Палаха)[56], 1 траўня[57], 21 жніўня[58] ці 28 кастрычніка. Колькасьць удзельнікаў такіх ня зусім недазволеных акцыяў, праўда, рэдка калі пераўзыходзіла пекальку дзесяткаў асобаў. Такім чынам, яны рабіліся лепкай мішэнню для апазыцыі, каб паказаць сваю сілу. Адным з новых элемэнтаў на палітычнай сцэне была спроба дыскусіі з прадстаўнікамі некаторых афіцыйных грамадзкіх арганізацыяў (прадстаўнікі апазыцыі, канечне ж, заклікаля да ня ўдзелу). На гэтым полі было асабліва актыўным Незалежнае згуртаваньне за мір, прадстаўніца якога Гана Гольцэрава ўсталёўвала кантакт з гарадзкім камітэтам Нацыянальнага Фронту, гарадзкою гарадзкою барадзкою за мір альбо з сымі зьвязам ахоўніку прыроды. Адной з асноўных тэмаў, якім пры гэтых перамовах надавалася ўвага, была менавіта экалёгія. З вялікай увагай грамадзтва сачыла за так званымі брненскімі форумамі[59], арганізаванымі зь вясны 1989 году 31-й базавай арганізацыяй Чэскага зьвязу ахоўнікаў прыроды з раёну каменны Верх гораду Брно. У гэтых дыскусійных сустрэчах рэгулярна браў удзел і прадстаўнікі незалежных ініцыятывы, а таксама славацкія актывісты экалёгіі. У брненскіх камуністычных функцыянэраў гэта выклікала усе больш і больш непакой. Іх неахвота да гэтай формы дыялёгу выявілася ў тым, што яны ня толькі не прадставілі свае погляды на экалягічныя праблемы, але і ня ўсе запрошаныя ўдзельнікі дыскусіяў зь іх боку зьявіліся. Напрыклад, на форуме, прысьвечаным праблемам экалёгіі ў Брне, які адбыўся 10.03.1989 на Чэскай вуліцы, былі запрошаныя трое маладых людзей, якія спрабавалі зьбіраць подпісы пад петыцыяй з патрабаваньнем вызваліць Вацлава Гаўла. Гэтая акцыя была ініцыяваная ня толькі ў Брне, але і ў Празе, Пардубіцах, Кладна, Ліберцы, Ўсьці-над-Лабэм, Ялавай, Ўсьці-над-Арлічы, Ліптоўскім Мікулаш

1989 году ў Брне і ў Паўднёвамараўскім краі ўвагу да сябе прыцягвалі крымінальныя справы ў дачыненьні Пэтра Цыбулкі, Станіслава Дэватага, Івана-Марціна Іраўса, Міраслава Марэчка, Яраслава Попэлкі, Іржы Ціхага, Уладзімера Вэсэлскага, Эвы Відларжавай ды іншых. Пэўную навіну ў рамках усёй рэспублікі ўяўляла сабой больш шчодрае выкарыстаньне адміністрацыйных працэсаў, якія супраць канкрэтнага «правапарушальніка» распачынаў адпаведны нацыянальны камітэт. Такія справы звычайна завяршаліся пазьней папярэджаньнем ці штрафам. Тым ня менш, шмат хто з членаў КПЧ і прадстаўнікоў кіраўніцтва ня ўтойваў свайго погляду, што «партыя занадта саступае». Прапанаваным імі рэцэптам быў працяг папярэдняга рэпрэсіўнага курсу. Іх унутраныя дакумэнты падкрэсьлівалі неабходнасьць наступальнай контрапрапаганды, пасьлядоўную рэалізацыю «права партыйнага кантролю», барацьбу з карупцыяй і іншымі «нэгатыўнымі зьявамі ў сфэры сацыялістычнай эканомікі» і да т. п. Іх аналіз сытуацыі быў, канечне, няпоўным. Перасьлед карупцыі ў дзяржаўным апараце ня мог быць дастатковым рэцэптам вырашэньня грамадзкіх праблемаў. Што яны перш за ўсё недаацанілі, дык гэта зрухі ў настроях грамадзкасьці й зьмены сацыяльнага клімату.

Палітычная апазыцыя пераставала быць ізаляванай жменькай асобаў. Напрыканцы васьмідзясятых гадоў яе грамадзкі ўплыў быў істотна большым, чым, напрыклад, у пачатковы пэрыяд існаваньня Хартыі-77. Асабліва з пачатку 1989 году хутка ўзрастала рашучасьць прадстаўнікоў некаторых грамадзкіх групаў салідарызавацца зь перасьледаванымі ды займаць крытычную пазыцыю да публічнага жыцьця. На адным зь першых месцаў тут стаялі афіцыйныя мастакі, асабліва акторы. Для функцыянэраў Паўднёвамараўскага КК КПЧ было непрыемнай неспадзяванкай адкрыць для сябе, колькі актораў брненскіх тэатраў паставілі свае подпісы пад пэтыцыяй, якая патрабавала вызваленьня Вацлава Гаўла (пасьля падзеяў тыдня Палаха), вядомай як Ініцыятыва прадстаўнікоў культуры. Занепакоенасьць была тым большай, што сярод падпісантаў зьявіліся й імёны чальцоў Камуністычнай партыі, як гэта было ў выпадку памянёнага ўжо Арнашта Голдфлама, Яна Грыгара зь Дзяржаўнага тэатру альбо Паўла Рымскага, актора Тэатру імя

братоў Мрыцікаў. Не засталіся ўбаку й акторы некаторых раённых сцэнаў Паўднёвамараўскага краю, напрыклад, зь Іглавы ці Готвальдава. Усяго ж гэту рэзалюцыю падпісалі з Тэатру імя братоў Мрыцікаў шаснаццаць асобаў, з тэатру «Радасьць» – дзевяць асобаў, адзін супрацоўнік Тэатру сатыры «Вячэрняе Брно», з драматычнай трупы Дзяржаўнага тэатру – сем актораў, з Ганацкага тэатру – восем, а з тэатру «На Правазку» – адзіны Пэтар Ослзлы. «БА КПЧ у тэатрах атрымалі заданьне спраўдзіць пазыцыі чальцоў партыі й зрабіць адпаведныя захады. Зь беспартыйнымі правесьці размовы па месцы працы галоўным рэжысэрам і дырэктарам тэатраў, з чальцамі ЗЧПМ (Зьвяз чэскіх працаўнікоў мастацтва) – кіраўніцтву зьвязу»[61]. Нягледзячы на гэта, многія мастакі паставілі свае подпісы й пад пэтыцыяй «Некалькі сказаў».

Некаторыя прадстаўнікі мастацкай грамадзкасьці не збаяцца́ліся ды непасрэдна ўключы́ліся ў апазыцыйную дзейнасьць. Напрыклад, Пэтар Ослзлы, загадчык літаратурнай часткі, рэжысэр і актор тэатру «На Правазку», належаў да галоўных арганізатараў адной з найбольш адметных незалежных імпрэзаў у Брне – сэмінараў на кватэрах[62]. Вялікае хваляваньне выклікаў гаксама выпадак актора гэтага ж тэатру Зьдзіслава Ржавага, знятага пад мянушкай Труда, (то бок Сумнага). Гэтага актора пераду́сім дзікую ты сяброўскім дачыненьнем з пэўнам цывілкам наступова далкам ідэнтыфікавалася з дысыдэнтам, як не аракавала ня публічных акцыях пратэсту ў на лаяльных працэсах у брненскіх судах. Кароткі час яна знаходзілася пад арыштам. Надобным чынам актор драматычнай трупы Брненскага дзяржаўнага тэатру Францішак Дэрфлер падпісаўся пад галоўнай заявай хартыі 77 – і гэтакі зрух сьвядомасьці быў немагчымы – калі не ялтыць зьменаў у навакольным сьвеце – безь незаўважных, аднак сыстэматычных выбухаў некаторых падрыхтаваных хартыі 77 «выпісьці з гета». Зрабіць сьвет незалежнай культуры й анаэробнай дзейнасьці цікавым і прыцягальным для мастакоў, інтэлектуалаў і студэнтаў[64].

[61] Справа датычыла наступных актораў: Эва Горнічава, Драгаміра Конава, Эрык Пардус, Іржы Лучак, Лібуша Кафкава, Максімілян Горнічы, Моймір Сьлезінгак, Дымір Пэнязь, Іржы Пэнязь, Марыла Дзюрава, Карэл Яркі, Ян Гегер, Кучара (Тэатар імя братоў Мрыцікаў); Зоя Мікатава, Аскрам Станек, Зьдзенек Шэйнік, Марыла Гакаўска, Карэл Гегнэр, Ян Новак, Катаржына Кралава, Францішак Грушка і Карэл Карас (тэатар «Радасьць»); Іржы Балцарак (тэатар сатыры «Вячэрняе Брно»); Ян Грыгар, Леапольд Франц, Зденек Калан, Гелена Трыбава, Павал Градзіл, Францішак Дэрфлер, Ева Валенцава (драматычная трупа Брненскага дзяржаўнага тэатру); Арношт Голдфлам, Ёзэф Ковалчук, Мілаш Намаўшчак, Гінэк Хмалярж, Ян Сэдлак, Міраслаў Маршалак, Бржэціслаў Рыхлік, Томаш Турак (Ганацкі тэатар); Пэтар Ослзлы (тэатар «На Правазку»). MZA, JmKV KSČ, sv. 201, ar. j. 362, Hodnocení politické a ekonomické situace v Jihomoravském kraji za únor 1989, list 106–107.

[62] Парайн.: FIALA, P., MIKŠ, F. (eds.): *Porozumění universita*: Vznik a organizace brněnských bytových přednášek a seminářů (1984–1989); Přednášky z filosofie a politologie. CDK, Brno 1993.

[63] Парайн.: *Dokument Charty 77 č. 37/86 z 28.12.1986*.

[64] Асабісты досьвед і сьведчаньні сяброў не дазваляюць мне ў такім кантэксьце прыводзіць імёны. Такім чынам, без пэўных інструмэнтаў **Р. В.** пэрыяд аднаўленьня поўнага палітычнага плюралізму ў

Вугоршчыне і ў Польшчы не зьбіраўся мяняць нэасталінісцкага курсу. Таго ж самага ён патрабаваў ад ніжэйшых эшалёнаў партыі. З даступных дакумэнтаў не вынікае, што пры гэтым (за выключэньнем асобных шараговых чальцоў КПЧ) ён спатыкаўся зь якойсьці адкрытай нязгодай. Сваю волю нічога не пераацэньваць кіраўніцтва партыі выказвала рознымі шляхамі. Да грамадзкасьці яно зьвярталася пры дапамозе сродкаў масавай інфармацыі, перадусім газэты «Рудэ Права»; для партыйнага актыву былі прызначаныя дырэктыўныя лісты й тэлетайпаграмы прэзыдыюму ЦК КПЧ. Ужо на пачатку 1989 году цэнтар улады вызначыў кірунак сваёй «Пазыцыяй у дачыненьні да варожай дзейнасьці», ніжэйшыя элемэнты партыі адчувалі сябе абавязанымі выконваць тэлетайпнае пасланьне цэнтральнага камітэту па пэтыцыі «Некалькі сказаў», апублікаванае ў канцы верасьня.

На працягу 1989 году прэзыдыюм Брненскага АК КПЧ загадаў распрацаваць ды прыняў некалькі дакумэнтаў, прысьвечаных незалежным ініцыятывам. Яны вызначалі стратэгію барацьбы з «варожымі элемэнтамі» і для падначаленых партыйных органаў, раённымі камітэтамі й Брненскім гарадзкім камітэтам пачынаючы й заканчваючы базавымі арганізацыямі (важкая роля адводзілася краёвай палітычнай школе, раённым дамам палітычнага выхаваньня ды інстытутам марксізму-ленінізму ў брненскіх вышэйшых навучальных установах). Аднак да барацьбы з праціўнікам мелі быць уцягнутыя і іншыя палітычныя партыі й арганізацыі Нацыянальнага Фронту, сродкі масавай інфармацыі, прафсаюзы й кіраўніцтва прадпрыемстваў навучальных установаў. Дэманстрацыяй ляяльнасьці да цэнтру была потым арганізаваная пасылка на адрас кіраўніцтва партыі рэзалюцыяў у падтрымку. Але, як было паказана вышэй, усё гэта ўдалося зрабіць толькі напалову.

У раскалыханай атмасфэры пасьля праскіх падзеяў 27 студзеня 1989 году адбывалася рэгулярная нарада прэзыдыюму краёвага камітэту партыі. Парадак дня датычыў палітычнай апазыцыі, і сакратары Міраслаў Тручка і Ян Наўраціл атрымалі заданьне распрацаваць тэкст, які б у духу тагачаснай палітычнай лініі характарызаваў сытуацыю ў краі. Вынік іх працы пад назвай

65 MZA, JmKV KSČ, sv. 201, ar. j. 361, PKV KSČ Brno, list 13–26, Tamcama, sv. 345. Informační z pravodaj 1989, č. 1, s. 11–15.
66 Tamcama, s. 26.
67 Tamcama.
68 Tamcama, s. 18.

«Праекта дакумента „Аб задачах дзеля эфэктыўнага супрацьдзеяньня варожай дзейнасьці нелегальных структураў» быў прыняты на пасяджэньні Палітбюро ЦК КПБ 20 ліпеня 1988 г.[65] Таксама ў 1988 г. ЦК КПБ выдаў пастанову «Аб мерах па ўзмацненні барацьбы з праявамі нацыяналізму і шавінізму»[66]. Дакумэнт, які знаёміць з інфармацыяй 1989 г., ствараў ЦК КПЧ ад траўня 1988 году ды іншыя зьвесткі, «выразна актывізуюцца сілы ўнутраных і вонкавых ворагаў сацыялізму»[66]. Адным з прапанаваных захадаў было патрабаваньне «выконваць эканамічныя задачы». «Гэта гарантыя таго, – сьцьвярджалі аўтары тэксту, – што варожым да сацыялізму сілам ня ўдасца дасягнуць рэакцыйных мэтаў. Мэтанакіраванае выкананьне рашэньняў партыі – надзейная заслона супраць іх дзейнасьці»[67]. На той выпадак, калі б гэтага было недастаткова, прэзыдыюм прадугледжваў і шэраг іншых захадаў і мерапрыемстваў пераважна прапагандысцкага характару. Акцэнт рабіўся й на працы з моладзьдзю, асабліва з ВНУ, і са сродкамі масавай інфармацыі. Сымптаматычна падкрэсьлівалася, што базавыя арганізацыі КПЧ павінны «непасрэдна рэагаваць на выступленьні антысацыялістычных групаў, выкрываць арганізатараў, якія дзейнічаюць у полі ўвагі БА КПЧ ды прымаць апэратыўныя меры дзеля спыненьня іх дзейнасьці»[68]. Дзеля гэтага было неабходна палепшыць вобраз рэпрэсіўнага апарату ў вачах грамадзкасьці. Таму дакумэнт патрабаваў: «Больш эфэктыўна прапагандаваць працу службаў грамадзкай бясьпекі, спрыяць стварэньню станоўчага стаўленьня да іх з боку грамадзкасьці, адназначна дзейнічаць супраць спробаў дысыдэнцкіх групаў дыскрэдытаваць працу нашай Дзяржбясьпекі»[69]. Складовай часткай гэтай прапагандысцкай вайны мела таксама быць – дый была – спроба кампрамэтаваць праціўніка. Дакумэнт згодна з агульнай палітычнай лініяй свайго часу ў гэтай сувязі падкрэсьліваў, што неабходна «растлумачыць стратэгічныя мэты нелегальных структураў, рэальных палітычных сілаў, якія стаяць за імі, выкрываць палітычнае й маральнае аблічча іх галоўных арганізатараў і дзеячаў у ЧССР і ў замежжы»[70]. Лепшай інфармаванасьці партыйнага актыву ва ўмовах краю мела служыць рашэньне «распрацаваць матэрыял з кароткімі характарыстыкамі галоўных прыхільнікаў Хартыі-77, уключаючы іх асноўных прадстаўнікоў з Паўднёвамараўскага краю. Матэрыял падаць да ведама грамадзкасьці ў краёвым друку ды выкарыстаць для падрыхтоўкі камуністаў да іх

[65] ГАСПІ, ф. 4, воп. 21, спр. 19, арк. 1–3.
[66] Там жа, арк. 1.
[67] Там жа, арк. 2.
[68] Там жа, арк. 3.
[69] Там жа, арк. 4.
[70] Там жа, арк. 5.
[71] Гл. таксама: Інструкцыя аб парадку ўзаемадзеяньня органаў дзяржбясьпекі з органамі ўнутраных справаў // Веснік КДБ, 1991, № 1, с. 13–26.

дзейнасьці ў галіне прапаганды»[71]. Аўтары, канечне, разьлічвалі й на сыстэматычнае выкарыстаньне ўнутранага партыйнага друку, перадусім «Улёткі» й «Весьніка КК КПЧ». Потым на працягу 1989 году ў гэтых пэрыядычных выданьнях часьцей пачалі зьяўляцца артыкулы, прысьвечаныя «нелегальным структурам», «дзейнасьці буржуазнай прапаганды», «дзейнасьці замежных радыёстанцыяў і іх падтрымцы антысацыялістычных сілаў» і да т. п. Дакумэнт таксама лічыў неабходным «на нарадах зь галоўнымі дзеячамі краёвых, раённых камітэтаў грамадзкіх арганізацыяў і нацыянальных камітэтаў, а таксама на ўзроўні іх базавых зьвёнаў рэгулярна закранаць праблематыку нелегальных групаў і апэратыўна інфармаваць аб іх дзейнасьці на давераным участку працы. Выкарыстоўваць гэтыя нарады для каардынаванага супрацьдзеяньня акцыям нелегальных групаў»[72]. Адпаведным сродкам задушэньня праціўніка лічыўся таксама яго крымінальны перасьлед: «У галіне дзяржаўнага кіраваньня» аўтары тэксту дамагаліся «за пасярэдніцтвам камуністаў пасьлядоўна ажыцьцяўляць прынятыя меры па лініі органаў бясьпекі, судоў і пракуратуры»[73].

Між тым пра «варожую дзейнасьць нелегальных групаў» на пасяджаньні, якое адбывалася 9 лютага, прэзыдыюм краёвага камітэту інфармаваў сам галоўны сакратар Герман; дапамагаў яму сакратар Ручка[74]. Пытаньнямі барацьбы з «унутраным ворагам» прэзыдыюм КК КПЧ на сваіх рэгулярных пасяджаньнях на працягу 1989 году прысьвячаў увагу яшчэ некалькі разоў: ініцыятыва ў большасьці выпадкаў прыходзіла з Прагі. Пасьля таго, як сакратарыят ЦК КПЧ распрацаваў і ўхваліў у лютым 1989 году «Доўгатэрміновую канцэпцыю прапаганды на замежжа», якая на адрас «капіталізму» канстатавала, што не зьмянілася «яго антаганістычная, антыгуманная сутнасьць, (…) гэтаксама як не зьмянілася й яго нянавісьць да сацыялізму»[75], і прэзыдыюм КК КПЧ вырашыў распрацаваць падобны дакумэнт для Паўднёвамараўскага краю. Ён быў прыняты 4 траўня 1989 году пад назвай «Задачы камуністаў пры павышэньні эфэктыўнасьці дзейнасьці супраць уплыву буржуазнай ідэалёгіі й прапаганды ў Паўднёвамараўскім краі»[76]. У некаторых плянах дакумэнт быў дыямэтральна супрацьлеглы лібэралізацыйным памкненьням палітыкі перабудовы й галоснасьці. Яго аўтары, напрыклад,

[72] Тамсама, s. 23.
[73] Тамсама, s. 25.
[74] *MZA, ÚmKV-KSČ, sv. 201, ar. j. 360, PKV-KSČ Brno*.
[75] Тамсама, list 144.
[76] *MZA, ÚmKV-KSČ, sv. 202, PKV-KSČ, ar. j. 366*.
[77] *MZA, ÚmKV-KSČ, sv. 201, ar. j. 360, PKV-KSČ Brno*, list 141.
[78] *MZA, ÚmKV-KSČ, sv. 201, ar. j. 360, PKV-KSČ Brno*, list 141.

канстатавалі: «Высілкі, накіраваныя на аб'ектыўную ацэнку мінулага й сучаснага разьвіцьця сацыялістычнага грамадзтва, якая ёсьць умовай яго далейшага разьвіцьця, шмат хто з буржуазных палітыкаў, тэарэтыкаў ды рэакцыйных дзеячаў выкарыстоўвае дзеля ўсё грубейшых нападак на сацыялістычныя краіны»[77]. Дакумэнт імкнуўся падаць пералік сродкаў, пры дапамозе якіх «буржуазная прапаганда» можа ўплываць на нашых грамадзянаў: не бракавала тут замежных тэлевізійных і радыёстанцыяў, «буржуазнага друку», самвыдатаўскай і эмігранцкай літаратуры, аднак былі й «кампутарныя гульні прафашысцкага й антыкамуністычнага характару», кружэлкі, дыскеты, відэакасэты з парнаграфічнымі фільмамі і да т. п. Вялікую рызыку аўтары дакумэнту бачылі і ў пашырэньні магчымасьцяў выяжджаць за мяжу. Разам з падарожнікамі ў капіталістычныя краіны (такіх у краі рэгістравалася ў год каля 75 тысячаў), небясьпеку «ідэалягічнай дывэрсіі» магло ўяўляць «і наведваньне грамадзянамі некаторых сацыялістычных краінаў, асабліва ПНР і ВНР, якія не пагаджаюцца з нашай палітыкай ды шмат калі ўступаюць у кантакт з нашымі дысыдэнтамі»[78]. Мішэньню нападу асабліва ж былі замежныя радыёстанцыі. Паводле аўтараў дакумэнту, яны «імкнуцца стварыць сетку інфарматараў, якія ім непасрэдна за мяжу пасылаюць інфармацыю аб становішчы ў ЧССР. Выкарыстаньне такой інфармацыі відавочна праводзіцца з выкарыстаньнем мэтадаў амэрыканскай інфармацыйнай махіны, уключна з сучаснай вылічальнай тэхнікай для падбору й складаньня навінаў»[79]. Зброяй павінна было стацца павышэньне якасьці контрапрапаганды, «падкрэсьліваньне посьпехаў» і г. д. Для дасягненьня такой мэты быў заснаваны аддзел контрапрапаганды пры КК КПЧ, які распачаў дзейнасьць у ліпені 1989 году[80], і некалькі намэнклятурных штатных адзінак лектараў па контрапрапагандзе пры асобных раённых дамах палітычнага выхаваньня, заснавальнікамі якіх былі раённыя камітэты партыі. Аўтары дакумэнту не пазьбеглі крытычных рэфлексіяў над кваліфікацыяй тых, хто меў несьці на сабе галоўны цяжар прапагандысцкай працы на месцах, лектараў краёвага камітэту й раённых камітэтаў КПЧ. Гэта была шматлікая каманда людзей – у краі іх працавала прыблізна 18 000, – аднак, відавочна, ня надта эфэктыўная.

[79] Тамсама, list 143.

[80] MZA, ÚmKV-KSČ, sv. 203, ar. j. 370, 31. PKV-KSČ. Informace o společenskoekonomické situaci v Jihomoravském kraji za měsíc červenec 1989.

Хаця дакумэнт з задавальненьнем сьцьвярджаў, «што 68 % лектараў маюць вышэйшую адукацыю, аднак сярод іх мала маладых лектараў (да 35 гадоў – усяго 6 %). Невялікае таксама валоданьне ангельскай і нямецкай мовамі. Толькі 8 % лектараў валодаюць ангельскай мовай і 17 % нямецкай»[81].

Спроба лепшай інфармаванасьці аб дзейнасьці «варожых структураў» была адзіным адчувальным вынікам прапагандысцкай бітвы, якую камуністы вялі ў апошнія месяцы перад лістападам 1989 году. Да патрэбаў падабранага функцыянэрскага актыву выдавалася інфармацыя пра дзейнасьць нефармальных ініцыятываў – яна большасьцю запазычвалася з замежных мэдыяў. Аднак партыйным функцыянэрам, якім яны прызначаліся, не ставала перадумоваў, каб правільна яе «прачытаць». На новыя падзеі на міжнароднай і ўнутранай палітычнай сцэне яны не былі ў стане рэагаваць іначай, чым пры дапамозе стэрэатыпаў: рэпрэсіямі й прадумваньнем контрапрапаганды, якая, аднак, ужо была нядзейснай і гучала наіўна. Яны не хацелі зразумець, што лёгіка разьвіцьця ва ўсім усходнім блёку ідзе ў кірунку дыялёгу з апазыцыяй. «Ня ведаю, пра што нам зь імі дыскутаваць, – заяўляў сакратар крайкаму Ўладзімер Герман на пленуме КК КПЧ ў пытаньні навукова-тэхнічнага разьвіцьця й перабудовы прамысловасьці й сельскай гаспадаркі 27 верасьня 1989 году, – і мы адкрыта кажам, што зь ніякімі Шабатам, Відларжавай, Голцнэравай, Голцнэрам ды іншымі прадстаўнікамі нелегальных структураў дыскутаваць ня будзем, а калі яны ў сваёй дзейнасьці будуць парушаць нашы законы, то павінны ўлічваць, што будуць пакараныя паводле гэтых законаў»[82].

Аднак іх занепакоенасьць і асьцярогі неабходна ўспрымаць усур'ёз. Дакумэнты, якія яны пасьля сябе пакінулі, сьведчаць пра тое, што асабліва пасьля студзеня 1989 году яны адчувалі пільную патрэбу вяртацца да тэмы апазыцыі. Пагрозы ў камбінацыі са стратай дзеяздольнасьці не былі адпаведным варыянтам вырашэньня надыходзячай палітычнай крызы. Не ўсьведамлялі яны, што ўжо ня ў стане ні пераканаць грамадзянаў, ні запалохаць іх. Пра рост асьцярог перад палітычнай апазыцыяй сьведчыць, напрыклад, і той факт, што на паседжаньні аддзелу адукацыі й навукі КК КПЧ 9 кастрычніка 1989 году сакратар Ота Шула, прыхільнік цьвёрдай лініі, зьвяртаў увагу на «перасоўваньне цэнтру

[81] Тамсама, list 142.

[82] MZA, f. KV KSČ, G 598, sv. 204, a. j. 35, PKV KSČ, 5.10.1989.

нелегальных структураў у Брно, дзе яны паспрабуюць правесьці больш удалыя акцыі, чым у Празе, каб «праявіць сябе». Падзеі пачалі хутка разгортвацца.

ЗАВЯРШЭНЬНЕ

Апошнія месяцы камуністычнага рэжыму азначалі для Брна выразную зьмену палітычнай сытуацыі й крызу папярэдняй сыстэмы кіраваньня. На рост дзейнасьці палітычнай апазыцыі, якую на чэскай зямлі можна было параўнаць толькі з праскім цэнтрам, вядучыя функцыянэры краю не былі ў стане рэагаваць іначай, чым паўтарэньнем усталяваных адміністрацыйных стэрэатыпаў: абвастрэньнем ідэалягічнай кампаніі ды паліцэйскімі й судовымі рэпрэсіямі. Аднак у памянёных вонкавапалітычных умовах, сярод якіх стрыжнявую ролю граў каляпс улады савецкай імпэрыі, традыцыйныя рэцэпты, спраўджаныя ў пэрыяд пачатку «нармалізацыі» альбо пасьля 1977 году, перастаралі дзейнічаць. Кардынальная трансфармацыя адбывалася асабліва ў настроях сярод насельніцтва. Рост пачуцьця ўласнай годнасьці й самаўпэўненасьці грамадзянскай супольнасьці, які суправаджаў надыход новага грамадзтва, досьвед савецкай акупацыі й пазьнейшых чыстак сярод незаплямленага пакаленьня, – быў палегчаны падрыхтоўчай працай жменькі прадстаўнікоў «прапашчай» палітычнай апазыцыі асабліва з шэрагаў падпісантаў Хартыі-77. Крытычная частка грамадзтва пазбаўлялася страху перад паступовым атаясамліваньнем з патрабаваньнямі дысыдэнцтва.

Пяць брненскіх вышэйшых навучальных установаў і некалькі сталых тэатральных сцэнаў уяўлялі сабой рэзэрвуар, дзе закіпалі апазыцыйныя настроі. А тыя паглыбляліся ды паскараліся і адносна высокай рэлігійнасьцю Паўднёвамараўскага рэгіёну, якая зрабіла магчымым адметны зрух унутры Чэхаславацкай народнай партыі, палітычнай сілы, якая некалькі папярэдніх дзесяцігодзьдзяў была пазбаўленым улады статыстам пры кіроўнай камуністычнай уладзе. Брненскі сьвет антырэжымна настроенай дзейнасьці да лістапада 1989 году быў рэальнай, упэўненай у сабе і ўнутрана структураванай палітычнай сілай, у якой хаваліся зародкі

будучых расколаў і разгалінаваньняў. Абласныя функцыянэры пачыналі пераходзіць ад дэманстратыўнага невуцтва да раздражнёных вокрыкаў. Яны ня ведалі, што гэта іх лебядзіная песьня.

З чэскай пераклаў Алесь Карцель
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/11/20
[image]

[illegible]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 7-8 (47-48) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

гісторыя

[image]-[image]2006

"ды Э. бесту •"крытыка • эсэістыка • аналітыка • палеміка • **гісторыя**

[image] [image] [image]

Олдржых Тума Антырэжымныя дэманстрацыі ў Празе

ОЛДРЖЫХ ТУМА (Oldřich Tůma) – доктар філязофіі, працуе ў Інстытуце найноўшай гісторыі АН Чэскай Рэспублікі.

Камуністычныя рэжымы заўжды баяліся ўсяго спантаннага і імкнуліся ўтрымліваць, наколькі гэта было мажліва, поўны кантроль над грамадзтвам ва ўсіх сфэрах. Яны часта з ахвотай арганізоўвалі пышныя маніфэстацыі ў сваю падтрымку і імкнуліся з такой нагоды сабраць на вуліцах як мага большую колькасьць народу (клясычны прыклад – сьвяткаваньне 1 мая). Удзел у маніфэстацыях быў своеасаблівым паўтаральным тэстам на ляяльнасьць і паслухмянасьць. З другога боку, сама ўява сабраных на вуліцах грамадзянаў, якія выказваюць аўтэнтычныя меркаваньні і патрабаваньні, была зь ліку найгоршых кашмараў камуністаў, што стаялі пры ўладзе. Апошнія асьцерагаліся спантанных выступаў грамадзянаў, нават калі яны ня тычыліся палітычных справаў. Чэхаславацкае чынавенства, напрыклад, прымала штогадовыя маштабныя меры падчас чэмпіянату сьвету па хакеі, каб папярэдзіць магчымыя вулічныя сьвяткаваньні перамогі над Савецкім Саюзам.

Яшчэ болей паноўны рэжым імкнуўся прадухіліць публічныя дэманстрацыі прадстаўнікоў іншых палітычных поглядаў, у выпадку неабходнасьці стараўся такія спробы як мага болей

эфэктыўна выключыць. З пункту гледжаньня ўладаў гэтая боязь была, па сутнасьці, цалкам абгрунтаваная: масавыя пратэсты і дэманстрацыі ўрэшце выявіліся адным з тых чыньнікаў, што прывялі да канчатковага каляпсу камуністычных рэжымаў ва Ўсходняй Эўропе. Узьнікненьне, існаваньне і падзеньне камуністычных рэжымаў мы маглі б палічыць за своеасаблівую барацьбу за грамадзкую плошчу, за вуліцу. Натуральна, гэта быў бы спрошчаны і абмежаваны погляд, у гульні было шмат іншых фактараў.

Тым ня менш, і гэты пункт гледжаньня ўсё ж адносны, і гісторыя камуністычнага рэжыму ў Чэхаславакіі ў гэтым сэнсе асабліва паказальная. За 40 гадоў існаваньня рэжыму сытуацыя цалкам зьмянілася. Напачатку, у лютым 1948-га, камуністы былі ў стане апанаваць вуліцы. Прыкладна ў палове існаваньня рэжыму, у жніўні 1969 году, яны змаглі ліквідаваць вулічныя акцыі пратэсту толькі коштам найвялікшых намаганьняў, з выкарыстаньнем сілы, пры масавым прыцягненьні паліцыі, войска і Народнай міліцыі. Пад канец, у лістападзе 1989-га, супраць іх паўстала пераважная большасьць грамадзянаў, і рэжым ужо быў ня ў стане – альбо ня меў дастатковай рашучасьці – супрацьстаяць з пазыцыі сілы.

У момант найвышэйшай палітычнай крызы і вырашальнага канфлікту ў лютым 1948 году вуліцы чэхаславацкіх гарадоў апанавалі рашучыя, добра арганізаваныя маніфэстацыі камуністаў і іх прыхільнікаў пад добрым камандаваньнем.

Апанэнты камуністаў ня здолелі арганізаваць дзейснага супрацьдзеяньня, спантанныя спробы грамадзянаў ня мелі шанцаў зьмяніць хаду падзеяў, асабліва з улікам таго, што камуністы кантралявалі сілавыя структуры дзяржаўнага апарату. Брутальна разагнанае шэсьце праскіх студэнтаў, якое адбылося ў час, калі камуністы ўжо трыюмфавалі і зыход барацьбы быў прадвызначаны, было ўсяго толькі адчайнай, хоць і сумленнай кропкай у прайгранай бітве за дэмакратыю.

У пазьнейшыя гады рэжым трывала авалодаў сытуацыяй, адкрытыя пратэсты здараліся толькі ў выключных выпадках і заўсёды былі рашуча задушаныя. Сытуацыя зьмянілася толькі праз дваццаць гадоў, падчас Праскай вясны, калі камуністычны

рэжым быў у многіх адносінах расхістаны і ад дэмантажу яго захавала толькі вайсковая інтэрвэнцыя СССР і іншых камуністычных дзяржаваў. Гады 1968 і 1969 зноў азваліся масавымі вулічнымі дэманстрацыямі. Крыху парадаксальна найбуйнейшыя антырэжымныя дэманстрацыі адбыліся ў час, калі ў палітычных адносінах усё было зноў вырашана – у жніўні 1969-га. Праская вясна была адметная хутчэй дэбатамі ў СМІ, на сходах і ў суполках, чым вулічнымі маніфэстацыямі. Шэрагі людзей на вуліцы вывела толькі інтэрвэнцыя войскаў Варшаўскай дамовы 21 жніўня 1968 году. Няўзброены і негвалтоўны супраціў быў дзейсным і стаў вырашальным фактарам крушэньня першапачатковага сцэнару інтэрвэнцыі. Тут гаворка ня толькі пра клясычныя дэманстрацыі, а хутчэй пра вынаходлівае супрацьстаяньне ўсяго грамадзтва вялізнай перавазе чужынскіх арміяў. Гэтае супрацьстаяньне, асабліва ў першыя дні, адбывалася і на вуліцы і каштавала, між іншым, дзясяткаў чалавечых ахвяраў. Яго галоўнай сілай былі перадусім юнакі і дзяўчаты ў веку каля дваццаці гадоў. Яно мела сваё значэньне і прымусіла інтэрвэнтаў зьмяніць тактыку і арыентавацца на паступовае адстойваньне палітычных мэтаў інтэрвэнцыі і на выкарыстаньне тых людзей, якія мелі давер грамадзтва, гэта значыць камуністаў-рэфарматараў на чале з Аляксандрам Дубчакам. Паўторная кансалідацыя рэжыму цягнулася доўгія месяцы і суправаджалася шматлікімі вулічнымі дэманстрацыямі. Гэта не былі антырэжымныя дэманстрацыі ў поўным сэнсе гэтага слова – наадварот, дэзарыентаванае грамадзтва празь іх неаднаразова прапаноўвала падтрымку рэфарматарам. Апошнія, аднак, увесь час саступалі ціску Саветаў і айчынных артадаксальных камуністаў, яны не змаглі ці не захацелі выкарыстаць падтрымку грамадзтва і адыгралі сваю ролю ў яе паступовай пацыфікацыі. Найбольш значнае сутыкненьне адбылося ў дні першых угодкаў жнівеньскай інтэрвэнцыі – у 1969 годзе. Масавыя дэманстрацыі былі тады задушаныя чэхаславацкімі танкамі, а людзкія ахвяры сталіся вынікам стралянінy чэхаславацкіх наёмнікаў-паліцаяў і міліцыянэраў.

Радыкальнае задушэньне дэманстрацыяў і далейшыя рэпрэсіі пасьля выразна зламалі супрацьстаяньне грамадзтва і ў наступныя дваццаць гадоў існаваньня рэжыму на вуліцах

удавалася захоўваць спакой. Апошнія два гады перад каляпсам зноў былі – найперш у Празе – сьведкамі антырэжымных вулічных дэманстрацыяў, зь якімі рэжым, праўда, яшчэ мог справіцца сілавымі мэтадамі, але якія прыкметна перайначылі атмасфэру ў грамадзтве і сталіся важнай увэртурай да лістапада 1989 году. Менавіта дэманстрацыям перад непасрэдным крушэньнем камуністычнай улады (1988, 1989), іх ходу, удзельнікам і рэакцыі рэжыму прысьвячаецца наступны артыкул.

ЖНІВЕНЬ 1969-ГА

Падзеі жніўня 1969 году можна ўспрымаць як пераломны момант у гісторыі Праскай вясны, менавіта сюды можна аднесьці яе фінішны этап. У гэты пэрыяд кіраўніцтва Камуністычнай партыі Чэхаславакіі захапіла паслухмяная Маскве антырэформавая група на чале з Густавам Гусакам. Кансалідацыя рэжыму і выкараненьне вынікаў лібэралізацыі перадапошняга году ішлі ўжо поўным ходам. Як важны ўнутрыпалітычны фактар тут усё яшчэ мелі значэньне актыўнасьць і энэргія, назапашаныя чэхаславацкім грамадзтвам на працягу 1968 году і найперш у кантэксьце супраціву вайсковай інтэрвэнцыі. Аднак гэтая энэргія ў вырашальныя моманты палітычнай барацьбы паміж жніўнем 1968-га і красавіком 1969 году не была мабілізаваная – пераважна віной тых, каму грамадзтва падтрымку прапаноўвала, г. зн. паасобных палітыкаў-рэфарматараў. Немалы патэнцыял народнага супраціву, скіраванасьць якога з акупантаў перайшла на пазьнейшы «нармалізацыйны рэжым», ня быў у межах унутрыпалітычнай барацьбы эфэктыўна скарыстаны. Тое, што з пункту гледжаньня рэжыму, які ўступаў у фазу хуткай кансалідацыі, гэты патэнцыял уяўляе сабой пэўную пагрозу і павінен быць зьнішчаны, партыйнаму кіраўніцтву Гусака вясной 1969 году было зразумела. Гэткім жа відавочным тады было й тое, што прынамсі частка грамадзтва ня зможа адрачыся ад ідэалаў, якім на працягу некалькіх месяцаў была верная. Пасьля таго, як не ўдалося выкарыстаць такое рашэньне падчас некалькіх палітычных крызаў і прадухіліць зьняцьце Аляксандра Дубчака з найважнейшай сілавой

функцыі, першыя ўгодкі інтэрвэнцыі былі грамадствам адзінадушна прынятыя як найлепшая нагода для публічнай дэманстрацыі сваёй пазыцыі.

Непасрэдна пасьля красавіцкіх зьменаў у кіраўніцтве Камуністычнай партыі Чэхаславакіі, калі бяз бою пакінуў пост Дубчак, грамадзтва знаходзілася ў стане канстэрнацыі і пэўнага шоку, але, відаць, і чаканьня таксама. Неўзабаве выявілася, што пэўныя надзеі, якія ўскладаліся на Гусака, былі толькі ілюзіямі, і шок ад далейшай капітуляцыі без супраціву паступова прыціхаў, але прынамсі частка грамадзтва яшчэ раз актывізавала супраціўленьне. Яно праявілася найперш у выглядзе ўлёткавай хвалі, якая пачала пашырацца напрыканцы вясны. Недзе ў сярэдзіне чэрвеня зьявіліся ўлёткі, якія сваім зьместам непасрэдна рэагавалі на набліжэньне гадавіны акупацыі і заклікалі грамадзянаў да пэўных дзеяньняў: да байкоту грамадзкага транспарту, крамаў, друку, забаўляльных і культурных праграмаў, да ўшанаваньня памяці асобаў, забітых інтэрвэнтамі ў жніўні 1968 году; да маніфэстацыйных кароткіх забастовак, сымбалічных актаў (жалобная вопратка або хаця б чорная стужка). Далей гэтыя ўлёткі пачалі зьяўляцца ўсё часьцей, а ў жніўні літаральна запаланілі краіну. Камітэт дзяржбясьпекі ў 1969 годзе зарэгістраваў 148 відаў і 13 231 асобнік антыдзяржаўных улётак. Гэтая лічба шматкроць перавышае сярэднюю іх колькасьць у папярэднія гады; параўнальную альбо большую колькасьць падобных папераў КДБ зарэгістраваў толькі ў 1942–1952 гады.

Неабходна ўсьвядоміць, што летам 1969 году грамадзтва ўсё яшчэ не было зламанае і запалоханае. У гэты пэрыяд яшчэ існаваў адносна шырокі доступ да размнажальнай (праўда, часта прымітыўнай) тэхнікі. Розныя грамадзкія, моладзевыя, прафэсійныя арганізацыі ўсё яшчэ не былі «нармалізаваныя» – асабліва на базавым, але часта і на вышэйшых узроўнях. Паводле зьвестак КДБ, множаньнем і распаўсюдам улётак у той час займаліся ня толькі прыватныя асобы, але і цэлыя калектывы розных прадпрыемстваў, установаў, рэдакцыяў і заводзкіх камітэтаў Рэвалюцыйнага прафсаюзнага руху. Улёткі размнажаліся нават у казармах. Распаўсюджваліся яны самымі рознымі спосабамі: праз пошту, міжасабовыя кантакты,

укідваньне ў паштовыя скрынкі, вывешваньне ў публічных месцах (у т. л. на дошкі аб'яваў Кампартыі і Рэвалюцыйнага прафсаюзнага руху), раскідваньне на вуліцах і г. д. Размнажаліся яны пераважна шляхам перадрукоўваньня на пішучых машынках, рататарах, ормігах і друкарскіх варштатах. Пра наяўнасьць улётак летам 1969 году часта паведамляў штодзённы друк. Іншай праявай супраціву нармалізацыі, што надыходзіла, былі антыдзяржаўныя надпісы. І іх у 1969 годзе было нашмат болей (КДБ зарэгістравала 1199 надпісаў, зь іх 632 у жніўні), чым у сярэднім у папярэднія гады – калі, аднак, ня браць да ўвагі апошнюю жнівеньскую дэкаду 1968 году.

З другога боку, дасягнула піку маштабная мэдыякампанія, у якой прарэжымныя СМІ перасьцерагалі ад якіх-колечы пратэстаў і пагражалі тым, хто меў намер учыніць падобную спробу зноў. Аднак дзеяньні рэжыму не абмяжоўваліся толькі прапагандай. Адклад адкрытага сутыкненьня з грамадзкасьцю на жнівень прыйшоўся нармалізацыйным колам вельмі дарэчы. На працягу лета ліхаманкава ўтвараліся і муштраваліся з мэтай супакаеньня дэманстрантаў і навядзеньня парадку паліцэйскія падразьдзяленьні, з Польшчы пастаўлялася ўзбраеньне і экіпіроўка, прыдатныя да вулічных сутыкненьняў, фармаваліся спэцыяльныя адзінкі арміі, рыхтаваліся аддзелы Народнай міліцыі (некаторыя аддзелы Народнай міліцыі, якія лічыліся не зусім добранадзейнымі, наадварот, былі раззброеныя). І, натуральна, праводзілася арганізацыйная работа на ўсіх узроўнях, ствараліся апэратыўныя штабы, выпрацоўваліся падрабязныя пляны, быў утвораны своеасаблівы інфармацыйны сэрвіс на некалькіх узроўнях (у межах КДБ, чэскага і фэдэральнага ўрадаў). Рэжым нібы рыхтаваўся да грамадзянскай вайны, камуністычнае кіраўніцтва было яўна гатовае да ўсяго. Зрэшты, гэта дакладна сфармуляваў ужо 10 ліпеня на нарадзе Галоўнага штабу Народнай міліцыі сам Густаў Гусак: «Пазыцыя кіраўніцтва наступная: хто адважыцца на актыўны супраціў альбо нешта падобнае дзесьці на вуліцы, раздушым неміласэрна, чаго б гэта ні каштавала».

Яшчэ сёньня прачытаньне пэрыёдыкі таго часу дазваляе адчуць напружаньне, якое нарастала з кожным днём. КДБ увесь час канстатаваў усё большую цыркуляцыю ўлётак, штодзённа

рэгістраваліся ў самых розных пунктах дзясяткі «антыдзяржаўных» надпісаў, віравала гістэрычная кампанія ў пэрыёдыцы. Кампартыя Чэхаславакіі зладзіла шэраг мітынгаў, а іх апагеем стаў дзесяцітысячны сход партыйных, прафсаюзных работнікаў і міліцыі 19 жніўня ў праскім Палацы зьездаў. Праз цэнтар Прагі некалькі разоў дэманстратыўна правозіліся падразьдзяленьні Народнай міліцыі. Апэратыўныя зводкі КДБ зьвярталі ўвагу на тое, што многія грамадзяне сярэдняга і старэйшага веку маюць намер у крытычныя дні пакінуць Прагу і, наадварот, многія маладыя людзі нібыта ў Прагу зьбіраюцца. Заходняя пэрыёдыка была поўная спэкуляцыяў на тым, што ж уласна адбудзецца, хто што справакуе і каму гэта пойдзе на карысьць. У такой прыгнятальнай атмасфэры іскрынкі вылецелі раней, чым чакалася. Ужо ўвечары 16 жніўня на месцы, якое ў XIX і XX стагодзьдзях было традыцыйным эпіцэнтрам чэскага грамадзкага і палітычнага жыцьця, г. зн. у верхняй частцы Вацлаўскай плошчы, ля статуі сьв. Вацлава, пачалі зьбірацца людзі. Групы дыскутавалі, пасьля разышліся без прыкметных інцыдэнтаў. Гэта паўтаралася і ў наступныя дні, адзіна што пабольшала людзей. 19 жніўня паліцыя ўжо са значнымі цяжкасьцямі вызваляла плошчу, прагучаў нават стрэл, якім быў паранены адзін з прысутных.

20 жніўня інцыдэнты паблізу помніка сьв. Вацлава пачаліся ўжо ў першай палове дня. Плошчу не ўдавалася ачысьціць, і недзе а 16-й гадзіне яна была запалоненая шматтысячным натоўпам. Вызваленьне плошчы перарасло ў вострыя сутыкненьні. Разам з нарастаньнем жорсткасьці з боку сілавых структураў нарастала і абурэньне натоўпу, людзі без ваганьняў чынілі гвалт. Змагацца зь сіламі парадку (акрамя паліцыі былі прыцягнутыя вайсковыя падразьдзяленьні памежных войскаў і Народнай міліцыі) імкнуліся спадручнымі спосабамі. Супраць дубінак, сьлезацечных гранатаў, вадамётаў і бронетранспартэраў частка дэманстрантаў скарысталася камянямі, у розных раёнах у цэнтры Прагі вырасла і некалькі імправізаваных барыкадаў. Пасьля ачысткі Вацлаўскай плошчы сутычкі перамясьціліся ў яе ваколіцы і да позьняга вечара працягваліся па ўсім разьлеглым цэнтры сталіцы. Урэшце бліжэй да ночы ўдалося разагнаць дэманстрантаў з дапамогай падразьдзяленьняў Чэхаславацкай народнай арміі. Яшчэ перад

гэтым здарылася трагедыя. З тэрыторыі за Парахавой вежай у шпіталь на Францішаку былі перавезеныя сьмяротна параненыя юнакі. Абставіны іх сьмерці ў свой час не былі дастаткова дакладна высьветленыя, прарэжымная прапаганда імкнулася – па сутнасьці, вельмі неверагодным чынам – пераканаць грамадзкасьць у тым, што сьмяротныя стрэлы былі зробленыя з шэрагаў дэманстрантаў. Зразумела, што за гэта нясуць адказнасьць рэпрэсіўныя органы. Вельмі праўдападобна, што ў паніцы ў натоўп з грузавога аўтамабіля, што ехаў, пачалі страляць байцы Народнай міліцыі. Яны, у адрозьненьне ад падразьдзяленьняў арміі, мелі баявыя набоі. Дакладна ідэнтыфікаваць канкрэтных вінаватых не ўдалося нават з дапамогай расьсьледаваньня, якое ў 1990-я гады праводзіў Аддзел дакумэнтацыі і расьсьледаваньня злачынстваў камунізму. Стрэлы адбыліся і ў іншых месцах рэспублікі.

Дэманстрацыі 20 жніўня і іх маштаб улады зьдзівілі і засталі іх у стане, калі ўвесь падрыхтаваны рэпрэсіўны апарат ня быў цалкам запушчаны. Гэтыя памылкі ўлады хацелі на наступны дзень выправіць. Усе падрыхтаваныя падразьдзяленьні былі прыведзеныя ў стан стопрацэнтнай гатовасьці, ахову пэўных аб’ектаў у Празе ўзяла на сябе армія, астатнія вайсковыя часткі былі перамешчаныя ў ваколіцы Прагі, на вуліцах гораду знаходзіліся сотні патрулёў і супрацоўнікаў КДБ у цывільным. Апошнія маглі ад самага ранку рапартаваць, што заклікі да пасіўнага супраціўленьня знаходзяць водгук у пераважнай частцы грамадзянаў. Гарадзкі грамадзкі транспарт быў у першай палове дня амаль цалкам байкатаваны (за цэлы дзень 21 жніўня было выручана на палову меней грошай, чым звычайна, падобная сытуацыя была і ў іншых гарадах), даход ва ўсёй розьнічнай сетцы на працягу дня быў нашмат ніжэйшы, чым звычайна.

Аднак увага была засяроджаная найперш на Вацлаўскай плошчы. Улады чакалі масавых дэманстрацыяў у другой палове дня, пасьля заканчэньня працоўнага дня, але зноў былі зьдзіўлены нечаканым ходам падзеяў. Людзі на плошчы зьбіраліся з раніцы, прычым рабочыя некаторых заводаў сышлі з прадпрыемстваў і перамясьціліся ў цэнтар. У поўдзень Вацлаўская плошча была амаль цалкам запоўненая. Заходнія

інфармацыйныя агенцтвы вызначалі колькасьць дэманстрантаў ад пяцідзесяці да ста тысячаў чалавек. Плошча была вызваленая і закрытая – з тым жа эфэктам, што і ў папярэдні дзень. Сутычкі, падобныя да тых, што былі напярэдадні, перамясьціліся на ўскраінныя вуліцы. 21 жніўня ўдзел у іх узяло нашмат болей людзей і адбываліся яны на большай плошчы. У другой палове дня, пасьля заканчэньня ранішняй зьмены на фабрыках, іх эпіцэнтар знаходзіўся найперш у тых праскіх раёнах, якія ляжалі на шляхах камунікацыі паміж цэнтрам гораду і найбуйнейшымі фабрыкамі. Напрыканцы дня і ўвечары адбываліся больш ці менш значныя сутычкі практычна па ўсім цэнтры. Так сама, як і ў папярэдні дзень, гэтыя сутычкі ў асобных месцах мелі характар нейкай пазыцыйнай вайны, калі пасьля атакі сілаў парадку дэманстранты крыху адступалі, каб пазьней, праз пэўны час, зноў заняць саступленую тэрыторыю. Урэшце гэтыя сутычкі былі пераважна спыненыя перамогай сілаў парадку пасьля прымяненьня цяжкой тэхнікі. Аднак пабочным вынікам было тое, што новыя асяродкі пратэстаў перамяшчаліся на некалькі вуліцаў убок. Усё большала затрыманых і параненых. Хаця акрамя паліцэйскіх падразьдзяленьняў было задзейнічана 2100 вайскоўцаў і каля 3500 членаў Народнай міліцыі (некаторыя падразьдзяленьні Народнай міліцыі з Паўночнамараўскага краю дастаўляліся ў Прагу цягам дня на самалёце), дэманстрантаў удалося расьсеяць толькі позна ўвечары дзякуючы прыцягненьню вайсковага падмацаваньня. Вырашальную ролю адыграў 17-ты танкавы полк з 90 танкамі. Нейкі афіцэр паліцыі пасьля гэта ацаніў так: «На той час для нас сытуацыя ў Празе была вельмі неспрыяльная. У шэрагу месцаў адбываліся сур'ёзныя сутыкненьні паміж дэманстрантамі і шарагоўцамі Грамадзкай бясьпекі і Народнай міліцыі. Пачалі будавацца барыкады, і нашыя сродкі былі неэфэктыўныя супраць іх, бронетранспартэры былі ня ў стане прарвацца. Хуліганы пасьля прыбыцьця танкаў пакінулі барыкады і адступілі. Гэтага нам хапіла, каб нашыя сілы парадку змаглі перафармавацца і кінуцца ім наўздагон, а пры неабходнасьці затрымліваць і дастаўляць на допыты. Такім чынам мы авалодалі сытуацыяй». Варта заўважыць: сутнасьць палягае ў тым, што гэта быў адзіны выпадак ваеннага выкарыстаньня танкаў Чэхаславацкай народнай арміі за ўвесь

час яе існаваньня (1945–1990).

21 жніўня зноў стралялі ў некалькіх месцах. Паліцэйскія пратаколы рэгіструюць пятнаццаць параненых цывільных асобаў і аднаго загінулага ў выніку прымяненьня агнястрэльнай зброі.

Падзеі 21 жніўня далёка не абмяжоўваліся Прагай. У мараўскай сталіцы Брне ход падзеяў вельмі нагадваў тое, што адбывалася ў Празе. З раніцы ў цэнтры гораду пачалі зьбірацца людзі, у другой палове дня дэманстрацыі набылі значны размах, была ўзьнятая армія, таксама вырасьлі барыкады, была страляніна і ахвяры (8 чалавек паранена, 2 загінулі). У Брне нават была абвешчана забарона выходзіць з дому ўначы, адмененая толькі праз тры дні. Вельмі бурныя і маштабныя дэманстрацыі адбыліся і ў паўночначэскім Лібэрцы. Дэманстрацыі рознага маштабу (ад вельмі буйных хваляваньняў да адносна лёгка задушаных спробаў іх узьняць) адзначаліся і ў іншых чэскіх і мараўскіх гарадах. У Брне і іншых гарадах Маравіі дэманстрацыі працягваліся і 22 жніўня. Пра маштаб дэманстрацыяў у рэспубліканскім кантэксьце сьведчыць тое, што для іх задушэньня было прыцягнута акрамя падразьдзяленьняў паліцыі амаль 20 тысячаў вайскоўцаў і 27 тысячаў сяброў Народнай міліцыі. Падчас хваляваньняў у пэрыяд з 18 да 22 жніўня па ўсёй краіне было затрымана болей за 2400 грамадзянаў, у тым ліку амаль 1500 у адной толькі Празе. Паліцэйскія зводкі аб затрыманых даюць даволі дакладнае ўяўленьне пра ўдзельнікаў дэманстрацыяў. Прыблізна 77 % былі людзі, маладзейшыя за дваццаць пяць гадоў, пры гэтым узроставая група менш за дваццаць гадоў была прадстаўленая 25 %. Сярод параненых пераважалі вельмі маладыя людзі, зь пяці застрэленых аднаму было больш за дваццаць гадоў, а самаму маладому яшчэ не было і пятнаццаці. Зьдзівіць можа сацыяльная структура затрыманых дэманстрантаў. Замежныя СМІ, калі дакладвалі пра жнівеньскія хваляваньні, казалі пераважна пра студэнтаў. Відаць, пэўную ролю адыграў і рэзананс сытуацыі на Захадзе, дзе напрыканцы 1960-х гадоў студэнты рэальна былі галоўнай сілай буйных дэманстрацыяў у Францыі і ФРГ ці пратэстаў супраць вайны ў Віетнаме ў ЗША. Рэальнасьць у Чэхаславакіі ў жніўні 1969-га

была, аднак, дыямэтральна супрацьлеглая. Сярод затрыманых былі рабочыя ці вучні-рамесьнікі. Адносна малую колькасьць студэнтаў можна патлумачыць фактам, што дэманстрацыі адбываліся падчас канікулаў і што ў жніўні яшчэ дзейнічалі адносна лібэральныя правілы для выезду на Захад, чым менавіта студэнты тым летам у апошні раз масава скарысталіся. Няма сумневу, правільным будзе сьцьверджаньне, што галоўнай сацыяльнай сілай антырэжымных пратэстаў у жніўні 1969 году былі маладыя рабочыя.

У дачыненьні да большасьці затрыманых як пры арышце, так і пасьля – падчас перавозкі, на паліцэйскіх участках і на допытах – шматразова ўжываўся жорсткі фізычны гвалт. Пра гэта адзінагалосна сьведчаць зьвесткі замежных агенцтваў, шматлікія ўспаміны ўдзельнікаў і скаргі затрыманых і абвінавачаных, якія падаваліся – аднак безвынікова – у кампэтэнтныя органы.

І ўсё ж вулічныя дэманстрацыі не былі адзіным спосабам, якім грамадзтва выказвала сваю пазыцыю. Побач з ужо згаданымі праявамі пасіўнага супраціву, якія даволі пасьпяхова прайшлі ў вялікіх гарадах, адбыліся і шматлікія стачкі. Гэтыя стачкі, якія ў большасьці ўяўлялі сабой кароткачасовае маніфэстацыйнае спыненьне працы, афіцыйная прапаганда імкнулася любымі сродкамі ўтаіць. Нягледзячы на гэта, яны закранулі дзясяткі заводаў у Празе і ў многіх іншых месцах.

22 жніўня на хваляваньні апошніх дзён упершыню адрэагавалі СМІ. Кампанію ў СМІ нельга назваць непрадуманай і беспасьпяховай. Да грамадзкасьці апэлявалі на некалькіх узроўнях. Побач з абавязковым ідэалягічным узроўнем, дзе, натуральна, гаварылася аб барацьбе з антысацыялістычнымі сіламі, контрарэвалюцыяй і г. д., быў яшчэ адзін, не такі яўны, але тым больш эфэктыўны ўзровень. Сутнасьць яго палягала ў стварэньні і ўзмацненьні супярэчнасьці паміж дзьвюма асноўнымі тэндэнцыямі, заключанымі ў гэтай сытуацыі. Першая, пазытыўная, на гэтым узроўні мела ня столькі ідэалягічныя характарыстыкі, колькі ў ёй апэравалі – ці, прынамсі, узнаўлялі – такімі паняцьцямі, як спакой, парадак,

гармонія. Пра другую, наадварот, пісалася так, каб выклікаць асацыяцыі зь небясьпекай, хаосам, рызыкай, злачынствам. Гэта ўсё, канечне, суправаджалася масай зманіпуляванай інфармацыі і адкрытай маны.

Дэманстранты прынцыпова апісваліся як дэклясаваная стыхія, вандалы, брудныя валасацікі і г. д., а ў лепшым разе як неразважлівая, зьбітая з панталыку моладзь. З вэрбальным бокам спалучаўся і ілюстрацыйны. Старонкі пэрыёдыкі былі поўныя старанна адабраных фатаздымкаў з акцыяў пратэсту апошніх дзён. Гэтыя здымкі ніколі не выяўлялі вялікай колькасьці дэманстрантаў разам ці нават паасобных дэманстрантаў з выразнымі індывідуальнымі рысамі. Гэта заўсёды былі невыразныя ілюстрацыі групак у руху, цьмяныя здымкі разьбітых вітрынаў ці вогненных барыкадаў. У асноўным гэта былі здымкі нібыта дрэннай якасьці, неакрэсьленыя, неасьветленыя, але менавіта гэтым яны абуджалі падсьвядомае адчуваньне спалучанасьці зь нечым непрыемным, гвалтоўным, злачынным.

[image]

Вызначальным чынам на разьвіцьцё палітычнай сытуацыі паўплываў таксама заканадаўчы акт прэзыдыюму Фэдэральнага сходу № 99/1969. У час, калі не адбываліся паседжаньні парлямэнту, яго прэзыдыюм мог прымаць т. зв. заканадаўчыя акты, якія да наступнага сходу парлямэнту мелі сілу закону. Заканадаўчы акт № 99/1969 быў прыняты прэзыдыюмам Фэдэральнага сходу 22 жніўня ўвечары і адразу ж уступіў у сілу. Уласна кажучы, ён уводзіў памяркоўны варыянт надзвычайнага становішча. Для некаторых злачынстваў і правіннасьцяў была выразна спрошчаная і паскораная працэдура пакараньня і адначасова ўзмоцненыя меры пакараньня. Паасобнымі судзьдзямі было згодна з гэтымі параграфамі асуджана ў агульнай колькасьці 1526 грамадзянаў, найчасьцей за хуліганства, ганьбаваньне рэспублікі і яе прадстаўніка і ганьбаваньне дзяржавы сусьветнай сацыялістычнай сыстэмы. Бясспрэчным быў імгненны застрашальны эфэкт, які прынесла найперш магчымасьць падаўжэньня тэрміну папярэдняга затрыманьня з

48 гадзінаў да трох тыдняў. Большасьць затрыманых гэтыя тры тыдні трымалася пад арыштам.

З пункту гледжаньня дальнабачнасьці гэткім жа вызначальным і важным для далейшай кансалідацыі рэжыму было стварэньне заканадаўчых перадумоваў для масавых зачыстак у школах, Акадэміях навук, дзяржаўных установах і да т. п. тых, хто сваёй дзейнасьцю «парушае сацыялістычны грамадзкі лад і страчвае праз гэта давер». Зьявілася магчымасьць прыпыняць на тры месяцы дзейнасьць добраахвотнай ці іншай арганізацыі або яе распускаць.

Заканадаўчы акт меў вызначаны тэрмін дзеяньня да 31 сьнежня 1969 году. У рэальнасьці, аднак, сутнасныя бакі заканадаўчага акту паступова пераходзілі ў новы крымінальна-працэсуальны і працоўны кодэксы і збольшага заставаліся ў сіле да 1989 году. Такім чынам, заканадаўчы акт служыў доўга і адыграў у нармалізацыйнай палітыцы партыйнага кіраўніцтва Гусака вельмі значную ролю. Яго ўхваленьне прэзыдыюмам Фэдэральнага сходу было делейшым майстэрскім тактычным прыёмам, такой тактыкі Масква і артадаксальная частка партыйнага кіраўніцтва пачала прытрымлівацца пасьля часовай палітычнай няўдачы жнівеньскай інтэрвэнцыі: пацыфікаваць чэхаславацкую грамадзкасьць найперш праз пасярэдніцтва тых палітыкаў-рэфарматараў, якія ўсё яшчэ карысталіся ў яе аўтарытэтам. Пад заканадаўчым актам былі подпісы канстытуцыйных дзеячаў, трох з чатырох «герояў Праскай вясны»: прэзыдэнта Людвіка Свабады, прэм'ер-міністра Олдржыха Чэрніка і Аляксандра Дубчака, ужо, праўда, у функцыі старшыні Фэдэральнага сходу. Яны зрабілі ўрэшце тое, што адмаўляліся зрабіць пад савецкім ціскам вясной і летам 1968 году, аднак у нашмат горшай і недаравальнай сытуацыі. У жніўні 1969 году яны сваім учынкам ужо не прадухілілі чужаземнай інтэрвэнцыі, не зьбераглі нічога з рэформавай праграмы і не ўтрымалі нават сваіх палітычных пасадаў (Дубчак са сваёй змушаны быў сысьці ўжо ў верасьні 1969 году, Чэрнік – у студзені 1970-га). Яны зрабілі ўнёсак толькі ў запалохваньне, дэзарыентацыю і дэмаралізацыю грамадзтва.

Камуністычны рэжым у жніўні 1969-га атрымаў перамогу над грамадзтвам. Урэшце, сутыкненьне інакш і не магло скончыцца. Ня толькі праз тое, што рэжым меў у распараджэньні дастатковыя сілавыя сродкі, але і праз тое, што выступленьне грамадзкасьці было самамэтай, яно не было падтрыманае і скарыстанае ніякай канцэптуальнай палітычнай сілай і праграмай. Да таго ж яно было цалкам стыхійнае і некаардынаванае. І стварэньне барыкадаў на праскіх і брненскіх вуліцах мела хутчэй сымбалічнае значэньне, яно не было праявай прадуманага тактычнага прыёму і як максымум мела на мэце часовае супрацьстаяньне бесьперашкоднаму прасоўваньню сілаў парадку. Змаганьне, ад якога частка чэскай грамадзкасьці не хацела адмовіцца, на ўзроўні рэальнай палітыкі было ўжо прайгранае і стала хутчэй адчайным, але годным жэстам. Пэўнае значэньне для будучыні мела й тое, што пазыцыя грамадзтва, і асабліва маладой генэрацыі, была зламаная не без супраціўленьня. Чэхаславацкі жнівень 1969-га адносіцца да значных эпізодаў супраціву камуністычнаму дэспатызму ў Цэнтральнай Эўропе. Чэская гістарыяграфія прысьвяціла яму надзвычайную ўвагу. Чэхаславацкі жнівень 1969-га ў шматлікіх адносінах можна параўнаць з больш вядомымі і лепей дасьледаванымі падзеямі, напрыклад, чэрвеня 1953 году ў былой ГДР ці сьнежня 1970 году ў Польшчы, хоць казаць пра «элемэнты грамадзянскай вайны», бадай, не выпадае. Гэта былі пераважна цалкам спантанныя і некаардынаваныя дзеяньні. Цьверджаньне прарэжымнай прапаганды, якое ўтрымліваецца і ў дакумэнтах органаў Кампартыі Чэхаславакіі, то бок, што гэта была доўга рыхтаваная і кіраваная з аднаго цэнтру акцыя, цалкам супярэчыць фактам. Зрэшты, ніводны такі арганізатар ня быў выкрыты і пакараны. Неіснаваньне якойсьці каардынаванай падрыхтоўкі пацьвярджаюць і ўнутраныя дакумэнты КДБ. Гэтаксама не ўдалося пацьвердзіць зьвесткі прарэжымных СМІ аб тым, што дэманстранты выкарыстоўвалі агнястрэльную зброю. Ва ўсялякім разе, гвалт, ужыты дэманстрантамі ў мэтах абароны ад рэпрэсіўных органаў у жніўні 1969 году, быў значна меншы, чым у ГДР у 1953 годзе ці падчас хваляваньняў у Польшчы ў сьнежні 1970-га.

Пры параўнаньні з вышэй згаданымі эпізодамі

антыкамуністычнага супраціву ў іншых краінах цікава адзначыць тое, наколькі ідэнтычна прарэжымная прапаганда Чэхаславакіі і ГДР маніпулявала грамадзкімі поглядамі, не зважаючы на розьніцу ў 16 гадоў, што падзяляюць гэтыя падзеі. Між тым як ва ўсходнім Бэрліне 17 чэрвеня 1953 году да хваляваньняў падбухторвалі нібыта правакатары з заходняга Бэрліна, якія ў якасьці ўзнагароды раздавалі хуліганам дробныя грошы ды цыгарэты, у Празе быццам бы да стварэньня барыкадаў і кіданьня камянёў заклікалі заходнія іншаземцы, а чэхаславацкія сродкі масавай інфармацыі ведалі і дакладную суму, якая прапаноўвалася хуліганам: 250–300 крон.

Заслугоўвае ўвагі спосаб, якім пры такой прапагандысцкай маніпуляцыі выкарыстоўваўся ілюстрацыйны матэрыял, пры гэтым справа не абмяжоўвалася толькі сфальшаванымі і выгадна для сябе камэнтаванымі здымкамі.

[image]

Усходненямецкія газэты пісалі, што ўдзельнікі дэманстрацыяў 1953 г. — спрэс «злачынныя тыпы».

Нібыта па-за непасрэдным кантэкстам расповеду пра хваляваньні былі ўжытыя і карыкатуры, якія апэлявалі да іншага пласта грамадзтва і такім чынам павінны былі дапоўніць просталінейную палітычную прапаганду. Гэтую камбінацыю непасрэднай індактрынацыі праз здымкі і менш адкрытай маніпуляцыі праз пасярэдніцтва карыкатураў пацьвярджае пара ілюстрацыяў з ГДР 1953 году і з Чэхаславакіі 1969 году. Ілюстрацыя № 1 паказвае тое, як усходненямецкія СМІ імкнуліся дыскрэдытаваць удзельнікаў хваляваньняў спасылкай на іх адзеньне і прычоску (у подпісе пад фатаздымкам гаворыцца пра «тэхаскую кашулю з каўбоем, тэхаскі гальштук з выявамі голых жанчын, тэхаскую фрызуру», пры гэтым багата ўжываюцца моцныя выразы кшталту «зладзейскі твар»). Пэрсанаж з такімі ж характэрнымі рысамі твару і адзеньня пасьля стаў асновай для карыкатуры, якая суправаджала рэпартаж пра інцыдэнт у заходнебэрлінскім мікрараёне Штэгліц, дзе адбыўся напад на мясцовую канцылярыю Аб’яднанай сацыялістычнай партыі Германіі. Малюнак канцэнтруе ў сабе сутнасныя пункты рэжымнага

тлумачэньня чэрвеньскіх хваляваньняў у ГДР: іх галоўным складнікам былі хуліганскія і дэклясаваныя элемэнты з заходняга Бэрліна, фінансаваныя амэрыканскімі і заходненямецкімі імпэрыялістамі і рэваншыстамі. Важна адзначыць тое, што карыкатура была апублікаваная за некалькі дзён да публікацыі здымку. Карыкатурыст «Neues Deutschland», такім чынам, павінен быў атрымаць у распараджэньне паліцэйскі здымак адпаведна апранутага затрыманага дэманстранта нейкім іншым шляхам.

[image]
Карыкатура з «Neues Deutschland», чэрвень 1953 г.

Чэхаславацкія СМІ ў 1969 годзе рабілі акцэнт найперш на папулярныя тады доўгія валасы і выказваліся вельмі экспрэсіўна: «Ухмыляўся, роў, пена ляцела ў яго з рота – ён быў падобны да гістэрычкі, а пасьля была ўжо валасатая сьмерць», апісваў нібыта сваё спатканьне з адным з дэманстрантаў паранены паліцыянт. Пра гіпэртрафаваную ўвагу, якую чэхаславацкія СМІ надавалі ў жніўні 1969-га доўгім валасам, сьведчыць карыкатура з газэты «Рудэ права», якая суправаджалася жартоўным тэкстам: «Ці не пазычыў бы ты мне грэбень?», і фатаздымкі з газэты «Обрана ліду» з наступным камэнтаром: «Паглядзіце ўважліва на гэтых справа! Падобныя да іх правакавалі, выклікалі хаос».

У адным важным аспэкце жнівеньскія пратэсты ў Чэхаславакіі ад падобных падзеяў у іншых сацыялістычных краінах адрозьніваліся. Хваляваньні ў Бэрліне ў 1953 годзе, у Познані ці ў Будапэшце ў 1956 годзе выбухнулі зьнянацку, зус

[image]

Карыкатура з «Рудэ права»,
жнівень 1969 г.

ім неспадзеўкі для непадрыхтаваных камуністычных рэжымаў і найперш для іх рэпрэсіўных органаў. Акты пратэсту ў жніўні 1969 году ў Чэхаславакіі адбыліся нібы ў адваротным парадку. Рэжым іх чакаў і мог усебакова да іх падрыхтавацца. Адбыліся яны ў самай безнадзейнай сытуацыі: рэжым ужо кансалідаваўся, пратэсты былі самамэтай, мелі ўсяго толькі

этычны і эмацыйны характар, але ніяк не праграмны. Тыя, каму натоўпы на вуліцах выказвалі сваю падтрымку (найбольш частым лёзунгам быў: «Дубчак») прыклалі рукі – мажліва, не са сваёй волі, але прыклалі – да іх задушэньня і далейшых рэпрэсіяў.

1988–1989

Гвалтоўная ліквідацыя дэманстрацыяў са жніўня 1969 году і далейшыя рэпрэсіі зламалі адкрыты супраціў грамадзкасьці. Галоўныя прадстаўнікі рэжыму Гусака гэта ўсьведамлялі і ганарыліся гэтым. Напрыклад, падчас польскай крызы ў 1980–1981 гадах лідэры Кампартыі Чэхаславакіі настойліва раілі сваім польскім таварышам быць больш рашучымі і як прыклад прыводзілі свой мэтад, ужыты ў жніўні 1969 году: «Некалькі дзён на вуліцах Прагі ішла барацьба, але пасьля контрарэвалюцыя больш не адважылася на нешта падобнае». У другой палове 1980-х гадоў, аднак, адбыліся нязначныя вулічныя пратэсты. Гэта былі акцыі як максымум некалькіх соцень чалавек і да таго ж першапачаткова не антырэжымнай скіраванасьці (найперш гэта былі маніфэстацыі, якія адбываліся штогод у вечар 8 сьнежня, у гадавіну сьмерці Джона Ленана), аднак рэжым лічыў якую заўгодна неафіцыйную акцыю варожай і згодна з гэтым дзейнічаў. Сапраўдную тысячную дэманстрацыю Прага зьведала ажно – зноў! – 21 жніўня 1988-га, у дваццатую гадавіну інтэрвэнцыі. Пасьля гэтага больш ці менш вялікія паводле колькасьці ўдзельнікаў дэманстрацыі з розных нагодаў – аднак перадусім да ўгодкаў значных агульнанацыянальных падзеяў – здараліся часта, да лістапада 1989 году іх прайшло болей за трыццаць. У студзені 1989-га (да дваццатых угодкаў самаспаленьня Яна Палаха) цэнтар гораду хвалявалі даволі маштабныя дэманстрацыі шэсьць дзён запар. Часам колькасьць удзельнікаў вымяралася сотнямі, іншым разам бывала і болей, але толькі ў выключных выпадках іх зьбіралася болей за дзесяць тысяч. Да 17 лістапада 1989 году дэманстрацыі ніводнага разу не набылі такога размаху, як у жніўні 1969-га.

Акурат гэтым антырэжымным дэманстрацыям і будзе прысьвечаная рэшта артыкулу – у ёй сьцісла будуць закранутыя

дэманстрацыі (масавыя, стотысячныя) пасьля 17 лістапада – гэта ўжо непасрэдна гісторыя каляпсу рэжыму. Дэманстрацыі папярэдняга году ў нечым былі пэўнай увэртурай да падзеньня рэжыму.

Вызначальнай рысай масавых выступленьняў грамадзкасьці ў Празе да 17 лістапада 1989 году была іх стыхійнасьць і спантаннасьць.

[image]

Улётка з інфармацыяй аб правядзеньні «маніфэстацыяў» у цэнтры Прагі 28 і 29 кастрычніка 1968 г.

Важным фактарам, які значна паспрыяў правядзеньню буйных дэманстрацыяў, былі, без сумневу, заклікі і праклямацыі з боку апазыцыйных колаў, найперш Хартыі-77. Непасрэдна на ход дэманстрацыяў апазыцыя ўплывала мала, і асабліва да гэтага не імкнулася, а пра іх арганізацыю няма ўжо чаго і казаць. Дыскусіі ўнутры апазыцыі ў ключавыя месяцы вясны і лета 1989 году адбываліся вакол пытаньня, ці праводзіць дэманстрацыі ўвогуле, а не вакол пытаньня – як. Незалежныя апазыцыйныя ініцыятывы хоць і склікалі сходы грамадзянаў, абаранялі неад'емнае права на свабоду сходаў, але вагаліся, ці варта надаваць дэманстрацыям адназначны палітычны зьмест і мэты. Гэтае схаванае напружаньне паміж стрыманай пазыцыяй Хартыі-77 і іншых згуртаваньняў у дачыненьні да дэманстрацыяў як да інструмэнту барацьбы за палітычную ўладу, з аднаго боку, і іх рэальным выбуховым значэньнем, з другога, яскрава адлюстроўвае ўлётка, выдадзеная незалежнымі ініцыятывамі з нагоды маніфэстацыі, прызначанай на 28 кастрычніка 1988 году. Тэкставая частка – цалкам звычайная палітычная агітацыя, у ёй гаворыцца ўсяго пра сход з нагоды сямідзясятай гадавіны ўзьнікненьня рэспублікі, але ілюстрацыйная частка, наадварот, асацыюецца з драматычнымі зьменамі: надыходзіць момант вызваленьня.

Ніколі не абмяркоўвалася магчымае прымяненьне гвалту як сродку абароны супраць паліцэйскага гвалту пры ліквідацыі дэманстрацыяў. Думка пра самаабарону ў канфрантацыі з рэжымам і яго рэпрэсіўнымі органамі пры гэтым ня мусіла

быць сама сабою чымсьці недапушчальным і кампрамэтацыйным. У 1980-я гады ў асяродзьдзі польскай апазыцыі, дзейнасьць якой у цэлым па праве і на працягу доўгага часу лічыцца недасяжным узорам, праграмнае прымяненьне гвалту разглядалася як нешта цалкам натуральнае.

Той факт, што падчас дэманстрацыяў у Празе іх удзельнікі па сутнасьці ніколі ня ўжылі ніякага гвалту, меў адназначна пазытыўнае значэньне. Не было і «гвалту ў дачыненьні да рэчаў», нават у сытуацыі, калі месца дзеяньня большасьці антырэжымных дэманстрацыяў было літаральна перапоўненае прарэжымнымі сымбалямі. Адсутнасьць гвалту была – у адрозьненьне ад 1969 году – асноўнай характэрнай рысай праскіх дэманстрацыяў у 1988–1989 гадах. Адну з прычынаў такога стану трэба шукаць, мабыць, у факце, што ў дэманстрацыях удзельнічалі ня толькі маладыя людзі. Трэба таксама адзначыць, што ў іх брала ўдзел ня так мала людзей, як пра гэта часта гавораць. Гэта тычыцца і абсалютных лічбаў, але найперш адносна – што да мэты і значэньня дэманстрацыяў. Да 17 лістапада ніколі не зьбіралася столькі людзей, каб дэманстрацыю можна было лічыць непасрэднай пагрозай рэжыму. Аднак звычайна іх зьбіралася столькі, што дэманстрацыі былі ня толькі значнай праклямацыяй нязгоды з рэжымам – яны таксама сур'ёзна ўмешваліся ў нармальны лад жыцьця гораду. Гэтым яны выклікалі, утрымлівалі і паглыблялі адкрытую крызу рэжыму. Для рэжыму яны былі выклікам, зь якім ён ня даў сабе рады. Яны ня толькі спрычыньваліся да палітызацыі і радыкалізацыі ўнутранай атмасфэры, але і пачыналі быць падставай і зачэпкай нарастальнай крытыкі на міжнароднай сцэне. Рэжым, нягледзячы на тое, што асобныя дэманстрацыі змог ліквідаваць, сваімі дзеяньнямі толькі ўзмацніў іх эфэкт, а таксама замежны і айчынны розгалас. Ужыць на парадак больш жорсткі гвалт і рэпрэсіі – скажам, узроўню 1969 году, – якія б, верагодна, грамадзкасьць запалохалі і прадухілілі выступленьні, ён з розных прычынаў не адважыўся. Цікава, што і ў гэтай канкрэтнай сытуацыі знаходзіць пацьверджаньне агульная тэза, што камуністычныя рэжымы маглі трымацца толькі дзякуючы тэрору, які, зрэшты, рабіўся нязручным і непрыдатным нават для іх саміх. Тое, што

рэжым не адважваўся, напрыклад, страляць у дэманстрантаў ці масава іх арыштоўваць, не азначае, што ў канцы 1980-х гадоў ён ня дзейнічаў у дачыненьні да дэманстрантаў часта брутальна і проціпраўна. Аднак чым рэакцыя рэжыму праз дваццаць гадоў ніяк не адрозьнівалася, дык гэта масмэдыйным узроўнем. Зноў актыўна ўжывалася тактыка ганьбаваньня дэманстрантаў, апісваньня іх як хуліганаў і дэклясаванага, крымінальнага элемэнту. Толькі доўгія валасы ўжо і для прарэжымнай прапаганды страцілі сваю ролю апазнавальнага знаку антыграмадзкага элемэнту – у пэўным сэнсе яго замянілі натурныя здымкі панка, бяз гэтага не абышоўся амаль ніводны выпуск тэлевізійных навінаў пра дэманстрацыі.

[image]
Паўтаральнасьць антырэжымных дэманстрацыяў прынесла эфэкт, які, відаць, найлепш было б ахарактарызаваць як пэўную зьмену сацыяльна-псыхалягічнага клімату. Удзел у дэманстрацыях меў прыкметны ўплыў на саміх удзельнікаў. Ён часта быў эўфарыйным перажываньнем агульна праяўленай мужнасьці, рашучасьці і роднасьці. Было важна і тое, што, нягледзячы на жорсткую рэакцыю ўладаў, большая частка ўдзельнікаў не пацярпела, і так была пастаўленая пад сумнеў актуальнасьць раней нібыта амаль аўтаматычна прыманага ўяўленьня пра тое, што кожнае выступленьне супраць рэжыму нясе за сабой непазьбежную расплату. У дэманстрацыях у большасьці ўдзельнічала абмежаванае кола адных і тых жа людзей. У гэтага быў свой пазытыўны бок: побач з традыцыйным дысыдэнцтвам утварылася яшчэ адна, колькасна больш вялікая група людзей, гатовых да грамадзкай дзейнасьці (даволі праўдападобным можа быць тое, што менавіта зь іх, зьяднаных і сфармаваных удзелам у дэманстрацыях, набіраліся тыя, хто зьбіраў подпісы пад пэтыцыямі). Пазьней, у лістападзе, яны былі ядром рэвалюцыйнай актыўнасьці. Для чэскага грамадзтва ў пэрыяд нармалізацыі была тыповаю сытуацыя, калі вышэй за ўзровень першасных груповак (г. зн. над узроўнем адносінаў паміж роднымі, сябрамі і г. д.) існаваў амаль суцэльны сацыяльны вакуўм. Антырэжымныя дэманстрацыі 1988–1989 гадоў былі, без сумневу, адным з важных фактараў, які дапамагаў гэтую сытуацыю парушыць і

зьмяніць.

Такім чынам, важна ацаніць уплыў традыцыі далістападаўскіх дэманстрацыяў і значэньне новага, створанага імі, соцыяпсыхалягічнага клімату на ход падзеяў 17 лістапада і пасьля. Бяз гэтай цалкам аўтаматызаванай атракцыйнасьці Вацлаўскай плошчы маніфэстацыя 17 лістапада ўжо магла скончыцца на Вышаградзе – усё самае важнае было сказанае і абвешчанае. Менавіта гэтая традыцыя прывяла людзей у Празе ў суботу і ў нядзелю зноў на вуліцы – і гэта была самая што ні ёсьць натуральная рэакцыя на падзеі 17 лістапада, – яна мабілізавала і радыкалізавала ўсю грамадзкасьць у выглядзе стотысячнага натоўпу, пачынаючы з панядзелка 20 лістапада. Гэтак жа і факт, што ўлада ўжо ў першай палове дня 19 лістапада саступіла грамадзкасьці Вацлаўскую плошчу, якую раней так апантана абараняла, і што тэрыторыя вакол помніка сьв. Вацлаву з раніцы 20 лістапада магла стаць цэнтрам бесьперашкоднай антырэжымнай агітацыі, быў псыхалягічным сыгналам, што рэжым развальваецца.

[image] Адным зь вельмі важных унёскаў у інтэрпрэтацыю «аксамітнай рэвалюцыі», які вынікае з факту прызнаньня далістападаўскіх дэманстрацыяў інтэгральным складнікам рэвалюцыі і іх дасьледаваньня, верагодна, ёсьць зьвестка, што галоўнаю і амаль адзінаю рухальнаю сілаю дэманстрацыяў не было малодшае пакаленьне. Што ёю не былі тыя, хто з уласнага досьведу амаль нічога ня ведаў пра нармалізацыйны рэжым і нават пра тое, «што можна баяцца». Склад дэманстрантаў мы можам зноў, вядома, з пэўнай ступеньню рызыкі быць недакладнымі – вывесьці са сьпісу затрыманых і дастаўленых у пастарункі (на тагачасным паліцэйскім жаргоне – «рэалізаваных» асобаў). Вельмі важным складнікам антырэжымных дэманстрацыяў у Празе былі людзі ў веку 25–40 гадоў. Яны складалі амаль 40 % затрыманых. Асабліва відавочная розьніца з вышэй прыведзенымі лічбамі 1969-га. Тады ўдзельнікі дэманстрацыяў (або тыя, хто быў затрыманы паліцыяй), старэйшыя за 25 гадоў, складалі недзе 23 %, а ў 1988–1989 гадах – болей, чым 53 %. Сацыяльны склад так драматычна ад 1969 году не адрозьніваецца. Панізілася колькасьць рабочых і вучняў-рамесьнікаў (але ўсё роўна была

высокай) – 55 %. Зноў жа надзіва нізкім (ці ніжэйшым, чым можна было чакаць у сувязі зь іх ключавой роляй пазьней на некалькі месяцаў, у лістападзе 1989-га) быў удзел студэнтаў: недзе 11 %. Хоць размова ідзе, канечне, аб лічбах, абсалютная вартасьць якіх можа быць, вядома, спрэчная, але адноснае значэньне якіх у параўнаньні з падзеямі жніўня 1969-га мае сваю вагу.

На канец – яшчэ адзін зацем што да сувязі антырэжымных выступленьняў канца 1960-х і 1980-х гадоў. Падаецца, што дэманстрацыі 1980-х гадоў зьяўляюцца ў пэўным сэнсе працягам падзей 1960-х гадоў (паводле пакаленьняў, зьместу і формы актаў пратэсту і г. д.). Мэтафарычна можна сказаць, што нібыта людзі, якія былі 21 жніўня з праскай Вацлаўскай плошчы гвалтоўна і брутальна выгнаныя, праз 19 гадоў туды вярнуліся (але ў нейкай ступені гэта сапраўды былі тыя ж людзі). Сымбалічным пацьверджаньнем такой сувязі ёсьць і тая акалічнасьць, што калі 25 жніўня 1988-га прэзыдыюм ЦК Кампартыі Чэхаславакіі меў паседжаньне, зьвязанае з дэманстрацыяй 21 жніўня – непрыемнай і неспадзяванай для іх падзеі, – то яго члены пагадзіліся ўзяць за аснову рашэньня, што рабіць, матэрыялы пра ход і задушэньне актаў пратэсту ў жніўні 1969 году. Антырэжымныя дэманстрацыі найперш зыходзілі з таго, што было з пункту гледжаньня маладога пакаленьня 1960-х гадоў і пакаленьня сярэдняга веку 1980-х гадоў, па сутнасьці, найважнейшым уражаньнем 1968 году (мажліва, нават уласна 1969 году) – г. зн. з актыўнага супрацьстаяньня нападу і нармалізацыйнаму рэжыму, які надыходзіў. Нібыта пацьвердзілася тагачасная заўвага, амаль прароцтва, якое пры занатоўваньні сваіх уражаньняў з дэманстрацыі 21 жніўня 1969-га у Брне запісаў тады дваццацігадовы студэнт: «Я бачыў гэтае мноства сяброў, аднаклясьнікаў зь дзевяцігодкі і дванаццацігодкі, калегаў з брыгады… Мы цэлае пакаленьне супраць іх… калі цяпер усё пойдзе абы-як, то мы выйграем праз 20 гадоў».

Новы тур барацьбы за кантроль над грамадзкай прасторай, а пасьля за ўладу ў дзяржаве адбываўся ў новай, нашмат больш спрыяльнай сытуацыі. Сытуацыя была іншай у многіх аспэктах, у якасьці прыкладу прыгадайма на заканчэньне адзін факт: у

жніўні 1969 году сярод дэманстрантаў былі чалавечыя ахвяры. І калі тады гэтыя сьмерці, без сумневу, відавочна паспрыялі запалохваньню, пацыфікацыі і затыканьню рота грамадзкасьці на доўгія гады, то ў лістападзе 1989-га паведамленьне (якое празь некалькі гадзінаў было прызнана непраўдзівым), што падчас дэманстрацыі загінуў адзін студэнт, прыкметна абурыла і мабілізавала грамадзкасьць і паспрыяла ўзьнікненьню настолькі маштабнай хвалі пратэстаў, што яна на працягу некалькіх дзён зьнішчыла ўжо падточанае збудаваньне.

Пераклала з чэскай Ганна Краснадземская

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 7-8 (47-48) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/11/21
[image]

[illegible]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 7-8 (47-48) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

гісторыя

[image]-[image]2006

"ды Э. бацу"

пост выбары • крытыка • эсэістыка • аналітыка • палеміка • **гісторыя**

[image] [image] [image]

Павал Жачак «Баявая зброя» Дзяржаўнай бясьпекі Супрацоўнікі Дзяржбясьпекі ў дырэктывах па агентурна-апэратыўнай працы 1947–1989 гадоў

ПАВАЛ ЖАЧАК (Pavel Žaček) – доктар філязофіі, працуе ў Інстытуце найноўшай гісторыі АН Чэшскай Рэспублікі.

Унутраныя дырэктывы Дзяржбясьпекі – яскравы прыклад таго, што нельга займацца вывучэньнем так званага пэрыяду нармалізацыі, які настаў пасьля жніўня 1968 году, без дасьледаваньня і веданьня папярэдняй дакумэнтацыі, якая адлюстроўвае ўнутранае разьвіцьцё тайнай палітычнай паліцыі савецкага тыпу. З розных прычынаў пазьнейшыя дакумэнты ўжо ня ўтрымліваюць шэрагу прынцыповых момантаў – указаньняў, службовых актаў ці расшыфроўкі ўжыванай тэрміналёгіі, – якія за шмат гадоў зрабіліся непісаным правілам, глыбока ўкарэненым у сьвядомасьць супрацоўнікаў ДБ. Гэтак, без сумневу, было і ў такой спэцыфічнай галіне, як

дырэктывы па агентурна-апэратыўнай працы.

Пасьля таго, як улада перайшла да КПЧ, у Дзяржбясьпекі не было патрэбы неяк прынцыпова мяняць мэтодыку сваёй дзейнасьці. І ў тэорыі, і на практыцы так званая агентурна-апэратыўная праца была непасрэдным працягам сытуацыі, што папярэднічала лютаму 1948 году. Адзін зь першых вядомых дакумэнтаў, які мае дачыненьне да тэрміналёгіі ДБ ў праблематыцы агентурнай сеткі, – гэта «Часовая дырэктыва аб дзейнасьці краёвых інфарматарскіх аддзяленьняў і філіялаў», якую на пачатку 1947 году выдаў аддзел № VII (Дзяржаўная бясьпека) Міністэрства ўнутраных справаў. Гэты аддзел, між іншым, кіраваў палітычнай агентурнай справай у дзяржаўным маштабе. Ужо тады кіраўніцтва ДБ даводзіла неабходнасьць стварэньня масавай агентурнай сеткі з мэтай ажыцьцяўленьня кантролю за жыцьцём грамадзтва: «Супрацоўнікі набіраюцца з усіх пластоў насельніцтва такім чынам, каб мы мелі магчымасьць атрымліваць інфармацыю з усіх працоўных месцаў, ад прадстаўнікоў усіх прафэсій, каб мы мелі дакладную карціну рэчаіснасьці».

«Часовая дырэктыва» пастанаўляла, что палітычная агентурная дзейнасьць (ПАД) «паводле свайго характару – дзейнасьць абарончая, бо ня ставіць перад сабой ніякіх агрэсіўных мэтаў і здабывае інфармацыю ў пытаньнях, якія ўяўляюць сабой пэўную цікавасьць, звычайнымі спосабамі… зьбірае зьвесткі, неабходныя для эфэктыўнай абароны супраць усялякіх нездаровых антыдзяржаўных памкненьняў, носьбітамі якіх могуць быць чэхі або славакі». Адказнымі за выкананьне задачаў, што тычацца палітычнай агентурнай дзейнасьці, былі прызначаны адпаведныя чыноўнікі аддзелу № VII Міністэрства ўнутраных справаў, групаў A і B (згодна з тагачаснай тэрміналёгіяй – унутрыдзяржаўная і замежная агентурная дзейнасьць), чыноўнікі Аддзелу бясьпекі–II у Празе, Брне і Астраве (а таксама падуладныя ім агентурныя падразьдзяленьні), у Славакіі – чыноўнікі паўнамоцнага прадстаўніцтва ўнутраных справаў і аддзелу Z у Браціславе. Апэратыўныя органы ўсіх пералічаных падразьдзяленьняў выкарыстоўвалі супрацоўнікаў, якія былі падзеленыя на **інфарматараў, даверaных асобаў** і **агентаў**. Паняцьце

«супрацоўнік» было акрэсьлена даволі проста: «...яны ня ёсьць нашымі штатнымі службоўцамі, аднак гэта сьвядомыя памочнікі нашай інфарматарскай службы, і пры гэтым іх матывацыя ня мае ніякага значэньня. Супрацоўнікамі ня лічацца асобы, якія падаюць нам пэўную інфармацыю, аднак самі не ўсьведамляюць, што падаюць яе выведным органам». Асобы, якія сьвядома падавалі «якія заўгодна зьвесткі», лічыліся ў ДБ выпадковымі ці сталымі інфарматарамі. «Сталы інфарматар, які заслужыў поўны давер, пасьля апрабаваньня можа лічыцца даверанай асобай».

Самыя важныя задачы выконваў, згодна з дырэктывай, **агент**. Ён даваў зьвесткі «за ўзнагароджаньне (грошы альбо іншыя выгоды)», аднак «пакрыцьцё наяўных выдаткаў і г. д.» не лічылася «агентурнай платай». Агентамі не рабіліся і ў выніку «запалохваньня». У шэрагі агентаў былі залічаныя таксама супрацоўнікі, якія высылаліся «за мяжу, як і кожная асоба, якая ўжо працавала на чужыя ўрады ці яшчэ на іх працуе» (гэтак званыя двайныя агенты, альбо дублёры).

На пачатку красавіка 1948 году начальнік групы III/A Міністэрства ўнутраных справаў разаслаў падначаленым структурам інструкцыю «Аб назвах супрацоўнікаў інфарматарскай службы» для таго, «каб усе службоўцы аддзелаў Z належным чынам засвоілі найменьні». Да 10 красавіка 1948 году службоўцы павінныя былі інструкцыю спаліць і адрапартаваць пра яе зьнішчэньне. Кіраўнік ДБ таксама настойваў: «Правядзіце дакладную рэгістрацыю агентурнай сеткі ў краях, узгодненую з патрабаваньнямі, прыведзенымі ў інструкцыі, бо ў самы блізкі час будзе праведзеная цэнтралізаваная рэвізія. Пры гэтым важна, каб сакрэтныя крыніцы (D) і іншыя інфарматары, якія не абслугоўваюцца намі рэгулярна, нягледзячы на тое, што яны вам вядомыя, не патрапілі ў рэестар агентурнай сеткі, і каб у яе максымальна цьвяроза былі залічаныя выключна тыя супрацоўнікі катэгорыяў A, AK і SI (з вызначэньнем тых, каго мы адносім да AP, AKP і SIP), якіх мы рэгулярна абслугоўваем». Перад Дзяржбясьпекай пасьля лютага 1948 году паўсталі новыя задачы, новыя прыярытэты. Таму яна была вымушана правесьці кардынальную пераацэнку сваёй агентурнай сеткі. Часткай

сыстэмных зьменаў у палітычнай паліцыі была і вышэйзгаданая інструкцыя.

Ва ўводзінах дырэктыва давала вызначэньне агентурнай сеткі як «сеткі супрацоўнікаў нашай інфарматарскай службы» ці «абагульняльнай назвы для ўсіх відаў і тыпаў супрацоўнікаў інфарматарскай службы або агентаў». Кіраўніцтва ДБ імкнулася аддаваць перавагу азначэньню «супрацоўнік» перад зьняважлівым «агент». «Назву «агент» у будучыні выкарыстоўваць непажадана, асабліва ў размове з супрацоўнікамі, а тым больш зь іншымі асобамі, бо гэтая назва часта зьвязаная з уяўленьнем пра штосьці зьняважлівае, тымчасам як на самай справе шчыры супрацоўнік інфарматарскай службы выконвае патрыятычную і надзвычай пачэсную працу. Пра агентаў будзем весьці гаворку толькі ў выключных выпадках...» У залежнасьці ад «ступені надзейнасьці і павязанасьці» з ДБ дырэктыва вылучыла «па-новаму, больш дакладна» тры галоўныя катэгорыі «агентаў», гэта наступныя:

а) даверaныя асобы і іншыя першаклясныя агенты;

б) даверaныя кандыдаты і іншыя агенты-кандыдаты;

в) сталыя інфарматары.

Найвышэйшай катэгорыяй агентурных супрацоўнікаў улічылася **даверaная асоба** (скарочанае абазначэньне **А**)[1]. Дадзеная асобай мог лічыцца сьвядомы, фармальна – пісьмова – і вусна – абавязаны, сталы і надзейны супрацоўнік Дзяржбясьпекі, якому тайна, згодна з загадамі дзейнічае ў варожым ці іншым асяродзьдзі, што зрабілася аб'ектам увагі інфарматарскай службы, і які зарэкамэндаваў сябе добра да такой ступені, што ўжо няма амаль ніякага сумневу, што ён выканае як належна загад інфарматарскай службы з выключнай дысцыплінаванасьцю». Неабходнай умовай быў таксама факт, што «ён працуе ня толькі надзейна, але і на ўнутранай перакананьне. Статусу даверанай асобы (А) такі чалавек набывае, страчвае ані ў тым разе, калі яму за яго выкананьне прапануюцца матэрыяльныя выгоды». Калі ж, аднак, з такога надзейнага супрацоўніка, які добра сябе зарэкамэндаваў,

[1] Улічылася даверaная асоба (скарочанае абазначэньне А). Дадзеная асоба мог лічыцца сьвядомы, фармальна – пісьмова – і вусна – абавязаны, сталы і надзейны супрацоўнік Дзяржбясьпекі, якому тайна, згодна з загадамі дзейнічае ў варожым ці іншым асяродзьдзі, што зрабілася аб'ектам увагі інфарматарскай службы, і які зарэкамэндаваў сябе добра да такой ступені, што ўжо няма амаль ніякага сумневу, што ён выканае як належна загад інфарматарскай службы з выключнай дысцыплінаванасьцю». Неабходнай умовай быў таксама факт, што «ён працуе ня толькі надзейна, але і на ўнутранай перакананьне. Статусу даверанай асобы (А) такі чалавек набывае, страчвае ані ў тым разе, калі яму за яго выкананьне прапануюцца матэрыяльныя выгоды». Калі ж, аднак, з такога надзейнага супрацоўніка, які добра сябе зарэкамэндаваў,

адзіным альбо пераважным матывам была матэрыяльная зацікаўленасць», то ён ва ўнутраным ужытку называўся даверанай асобай, «а толькі» **агентам** (**АР**)[2]. «Мы, адзначаў, павінны імкнуцца, каб мець як мага больш агентурных супрацоўнікаў – дадзеных асобаў, нават калі і яны ў многіх выпадках у залежнасьці ад абставін могуць атрымліваць непасрэдна ці ўскосна матэрыяльнае ўзнагароджанне. Пры правільным кіраваньні з АР павінен стацца А, то бок асоба, якая дзейнічае не з матэрыяльных памкненьняў».

У выпадку ж, калі апэратыўны орган ДБ яшчэ ня быў абсалютна упэўнены ў тым, што завербаваны «супрацоўнік» будзе сапраўды дзейнічаць, а не падманваць, ён называўся **сумніўнай даверанай асобай** (**СД**)[3]. Адзін з такіх «сумніўных» у 1926 г. быў быць «сьвядомым і фармальна абавязаным супрацоўнікам ДБ».

Калі ж даверанай асобе-кандыдат (**АК**) кіруюцца «пераважна матэрыяльнай зацікаўленасьцю», ён меў унутраную назву не даверанай асобы-кандыдат, а **агент-кандыдат** (**АКР**)[4]. «Наша задача – дасягнуць таго, каб і з гэтай катэгорыі пры правільным кіраваньні выхоўваліся сапраўдныя даверанаяасобы тыпу А».

У выпадку, калі агентурны супрацоўнік дагэтуль ня быў «фармальна абавязаны», але Дзяржаўная бяспека ўжо рэгулярна атрымлівала ад яго «па сутнасьці праўдзівыя зьвесткі», такі супрацоўнік лічыўся **сталым інфарматарам** (**SI**). «Катэгорыя SI была заведзеная, галоўным чынам, для таго, каб ад астатніх агентурных супрацоўнікаў належным чынам адрозьніць тых, хто дагэтуль ня даў агентурных абяцаньняў і якіх таму – хоць яны і рэгулярна падаюць зьвесткі – мы ня можам лічыць дастаткова моцна прывязанымі. Таксама сюды адносяцца рэгулярныя інфарматары, якія з розных прычынаў ня ведаюць, што перадаюць інфармацыю менавіта нашай службе».

Для ўнутранай арыентацыі апэратыўныя органы павінны былі

[2] У 1926 г. «Абазначэньне агентаў» было зьменена на «Абазначэньне даверанай асобы». Адначасова ўмоцнена, што пераважная даверанай асобай павінна быць матэрыяльная зацікаўленасьць.

[3] Дарэчы, у 1926 г. «Абазначэньне сумніўных даверанай асобай» было зьменена на «Абазначэньне даверанай асобай-кандыдат».

[4] На гэты конт дырэктыва паведамляла: «Абазначэньне АКР павінна паказваць на тое, што завэрбаваны агентурны працаўнік ня толькі яшчэ дагэтуль дастаткова не зарэкамэндаваў сябе як надзейны работнік, але што і ягоныя памкненьні маюць дагэтуль – пераважна – неідэалягічны характар».

абазначаць сталых інфарматараў, якія працуюць, «кіруючыся пераважна матэрыяльнай зацікаўленасьцю, скарачэньнем SIP. Да гэтай катэгорыі належалі таксама інфарматары, якія працуюць праз запалохваньне альбо кіруючыся іншымі неідэалягічнымі матывамі». Дырэктыва катэгарычна падкрэсьлівала, што да «катэгорыі SI» можна аднесьці выключна тых інфарматараў, «якія ўжо знаходзяцца сьвядома ці несьвядома ў пэўных трывалых стасунках з кіроўным органам».

Усе тры згаданыя катэгорыі супрацоўнікаў, зь якіх складалася агентурная сетка ДБ, абслугоўваліся аднолькавым чынам, былі ў рэестры («у агентурнай картатэцы»), а іх данясеньні апэратыўныя органы ўкладалі «ў асабовыя справы». Дырэктыва патрабавала іх дакладнага разьмежаваньня, каб атрымаць дакладную інфармацыю «пра ступень іх надзейнасьці і прывязанасьці». Супрацоўнік, канечне, можа быць пераведзены з адной катэгорыі ў іншую. «Мэта кіроўнага органу – дамагчыся прасоўваньня супрацоўнікаў у больш высокую катэгорыю».

Дзяржаўная бясьпека акрамя «сталых інфарматараў» таксама карысталася паслугамі яшчэ адной катэгорыі – так званых «выпадковых ці неабавязаных супрацоўнікаў», якія, аднак, не лічыліся часткай агентурнай сеткі. «Для іх рэгістрацыі выкарыстоўваўся не агентурны рэестар, а адмысловая дапаможная картатэка. Хаця гаворка ў гэтым выпадку вядзецца пра неагентурныя крыніцы, аднак такія крыніцы неабходныя і незаменныя. Іх важнасьці нельга недаацэньваць».

Першы з выпадковых і неабавязаных супрацоўнікаў быў **кансультант** (інакш «даверaная крыніца»), якога «дасюль» называлі «даверaная асоба»: «Гэта асоба, якая сьвядома і з ахвотай дае нам інфармацыю і парады, калі мы да яе зьвяртаемся з запытам. І на гэтых асобаў, як правіла, вядзецца картатэка, бо яны зьяўляюцца важнай крыніцай нашых ведаў. Аднак тут адсутнічае трывалая залежнасьць ад нашай службы. Калі гэтыя «даверaныя крыніцы» рэгулярныя, мы абазначаем іх літарай «D» і зьвяртаемся да іх у любы час, калі толькі нам спатрэбіцца ад іх інфармацыя. Пішам: D № ... нам паведаміў. Спосаб абазначэньня такі ж, як і дагэтуль[5]. Асабовыя справы не

заводзяцца, акрамя выпадкаў, калі гаворка ідзе пра пастаяннага інфарматара, якога мы пастаянна абслугоўваем (SI)». Іншай катэгорыяй сталі прынагодныя і спарадычныя інфарматары, якія перадаюць інфармацыю «несьвядома ці хоць бы і сьвядома, але не рэгулярна, а час ад часу, пры пэўнай нагодзе, гэта значыць, што трывалыя стасункі зь Дзяржаўнай бясьпекай адсутнічаюць».

У заключэньні дырэктыва зрабіла празрыстую выснову: «Матэрыяльныя выгоды, зразумела, будуць прапанаваны і далей, калі гэта будзе на карысьць нашай службе. Для катэгорый AP, AKP, SIP залічваем супрацоўнікаў адзначаны, калі для іх матэрыяльная падтрымка зьяўляецца выключнай альбо калі гаворка ідзе пра інфарматара-прафэсіянала, у якога страх ці іншыя неідэалягічныя матывы пераважаюць.

Даверануюасобу (A) альбо сталага інфарматара, якога ў інтарэсах павышэньня эфэктыўнасьці і якасьці яго працы мы матэрыяльна падтрымліваем, мы, бясспрэчна, не залічваем да катэгорыяў AP, AKP альбо SIP, пры гэтым нам павінна быць зразумела, што ён працуе ў першую чаргу ня дзеля таго, каб гэтыя выгоды атрымаць. Бо бываюць выпадкі, калі дзейнасьць супрацоўніка патрабуе такой аддачы ў сэнсе часу і асабістых выдаткаў, што ўзнагароджаньне проста неабходнае.

Акрамя таго, досьвед паказвае, што пэўная ўвага і ўвогуле спрыяньне ў асабістых пытаньнях у многіх выпадках абавязковыя і павышаюць нават у ідэальнага, неэгаістычнага і перакананага супрацоўніка жаданьне працаваць – бо ён радуецца таму, што яго праца належным чынам ацэньваецца, што яму такім ускосным чынам дэманструецца. Каштоўнага супрацоўніка мы, канечне, ня можам пакінуць жыць у поўнай галечы ці ва ўмовах, якія не спрыяюць плённай працы.

Літара «P» абазначае – наадварот – абсалютна іншую рэч: прафэсіянала, кар'ерыста ці чалавека, які хоць і ёсьць службова надзейным, але кіруецца зусім не асабістым перакананьнем, а калі і так, то ў недастатковай ступені».

Толькі ў дадатку да дырэктывы была згаданая адмысловая субкатэгорыя агентурных супрацоўнікаў – даверaных асобаў,

5. Тым ня менш, дырэктыва дае зразумець, што Адміністрацыя дае, ранейшаму, Дабранага ўвагі на тое, што дагэтуль мы гэтай літарай пазначалі усе даверапыя крыніцы. Цяпер мы гэтай літарай абазначаем толькі тых, хто працуе ў якасьці даравідаў, аднак каго мы «абслугоўваем» ня ў той меры, каб уключыць іх у склад сталых інфарматараў

якая стаяла ля вытокаў пазнейшага рэзыдэнта: «Даверэная асоба (А) можа з дазволу начальніка сэктару А атрымаць заданьне ад кіроўнага органу, гэта значыць, можа сканта працаваць зь іншымі супрацоўнікамі агентурнай сеткі. У гэтым разе мы разглядаем даверэную асобу як кіроўны орган і выкарыстоўваем скарачэньне АА (гаворка ідзе пра так званае звужэньне сеткі). АА ўжо, па сутнасьці, ёсьць службовым органам і можа – паводле абставінаў – атрымліваць плату, гэтым заробак, хоць і налічваецца з агентурнага фонду, ёсьць агентурным узнагароджаньнем, а лічыцца гандарарам, выкананую працу, падобна заробку, які службовыя асобы атрымліваюць ад дзяржавы. Падрабязнасьці яшчэ будуць удакладняцца». У пераліку скарачэньняў ён быў таксама пазначаны як так званы «шэф-агент».

Паступовае разьвіцьцё агентурна-апэратыўнай працы знайшло адлюстраваньне ў наступнай дырэктыве Міністэрства ўнутраных справаў, якая выйшла ў канцы 1948 году. Аўтары «Адміністрацыйна-апэратыўнай інструкцыі для краёвых штабоў Дзяржаўнай бясьпекі» зноў вярнуліся да праверанай надзейнай назвы **агент**. Ва ўводзінах да інструкцыі тлумачылася: «Агент – запазычанае слова. Абазначае: той, хто дзейнічае, або той, каму даверана дзейнічаць. Кожны са службовых органаў ёсьць, па сутнасьці, чэхаславацкім агентам Дзяржаўнай бясьпекі. Слова ня мае зьняважлівага значэньня. Сёньня яно выкарыстоўваецца для абазначэньня няштатных супрацоўнікаў, то бок тых, хто працуе на нашу службу, ня будучы яе афіцыйнымі службоўцамі. У вузкім сэнсе агентам называюць таго, хто пры гэтым карыстаецца даверам ворага».

Вызначэньне агентурнага супрацоўніка тыпу «агент» таксама зьмянілася: «Агент – гэта сьвядомы, а таксама фармальна (пісьмова ці ў іншай форме) абавязаны, пастаянны і надзейны супрацоўнік службы Дзяржаўнай бясьпекі, які тайна, згодна з загадамі, вядзе дзейнасьць у асяродку ворага ці ў месцы дысьлякацыі ворага і карыстаецца яго даверам». Вузейшая катэгарызацыя агентаў была заснаваная на папярэдняй дырэктыве.

«а) Агент (скарочана А) – гэта агент, які зарэкамэндаваў сябе

настолькі, што ўжо амаль няма сумневу ў тым, што ён выканае які заўгодна загад службы дзяржаўнай бясьпекі з абсалютнай дысцыплінаванасьцю, і пры гэтым будзе дзейнічаць ня толькі надзейна, але і на падставе асабістага перакананьня.

б) Агент Р (скарочана АР) – гэта агент, які дзейнічае, кіруючыся іншымі матывамі.

в) Агент-кандыдат (скарочана АК) – гэта завэрбаваны агент, які яшчэ не дастаткова выпрабаваны і няма дастатковай падставы для таго, каб сказаць, што ён сябе выдатна зарэкамэндаваў.

г) Агент Р–кандыдат (скарочана АКР) – гэта агент Р, якога яшчэ не дастаткова выпрабавалі».

На працягу 1948 году зьнікла катэгорыя «давераная асоба» і, наадварот, большае значэньне атрымалі **інфарматары**, якія найперш не валодалі важнай якасьцю агента, гэта значыць, не карысталіся даверам у «варожым асяродку»: «Гэта завэрбаваныя асобы, якія рэгулярна нас інфармуюць ці выконваюць сакрэтныя загады службы дзяржбясьпекі і рэгулярна ёю абслугоўваюцца. Яны ня лічацца агентамі, бо ня маюць даверу ворага». Інфарматары былі падзеленыя на дзьве асноўныя групы:

«а) сталы інфарматар (скарочана SI) кіруецца асабістым перакананьнем;

б) сталы інфарматар Р (скарочана SIP) кіруецца ня толькі перакананьнем».

Шэф-агенты (АА) былі замененыя **рэзыдэнтамі**: «Рэзыдэнт (скарочана R) – гэта шчыры няштатны памочнік службы Дзяржбясьпекі, які абавязаўся абслугоўваць завэрбаваных інфарматараў службы Дзяржбясьпекі. (Толькі ў выключных выпадках сам падае данясеньні.) Не абслугоўвае агентаў. Рэзыдэнтаў выкарыстоўваюць для звужэньня прафіляктычнай сеткі».

Гэтым разам ДБ толькі мімаходзь згадала факт, што акрамя «сталых інфарматараў» служба карысталася таксама паслугамі

«катэгорыі выпадковых неабавязаных супрацоўнікаў», якія не разглядаліся як частка агентурнай сеткі. «Гэта асобы, якія сьвядома і з ахвотай падаюць нам інфармацыю, калі гэта неабходна. Гэтыя асобы – вельмі важная крыніца нашых ведаў, аднак яны не знаходзяцца ў непасрэднай залежнасьці ад службы. Мы называем іх дарадцамі альбо «даверанымі крыніцамі» (скарочана D)».

У першы і апошні раз дырэктывы згадвалі самую спэцыфічную і небясьпечную форму працы ДБ: «У выпадку, калі кіроўны орган атрымае асабіста, якім заўгодна спосабам, давер ворага, ён надзяляецца функцыямі агента...» Ад агента ён адрозьніваўся ня толькі тым, што быў кадравым службоўцам Дзяржаўнай бясьпекі, але таксама іншай формай агентурнай дзейнасьці. У кола абавязкаў такога агента ўваходзіла «не паставіць пад пагрозу іншых супрацоўнікаў Дзяржаўнай бясьпекі, то бок імкнуцца, каб ня здарылася выкрыцьця кіроўнага органу».

Апошні абзац, прысьвечаны агентурнай тэрміналёгіі, падзяляе агентурную сетку на мэтавую, якая павінна была «імкнуцца пранікнуць і весьці дзейнасьць супраць канкрэтнага ворага», і на прафіляктычную, зарыентаваную «на раскрыцьцё варожай дзейнасьці».

У наступны пэрыяд у дзейнасьці ДБ адбылася пэўная рэарганізацыя, і фармальнае разьвіцьцё дырэктываў і іх працоўных і мэтадычных наступстваў застаецца не зусім ясным. На пачатку 1950 году дакладна была прынятая новая «намэнклятура супрацоўнікаў».

а) Агент апэратыўны (Ao) быў супрацоўнікам фармальна завэрбаваным, які рэгулярна абслугоўваўся, меў «давер ворага і таемна, на загад ДБ, дзейнічаў у асноўным пункце аб'екту ў інтарэсах ДБ».

б) Агент унівэрсальны (Av) вызначаўся аналягічна, з адным адрозьненьнем, што на загад Дзяржаўнай бясьпекі таемна дзейнічаў «у варожым асяродку».

в) Інфарматар апэратыўны (Io) быў фармальна завэрбаваным супрацоўнікам, які рэгулярна абслугоўваўся і «сыстэматычна

падаваў зьвесткі з асноўнага пункту аб'екту зацікаўленасьці ДБ».

г) Інфарматар унівэрсальны (Iv) быў такім самым тыпам супрацоўніка, які, аднак, не падае «зьвестак з асноўнага пункту зацікаўленасьці ДБ».

д) Даверанай асобай (D) лічыўся вусна завэрбаваны супрацоўнік, які абслугоўваецца, калі неабходна. «Даверам ворага не карыстаецца. D – гэта асобы, якія сьвядома і з ахвотай падаюць службе бясьпекі інфармацыю ці розныя паслугі, калі гэта спатрэбіцца».

21 лістапада 1950 году датуецца аж занадта кароткі ліст, адрасаваны беспасярэдне калегіі міністра нацыянальнай бясьпекі і савецкім дарадцам, у дачыненьні да якіх «пры рэарганізацыі агентурнай службы» было адменена «вызначэньне «супрацоўнік», якое выкарыстоўвалася дасюль». Ранейшае вызначэньне **«агент»** асабліва не адрозьнівалася ад абноўленага: «Агент (A) – супрацоўнік фармальна абавязаны, які рэгулярна абслугоўваецца, мае давер ворага і таемна – на загады службы Дзяржаўнай бясьпекі – дзейнічае ў варожым асяродку». Крыху зьмененыя былі патрабаваньні да інфарматара: «Інфарматар (I) – супрацоўнік фармальна абавязаны, які рэгулярна абслугоўваецца, падае зьвесткі і ўяўляе сабой інтарэс з пункту гледжаньня дзяржаўнай бясьпекі». Зьмены адбыліся і для катэгорыі «рэзыдэнт», ён ужо мог кіраваць і агентамі: «Рэзыдэнт (R) – супрацоўнік фармальна абавязаны, які рэгулярна абслугоўваецца і сам у інтарэсах Дзяржаўнай бясьпекі абслугоўвае некалькі інфарматараў ці агентаў, а атрыманыя ім матэрыялы і складваюцца ў папку гэтага рэзыдэнта». У апошнюю чаргу была дададзеная новая катэгорыя «гаспадар кансьпіратыўнай кватэры» (KB), пра якога толькі гаварылася, што ён «павінен рэгістравацца ў агентурнай картатэцы».

У канцы 1951 году Міністэрства нацыянальнай бясьпекі правяло праверку агентурнай дзейнасьці службоўцаў ДБ, якая нібыта паказала, «што праца з агентурнымі супрацоўнікамі ўсё яшчэ недаацэненая, і як вынік гэтага, агентура яшчэ ня сталася баявой зброяў работнікаў нацыянальнай бясьпекі ў барацьбе

супраць клясавага ворага». Міністар нацыянальнай бясьпекі Ладзіслаў Копршыва ў сакрэтным загадзе № 36 «Праца з агентам» нават сьцьвярджаў: «Камандзіры ўсіх узроўняў не заўважалі канкрэтнай праблематыкі агентурнай працы падначаленых працаўнікоў, працу з агентамі не кантралююць і тым самым аслабляюць баяздольнасьць бясьпекі. Колькаснае становішча сёньняшняй агентуры зусім нездавальняючае, выбару новых агентурных супрацоўнікаў надаецца малая ўвага».

Уласна агентурная праца апэратыўных органаў ДБ мела наступныя асноўныя хібы. Апэратыўныя «органы» нібыта надта «часта» схілялі да супрацоўніцтва асобаў, якіх хутчэй павінны былі «распрацоўваць як варожых аб'ектаў». Дрэнны аналіз «выпадкаў» часам быў прычынай выбару неадпаведных, дрэнна абавязаных супрацоўнікаў і нездавальняючага кіраўніцтва імі. Паводле аналізу, замест дасканалага выкарыстаньня тайнага супрацоўніка палітычная паліцыя, па сутнасьці, пакрывала «варожага агента». Нібыта раскрыліся і выпадкі, калі «аб'екты, абавязаныя да супрацоўніцтва», сыстэматычна давалі правакацыйныя зьвесткі. Зь некалькіх выпадкаў апошняга часу, якія, канечне ж, былі тыповыя толькі для пачатковай фазы стварэньня масавай агентурнай сеткі, стала яскрава відаць іншая «сур'ёзная памылка... органы схіляюць да супрацоўніцтва асобаў, пра якіх практычна нічога ня ведаюць, а пасьля раскрыцьця выпадку з абсалютна іншай агентурнай крыніцы робіцца вядома, што гэта быў член антыдзяржаўнай групоўкі». Неабходна падкрэсьліць, што задачай гэтай самакрытыкі, якая абагульняла некаторыя агентурныя выпадкі ДБ, была не рэлятывізацыя небясьпечнасьці працы з агентурнай сеткай, а імкненьне выправіць выяўленыя недахопы. Да гэтага мае дачыненьне і выкрыцьцё наступнай «памылкі» – «да супрацоўніцтва прыцягваюцца асобы, якія знаходзяцца на пэрыфэрыі варожага асяродку і ня маюць ані задаткаў інфарматараў, ані перадумоваў для таго, каб зрабіцца агентамі і ўкараніцца ў варожыя шэрагі».

Наступная заўвага тычылася толькі тых тайных супрацоўнікаў ДБ, якіх удалося схіліць да супрацоўніцтва з апэратыўнымі органамі праз запалохваньне: «Форма вэрбоўкі часта бывае

шаблённай, паводле нейкага аднаго выпадку, які сябе «апраўдаў», напрыклад, чалавек выклікаецца ў службу бясьпекі, пры гэтым папярэдне ў яго дачыненьні не праведзеная люстрацыя і не падрыхтаваная нават вэрбоўная прапанова. На допыце ён пад пагрозамі вымушаны падпісаць прысягу, пры гэтым органы нават не валодаюць ніякім кампрамэтоўным матэрыялам і толькі потым, дадаткова, выпрацоўваюць вэрбоўную прапанову. Выявіліся нават выпадкі, якія заслугоўваюць пакараньня, калі як сродак вэрбоўкі выкарыстоўвалася нават фізычнае ўзьдзеяньне, гвалт і розныя пагрозы». Аўтары дырэктывы адчувалі і неабходнасьць зьвярнуць увагу на «недахопы… у абслугоўваньні супрацоўнікаў, якія былі выкліканыя тым, што:

а) кіроўны орган недастаткова рыхтуецца да сустрэчы з агентам і ня ставіць перад ім дакладных задачаў, як агульных, так і дэталёвых,

б) пры наступнай сустрэчы не настойвае на выкананьні пастаўленых задачаў альбо нават не кантралюе, ці былі яны выкананыя і як,

в) не кантралюе дзейнасьці агента,

г) як вынік, ня мае поўнага ўяўленьня аб працы агента, яго стаўленьні да задачы, яго здольнасьцях, якасьці і грунтоўнасьці яго данясеньняў,

д) не прытрымліваецца прынцыпаў кансьпірацыі.

Вядома ж, неабходна пакласьці канец такому безадказнаму стаўленьню да агентурнай працы. Кожны апэратыўны супрацоўнік мусіць усьведамляць, што яго галоўнай зброяй у барацьбе з клясавым ворагам ёсьць палітычная сьпеласьць і агентура».

Таму міністар Копршыва загадаў «прытрымлівацца наступных прынцыпаў пры працы з агентамі». Пры падборы «прыдатных тыпаў і пры падрыхтоўцы да вэрбоўкі» работнікі ДБ мусілі, у першую чаргу, «палітычна ўсьвядоміць, дзе знаходзіцца ці можа знаходзіцца вораг народна-дэмакратычнага ладу – то бок, дзе

знаходзяцца аб’екты органаў Дзяржбясьпекі». Потым было «неабходна заўсёды скіроўваць... агентуру згодна з загадзя падрыхтаваным плянам». Пры выбары тыпаў, прыдатных для вэрбоўкі, трэба было ўлічваць два «галоўныя патрабаваньні:

а) надзейнасьць (гэта значыць, якія ёсьць гарантыі, што гэтая асоба пры правільным кіраваньні і кантролі ня здрадзіць);

б) прыдатнасьць тыпу (гэта значыць, якія стасункі і кантакты мае прапанаваная асоба з клясавым ворагам, якія яе асабістыя якасьці, які маецца на яе кампрамэтоўны матэрыял і г. д.)».

Толькі пасьля гэтага можна было «брацца за непасрэдную апрацоўку выбранага тыпу».

Прынцыпам усіх апэратыўных работнікаў Дзяржбясьпекі павінна было стаць усьведамленьне, «што вэрбаваць можна толькі тых асобаў, якія ўжо як сьлед апрацаваныя, а гэта значыла:

Прагледзець усе картатэкі, навесьці зьвесткі пра папярэднюю дзейнасьць, палітычнае мінулае, кантакты, захапленьні, рысы характару, сваякоў, знаёмых і г. д., проста тое, што дазволіць скласьці дакладнае ўяўленьне пра асобу, у некаторых выпадках ёсьць неабходнасьць да адшуканай і такім чынам апрацаванай асобы прымацаваць іншага агента, які пра яе паводзіны і характар можа падаць падрабязны рапарт, перад вэрбоўкай варта за абранай асобай паназіраць, у асабліва важных выпадках некаторы час і пасачыць, неабходна апрацаваць абраную асобу з дапамогай тэхнічных сродкаў (тэлефоннае праслухоўваньне, мікрафонная сувязь, цэнзура карэспандэнцыі), сабраць кампрамэтоўны матэрыял – альбо выпрацаваць плян дзеяньняў у яго пошуку і зборы – і ўсё гэта да такой ступені, каб завэрбаваная асоба ясна зразумела, што ўсё яе далейшае існаваньне залежыць ад супрацоўніцтва з органамі Дзяржбясьпекі.

На аснове такой апрацоўкі і сабранага матэрыялу неабходна ўзважыць атрыманыя зьвесткі, і калі матэрыял пра злачынную дзейнасьць надта сур’ёзны, трэба вырашыць, ці ня будзе больш мэтазгодным абраную асобу арыштаваць, чым завэрбаваць. У

кожным разе перад вэрбоўкай павінен быць падрыхтаваны плян захадаў на выпадак, калі асоба адмовіцца ад супрацоўніцтва са службай бясьпекі (напрыклад, калі матэрыял аб злачыннай дзейнасьці дастатковы, да вэрбоўнай прапановы адначасова мусіць прыкладацца ордэр на арышт і г. д.)». Як жа гэта было – на першы погляд – у пачатку пяцідзясятых гадоў проста! Альбо так, альбо не! Трэцяга няма!

Загад міністра Копршывы падкрэсьліваў як вырашальны элемэнт «для атрыманьня канкрэтных вынікаў агентурнай дзейнасьці… спосаб кіраваньня агентурнымі супрацоўнікамі». Дрэннае кіраваньне агентурнымі супрацоўнікамі цягне за сабой альбо выкрыцьцё агента, альбо яго недастаткова поўнае выкарыстаньне. Кіроўны орган ніколі не павінен быў забывацца пра факт, «што агент абарачаецца ў варожым асяродзьдзі, якое на яго робіць свой уплыў». Ён павінен быў агента «сыстэматычна» рыхтаваць, «як у палітычным, так і ў апэратыўным сэнсе да выкананьня заданьняў». Апэратыўны работнік мусіў пра гэта ўвесь час памятаць, у тым ліку і «пры наладжваньні дачыненьняў паміж ім і агентам». Ні ў якім разе нельга было дапускаць ніякай фамільярнасьці, ад агента нельга было прымаць ніякіх падарункаў, пачастункаў і інш. «Агента неабходна выхоўваць так, каб ён усьведамляў, што працуе на дзяржаву пры пасярэдніцтве Дзяржаўнай бясьпекі, а ні ў якім разе не на гэты орган бясьпекі, а ў выпадку, калі характар працоўных магчымасьцяў агента таго вымагае, неабходна перадаць агента іншаму органу, аддзелу ці краю».

Зусім неперакананаўча гучыць той урывак з загаду Копршывы, дзе гаворыцца пра забарону правакацый: «Пры кіраваньні агентурнымі супрацоўнікамі орган павінен памятаць, што агент ні ў якім разе не павінен стаць ініцыятарам злачынстваў ці зрабіцца цэнтральнай фігурай у антыдзяржаўнай гульні. Ні пры якіх умовах агент ня мае права падбухторваць іншых да тэрарыстычнай дзейнасьці, агентам неабходна кіраваць такім чынам, каб пра любыя тэрарыстычныя ці сабатажныя дзеяньні ён імгненна рапартаваў вышэй і гэтыя тэндэнцыі паралізоўваў. Абавязкам кіроўнага органу ў падобных выпадках ёсьць тэрміновая ліквідацыя такіх аб'ектаў». Дадаткова тут было пазначана, што «агент ня можа рабіцца правакатарам».

Пры кіраваньні агентурнымі супрацоўнікамі «часта здараліся сытуацыі, калі аб'ект, на які была скіравана ўвага агента, быў ліквідаваны» і перад членамі ДБ паўставала пытаньне пра «пераарыентацыю агента». «Пра гэтую магчымасьць неабходна памятаць ужо пры ліквідацыі аб'екту, бо неабходна захаваць магчымасьць своечасова папярэдзіць агента, каб ён ня страціў даверу ворага». Адначасова было неабходна падрыхтаваць агенту «глебу» для далейшай «працы зь іншым аб'ектам». У гэтых выпадках ДБ павінна была такім чынам арганізаваць працу іншых агентаў, каб яны, «нават не здагадваючыся, што гаворка ідзе пра супрацоўніка Дзяржбясьпекі, падрыхтавалі агенту ўмовы для далейшай дзейнасьці. Радзей, пры грунтоўным вывучэньні ўсіх стасункаў і кантактаў агента з клясавым ворагам, выяўлялася, што агент сам мае магчымасьць глыбейшага пранікненьня, пры акуратным кіраваньні, у іншыя варожыя аб'екты. Тут галоўным ёсьць прынцып, што толькі падрабязнае вывучэньне працоўных магчымасьцяў і асабістых якасьцяў дапамагае прыняць рашэньне пра наступную пераарыентацыю агента».

Акрамя сталага падкрэсьліваньня ролі кансьпірацыі, у загадзе быў і ўрывак, які патрабаваў ад кожнага апэратыўніка пільна кантраляваць дзейнасьць сваіх агентурных супрацоўнікаў. «У першую чаргу неабходна кантраляваць выкананьне заданьняў і правяраць атрыманыя ад яго зьвесткі. Другі від кантролю, які кіроўны орган павінен час ад часу праводзіць, гэта выпадковае сачэньне, выкарыстаньне тэхнічных сродкаў, праслухоўваньне важных спатканьняў агентурнага супрацоўніка з аб'ектам і кантроль пры дапамозе іншага агента ці інфарматара». Адмысловай формай кантролю быў кантроль адміністрацыйны, вынікам якога мусіла стаць «старанна складзеная агентурная кніга, якая павінна быць жывым дакумэнтам». Кіроўны орган мусіў «сыстэматычна» ўносіць у агентурную кнігу ўсе акалічнасьці, зьвязаныя з працай і дзейнасьцю агентурнага супрацоўніка.

У выпадку, калі апэратыўны орган выяўляў, што яго агентурны супрацоўнік выкрыты, ён павінен быў агента «або адразу прыбраць, або пасьля грунтоўнай падрыхтоўкі… выкарыстаць для таго, каб зьбіць ворага з панталыку, ці перавесьці яго туды,

дзе б яго яшчэ можна было выкарыстаць». Дырэктыва прыводзіла і парадак дзеяньняў на выпадак, калі «агентурны супрацоўнік здрадзіць ці адмовіцца ад далейшага супрацоўніцтва». Службоўцы ДБ мусілі «ўвесь выпадак як сьлед прааналізаваць і адшукаць памылку», як зь іхнага боку, так і з боку агента. «Калі ж іншае рашэньне немагчымае, то неабходна, выкарыстаўшы кампрамэтоўны матэрыял, прыняць суровыя меры і аддаць агента пад суд».

Загад таксама ясна вызначаў, што за кіраваньне і кантроль дзейнасьці агентурнай сеткі нясуць адказнасьць кіраўнікі ўсіх узроўняў, галоўны абавязак якіх – «праца з агентамі». «Калі, аднак, камандзіры хочуць як сьлед кантраляваць працу падначаленых службоўцаў з агентамі, яны самі павінны займацца агентурнай дзейнасьцю». Міністар Копршыва падкрэсьліваў: «Агентура – гэта самая дзейсная зброя супраць клясавага ворага з усіх элемэнтаў нашай службы. Агентура дае магчымасьць выкрыць і ліквідаваць клясавага ворага раней, чым ён ажыцьцёвіць свае злачынныя намеры... Новыя задачы, якія паўстаюць пры абвастрэньні клясавай барацьбы на шляху да сацыялізму, патрабуюць ад нашай службы, каб яна крочыла ў нагу з часам і заўсёды магла ў зародку пасьпяхова выкрываць антыдзяржаўную дзейнасьць ворага. Ведаць намеры ворага і наносіць удар у самы прыдатны час – такую магчымасьць нам даюць зьвесткі надзейна арганізаванай агентурнай сеткі. Таму агентура ў руках верных партыі, палітычна сьпелых і прафэсійна абазнаных працаўнікоў – гэта першая зброя нашай нацыянальнай бясьпекі. Гэтую зброю сёньня неабходна зрабіць цэнтрам найвялікшай увагі і яе вастрыё скіраваць супраць ворагаў міру і сацыялізму ў нашай краіне».

ЭРА БАРАКА

Наступны сакрэтны загад № 72 аб працы з агентамі, а таксама «Дырэктыва па агентурна-апэратыўнай працы» былі распрацаваныя і ў красавіку 1954 году выдадзеныя міністрам унутраных справаў Рудольфам Баракам. Ва ўступе да дырэктывы ён ставіць перад «органамі Міністэрства ўнутраных справаў пачэсную і адказную задачу: ахоўваць пабудову

сацыялізму ў нашай айчыне». Члены Дзяржаўнай бясьпекі адчувалі сябе як «на першай лініі барацьбы супраць унутранага і замежнага ворага». Пад кіраўніцтвам КПЧ і «ў цеснай повязі з працаўнікамі гарадоў і вёсак» яны мусілі дасягнуць «шматлікіх посьпехаў. Яны абясшкодзілі як у цэнтры, так і ў краях шмат небясьпечных шпіянажных, сабатажных, тэрарыстычных і іншых антыдзяржаўных груповак, сканфіскавалі значную колькасьць зброі, рацыяў і антыдзяржаўных улётак». Гэтых «посьпехаў» ДБ дасягнула «дзякуючы пастаяннаму павышэньню палітычнага ўзроўню» сваіх апэратыўнікаў, якія «выхоўваюцца ў духу адданасьці справе рабочай клясы, камуністычнай партыі і Савецкаму Саюзу, у духу непрымірэнчай нянавісьці да ворагаў міру і сацыялізму». Павышэньне палітычнага ўзроўню працаўнікоў Міністэрства ўнутраных справаў нібыта выявілася ня толькі «ва ўпартай барацьбе супраць парушэньня сацыялістычных законаў», але перадусім «у барацьбе за правільнае выкарыстаньне агентурнага апарату як аднаго з асноўных відаў зброі» ў руках Дзяржаўнай бясьпекі. «Практыка паказвае, што ад правільнага выкарыстаньня агентурнага апарату ў пераважнай большасьці выпадкаў залежыць посьпех барацьбы апэратыўных органаў Міністэрства ўнутраных справаў супраць ворага. Апэратыўныя працаўнікі, якія правільна зразумелі значэньне агентурнай працы, таму зьяўляюцца прыкладам у барацьбе з ворагамі народна-дэмакратычнага ладу». Нягледзячы на гэта, у працы органаў ДБ увесь час прысутнічалі «значныя недахопы». Адным з такіх недахопаў быў факт, што «многія» апэратыўнікі ДБ «як у цэнтры, так і на пэрыфэрыі, яшчэ не зразумелі значэньня агентурнай працы як найважнейшай зброі ў барацьбе з ворагам, не зразумелі, што апэратыўны працаўнік бяз добра выбудаванай, арганізаванай і кіраванай агентурнай сеткі – гэта проста канцылярскі бюракрат, які ня здольны выкрыць і абясшкодзіць ворага». Некаторыя сэктары апарату ДБ усё яшчэ замянялі «грунтоўную агентурную працу» працай з «так званымі даверанымі асобамі». Галоўны папрок на адрас многіх апэратыўных працаўнікоў гучаў наступным чынам: «замест таго... каб вэрбаваць агентуру, якая мае доступ у асяродак, варожы народна-дэмакратычнаму ладу, мае магчымасьць глыбока пранікаць у варожае падпольле, выкрываць яго варожую дзейнасьць і намеры, яны большую частку свайго часу

губляюць на сустрэчы з даверанымі асобамі». Супрацоўнікі ДБ тыпу «давераная асоба» былі «ў пераважнай большасьці актыўнымі працаўнікамі і функцыянэрамі», адкрыта выступалі «супраць ворагаў… народна-дэмакратычнага ладу», ня маючы магчымасьці «пранікаць у варожы асяродак, тым больш у актыўнае варожае падпольле». Аўтары дырэктывы прыйшлі да лягічнай высновы, што замена агентурнай працы працай з даверанымі асобамі не магла прынесьці жаданых вынікаў». Кантакт апэратыўнага працаўніка – «які абслугоўвае даверaны яму аб'ект ці сэктар» – з функцыянэрамі і актывам натуральным чынам дапамагаў яму арыентавацца ў сытуацыі, зьведваць і спраўджваць факты, на якія пазьней ён мог «зьвяртаць увагу агентуры». Аднак ніхто ня меў права «кантактамі з актывам» падмяняць працу з агентурай.

«Наступным сур'ёзным недахопам у агентурнай працы ёсьць слабы кантроль за дзейнасьцю апэратыўных працаўнікоў з боку ніжэйшага, сярэдняга і вышэйшага кіраўніцтва. Яшчэ ёсьць такія працоўныя месцы, на якіх асобныя апэратыўныя працаўнікі за апошні год ці два не завэрбавалі ніводнага агента ці інфарматара і не завялі ніводнай агентурнай справы. Такія «апэратыўныя» працаўнікі ўжо даўно перасталі быць апэратыўнымі і не прыносяць партыі і дзяржаве ніякай карысьці. Як гэта магчыма, што іх камандзіры цэлы год ці нават больш ня бачаць, што органы, ім падначаленыя, ігнаруюць агентурную дзейнасьць? Гэтак можа быць толькі з той прычыны, што гэтыя камандзіры агентурна-апэратыўнай працы не патрабуюць і зусім не праводзяць кантролю працы на даверaных ім участках».

Не ў апошнюю чаргу міністар Барак лічыў неабходным «энэргічна і рашуча» ліквідаваць наступны «недахоп» у агентурна-апэратыўнай працы, а менавіта «выкарыстаньне правакацыйных мэтадаў». Хаця гэтыя выпадкі сустракаюцца ня надта часта, некаторыя апэратыўнікі недаацанілі палітычнага значэньня барацьбы за сацыялістычныя законы і карыстаюцца правакацыйнымі мэтадамі пры працы з агентурай. Правакацыйныя мэтады неспалучальныя з правільным разуменьнем сэнсу агентурнай працы, а выпадкі выкарыстаньня правакацыйных мэтадаў трэба лічыць грубым

парушэньнем сацыялістычнай законнасьці».

Апошнім са згаданых сур'ёзных недахопаў у агентурнай працы было «парушэньне асноўных прынцыпаў кансьпірацыі», і гэта тычылася як пытаньняў нармаваньня, так і абслугоўваньня агентаў. «Выпадкі дэкансьпірацыі агентаў – празь непрадуманае нармаваньне агентуры, празь нядбайную арганізацыю агентурных сустрэчаў, празь няправільнае і фармальнае кіраваньне агентурнымі супрацоўнікамі – сьведчыць пра тое, што дастаткова многа апэратыўных працаўнікоў як сьлед не разумеюць, што адзіна засакрэчаны агентурны супрацоўнік можа пасьпяхова выконваць заданьні».

Ва ўступе міністар унутраных справаў яшчэ патрабаваў: «Ад хуткага і пасьлядоўнага выкараненьня недахопаў у агентурнай працы залежыць павышэньне агульнага апэратыўнага ўзроўню органаў Міністэрства ўнутраных справаў. Умовы абвостранай клясавай барацьбы патрабуюць пастаяннага павышэньня ўзроўню апэратыўнай працы як у цэнтры, так і на пэрыфэрыі. Таму абавязкам усіх працаўнікоў Міністэрства ўнутраных справаў ёсьць рашучае і прынцыповае, праведзенае ў сьціслыя тэрміны паляпшэньне агентурна-апэратыўнай працы». Акрамя знаёмства з новымі дырэктывамі, Барак распарадзіўся ў першую чаргу перавесьці «даверaных асобаў», якія маюць магчымасьць выкрываць і распрацоўваць варожыя групоўкі ці асобных варожых асобаў, у катэгорыю інфарматараў – а ў некаторых выпадках нават у катэгорыю агентаў – і ўключыць іх у агентурную сетку. «З астатнімі даверанымі асобамі і надалей падтрымліваць сувязь як з актывам, аднак толькі па меры неабходнасьці». Усім камандзірам, якія кіруюць апэратыўнай працай на ўсіх узроўнях, было загадана прыняць «падставовыя меры» для пошуку агентуры, «патрэбнай» на аб'ектах і па лініях працы, пасьлядоўна прытрымлівацца інструкцый па агентурнай дзейнасьці і пры гэтым увесь час «памятаць, што самамэтавы, масавы, павярхоўны і фармальны пошук агентуры ня можа прынесьці жаданых вынікаў». Загад ізноў забараняў усім апэратыўнікам карыстацца «правакацыйнымі мэтадамі» пры працы з агентурай. Барак патрабаваў, каб яму ці яго намесьнікам імгненна дакладвалі пра ўсе выпадкі «выкарыстаньня правакацыйных мэтадаў у агентурна-

апэратыўнай працы і парушэньня сацыялістычнай законнасьці, а вінаватыя каб былі своечасова пакараныя».

Сама сабою «Дырэктыва па агентурна-апэратыўнай працы» пашырала вызначэньне агентурна-інфарматарскай сеткі, у якую, як і раней, уваходзілі асобы, «тайна завэрбаваныя для выкрыцьця, апрацоўкі, дакумэнтаваньня і своечасовага перапыненьня злачыннай дзейнасьці варожага падпольля, агентуры варожых выведных і эмігранцкіх цэнтраў, для выкрыцьця шкоднікаў, дывэрсантаў, тэрарыстаў і іншых злачынных элемэнтаў, якія імкнуцца падарваць народна-дэмакратычны лад у ЧССР». Агентурная сетка ў залежнасьці ад рознага характару заданьняў у распрацаваным «варожым асяродзьдзі» падзялялася на: 1) агентаў, 2) інфарматараў, 3) рэзыдэнтаў, 4) гаспадароў кансьпіратыўных кватэраў і кватэраў, здадзеных для сустрэчаў.

Агент (А) у 1954 годзе вызначаўся як найздатнейшы тайны супрацоўнік апэратыўных органаў Міністэрства ўнутраных справаў, галоўнай якасьцю якога мусіла быць «здольнасьць пранікаць у варожае падпольле і ў выведныя органы супраціўніка, апрацоўваць іх і выконваць іншыя спэцзаданьні». Пад гэтымі заданьнямі мелася на ўвазе «актыўная апрацоўка шпіёнаў, шпіёнскіх рэзыдэнтураў, сабатажнікаў і шкоднікаў, падпольных арганізацыяў (буржуазна-нацыяналістычных, кулацка-паўстанцкіх, былых рэакцыйна-палітычных партыяў і г. д.), выведных органаў праціўніка і яго эмігранцкіх цэнтраў».

Каб магчыма было выканаць гэтыя задачы, ДБ вэрбавала агентуру, «як правіла, зь ліку членаў… варожых арганізацыяў альбо з асобаў, якія мелі магчымасьць у гэтыя арганізацыі пранікнуць». Агента апэратыўныя органы павінны былі вэрбаваць «на аснове кампрамэтоўных матэрыялаў – гэта значыць, яго злачыннай дзейнасьці, – патрыятычных памкненьняў, ягоных сымпатыяў да народна-дэмакратычнага ладу, або, урэшце, за матэрыяльныя выгоды. Прыдатнымі кандыдатамі для вэрбоўкі на аснове кампрамэтоўных матэрыялаў могуць быць няўстойлівыя элемэнты, якія ўключыліся ў антыдзяржаўную дзейнасьць пад пагрозамі ці за матэрыяльныя выгоды і якія ў антыдзяржаўнай дзейнасьці ня

гралі галоўнай ролі». Службоўцы ДБ, аднак, мусілі ўвесь час памятаць, «што самай надзейнай ёсьць агентура, якая пайшла на вэрбоўку з патрыятычных памкненьняў». Гэта было асабліва важна пры выкананьні «спэцзаданьняў: вэрбоўка за мяжой, аднаўленьне ці наладжваньне сувязі з замежнай і іншай агентурай і г. д.», якія маглі выконваць толькі «агенты з шэрагу надзейных асобаў, адданых народна-дэмакратычнаму ладу, якія прысягнулі, што ня здрадзяць дзяржаўным інтарэсам. На ідэалягічнай базе набіраюцца таксама агенты з замежных грамадзянаў, якія сымпатызуюць народна-дэмакратычнаму ладу, а таксама з інфарматараў, якія маюць магчымасьць працаваць на варожай тэрыторыі».

Інфарматар (І) вызначаўся як тайны супрацоўнік органаў Міністэрства ўнутраных справаў, «завэрбаваны, як правіла, на аснове патрыятычных памкненьняў, які дае інфармацыю пра варожыя элемэнты са свайго атачэньня»; акрамя гэтага ён мог быць завэрбаваны і на аснове кампрамэтоўных матэрыялаў». Інфарматары мусілі выконваць наступныя заданьні:

а) выкрываць «асобаў, варожых народна-дэмакратычнаму ладу, факты антыдзяржаўнай дзейнасьці» і своечасова пра іх інфармаваць сваё кіраўніцтва;

б) браць удзел у «апрацоўцы канкрэтных асобаў» і ў меру сваіх магчымасьцяў дапамагаць у выкрыцьці «злачыннай дзейнасьці ворагаў»;

в) спрыяць выкананьню іншых загадаў органаў Дзяржбясьпекі, зьвязаных з «аховай дзяржаўнай таямніцы і асабліва важных аб'ектаў у дзяржаве», і пры пошуку «антыдзяржаўных злачынцаў».

Інфарматараў апэратыўныя працаўнікі выкарыстоўвалі і для іншых «вузка спэцыяльных мэтаў», перадусім дзеля «прадухіленьня дывэрсійных актаў». Пры гэтым інфарматар павінен быў выкрываць і зьвяртаць увагу кіраўніцтва на «дывэрсійныя намеры ворага», сыгналізаваць пра «факты парушэньня вытворчых працэсаў, правілаў тэхнікі бясьпекі на вытворчасьці і інш., за якімі могуць хавацца дывэрсійныя і шкодніцкія дзеяньні. Антыдывэрсійныя інфарматары

вэрбуюцца на важных прамысловых аб'ектах (на вугальных шахтах і руднікаў, на чыгунцы, на зброевых заводах, электрастанцыях, вайсковых складах і г. д.), у месцах, дзе дывэрсіі маглі б мець значныя наступствы». Таксама спэцзаданьнямі лічыліся атрыманьне «асабістых зьвестак і характарыстык» розных асобаў і ахова дзяржаўнай мяжы. «Інфарматар своечасова перадае органу МУС зьвесткі пра ўсіх падазроных асобаў, якія зьяўляюцца ў памежнай зоне, і пра факты парушэньня мяжы».

У катэгорыю «агент» мог быць пераведзены толькі інфарматар, «які ў працэсе агентурна-апэратыўнай працы» атрымаў магчымасьць «пранікнуць у той ці іншы варожы асяродак ці весьці апрацоўку асобных антыдзяржаўных злачынцаў».

Тайныя супрацоўнікі тыпу «рэзыдэнт» вэрбаваліся, «галоўным чынам, з камуністаў ці беспартыйных, безумоўна адданых народна-дэмакратычнаму ладу, якія маюць здольнасьці і могуць кіраваць групай інфарматараў», а «часам» і зь ліку агентаў. Рэзыдэнты былі неабходныя Дзяржбясьпецы ў выпадках, калі апэратыўныя працаўнікі былі ў асабістым кантакце з «мноствам агентаў» і не маглі забясьпечыць іх «правільнага абслугоўваньня», а таксама тады, калі асабістае ўзаемадзеяньне апэратыўнага працаўніка з інфарматарамі і агентамі ўскладнялася спэцыфічнымі ўмовамі працы. Колькасьць інфарматараў, што знаходзіліся пад «апякунствам», залежала ад акалічнасьцяў, а таксама ад магчымасьцяў самога рэзыдэнта, аднак іх не павінна было быць «болей за пяць ці восем».

Дырэктыва ўвяла новую катэгорыю: зьнятыя кватэры – кватэры для спатканьняў. Ажно да гэтай пары Дзяржаўная бясьпека не карысталася зьнятымі кватэрамі, апэратыўныя працаўнікі прымалі агентуру на кансьпіратыўных кватэрах альбо ў грамадзкіх месцах. «Гаспадары гэтых кватэраў выбіраюцца зь ліку праверaных, шчырых і адданых народна-дэмакратычнаму ладу людзей, кватэры якіх павінны адпавядаць неабходным патрабаваньням для прыёму агентуры – малая колькасьць жыхароў, прыдатнае разьмяшчэньне, пад'езды, уваходы і выхады, – якія забясьпечваюць кансьпірацыю працы».

Нягледзячы на тое, што гаспадары гэтых кватэраў падпісвалі паперу пра нераскрыцьцё таямніцы пра асобаў, якія наведваюць іхныя дамы, апэратыўныя працаўнікі мусілі прымаць усе захады дзеля таго, каб гаспадар кансьпіратыўнай кватэры не пазнаёміўся з агентамі. «За кватэру ці пакой для спаткаьняў з агентурай гаспадар атрымлівае плату згодна з дамовай».

Для працы «з самай шчырай і надзейнай агентурай» прызначаліся кансьпіратыўныя кватэры, што былі маёмасьцю органаў МУС. «Для жыхароў яны маскаваліся пад канцылярыі ці пад прыватныя кватэры – людзі, якія ў іх жывуць, мусілі заслугоўваць надзвычайнага даверу, гэта маглі быць альбо адмыслова завэрбаваныя інфарматары, альбо засакрэчаныя апэратыўнікі». Пры выбары кансьпіратыўнай кватэры, якая павінна была знаходзіцца «ў горадзе, у вялікім жылым доме», найвялікшую ролю адыгрывала яе разьмяшчэньне з пункту гледжаньня забесьпячэньня кансьпірацыі. «На кансьпіратыўных кватэрах можна праводзіць адну-дзьве сустрэчы на дзень… У выпадку, калі сярод прыманай агентуры выявіцца здраднік, дзейнасьць кансьпіратыўнай кватэры неабходна імгненна спыніць».

Дырэктыва досыць слушна падкрэсьлівала, што «посьпехі ў працы агентуры» залежаць, у першую чаргу, ад таго, наколькі «правільна і мэтазгодна» апэратыўны працаўнік выкарыстоўвае «яе магчымасьці і здольнасьці». Абавязкам адпаведнага кіроўнага органу было клапаціцца пра павышэньне «выведных і контравыведных якасьцяў агентуры» і пра яе выхаваньне «ў духу адданасьці народна-дэмакратычнаму ладу». Наступным абавязкам была бесьперапынная праверка і кантроль працы «і паводзінаў» агентуры. «Гэтая праверка і кантроль ажыцьцяўляюцца пры асабістых кантактах з агентурай (на сустрэчах) і празь іншых агентаў, а таксама рознымі агентурна-апэратыўнымі сродкамі, а пры неабходнасьці і з выкарыстаньнем тэхнічных сродкаў». Дырэктыва зноў выказвалася наконт правакацый: «Апэратыўным працаўнікам катэгарычна забараняецца даваць агентам якія б ні было правакацыйныя заданьні. Апэратыўны працаўнік не павінен дапускаць правакацыйных паводзінаў з боку агента. Агент ня мае права быць ініцыятарам антыдзяржаўных дзеяньняў і, як

правіла, ня можа займаць кіроўнага месца ў апрацоўваным асяродку».

ДБ пры кіраваньні шырокай агентурнай сеткай набыла багаты досьвед. Яна ўсьведамляла тое, што агентура вэрбуецца ў асноўным з асяродзьдзя «варожых элемэнтаў», пад уплыў якіх «у працэсе сваёй працы» яна ўвесь час падпадала. Галоўны прынцып стасункаў між ДБ або канкрэтным кіроўным органам і тайным супрацоўнікам палягаў у неабходнасьці паралізацыі «варожага ўзьдзеяньня на агентуру».

«Выхаваўчая работа» з агентам мусіла мець «сыстэматычны, канкрэтны і дыфэрэнцыяваны характар, які вынікае з асабістых якасьцяў агента, яго мінулага, службовага становішча і навыкаў». Службоўцы ДБ мусілі выхоўваць агентуру «ў духу:

а) адданасьці народна-дэмакратычнаму ладу і палітычнай пільнасьці;

б) разьвіцьця і ўдасканальваньня іх выведных і контравыведных якасьцяў і кансьпірацыі ў працы;

в) сумленнасьці і адданасьці ў працы з органамі МУС, дысцыпліны і дакладнасьці ў выкананьні заданьняў...

Мэтады выхаваньня агентуры наступныя.

а) Патрабаваньне своечасовага і дакладнага выкананьня ўсіх пастаўленых заданьняў. Гэтае патрабаваньне павінна выказвацца тактоўна ў дачыненьні да агентуры, не павінна ўтрымліваць элемэнтаў грубасьці і фармалізму.

б) На гутарках з агентурай апэратыўны працаўнік павінен цікавіцца яе палітычнымі поглядамі і настроямі і на канкрэтных прыкладах даводзіць перавагі народна-дэмакратычнага ладу перад капіталістычным.

в) Апэратыўны працаўнік павінен спрытна прывязаць да сябе агентуру ня толькі тым, што запатрабуе выкананьня заданьняў, але і тым, што праявіць клопат пра яе асабістае жыцьцё.

г) Павышаць кваліфікацыю агентуры шляхам аналізу яе

паводзінаў у тым ці іншым асяродзьдзі, разбору памылак і дапамогі пры іх выпраўленьні».

Камандаваньне ДБ заяўляла, што апэратыўны працаўнік сваімі паводзінамі павінен стаць для агента «аўтарытэтам». Было забаронена «наладжваць з агентамі фамільярныя адносіны, ладзіць сумесныя папойкі, прымаць ад іх якія б там ні было падарункі і карыстацца іх паслугамі». Недапушчальным было таксама прыводзіць агента да сябе дадому і «такім чынам падтрымліваць знаёмства» зь ягонай сям'ёй. Агентуры нельга было даваць абяцаньняў, якія «ня могуць быць выкананыя».

«Сустрэчы з агентурай апэратыўны працаўнік ладзіць у залежнасьці ад важнасьці і характару заданьняў, але не радзей за два-тры разы на месяц. На сустрэчы апэратыўны працаўнік павінен патрабаваць ад агента дакладу аб выкананьні папярэдніх заданьняў, даваць яму новыя заданьні і падрабязныя інструкцыі дзеля іх выкананьня, выслухоўваць прапановы агента ў гэтым пытаньні і вызначаць тэрмін выкананьня».

Адзін з разьдзелаў дырэктывы меў назву «Перарываньне сувязі з агентурай». «З агентурнай сеткі неабходна выключыць:

а) двайных агентаў (дублёраў);

б) супрацоўнікаў, якія скампрамэтавалі сябе правакацыйнамі паводзінамі;

в) проста няздольных супрацоўнікаў;

г) тых супрацоўнікаў, якія ня могуць выконваць заданьняў органаў МУС з прычыны доўгай цяжкай хваробы;

д) супрацоўнікаў, якія катэгарычна адмаўляюцца ад далейшага супрацоўніцтва».

Апэратыўны працаўнік пра перарываньне сувязі з агентам павінен быў напісаць падрабязны рапарт. У некаторых выпадках вышэйшы начальнік праводзіў «праверачную сустрэчу», каб пераканацца ў «спыненьні супрацоўніцтва». У

апошняй інстанцыі са спыненьнем сувязі з агентам мусілі пагадзіцца тыя камандзіры, якія **прымалі рашэньне пра яго вэрбоўку**. «Агент, зь якім перапыняецца кантакт, падпісвае прысягу пра захаваньне таямніцы. У выключных выпадках, калі нямэтазгодна паведамляць агентурнаму супрацоўніку аб спыненьні супрацоўніцтва, прысяга пра захаваньне таямніцы не патрабуецца».

У ходзе агентурна-апэратыўнай працы ДБ узнавіла кантакт з цэлым шэрагам ужо «выключаных» агентаў. Пасьля пад'ёму ўсіх матэрыялаў «на агента» з апэратыўнага архіву і іх вывучэньня кіроўны орган пісаў «абгрунтаваную прапанову» для аднаўленьня супрацоўніцтва з «гэтым выключаным агентам».

ШАСЬЦІДЗЯСЯТЫЯ ГАДЫ

На пачатку шасьцідзясятых гадоў Дзяржбясьпека нарэшце правяла аналіз сваіх працоўных мэтадаў, якімі дагэтуль карысталася, і на аснове гэтага разбору Міністэрства ўнутраных справаў прыняло новыя правілы агентурна-апэратыўнай працы. У падкрэсьлена ідэалягічным уступе да «Дырэктывы па агентурна-апэратыўнай працы Дзяржаўнай бясьпекі», якую ў сярэдзіне траўня 1962 году выдаў міністар унутраных справаў Любамір Штроўгал, акрамя абвяшчэньня пра пераход да разьвіцьця сацыялізму ў Чэхаславакіі пад кіраўніцтвам КПЧ вярхушка ДБ імкнулася абмаляваць зьмяшчэньне прыярытэтаў у працы Дзяржбясьпекі, што было рэакцыяй на зьмены палітычнай рэальнасьці за мяжой і посьпехі заходніх інфарматарскіх службаў. «Чэхаславацкая сацыялістычная рэспубліка разам з ГДР утвараюць заходнюю мяжу сацыялістычнага лягеру, што ставіць нас на перадавую лінію барацьбы... Варожыя выведкі выкарыстоўваюць для шпіянажу і падрыўной дзейнасьці супраць нас замежных грамадзянаў, якія прыехалі да нас, атрымаўшы візу, і іншыя варожыя клясавыя элемэнты. Таму галоўныя высілкі Дзяржаўнай бясьпекі скіраваныя супраць імпэрыялістычных выведак, асабліва амэрыканскай, заходненямецкай, ангельскай і французскай». Акрамя таго, ДБ павінна «ўсё болей і болей умела і эфэктыўна змагацца супраць усіх клясавых ворагаў і

непапраўных асацыяльных элемэнтаў, якія вядуць антыдзяржаўную дзейнасьць». Дырэктыва найвышэйшага ўзроўню сакрэтнасьці – зусім сакрэтна асаблівай важнасьці – агаворвала залежнасьць тайнай паліцыі ад КПЧ: «Дзяржаўная бясьпека працуе пад кіраўніцтвам партыі і сыстэматычна кантралюецца партыяй. Усе заданьні Дзяржаўнай бясьпекі неабходна разумець пасьлядоўна ў духу палітычнай лініі партыі. На кожным працоўным месцы неабходна імкнуцца да поўнага і глыбокага ажыцьцяўленьня галоўнай мэты партыі і ленінскіх нормаў партыйнага жыцьця». Цалкам абсурдна гучыць наступная фраза: «Моц Дзяржаўнай бясьпекі палягае ў цеснай сувязі з народам, у верным служэньні народу пры ахове сацыялістычнага ладу». «Перавага» камуністычнага лягеру і «посьпехі сацыялістычнага ладу» нібыта стварылі сытуацыю, якая дала магчымасьць ДБ «прыцягваць шырэйшае кола асобаў», якія жадаюць «добраахвотна ўдзельнічаць у ахове бясьпекі нашай краіны».Чэхаславацкія рабочыя нават нібыта «ў дапамозе службе бясьпекі» бачылі «адну з формаў удзелу ў кіраваньні дзяржавай». Камандаваньне ДБ патрабавала ад сваіх падразьдзяленьняў гнуткай і своечасовай рэакцыі на «ўсе праявы, асабліва на новыя вычварныя мэтады варожай дзейнасьці», і сыстэматычнага павышэньня якасьці працы. «Дзейнасьць Дзяржаўнай бясьпекі павінна насіць наступальны характар… У агентурна-апэратыўную дзейнасьць неабходна ўводзіць навуковыя працоўныя мэтады, якія базуюцца на пасьлядоўнай аналітычнай працы і канцэптуальнай зразумеласьці заданьняў, з дапамогай якіх можна будзе ўдасканаліць рэпрэсіўную і прафіляктычна-выхаваўчую дзейнасьць, павысіць арганізатарскую і кіроўную ролю камандзіраў, дасягнуць таго, каб праца вялася мэтазгодна ў поўнай адпаведнасьці з вымогамі партыі».

Ня менш цікавыя былі і патрабаваньні кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных справаў, што тычыліся асобных членаў палітычнай паліцыі: «Працаўнікі дзяржаўнай бясьпекі павінны разумець сучасную вонкавапалітычную сытуацыю, заканамернасьці і задачы пабудовы нашай сацыялістычнай супольнасьці. Яны павінныя быць усебакова адукаваныя, прынцыповыя, сумленныя, сьціплыя, маральна ўстойлівыя і мець цьвёрды характар. Супраць ворагаў сацыялістычнага ладу яны павінны

дзейнічаць пасьлядоўна і бескампрамісна. Працаўнікі Дзяржаўнай бясьпекі мусяць заўсёды памятаць, што яны прадстаўнікі сацыялістычнай дзяржавы, сацыялістычнай бясьпекі». Прыведзеная дырэктыва мела быць ня проста мэтадычнай інструкцыяй у агентурна-апэратыўнай працы Дзяржаўнай бясьпекі, але, у першую чаргу, «інструкцыяй для творчага выкарыстаньня палітычнай лініі партыі» ў жыцьці і працы яе членаў.

Вызначэньне тайных супрацоўнікаў як галоўнага сродку «пры выкананьні апэратыўных заданьняў», аднак, разам са зьменай прыярытэтаў ДБ выразна пасунулася. Супрацоўнікі сталі «важнымі памочнікамі… у барацьбе супраць замежных выведак, іх унутраных паслугачоў і асацыяльных элемэнтаў… Апэратыўныя працаўнікі выкарыстоўвалі тайных супрацоўнікаў для пошуку, апрацоўкі, дакумэнтаваньня, выкрыцьця і своечасовага абясшкоджваньня антыдзяржаўных злачынцаў, а таксама для папярэджваньня такой дзейнасьці з дапамогай прафіляктычных захадаў».

І надалей ДБ дыфэрэнцыявала тайных супрацоўнікаў на наступныя групы: а) агенты; б) інфарматары; в) рэзыдэнты; г) гаспадары кансьпіратыўных ці зьнятых кватэраў.

Тайны супрацоўнік катэгорыі **«агент»** (A, TS-A) вэрбаваўся «найперш дзеля працы з канкрэтнымі выпадкамі», ён павінен быў валодаць магчымасьцямі і здольнасьцямі для «выкананьня наступных задачаў, што стаялі перад Дзяржбясьпекай:

а) адшукваць, актыўна апрацоўваць і выкрываць кадравых выведнікаў, сыгналы аб дзейнасьці варожых выведак і іх агентуры, выведваць намеры, формы і мэтады іх працы;

б) пранікаць у палітычныя, эканамічныя, навукова-тэхнічныя, выведныя і іншыя органы і асяродкі ў капіталістычных дзяржавах і ў арганізацыі эмігрантаў-уцекачоў;

в) выведваць і выкрываць факты пранікненьня агентуры варожых выведак на важныя гаспадарчыя, вайсковыя і іншыя аб’екты на тэрыторыі ЧССР і перашкаджаць уцечцы сакрэтных зьвестак з гэтых аб’ектаў;

г) апрацоўваць варожых асобаў, якія праводзяць падрыўную дзейнасьць супраць нашай дзяржавы ці супраць іншых сацыялістычных краінаў;

д) выконваць канкрэтныя заданьні пры выкарыстаньні апэратыўнай тэхнікі, правядзеньні падрыўной дзейнасьці ў варожым асяродку, пошуку зьніклых асобаў і іншых апэратыўных заданьняў».

Апэратыўныя працаўнікі вэрбавалі агентаў «перадусім на добраахвотнай, асабліва на патрыятычнай аснове, пераважна з шэрагу шчырых і палітычна сьвядомых грамадзянаў», якія выказвалі «зацікаўленасьць» у дапамозе ДБ. Кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных справаў ізноў падкрэсьліла думку пра тое, што тайныя супрацоўнікі, завэрбаваныя «на аснове патрыятычных перакананьняў і сацыялістычнай сьвядомасьці», – самыя надзейныя агенты. Апэратыўныя органы ДБ павінны былі весьці іх такім чынам, каб у агентаў была магчымасьць «параўноўваць факты і ўмець адрозьніваць памылкі і няправільныя паводзіны несьвядомых грамадзянаў ад злачыннай дзейнасьці варожых асобаў». Дырэктыва патрабавала ад супрацоўнікаў дысцыплінаванасьці, здольнасьці «наладжваць кантакты з аб'ектамі зацікаўленасьці» ДБ, «уваходзіць у давер і ўмець выкрываць іх злачынную дзейнасьць». У неапошнюю чаргу яны таксама мусілі ўмець «захоўваць канспірацыю», поўную сакрэтнасьць працы ў ДБ.

Выключна сур'ёзным і, можна лічыць, самым важным пытаньнем быў выбар асобы, прыдатнай для выкананьня абавязкаў тайнага супрацоўніка ДБ, улічваючы і працэс яго прыцягненьня да супрацоўніцтва. Апэратыўны працаўнік найперш выбіраў «прыдатнага» кандыдата, пасьля выносіў камандзіру адпаведнага апэратыўнага падразьдзяленьня прапанову аб «правядзеньні асабістай сустрэчы з кандыдатам з мэтай ягонага перакананьня ў мэтазгоднасьці супрацоўніцтва». Пасьля «ўсталяваньня» кантакту з кандыдатам апэратыўны працаўнік зьбіраў дасье на выбранага кандыдата ў апэратыўнай картатэцы. Падчас падрыхтоўкі кандыдата да супрацоўніцтва службоўца ДБ «несупынна» яго правяраў і зьбіраў на яго «праверачны матэрыял». А калі пераконваўся «падчас

знаёмства, што кандыдат валодае неабходнымі перадумовамі», то пераходзіў да схіленьня кандыдата да супрацоўніцтва на аснове прапановы, зацьверджанай кіраўніком адміністрацыі ці яго намесьнікам. «Калі ж было відавочна, што кандыдат не валодае неабходнымі перадумовамі, сувязь зь ім перарывалася, запіс у картатэцы скасоўваўся, а праверачныя матэрыялы, якія ня ўтрымлівалі ніякіх падазроных зьвестак, зьнішчаліся». Ва ўсякім разе, працягласьць этапу знаёмства не павінна была перавышаць шэсьць месяцаў.

Дырэктыва дапускала вэрбоўку агента «на падставе дзейнасьці», якая яго кампрамэтуе. «Кампрамэтоўная дзейнасьць можа вынікаць з дробнай злачыннай дзейнасьці альбо з парушэньня прынцыпаў сацыялістычнага супольнага жыцьця, з парушэньня яго працоўных абавязкаў і да т. п.». Зьвесткі, на падставе якіх агент быў завэрбаваны, павінны былі «як сьлед» правярацца і мець пад сабой «дакумэнтальную» базу. «Апэратыўны працаўнік выкарыстае толькі тыя кампрамэтоўныя матэрыялы, якія хутчэй за ўсё паўплываюць на рашэньне кандыдата». Вэрбоўка супрацоўнікаў праводзілася выключна «ў асяродзьдзі», якое гарантавала «як кансьпірацыю, так і бесьперашкодны ход дамоваў». Дасьведчаны апэратыўны працаўнік, у некаторых выпадках нават у адсутнасьць камандзіра падразьдзяленьня ці аддзелу, пры «размове» павінен быў трымацца тактоўна, не дапускаючы раскрыцьця крыніцы, зь якой была атрыманая кампрамэтоўная інфармацыя. «Апэратыўны супрацоўнік павінен быў паўплываць на агента, завэрбаванага на падставе кампрамату, каб той больш не праводзіў гэтае дзейнасьці. Павінен быў сыстэматычна весьці агента, каб выхаваць зь яго прыстойнага чалавека».

Ухваленьне вэрбоўкі кандыдата было складанай працэдурай. Апэратыўны працаўнік ня мог дзейнічаць, ня маючы на руках пісьмовай прапановы, якая мусіла быць папярэдне ўхваленая кіраўніком адміністрацыі ці яго намесьнікам, радзей усімі вышэйшымі начальнікамі, пачынаючы ад камандзіра аддзяленьня і заканчваючы ўказаным намэнклятурным узроўнем. Будучы кіроўны орган у прапанове павінен быў прывесьці асноўныя зьвесткі, якія характарызуюць кандыдата, а

таксама вынікі праверкі падчас падрыхтоўкі да супрацоўніцтва, мэту вэрбоўкі, прыдатнасьць, месца, час і плян «размовы» з кандыдатам і, канечне ж, указаньне таго, хто будзе вэрбоўку праводзіць.

У выпадку згоды кандыдата да супрацоўніцтва службоўца ДБ праводзіў яго падрабязны інструктаж. «Ён мусіў растлумачыць агенту значэньне і мэту супрацоўніцтва, асабліва падкрэсьліваючы абавязак захоўваць прынцыпы кансьпірацыі, а таксама разабраць зь ім найбліжэйшыя канкрэтныя заданьні і спосаб іх выкананьня. Адначасова неабходна было абгаварыць прынцыпы ўзаемнай сувязі і наладжваньня кантактаў».

Кандыдаты павінны былі «ў абавязковым парадку» падпісаць пісьмовую прысягу аб супрацоўніцтве. Гэта не патрабавалася толькі тады, калі падпісаньне магло «паставіць пад пагрозу добрае стаўленьне кандыдата да супрацоўніцтва». У гэтым разе дастаткова было вуснай згоды. «Агент, як правіла, сам абірае сабе падпольную мянушку. Калі ж ён адмовіўся гэтак зрабіць, апэратыўны працаўнік не павінен настойваць. У гэтым разе агент не падпісвае пісьмовых данясеньняў, а апэратыўны працаўнік заводзіць асабістую справу пад псэўданімам, які вызначае сам». Аб ходзе «размовы», пры якой адбылася вэрбоўка агента, апэратыўны працаўнік, канечне ж, павінен падаць пісьмовы рапарт вышэйшаму камандзіру. Пасьля згоды функцыянэра, які прапанову на вэрбоўку тайнага супрацоўніка ўхваліў, кіроўны орган рэгіструе агента ў апэратыўнай картатэцы. «Надзвычай здольныя і адданыя сацыялістычнаму ладу агенты, якія цягам супрацоўніцтва добра сябе праявілі, набылі досьвед і адпавядаюць абавязковым патрабаваньням, могуць выкарыстоўвацца ў якасьці рэзыдэнтаў».

Грамадзянаў замежных дзяржаваў часьці контравыведкі ДБ вэрбавалі для супрацоўніцтва на наступных падставах:

«а) сваяцкія, асабістыя ці сяброўскія дачыненьні з нашымі грамадзянамі, у выпадку іх прагрэсіўнага стаўленьня і сымпатыі да нашага сацыялістычнага ладу;

б) праверaная кампрамэтоўная дзейнасьць;

в) матэрыяльная зацікаўленасьць;

г) выгадная камбінацыя ўмоваў», пералічаных у папярэдніх пунктах.

Апэратыўны працаўнік выбіраў і прымаў такія «падрыхтоўчыя захады», якія павінны былі «паступова» ўплываць на замежніка. Іх вэрбоўка праходзіла на тэрыторыі ЧССР у прысутнасьці кіраўнікоў апэратыўнай адміністрацыі ці іх намесьнікаў. У выключных выпадках рэалізацыі акцыі за мяжой «спосаб вэрбоўкі агента» павінен быў распрацоўвацца «надзвычай акуратна, з улікам мясцовай спэцыфікі». У абодвух выпадках вэрбоўку замежных грамадзянаў ухваляў міністар унутраных справаў або ягоны намесьнік. Пісьмовая прысяга аб супрацоўніцтве ад замежнікаў, «як правіла», не патрабавалася.

Тайны супрацоўнік катэгорыі **«інфарматар»** (I, TS-I) вэрбаваўся «на добраахвотнай, найлепей на патрыятычнай аснове». Ад агента ён адрозьніваўся тым, што, «як правіла», вэрбаваўся для працы з канкрэтным выпадкам, але найперш [для працы] на важных аб'ектах, у месцах канцэнтрацыі варожых элемэнтаў, у памежнай зоне» і да т. п. «Інфарматары выбіраюцца з шэрагу грамадзянаў, якія маюць шырокія кантакты зь людзьмі на працоўным месцы альбо па месцы жыхарства і карыстаюцца іх даверам, дысцыплінаваныя, сур'ёзныя і здольныя пры супрацоўніцтве зь Дзяржаўнай бясьпекай пасьлядоўна выконваць прынцыпы кансьпірацыі».

Яны павінны былі выконваць «перадусім» наступныя «заданьні дзяржаўнай бясьпекі:

а) здабываць зьвесткі пра прыхаваныя праявы варожай дзейнасьці, выкрываць асобаў, якія былі ініцыятарамі гэтых праяваў, зьбіраць зьвесткі пра варожыя замыслы і дзейнасьць асобаў, якія адмоўна настроеныя ў дачыненьні да сацыялістычнага ладу;

б) даведвацца пра падазроныя сувязі замежных візавых гасьцей, дапамагаць пры ахове нашай эканомікі, дзяржаўнай мяжы, усіх транспартных сродкаў, рабіць экспэртныя заключэньні тэхнічнага, навуковага, мастацкага ці іншага характару;

в) выконваць частковыя заданьні пры выкарыстаньні апэратыўных сродкаў, здабываць інфармацыю для апэратыўных патрэбаў;

г) згодна з указаньнямі апэратыўнага працаўніка прымаць прафіляктычныя захады выхаваўчага характару з мэтай своечасовага папярэджаньня і абясшкоджваньня варожых намераў, гаспадарчых шкодаў і распаўсюджваньня адмоўнага ўплыву варожых элемэнтаў».

Наладжваньне «папярэдняга кантакту» апэратыўнага працаўніка з кандыдатам праходзіла падобным чынам, як і ў кандыдата-агента, з адзіным адрозьненьнем: «працягласьць знаёмства» ў кандыдата ў інфарматары не магла быць большай за тры месяцы. Прапанову на «асабісты кантакт» з кандыдатам, да таго ж, ухваляў толькі камандзір падразьдзяленьня, а вэрбоўную прапанову толькі начальнік аддзелу. Калі інфарматар адпавядаў «умовам, неабходным для працы з канкрэтным выпадкам», ён мог быць пераведзены ў катэгорыю «агент».

Тайным супрацоўнікам катэгорыі **«рэзыдэнт»** (R, TS-R) быў палітычна сьпелы, абсалютна надзейны і жыцьцёва дасьведчаны супрацоўнік ДБ, якога дырэктыва вызначала як галоўнага памочніка апэратыўнага працаўніка, што мела на ўвазе магчымасьць выкананьня пад наглядам кіроўнага органу «перадусім наступных заданьняў:

а) абслугоўваць і кіраваць працай тых тайных супрацоўнікаў, якія былі перададзены ў ягонае распараджэньне апэратыўным працаўніком;

б) прымаць ад гэтых тайных супрацоўнікаў пісьмовыя ці вусныя данясеньні і перадаваць іх апэратыўнаму працаўніку;

в) выхоўваць даверaных яму тайных супрацоўнікаў».

Рэзыдэнтуры, агентурныя міні-сеткі, якімі кіравалі выключна рэзыдэнты, а ня кадравыя службоўцы, будаваліся адпаведнымі апэратыўнымі ўтварэньнямі ДБ, «асабліва на значных аб'ектах і там, дзе былі «ўскладненыя ўмовы» для рэгулярнага і

непасрэднага абслугоўваньня тайных супрацоўнікаў», ці калі была якая іншая «пагроза іх выкрыцьця», або таго патрабавалі іншыя спэцыфічныя ўмовы працы».

Рэзыдэнтамі маглі стаць толькі выбраныя асобы, напрыклад, былыя працаўнікі Міністэрства ўнутраных справаў, якія на дадзены момант працуюць на цывільных працоўных месцах. «Рэзыдэнтам таксама можа стаць праверaны дасьведчаны агент ці інфарматар, які валодае задаткамі, дастатковымі для даручэньня яму складанай працы рэзыдэнта».

Пісьмовую прапанову для вэрбоўкі рэзыдэнта (ці пераводу на гэтую функцыю агента альбо інфарматара) рыхтаваў апэратыўны працаўнік, які праз сваё начальства перадаваў яе для ўхваленьня начальніку адміністрацыі. Начальнік адміністрацыі, з улікам апэратыўнай сытуацыі, магчымасьцяў і здольнасьцяў агента, вырашаў таксама, колькі тайных супрацоўнікаў рэзыдэнт будзе абслугоўваць. «Пры перадачы тайных сурацоўнікаў у распараджэньне рэзыдэнта апэратыўны працаўнік павінен зьвярнуць асаблівую ўвагу на характар іх узаемаадносінаў, як працоўных, так і асабістых. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на тое, каб паміж імі не было блізкага сваяцтва альбо каб рэзыдэнт ня быў непасрэдным падначаленым даверанага яму тайнага супрацоўніка». Апэратыўны працаўнік павінен быў перадаваць рэзыдэнту тайных супрацоўнікаў паступова і заўсёды асабіста. Пры гэтым ён заўсёды падрабязна агаворваў з рэзыдэнтам «пытаньні сувязі, спосабу абслугоўваньня, арганізацыі сустрэчаў і перадачы зьвестак». Узровень кансьпірацыі ў рэзыдэнта быў параўнальны з кансьпірацыяй апэратыўнага працаўніка; ягоная праца праходзіла «пад непасрэднай апекай і кантролем» з боку кіроўнага органу.

Сустрэчы «з абсалютна надзейнымі і абазнанымі ў справе інфармаваньня» тайнымі супрацоўнікамі службоўцы ДБ ладзілі на **кансьпіратыўных** і **зьнятых кватэрах**. З астатнімі супрацоўнікамі кіроўныя органы сустракаліся «ў іншых вызначаных памяшканьнях або месцах», прыдатных «для захоўваньня кансьпірацыі». Было забаронена ладзіць сустрэчы з тайнымі супрацоўнікамі ці вэрбаваць іх у аб’ектах, якія

належалі Камуністычнай партыі, а таксама іншым палітычным суб'ектам Нацыянальнага фронту, і нават нацыянальным камітэтам.

Канспіратыўная кватэра ўяўляла сабой «самастойны аб'ект, самастойную кватэру ці іншае самастойнае памяшканьне», тайна зьнятае апэратыўнай службай для сустрэчаў з супрацоўнікамі. Афіцыйна яна лічылася прыватнай кватэрай, канцылярыяй ці працоўным памяшканьнем дзяржаўнага, каапэратыўнага ці камунальнага прадпрыемства і да т. п. «Канспіратыўная кватэра павінна знаходзіцца пад афіцыйным прыкрыцьцём тайнага супрацоўніка ці апэратыўнага працаўніка, які для гэтай мэты карыстаецца спэцыяльным сакрэтным пасьведчаньнем».

Самым распаўсюджаным тыпам кватэраў для правядзеньня сустрэчаў былі так званыя **зьнятыя кватэры** ці іншыя памяшканьні, уласьнікамі (утрымальнікамі) якіх былі палітычна надзейныя асобы, якія гарантавалі «захаваньне таямніцы зацікаўленасьці» тайнай паліцыі. Фармаваньні ДБ выбіралі і здымалі такія кватэры для апэратыўных мэтаў «на пэўныя гадзіны ці на пэўны пэрыяд» на падставе дамовы з гаспадарамі кватэры. Абавязкам службоўца ДБ, які адказваў за зьнятую кватэру, было раз на тры месяцы правяраць «дзейснасьць легенды», пад прыкрыцьцём якой тайныя супрацоўнікі кватэру наведвалі. Ён таксама нес адказнасьць за захаваньне таямніцы яе сапраўднага выкарыстаньня ад **гаспадара зьнятай кватэры**. «Апэратыўны працаўнік павінен весьці дакладную часавую рэгістрацыю ўсіх наведваньняў канспіратыўнай ці зьнятай кватэры, не выключаючы яе наведваньня іншымі апэратыўнымі працаўнікамі і начальнікамі. Начальнікі павінныя дбаць пра тое, каб у гэтыя кватэры прыходзіла абмежаваная колькасьць тайных супрацоўнікаў і ў іх ня ладзілася больш за дзьве-тры сустрэчы на дзень».

Дырэктыва прынцыпова разрозьнівала тайных супрацоўнікаў і даверaных асобаў, праца зь якімі нібыта была «наступнай формай сувязі Дзяржаўнай бясьпекі з народам». **Даверанай асобай** ДБ мог стаць толькі «палітычна сьпелы грамадзянін,

цалкам адданы сацыялістычнаму ладу», які меў «магчымасьць, здольнасьць і жаданьне даваць апэратыўным працаўнікам асобныя зьвесткі інфармацыйнага характару» з асяродку, якім цікавілася ДБ. Апэратыўныя працаўнікі наладжвалі «кантакт» з такімі даверанымі асобамі, якія маглі дапамагчы «галоўным чынам у наступным:

а) даваць асабістыя тлумачэньні і меркаваньні аб прычынах парушэньня вытворчых і тэхналягічных працэсаў і іншых нэгатыўных зьявах на заводах, прадпрыемствах, у калгасах і іншых установах;

б) паведамляць пра настроі і тэндэнцыі, якія пашыраюцца сярод працаўнікоў варожымі асобамі, замежнікамі і г. д.;

в) дапаўняць зьвесткі пра праверaных асобаў;

г) выконваць іншыя заданьні ў інтарэсах апэратыўнай службы Дзяржаўнай бясьпекі».

Даверaныя асобы, аднак, не маглі замяніць іншых тайных супрацоўнікаў; ім нельга было нават даваць заданьняў, як іншым тайным супрацоўнікам. Пры кантакце зь імі службовец ДБ павінен быў прытрымлівацца «іншага парадку», чым пры кантакце з тайнымі супрацоўнікамі. «Даверанымі асобамі ня могуць лічыцца сваякі ці сябры апэратыўнага працаўніка, а таксама выпадковыя знаёмыя».

І спосаб іх вэрбоўкі быў іншы. Пасьля падбору прыдатнай асобы, якая мела «задаткі для дапамогі» ДБ у якасьці даверанай асобы, апэратыўны працаўнік пераконваўся ў тым, што яна «вартая даверу» і атрымліваў згоду камандзіра падразьдзяленьня. Толькі пасьля гэтага ён сустракаўся «пры зручнай нагодзе» з гэтай асобай і зьвяртаўся да яе з пытаньнем, ці не згадзілася б яна «час ад часу падтрымліваць кантакт і падаваць некаторыя асабовыя зьвесткі, прыватныя тлумачэньні і іншае». У выпадку згоды ён тлумачыў, пра якога кшталту дапамогу ідзе гаворка і адначасова дамаўляўся пра спосаб узаемасувязі.

«Кантакты з даверанай асобай апэратыўны працаўнік ладзіць

нерэгулярна, толькі калі зьяўляецца неабходнасьць. Даверануюасобу нельга прымаць на кансьпіратыўнай ці зьнятай кватэры. Самым прыдатным месцам для сустрэчаў з даверанай асобай ёсьць грамадзкае памяшканьне ці месца працы даверанай асобы. Калі таго патрабуе характар справы, кантакт апэратыўнага працаўніка з даверанай асобай утойваецца ад грамадзкасьці. Каб гэтыя сустрэчы ня кідаліся ў вочы, яны прыкрываюцца наладжваньнем кантактаў апэратыўнага працаўніка зь іншымі грамадзянамі з атачэньня даверанай асобы, з тымі, хто разам зь ёй працуе ці жыве. Але асабліва неабходна ўтойваць зьмест размовы апэратыўнага працаўніка з даверанай асобай».

І пры значна больш адвольнай форме супрацоўніцтва службоўцы ДБ пры выкарыстаньні атрыманай інфармацыі павінны былі дбаць пра тое, каб імя даверанай асобы, якая гэтыя зьвесткі перадала, заставалася ў сакрэце. У выпадку, калі апэратыўны працаўнік інфармацыю, атрыманую ад даверанай асобы, зьбіраўся скарыстаць «публічна», ён мусіў спытацца згоды даверанай асобы. Даверaная асоба не павінна была рабіць «пісьмовых данясеньняў», толькі ў выпадку, калі яна сама выказала ахвоту, «паведамленьні» маглі прымацца ў пісьмовай форме. Службоўцы ДБ, «як правіла», не адкрывалі перад даверанымі асобамі «мэтадаў і формаў» апэратыўнай працы. «На даверaных асобаў складаўся толькі сьпіс у камандзіра падразьдзяленьня. Даверануюасобу, якая добра сябе зарэкамэндавала, мае магчымасьць і здольнасьці для таго, каб стаць тайным супрацоўнікам, апэратыўны працаўнік можа завэрбаваць як тайнага супрацоўніка».

Дырэктыва іншымі словамі паўтарала досьвед, атрыманы ўжо колькі гадоў таму: «Вынікі працы з тайнымі супрацоўнікамі залежаць ня толькі ад правільнасьці іх выбару, але і ад таго, якое яны маюць кіраваньне і выхаваньне». За «кіраваньне і выхаваньне» тайных супрацоўнікаў адказваў канкрэтны апэратыўны працаўнік, які з дапамогай сваіх начальнікаў павінен быў засвоіць «мастацтва адпаведным чынам і ў поўнай ступені выкарыстоўваць магчымасьці і здольнасьці» сваіх тайных супрацоўнікаў.

Кіроўны орган павінен быў мэтанакіравана рыхтаваць канкрэтныя заданьні для супрацоўнікаў, якія ён ставіў такім чынам, «каб яны адпавядалі апэратыўнай сытуацыі», магчымасьцям і здольнасьцям тайных супрацоўнікаў. З аднаго боку, кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных справаў патрабавала: «Тайных супрацоўнікаў неабходна вучыць дзейнічаць самастойна і ініцыятыўна». З другога боку, гэта не павінна было пераступіць пэўнай мяжы: «Апэратыўнаму працаўніку забараняецца даваць тайным супрацоўнікам заданьні, якія могуць прывесьці да правакацыі. Ён павінен строга сачыць за тым, каб тайны супрацоўнік не дапускаў ніякіх правакацыйных паводзінаў і сам не зрабіўся ініцыятарам злачыннай дзейнасьці ці парушэньня прынцыпаў сацыялістычнага супольнага жыцьця». Пэрыядычнасьць сустрэчаў залежала ад «характару заданьняў», пастаўленых кіроўным органам перад тайным супрацоўнікам. Нягледзячы на гэта, мінімальная колькасьць сустрэчаў у параўнаньні з папярэдняй дырэктывай была зьніжаная: «Лепш за ўсё праводзіць рэгулярныя сустрэчы з канкрэтнай мэтай – мінімальна адзін раз на месяц».

Так званая выхаваўчая праца і надалей заставалася адной з галоўных формаў узьдзеяньня на тайных супрацоўнікаў. Кіроўны орган вёў яе «сыстэматычна і індывідуальна», яна павінна была быць «канкрэтнай». «Яна мусіць вынікаць з асабістых якасьцяў тайнага супрацоўніка, яго мінулага, грамадзкай пазыцыі, а таксама з досьведу, атрыманага падчас супрацоўніцтва са службай Дзяржбясьпекі». Дырэктыва патрабавала «правільнага выхаваньня» тайных супрацоўнікаў, маючы на ўвазе «высокі маральны ўзровень» службоўцаў ДБ, у тым ліку палітычны і прафэсійны ўзровень іх працы.

Таксама заслугоўвае ўвагі чарговасьць асобных галінаў так званага выхаваўчага ўзьдзеяньня на супрацоўнікаў. Невыпадкова першы пункт утрымлівае палітычную індактрынацыю, другі – патрабуе дзейнічаць у рамках «сацыялістычнай законнасьці», толькі пасьля гэтага ідзе ўдасканальваньне прафэсійных навыкаў агента, а на апошнім месцы знаходзяцца маральна-валявыя якасьці. Выхаваўчую работу службоўцы ДБ павінны былі «праводзіць у першую чаргу:

а) у духу адданасьці тайнага супрацоўніка сацыялістычнаму ладу;

б) дзеля павышэньня іх палітычнай пільнасьці і захаваньня сацыялістычнай законнасьці;

в) дзеля разьвіцьця і ўдасканальваньня іх выведных і контравыведных якасьцяў і паглыбленьня кансьпірацыі працы;

г) дзеля разьвіцьця такіх якасьцяў, як праўдзівасьць, шчырасьць, сур'ёзнасьць, пільнасьць, маральная непахіснасьць і дысцыплінаванасьць».

Канкрэтнымі «праверанымі мэтадамі выхаваньня» тайных супрацоўнікаў былі перадусім наступныя.

«а) Тлумачэньне палітычных пытаньняў. Пры сустрэчах апэратыўны працаўнік павінен цікавіцца палітычнымі поглядамі тайных супрацоўнікаў і на ўсе іх пытаньні цярпліва і зь веданьнем справы адказваць. Асаблівую ўвагу неабходна надаць тым, хто апрацоўвае замежных грамадзянаў і тых, хто быў завэрбаваны на падставе кампрамэтоўнай дзейнасьці. Пры гэтым неабходна імкнуцца, каб уплыў апэратыўнага працаўніка быў мацнейшы за ўплыў варожага асяродку.

б) Патрабаваньне своечасовага і дакладнага выкананьня атрыманых заданьняў. Гэты прынцып неабходна выконваць настойліва, але тактоўна. Апэратыўны працаўнік пры кіраваньні тайнымі супрацоўнікамі павінен пазьбягаць павярхоўнасьці і фармальнасьці; павінен выхоўваць іх уласным прыкладам.

в) Знаёмства надзейных тайных супрацоўнікаў зь некаторымі мэтадамі і спосабамі працы імпэрыялістычных выведак, іх агентуры і клясавых ворагаў. Гэта азнаямленьне праводзіць апэратыўны працаўнік з дазволу камандзіра падразьдзяленьня ў неабходным аб'ёме. Пасьля гэтага яны маюць магчымасьць лепш арыентавацца ў асобных зьявах пры кантакце з асобамі, якія апрацоўваюцца, і лепш выконваць свае заданьні.

г) Аналіз паводзінаў тайных супрацоўнікаў. Апэратыўны

працаўнік зьвяртае іх увагу на памылкі і хібы і дапамагае пры іх выпраўленьні. Пры гэтым ён выбірае прыдатную форму, каб не адштурхнуць іх ад далейшага супрацоўніцтва. Таксама выяўляе цікавасьць да іх асабістага жыцьця. Клапоціцца пра стварэньне прыдатных умоваў для далейшага супрацоўніцтва».

Не ў апошнюю чаргу дырэктыва забараняла службоўцам ДБ «наладжваць такія дачыненьні» з тайнымі супрацоўнікамі, якія б іх неяк абавязвалі ці кампрамэтавалі. «Прыдатным спосабам ім таксама неабходна даць зразумець, што нельга задавальняць просьбы аб разнастайным умяшальніцтве дзеля іх саміх альбо іх сваякоў і знаёмых». Кіроўны орган павінен быў таксама дбаць пра тое, «каб тайны супрацоўнік не злоўжываў супрацоўніцтвам для правядзеньня злачыннай дзейнасьці, для запалохваньня грамадзянаў і іншага».

ДБ не забывалася і пра кантроль дзейнасьці тайных супрацоўнікаў. Ён нават лічыўся «неад'емнай часткай» працэсу кіраваньня і выхаваньня. «Апэратыўны працаўнік павінен несупынна правяраць і кантраляваць тайных супрацоўнікаў з пункту гледжаньня іх паводзінаў, выкананьня заданьняў і праўдзівасьці пададзеных данясеньняў. Асаблівую ўвагу трэба надаваць тым, хто быў завэрбаваны на падставе *кампрамэтоўнай дзейнасьці*». Для гэтай мэты апэратыўны працаўнік мог выкарыстоўваць любыя апэратыўныя магчымасьці і сродкі (пры неабходнасьці і сродкі тэхнічныя), а ў першую чаргу іншых тайных супрацоўнікаў і даверaных асобаў. «Апэратыўны працаўнік, аднак, павінен дбаць пра тое, каб не адбылося ўзаемнага рассакрэчваньня тайных супрацоўнікаў і даверaных асобаў».

Службоўцы ДБ у рамках паступовага адыходу ад адкрытага рэпрэсіўнага ўзьдзеяньня на чэхаславацкую грамадзкасьць хутчэй арыентаваліся на прыхаванае ўзьдзеяньне, так званае «прафіляктычнае»: «Апэратыўныя працаўнікі чым далей, тым больш павінны выкарыстоўваць тайных супрацоўнікаў для папярэджаньня альбо для своечасовага перапыненьня злачыннай дзейнасьці. Прафіляктычныя захады прымаліся з дапамогай тайных супрацоўнікаў, галоўным чынам з наступнымі мэтамі:

а) каб варожыя элемэнты не маглі ўцягваць у антыдзяржаўную дзейнасьць палітычна нясьпелых і клясава несьвядомых рабочых, іншых работнікаў, а галоўнае моладзь, альбо каб такія асобы былі своечасова вызваленыя з-пад уплыву ворага;

б) каб існыя легальныя групоўкі падчас апрацоўкі не пашыраліся, і каб, арыентуючыся па сытуацыі, тайныя супрацоўнікі ажыцьцяўлялі ў такіх групоўках падрыўную дзейнасьць;

в) каб групоўкам ці асобам, што апрацоўваюцца, ужо на стадыі падрыхтоўкі было зьнемагчымлена працягнуць і давесьці да канца сур'ёзную злачынную дзейнасьць».

Упершыню ў загад Міністэрства ўнутраных справаў – адміністрацыйны акт найвышэйшага ўзроўню – трапіла патрабаваньне каардынаванага і мэтанакіраванага выкарыстаньня агентурнай сеткі. Праз чатырнаццаць гадоў пасьля прыходу да ўлады ў Чэхаславакіі камуністаў ДБ перайшла на якасна новы ўзровень. «Вельмі важным патрабаваньнем для мэтазгоднага кіраваньня апэратыўнай працай ёсьць каардынаваньне і ўсебаковае выкарыстаньне сеткі тайных супрацоўнікаў і яе скіраванасьць на галоўны цэнтар варожай дзейнасьці. Ведамаснасьць асобных частак і лякальны патрыятызм асобных краёў і раёнаў – гэта шкодная зьява і перашкода, якая часта робіць немагчымым хуткае, дзейснае і пасьлядоўнае выкрыцьцё варожай дзейнасьці. Якасныя тайныя супрацоўнікі павінны скіроўвацца і выкарыстоўвацца згодна з апэратыўнай неабходнасьцю. Тайны супрацоўнік адміністрацыі ведамаснага апарату пры неабходнасьці можа быць выкарыстаны для выкананьня заданьняў на ўзроўні аддзелу Кампартыі МУС і наадварот. Асабліва неабходна каардынаваць выкарыстаньне тайных супрацоўнікаў у рамках асобных падразьдзяленьняў».

У пары абзацаў дырэктывы таксама можна адшукаць інфармацыю пра выкарыстаньне і прамое кіраваньне ДБ кіраўніцтвам КПЧ, улічваючы пастаянны кантроль правільнасьці «палітычнай і клясавай арыентацыі» ў працы тайнай палітычнай паліцыі. «Камандзіры ўсіх узроўняў рэгулярна кантралююць, як выконваюцца пастановы партыі ў

працы службы бясьпекі; як праводзяцца на апэратыўных участках разборы апэратыўнай сытуацыі і ці робяцца палітычна правільныя высновы для апэратыўнай працы; ці правільна з палітычнага і клясавага пункту гледжаньня скіраваная распрацоўка; як апэратыўная работа – асабліва мэтады і формы кіроўнай і выхаваўчай працы тайных супрацоўнікаў – адпавядае палітычнай лініі партыі і дырэктывам кіраўніцтва МУС; якіх вынікаў у працы дасягаюць як апэратыўныя працаўнікі, так і даверaныя ім тайныя супрацоўнікі».

Кансьпірацыя павінна была стаць натуральным навыкам і «асноўнай якасьцю кожнага апэратыўнага працаўніка, – сьцвярджала дырэктыва. – Без дасканалага засваеньня шэрагу мэтадаў утойваньня працы апэратыўны працаўнік ня здольны пасьпяхова выконваць заданьні з даверанымі яму тайнымі супрацоўнікамі і даверанымі асобамі». Выключэньні ў кансьпірацыі дапускаліся толькі ў асаблівых выпадках. «Ва ўскладненых умовах – напрыклад, пры спатканьні з тайнымі супрацоўнікамі на вёсцы – сустрэчы могуць ладзіцца ў іншых месцах, а ня толькі на кансьпірацыйных ці зьнятых кватэрах, калі на гэта дасьць згоду начальнік падразьдзяленьня». Сваіх тайных супрацоўнікаў меў права ведаць толькі апэратыўны працаўнік, які зь імі працаваў. «Недапушчальна знаёміць астатніх службоўцаў ДБ са зьвесткамі, якія датычаць тайных супрацоўнікаў ці іх справаў. Гэтыя пытаньні апэратыўны працаўнік мае права абмяркоўваць толькі з вышэйшым начальнікам. Забараняецца гаварыць пра апрацоўку канкрэтных асобаў на сходах і сустрэчах работнікаў ДБ... Начальнікі і апэратыўныя працаўнікі павінны строга дбаць і кантраляваць, каб адміністрацыйныя сілы не былі азнаёмленыя з імёнамі тайных супрацоўнікаў і з імёнамі апрацоўваных асобаў».

Пад канец гаворкі пра кансьпірацыю міністар унутраных справаў падкрэсьліў абавязак камандзіраў апэратыўных падразьдзяленьняў «разьбіраць кожны выпадак дэкансьпірацыі, рабіць з гэтага дысцыплінарныя высновы і даводзіць досьвед такога кшталту да кожнага, каб пазьбегнуць паўтарэньня падобных выпадкаў».

Умовай плянамернага і комплекснага выкарыстаньня агентурнай сеткі была «стабілізацыя сеткі» тайных супрацоўнікаў «з мэтай абмежаваньня шкоднага адхіленьня». Асаблівую атмасфэру страху і кансьпірацыі нават унутры ДБ стварала бясконцае правядзеньне «сыстэмных праверак і іншых захадаў», якія павінны былі перашкодзіць «пранікненьню імпэрыялістычных выведак у шэрагі тайных супрацоўнікаў».

Дзеля ўдасканальваньня агентурнага апарату контравыведныя апэратыўныя часьці павінны былі пастаянна аналізаваць агентурную сетку і ў працэсе пазбаўляцца ад «такіх тайных супрацоўнікаў, якія ня могуць, ня здольныя або і не жадаюць выконваць заданьні Дзяржаўнай бясьпекі». У першую чаргу было неабходна «выключыць з шэрагаў тайных супрацоўнікаў тых:

а) хто вядзе несумленную гульню і падманвае кіроўныя органы, выкарыстоўвае свае стасункі з ДБ для правядзеньня злачыннай дзейнасьці;

б) хто скампрамэтаваў сябе правакацыйнымі паводзінамі;

в) хто няздольны;

г) хто рашуча адмаўляецца супрацоўнічаць далей;

д) хто быў дэкансьпіраваны».

Правілы перапыненьня супрацоўніцтва з тайнымі супрацоўнікамі ў асноўным не адрозьніваліся ад папярэдняй мэтодыкі. «Стасункі з даверанымі асобамі апэратыўныя працаўнікі перарываюць тады, калі давераная асоба вядзе несумленную гульню або страчвае магчымасьць выконваць ролю даверанай асобы». Удакладняліся ўмовы так званага часовага перапыненьня супрацоўніцтва: «У некаторых выпадках настае часовае перапыненьне супрацоўніцтва з тайным супрацоўнікам на працяглы тэрмін (напрыклад, дзеля хваробы, службовай выправы ці сямейных абставін і інш.). Калі гаворка ідзе пра пэрыяд большы за два месяцы, кіроўны орган павінен падаць начальніку аддзелу пісьмовае абгрунтаваньне перапыненьня супрацоўніцтва, якое пасьля зацьверджаньня

падшываецца ў асабовую справу тайнага сурацоўніка. Калі гаворка ідзе пра доўгатэрміновую хваробу, празь якую тайны супрацоўнік ня можа выконваць сваіх абавязкаў, супрацоўніцтва зь ім заканчваецца».

Дзесяць доўгіх гадоў спатрэбілася ДБ для выданьня новых дырэктываў у агентурна-апэратыўнай працы. Цягам гэтага часу яна шукала свой твар, паступова і зь цяжкасьцю павышала прафэсійны ўзровень сваіх контравыведных фармаваньняў, але нягледзячы на гэта па-ранейшаму заставалася ў значнай ступені ўкаранёная ва ўласным мінулым. Падчас Праскай вясны ў Чэхаславакіі нібыта насталі змрочныя часы для палітычнай паліцыі савецкага тыпу. Агентурная сетка разам з заняпадам палітычнай інфарматарскай службы супраць айчыннай апазыцыі па сутнасьці распалася. Пасьля жніўня 1968 году і пазьней цягам 1969 году з падтрымкай новага кіраўніцтва КПЧ і пад моцным савецкім ціскам ДБ пачала паўставаць з попелу. На пачатку сямідзясятых гадоў здалося, што сытуацыя ў фэдэральным Міністэрстве ўнутраных справаў стабілізавалася. Кіраўніцтва ДБ магло распачаць падрыхтоўку і выданьне новых дырэктываў у апэратыўнай рабоце, якія рэагавалі на зьмены, што адбыліся ў апэратыўнай сытуацыі, на маштабную дэкансьпірацыю і нават на адступніцтва некаторых службоўцаў контравыведкі й выведкі.

ПЭРЫЯД НАРМАЛІЗАЦЫІ

У лютым 1972 году фэдэральны міністар унутраных справаў Радка Каска выдаў свой загад № 8/1972, да якога прыкладалася службовая інструкцыя A-oper-I-3 «Дырэктыва аб працы з тайнымі супрацоўнікамі чэхаславацкай контравыведкі». Ва ўступе таксама прысутнічаюць пэўныя ідэалягічныя разважаньні: «Крыза папярэдніх гадоў у ЧССР адгукнулася сур'ёзным паслабленьнем функцый сацыялістычнай дзяржавы і актывізацыяй правых апартуністычных і іншых антысавецкіх сілаў, і як вынік гэтага – павышэньнем цікавасьці варожых выведак да ЧССР. З прыходам войскаў саюзьнікаў контрарэвалюцыйныя сілы ў ЧССР страцілі магчымасьць адкрытага выступленьня і давядзеньня да канца

сваіх намераў.

Пасьля жніўня 1968 году з ЧССР уцёк шэраг асобаў, настроеных супраць сацыялістычнага ладу, якія папоўнілі сабой моцную базу варожых выведак, што дагэтуль складалася з прадстаўнікоў пасьлялютаўскай эміграцыі і іншых перасяленцаў у капіталістычныя краіны. Але і ў ЧССР засталіся антысацыялістычныя і апартуністычныя сілы, якія разам з гэтак сама арыентаванымі знаёмымі і сваякамі ўцекачоў, паводле апэратыўных зьвестак, зьяўляюцца аб'ектам цікавасьці заходніх выведных цэнтраў.

Гэтыя абставіны робяць яшчэ больш значнай галоўную задачу чэхаславацкай контравыведкі – змагацца са шпіянажам і дывэрсійнай дзейнасьцю варожых выведак, выкрываць іхных агентаў і памагатых на тэрыторыі ЧССР, перашкаджаць уцечцы сакрэтных зьвестак, а таксама выкрываць і абясшкоджваць антысацыялістычную і антыкамуністычную падрыўную дзейнасьць унутраных ворагаў. Асноўным сродкам барацьбы з варожай дзейнасьцю ёсьць агентурная сетка чэхаславацкай контравыведкі».

Загад перадусім прадпісваў цягам трох месяцаў вывучыць гэтыя дырэктывы ўсім апэратыўным працаўнікам чэхаславацкай контравыведкі і як мага хутчэй пачаць выкарыстоўваць іх на практыцы. Другім важным пунктам быў загад: «Да 1 кастрычніка 1972 году правесьці пераацэнку катэгорыі тайных супрацоўнікаў-інфарматараў і прыняць рашэньне пра іх перавод у катэгорыю «агент» або пра іх далейшае выкарыстаньне ў якасьці даверaных асобаў контравыведкі; да прапановаў аб пераводзе інфарматараў у агенты распрацаваць мэмарандум, які мусіць зацьвердзіць адпаведны начальнік, што валодае неабходнымі для гэтага паўнамоцтвамі; адначасова з гэтым распрацаваць мэмарандум на ўсіх астатніх тайных супрацоўнікаў, якія застаюцца ў агентурнай сетцы». Кантроль за выкананьнем гэтых дырэктываў быў прызначаны ажыцьцяўляць намесьнік міністра ўнутраных справаў ЧССР палкоўнік Ян Ганульяк.

Дырэктыва пераацаніла некаторыя агульнапрынятыя ўяўленьні пра асобаў, уключаных у агентурную сетку контравыведкі.

«Чэхаславацкая контравыведка ў сваёй дзейнасьці абапіраецца на дапамогу асобаў, як правіла грамадзянаў Чэхаславакіі, якія выказваюць ахвоту і могуць дапамагаць контравыведцы пры чыненьні перашкодаў падрыўной дзейнасьці вонкавага і ўнутранага ворага».

Карыстаючыся тэрміналёгіяй канца саракавых – пачатку пяцідзясятых гадоў, усе завэрбаваныя асобы лічыліся супрацоўнікамі контравыведкі і падзяляліся на дзьве асноўныя групы: а) тайныя супрацоўнікі, б) давераныя асобы.

Тайны супрацоўнік наноў вызначаўся як той, «хто быў сьвядома завэрбаваны і супрацоўнічае таемна ад грамадзкасьці апісаным у гэтай дырэктыве спосабам, падтрымлівае з працаўнікамі контравыведкі кансьпіратыўныя стасункі, выконвае пастаўленыя задачы, падае ці перадае зьвесткі і інфармацыю альбо прапануе контравыведцы дапамогу ці паслугі, якія неабходна ўтойваць». Выкарыстаньне працы тайных супрацоўнікаў адкрыта называлася галоўнай формай дзейнасьці контравыведкі «супраць замежных выведных і іншых варожых цэнтраў, іх мясцовых паслугачоў і ўнутранага ворага». Апэратыўныя працаўнікі павінны былі выкарыстоўваць тайных супрацоўнікаў «для пошуку, расьсьледаваньня і дакумэнтаваньня антыдзяржаўнай злачыннай дзейнасьці і для прафіляктыкі такой дзейнасьці з дапамогай апэратыўных захадаў».

Контравыведка адрозьнівала наступныя катэгорыі тайных супрацоўнікаў: а) агент, б) рэзыдэнт, в) гаспадар зьнятай кватэры.

Агент быў тайным супрацоўнікам, які выконваў заданьні па «пошуку, расьсьледаваньні і дакумэнтаваньні антыдзяржаўнай злачыннай дзейнасьці і… арыентаваны на чыненьне перашкодаў у гэтай злачыннай дзейнасьці». Канкрэтна гэта значыла, «у прыватнасьці, наступнае:

а) ён адшуквае, актыўна апрацоўвае і выкрывае кадравых выведнікаў, сыгналы аб дзейнасьці варожых выведак і іх агентуры зь ліку грамадзянаў Чэхаславакіі і замежных грамадзянаў; высьвятляе намеры, мэтады, формы працы і да т.

п.;

б) пранікае ў варожыя выведныя цэнтры і іншыя варожыя арганізацыі за мяжой і ў згуртаваньні чэхаславацкай эміграцыі;

в) зьбірае зьвесткі і выкрывае спробы пранікненьня агентуры варожых выведак на важныя гаспадарчыя, вайсковыя і іншыя аб'екты на тэрыторыі ЧССР і перашкаджае ўцечцы сакрэтных зьвестак з гэтых аб'ектаў;

г) зьбірае зьвесткі аб прыхаваных варожых праявах і тэндэнцыях, выкрывае ініцыятараў гэтых праяваў, высьвятляе іх замыслы, дзейнасьць і каналы паступленьня падрыўной ідэалягічнай дзейнасьці вонкавых і ўнутраных ворагаў на важных аб'ектах, у месцах засяроджаньня варожых антысацыялістычных і асацыяльных элемэнтаў і на іншых важных участках, якія зьяўляюцца аб'ектам распрацоўкі ці інфарматарскай аховы контравыведкі;

д) даведваецца пра месцазнаходжаньне і апрацоўвае варожых асобаў, якія арганізуюць і праводзяць падрыўную, шкодніцкую і сабатажную дзейнасьць супраць нашай дзяржавы ці супраць іншых сацыялістычных краін;

е) дапамагае пры ахове чэхаславацкай эканомікі, узброеных сілаў, дзяржаўных межаў, транспарту і сродкаў сувязі ад шкодніцкай і сабатажнай дзейнасьці вонкавых і ўнутраных ворагаў;

ё) выконвае канкрэтныя заданьні ў пошуку асобаў;

ж) выконвае заданьні прафіляктычна-выхаваўчага характару з мэтай папярэджваць і прадухіляць узьдзеяньне варожай ідэалягічнай падрыўной дзейнасьці, гаспадарчыя шкоды і надзвычыйныя сытуацыі ў чэхаславацкіх узброеных сілах, якія зьніжаюць боегатовасьць войска;

з) выкрывае канкрэтныя заданьні па правядзеньні падрыўной дзейнасьці ў варожым асяродку».

Рэзыдэнтам мог быць толькі «адмыслова абраны, абсалютна

надзейны, жыццёва абазнаны, а з пункту гледжаньня контравыведкі прафэсійна падрыхтаваны тайны супрацоўнік», здольны арганізаваць і падтрымліваць канспіратыўную сувязь з агентамі, якім ён, згодна з указаньнямі кіроўнага органу, даваў заданьні. Рэзыдэнт паводле гэтага вызначэньня ня толькі прымаў іх пісьмовыя і вусныя данясеньні, але нават пасьля іх аналізу перадаваў зьвесткі апэратыўнаму працаўніку і асабіста суўдзельнічаў у выхаваньні «даверaных» яму агентаў. «Рэзыдэнтам можа быць і надзейны былы працаўнік МУС, які працуе на цывільнай працы. Рэзыдэнтам таксама можа быць праверaны дасьведчаны агент, які мае задаткі для гэтай адказнай працы і ня быў завэрбаваны на падставе кампрамэтоўнага матэрыялу».

Рэзыдэнтуру службоўцы контравыведных частак ДБ будавалі «галоўным чынам на канкрэтных аб'ектах і там, дзе меліся ўскладненыя ўмовы для непасрэднага кіраваньня агентамі» альбо існавала небясьпека іх дэканспірацыі ці калі таго патрабавалі іншыя «спэцыяльныя» ўмовы працы. «Апэратыўны працаўнік, улічыўшы апэратыўную сытуацыю, магчымасьці і здольнасьці рэзыдэнта, выбірае і рыхтуе агентаў, якімі рэзыдэнт будзе кіраваць. Апэратыўны працаўнік павінен даведацца і ацаніць асабістыя дачыненьні паміж агентам і рэзыдэнтам і назіраць за іх асабістымі рысамі характараў. Асаблівую ўвагу ён павінен зьвярнуць на тое, каб рэзыдэнт ня быў непасрэдным падначаленым, падпарадкаваным даверанаму яму агенту, і каб рэзыдэнт сваімі здольнасьцямі, адукаванасьцю, інтэлектуальным і палітычным узроўнем заўсёды пераўзыходзіў агента».

Вызначэньне **зьнятых і канспіратыўных кватэр (памяшканьняў)**, па сутнасьці, не зьмянілася: і надалей яны выкарыстоўваліся «выключна для сустрэчаў з абсалютна надзейнымі і дасьведчанымі ў інфарматарскай справе тайнымі супрацоўнікамі. Сустрэчы з астатнімі тайнымі супрацоўнікамі мусяць ладзіцца ў іншых памяшканьнях альбо месцах, прыдатных з пункту гледжаньня захаваньня канспірацыі». Канечне ж, засталося забароненым правядзеньне сустрэчаў з тайнымі супрацоўнікамі на аб'ектах КПЧ, астатніх палітычных партыяў і ў канторах прадстаўнічых органаў усіх узроўняў.

«Зьнятая ці канспіратыўная кватэра павінна выбірацца менавіта з улікам магчымасьці правядзеньня сустрэчаў пры ўмове іх абсалютнай сакрэтнасьці… Апэратыўны працаўнік павінен своечасова прымаць неабходныя захады, каб не дапусьціць выкрыцьця сапраўднага прызначэньня кватэры перад пабочнымі асобамі і органамі нацыянальных камітэтаў».

Дырэктыва сьцьвярджала, што зьнятая кватэра «ў пляне магчымасьці атрыманьня, утрыманьня, фінансавых выдаткаў і ўтойваньня ад грамадзкасьці была самым ставывыкарыстоўваным месцам для сустрэчаў». А **ўтрымальнік зьнятай кватэры** быў тайным супрацоўнікам, спэцыяльна завэрбаваным «з мэтай здачы кватэры ці памяшканьня для правядзеньня канспіратыўных сустрэчаў» службоўцаў дзяржаўнай бясьпекі з тайнымі супрацоўнікамі. Адпаведнае апэратыўнае фармаваньне контравыведкі заключала з гаспадаром здаванай кватэты спэцыяльную дамову, дзе прыводзіліся ўмовы выкарыстаньня гэтых памяшканьняў, у тым ліку і двухбаковыя абавязкі, у першую чаргу, безумоўна, абавязак гаспадара кватэры трымаць у сакрэце факт выкарыстаньня кватэры ДБ. Разам з тым дырэктыва патрабавала забясьпечыць, каб гаспадар здаванай кватэры ня мог ідэнтыфікаваць тайных супрацоўнікаў, якія прыходзяць на кватэру.

Канспіратыўная кватэра, у адрозьненьне ад зьнятай, уяўляла сабой самастойны аб'ект, самастойную кватэру ці іншае памяшканьне, якое знаходзіцца ў непасрэдным выкарыстаньні апэратыўнага фармаваньня контравыведкі. «Канспіратыўная кватэра знаходзіцца ў афіцыйнай уласнасьці апэратыўнага працаўніка як гаспадара кватэры, які пры афармленьні дакумэнтаў карыстаецца несапраўдным грамадзянскім пашпартам. Толькі ў выключных выпадках канспіратыўная кватэра можа легалізавацца і тайным супрацоўнікам».

Другая катэгорыя супрацоўнікаў, **«давераная асоба»**, дапамагала ДБ выконваць «галоўным чынам дапаможныя і кантрольныя заданьні ў сувязі з пошукам ці тлумачэньнем антыдзяржаўнай дзейнасьці і з арганізацыяй уласнай агентуры». Даверaныя асобы выбіраліся «згодна з патрэбамі і

задачамі, што вынікаюць з апэратыўнай сытуацыі на ахоўваным ці расьсьледаваным аб'екце, праблематыкі і г. д., з шэрагаў надзейных чэхаславацкіх грамадзянаў, членаў КПЧ і беспартыйных», якія «добраахвотна на аснове ўзаемадавер у» былі «згодныя ў меру сваіх магчымасьцяў і здольнасьцяў падаваць контравыведцы асобныя зьвесткі інфармацыйнага характару ці чыніць ёй неабходную дапамогу і паслугі».

Члены контравыведных фармаваньняў наладжвалі стасункі з такімі даверанымі асобамі, якія маглі дапамагчы ДБ, «у прыватнасьці, у наступным:

а) паведамляць пра зьявы і прыкметы, што зьяўляюцца сыгналам варожай і злачыннай дзейнасьці альбо яе падрыхтоўкі, якая ладзіцца вонкавым ці ўнутраным ворагам;

б) перадаваць зьвесткі, што характарызуюць апэратыўную сытуацыю на ахоўваным ці расьсьледаваным аб'екце, у праблематыцы і інш.;

в) падаваць інфармацыю, якая датычыць працэсу пошуку крыніцаў, каналаў пранікненьня і распаўсюджаньня варожай ідэалёгіі, нэгатыўных тэндэнцыяў і настрояў сярод асобных грамадзянаў Чэхаславакіі ці іх груповак альбо сярод замежных грамадзянаў;

г) зьвяртаць увагу на падазроную цікавасьць замежных асобаў і грамадзянаў Чэхаславакіі да ахоўваных важных аб'ектаў, установаў ці абсталяваньня, да дзейнасьці на іх і да асобаў, якія на гэтых аб'ектах працуюць;

д) зьвяртаць увагу на магчымасьць парушэньня вытворчых і тэхналягічных працэсаў і магчымасьць стварэньня надзвычайных становішчаў і іншых нэгатыўных зьяваў на заводах, фабрыках, ва ўстановах, у чэхаславацкіх узброеных сілах і выказваць меркаваньні аб прычынах надзвычайных сытуацый і зьяваў, якія здарыліся ў гэтым асяродку;

е) дапаўняць зьвесткі аб правяраных асобах;

ё) выконваць іншыя заданьні для апэратыўнай часткі

контравыведкі ў залежнасьці ад патрэбаў наяўнай апэратыўнай сытуацыі на ахоўваным ці расьсьледаваным аб'екце ці ў праблематыцы і да т. п.».

Пры падборы «даверанай асобы» апэратыўны працаўнік праводзіў яе «асноўную праверку», і калі пераконваўся, што яна «надзейная і вартая даверу і г. д.», ён, атрымаўшы згоду камандзіра, наладжваў зь ёю кантакт, які ён меў з даверанай асобай «нерэгулярна, паводле патрэбы і разьвіцьця апэратыўнай сытуацыі ў праблематыцы і на ўчастку», дзе меркавалася яе выкарыстаньне. Паколькі з даверанымі асобамі не дазвалялася ладзіць сустрэчы на зьнятых ці канспіратыўных кватэрах, апэратыўны працаўнік выбіраў месца сустрэчы «з улікам яго грамадзкага становішча, службовай ці працоўнай прыналежнасьці, грамадзкай дзейнасьці і да т. п.», як правіла, у «прыдатным грамадзкім памяшканьні ці на працоўным месцы даверанай асобы». У выпадку, калі давераная асоба сама праяўляла ахвоту, дазвалялася прымаць ад яе данясеньні ў пісьмовай форме. «У астатніх выпадках аб важных паведамленьнях даверaных асобаў апэратыўны працаўнік робіць запісы сам».

Кантакт службоўца ДБ з даверанай асобай, калі тая выказвала «катэгарычнае жаданьне», утойваўся. «Таксама ўтойваецца кантакт з даверанай асобай, якая разглядаецца як магчымы кандыдат у тайныя супрацоўнікі ў будучыні. Такія кантакты павінныя прыкрывацца прыдатнымі кантактамі апэратыўнага працаўніка зь іншымі грамадзянамі, сярод якіх давераная асоба працуе або жыве». Падобным чынам ужо папярэднія дырэктывы вырашалі пытаньне выкарыстаньня інфармацыі, калі апэратыўны працаўнік павінен быў «клапаціцца пра ўтойваньне імя даверанай асобы, якая перадала контравыведцы інфармацыю». Умовай «адкрытага» выкарыстаньня інфармацыі было паўторнае папярэджаньне пра гэта даверанай асобы: «Давераная асоба ня можа замяняць тайных супрацоўнікаў. Яна можа выкарыстоўвацца толькі ў маштабе… гэтай дырэктывы і для паглыбленьня зьвестак, якія сама падала. Яна ня мае права выконваць заданьні, ад якіх залежыць бясьпека дзяржавы і іншыя важныя контравыведныя заданьні, для выкананьня якіх неабходна ў поўнай меры валодаць апэратыўнай сытуацыяй,

мэтадамі і формамі працы контравыведкі. Калі ж давераная асоба валодае задаткамі для выкананьня заданьняў такога кшталту і калі падчас папярэдніх сустрэчаў апэратыўнага працаўніка з даверанай асобай вытрымліваліся прынцыпы кансьпірацыі, давераная асоба можа быць завэрбаваная ў якасьці тайнага супрацоўніка». Сьпіс даверaных асобаў, згодна з дырэктывай, вёў камандзір кожнага падразьдзяленьня, якое зьвярталася па паслугі да даверaных асобаў у рамках працы з агентурнай сеткай, у апэратыўнай картатэцы яны існавалі «ў форме дадатку да асабовай справы аб'екта».

Пры выбары тайных супрацоўнікаў службоўцы ДБ найперш зьвярталі ўвагу на элемэнтарныя інтэлектуальныя, псыхічныя і фізычныя дадзеныя супрацоўніка, існаваньне аб'ектыўных і суб'ектыўных умоваў супрацоўніцтва і інш. «Спэцыяльнымі момантамі ёсьць, напрыклад, патрабаваньні, каб выбраны кандыдат меў задаткі для пранікненьня ў варожыя выведныя цэнтры, для распрацоўкі канкрэтнага выпадку, для аказаньня дапамогі пры правядзеньні пошукавых мерапрыемстваў у спэцыфічным асяродзьдзі і да т. п. На ролю тайнага супрацоўніка не выбіраліся функцыянэры КПЧ і вышэйшыя дзяржаўныя чыноўнікі».

Дзяржбясьпека мела абсалютна ясныя матывы вэрбоўкі тайных супрацоўнікаў, якая праводзілася:

«а) на падставе ідэйных памкненьняў кандыдата;

б) на падставе матэрыяльнай зацікаўленасьці;

в) на падставе кампрамэтоўных акалічнасьцяў, якія контравыведка даведалася пра кандыдата».

Да гэтага дырэктыва дадавала: «Ніводны з гэтых спосабаў вэрбоўкі нельга лічыць прыярытэтным; выбар аднаго ці другога спосабу заўсёды грунтуецца на атрыманых зьвестках з мэтай выкарыстаньня тайнага супрацоўніка. Аднак заўсёды дзейнічае прынцып, што кандыдат прымае рашэньне на падставе ўласных разважаньняў, то бок сьвядома. Добраахвотнасьць з боку кандыдата – адзін з галоўных прынцыпаў вэрбоўкі супрацоўнікаў контравыведкі. Толькі пры пэўных спэцыфічных

умовах працы контравыведкі, асабліва там, дзе пад пагрозай знаходзяцца асабліва важныя абарончыя, палітычныя ці эканамічныя інтарэсы дзяржавы, можна, згодна з характарам выпадку, супрацоўніцтва дамагацца. Такім выпадкам ёсьць, напрыклад, непасрэдная небясьпека тэрору, сабатажу, шкодніцтва і інш. Ідэйныя перакананьні і матэрыяльная зацікаўленасьць пры прыняцьці рашэньня кандыдатам і падчас тайнага супрацоўніцтва часта ўзаемадапаўняюцца».

Ідэйныя памкненьні вызначаліся ня менш цікавым спосабам: «Ідэйным матывам ёсьць асабістае перакананьне кандыдата ў неабходнасьці барацьбы супраць вонкавага і ўнутранага ворага, якое грунтуецца на марксісцка-ленінскім сьветапоглядзе, сацыялістычным патрыятызьме, непрыманьні імпэрыялізму і імпэрыялістычных войнаў, нянавісьці да імпэрыялістычных выведак альбо да некаторых іх супрацоўнікаў, агідзе да ўнутранага ворага, асабліва пасьля падзей 1968 году і да т. п. Ідэйная матывацыя можа грунтавацца таксама на асабістай зацікаўленасьці кандыдата ў праблематыцы бясьпекі і дзейнасьці контравыведкі». Матыў матэрыяльнай зацікаўленасьці, наадварот, грунтаваўся на «асабістым перакананьні» кандыдата супрацоўнічаць з ДБ. «Добраахвотнае прыняцьце рашэньня, аднак, абапіраецца перадусім на пэўныя выгоды, якія прапануюцца тайнаму супрацоўніку падчас супрацоўніцтва з контравыведкай. Сярод матэрыяльных выгодаў, як выключэньне, можа быць і рэгулярны заробак, матэрыяльнае забесьпячэньне сям'і тайнага супрацоўніка, пералік папярэдне вызначаных сумаў на яго ашчадную кніжку, мэтавыя прэміі і іншыя формы матэрыяльнай узнагароды, якія паміж тайным супрацоўнікам і контравыведкай могуць быць вызначаныя папярэдне, на пачатку супрацоўніцтва ці падчас супрацоўніцтва, і агаворвацца ў дамове аб супрацоўніцтве».

[image]
Першыя старонкі агентурнай справы контравыведкі ДБ, канец 1970-х гг.

Загад міністра ўнутраных спраўаў «у абгрунтаваных выпадках» даваў магчымасьць службоўцам ДБ вэрбаваць тайных супрацоўнікаў катэгорыі «агент» (аднак ні ў якім разе не

рэзыдэнтаў і ўтрымальнікаў зьнятых кватэраў) «на падставе кампрамэтоўных акалічнасьцяў, атрыманых на іх контравыведкай». У дырэктыве канкрэтна гаварылася: «Кампрамэтоўныя зьвесткі тычацца дзейнасьці кандыдата, якая кампрамэтуе яго перад чэхаславацкімі законамі ці перад грамадзкасьцю… Што тычыцца кампрамэтоўнай дзейнасьці, якая не зьяўляецца злачыннай, неабходна ўлічваць меру кампрамэтацыі з пункту гледжаньня кандыдата і асяродку, якое б яе аціаніла. У выпадку замежных грамадзянаў гаворка можа ісьці пра кампрамэтацыю перад законамі радзімы, установамі і арганізацыямі, заданьні якіх ён у ЧССР выконвае, ці пра кампрамэтацыю перад грамадзкасьцю ўласнай краіны». Крыху алібістычна дырэктыва працягвала: «Кандыдат, завэрбаваны на падставе кампрамэтоўнага матэрыялу, прымае рашэньне, грунтуючыся на ўласнай ацэнцы, ці яму супрацоўніцтва з контравыведкай выгаднейшае за наступствы, якія б мела для яго асобы выкарыстаньне кампрамэтоўных матэрыялаў». У выпадку, калі і пасьля гэтага шантажу асоба не згаджалася падпісаць згоду на супрацоўніцтва, дырэктыва заклікала прытрымлівацца дзейных законаў: «Калі кандыдата ня ўдасца завэрбаваць на падставе кампрамэтоўнага матэрыялу, камандзір з патрэбнымі паўнамоцтвамі прыме рашэньне, з улікам чэхаславацкага заканадаўства, ці будзе – і калі так, то якім чынам – выкарыстаны кампрамэтоўны матэрыял».

Гэтаксама і дырэктыва 1972 году адэкватна ацэньвала так бы мовіць выхоўваньне тайных супрацоўнікаў, калі гаворка ішла пра дзейнасьць прадуманую, сыстэматычную і канкрэтную. «Апэратыўны працаўнік кіруе тайнымі супрацоўнікамі такім чынам, каб яны правільна разумелі міжнародныя і ўнутрыпалітычныя пытаньні, асабліва пытаньні бясьпекі і аховы ЧССР і астатніх сацыялістычных краінаў. У гэтым кірунку ён арыентуе выхаваўчую працу такім чынам, каб яна вяла да павышэньня і ўзмацненьня адданасьці тайных супрацоўнікаў сацыялістычнаму грамадзкаму і дзяржаўнаму ладу, да паглыбленьня іх палітычнай сьвядомасьці і інтэрнацыяналізму».

Апэратыўны працаўнік ДБ пры выхоўваньні тайных

супрацоўнікаў выкарыстоўваў, «у прыватнасьці, наступныя мэтады:

а) тлумачэньне палітычных поглядаў у адпаведнасьці з узроўнем палітычнай сьпеласьці тайнага супрацоўніка пры асабістым кантакце падчас сустрэчаў. Погляды і пытаньні неабходна тлумачыць зь веданьнем справы. Асаблівую ўвагу надаваць тым, хто апрацоўвае замежнікаў ці асобаў з шэрагу антысацыялістычных, апартунісцкіх і іншых варожых элемэнтаў. Павышаную ўвагу надаваць асобам, завэрбаваным на падставе кампрамэтоўнай дзейнасьці. Трэба імкнуцца, каб уплыў на тайнага супрацоўніка з боку апэратыўнага працаўніка быў мацнейшы і больш надзейны, чым уплыў на яго з боку варожага асяродку;

б) патрабаваньне своечасовага і дакладнага выкананьня атрыманых заданьняў. Гэты прынцып трэба ўкараняць пасьлядоўна, але тактоўна. Апэратыўны працаўнік пры кіраваньні тайнымі супрацоўнікамі павінен пазьбягаць павярхоўнасьці і фармальнасьці, а ў першую чаргу ўзьдзейнічаць на іх асабістым прыкладам;

в) разбор паводзінаў тайных супрацоўнікаў, пры гэтым неабходна зьвяртаць іх увагу на памылкі і недахопы і дапамагаць у іх выкараненьні. Пры гэтым трэба выбіраць прыдатную форму, каб не адштурхнуць іх ад супрацоўніцтва. Таксама трэба праяўляць цікавасьць да іх асабістага жыцьця, клапаціцца пра стварэньне адпаведных умоваў для разьвіцьця далейшага супрацоўніцтва».

У рамках спэцыяльнай падрыхтоўкі могуць удасканальвацца «веды і ўменьні тайнага супрацоўніка, якія тычацца захоўваньня канспірацыі пры выкананьні заданьняў. Паводле патрэбы яго накіроўваюць на наладжваньне і пашырэньне патрэбных стасункаў на распрацоўваным аб'екце ці выпадку. Яго вучаць спосабам усталяваньня кантактаў зь людзьмі з варожага асяродку, у сутыкненьне зь якімі ён прыйдзе пры выкананьні заданьняў».

Празь дзесяць гадоў пасьля апошняй дырэктывы зноў зьнізілася частата сустрэчаў апэратыўных працаўнікоў з тайнымі

супрацоўнікамі. «Пажадана, каб і ў пэрыяды незапатрабаванасьці тайных супрацоўнікаў ажыцьцяўляліся рэгулярныя сустрэчы зь імі з пэрыядычнысьцю, вызначанай камандзірам падразьдзяленьня, аднак не радзей за раз на тры месяцы».

У выпадку «датэрміновага перапыненьня супрацоўніцтва» з тайным супрацоўнікам (з прычыны хваробы, працоўнай занятасьці ці інш.), калі меркавалася, што перапыненьне супрацоўніцтва зацягнецца на час, большы за шэсьць месяцаў, апэратыўны працаўнік падаваў рапарт аб перапыненьні супрацоўніцтва таму начальніку, зь якім узгаднялася вэрбоўка. Заканчэньне супрацоўніцтва наставала і з тымі тайнымі супрацоўнікамі, «якія здрадзілі, эмігравалі, учынілі злачынства, скампрамэтавалі сябе правакацыйнымі і несумленнымі паводзінамі, а таксама з тымі, якія былі дэканспіраваныя, адмаўляюцца супрацоўнічаць ці страцілі магчымасьць супрацоўнічаць далей у сувязі са зьменай свайго становішча. Сярод іншых прычынаў могуць быць, у прыватнасьці, наступныя:

«а) калі тайны супрацоўнік выканаў заданьне, для якога быў завэрбаваны, і далейшае яго выкарыстаньне немагчымае;

б) калі скончыўся загадзя вызначаны тэрмін супрацоўніцтва;

в) калі тайны супрацоўнік сябе належным чынам не зарэкамэндаваў ці ня выканаў заданьняў, дзеля якіх быў завэрбаваны;

г) калі апэратыўны орган не настойвае на далейшым супрацоўніцтве;

д) калі тайны супрацоўнік быў прызначаны на высокую палітычную ці дзяржаўную пасаду».

На пачатку 1978 году міністар унутраных справаў ЧССР Ярамір Обзіна выдаў загадам № 3 апошнюю «Дырэктыву аб працы з супрацоўнікамі контравыведкі». Пакуль што няма абсалютнай яснасьці ў пытаньні, якія прычыны ў гэты пэрыяд падштурхнулі кіраўніцтва фэдэральнага Міністэрства ўнутраных справаў да

выданьня цэлай сэрыі дырэктываў, што тычыліся апэратыўнай працы ДБ, калі ўлічваць і дырэктывы аб агентурна-апэратыўнай працы. Асабліва таму, што яны, у прынцыпе, не адрозьніваюцца ад папярэдніх. Міністар унутраных справаў Обзіна ніякіх тлумачэньняў да выданьня свайго загаду не дадаў: «Для забесьпячэньня належнага выкананьня заданьняў працаўнікамі контравыведкі пры працы з супрацоўнікамі контравыведкі па ахове сацыялістычнага дзяржаўнага і грамадзкага ладу, сацыялістычнай эканомікі, бясьпекі і правоў грамадзянаў Чэхаславакіі і пры ахове бясьпекі дзяржаваў сусьветнага сацыялістычнага блёку…»

Ва ўступе да дырэктывы яе аўтары вызначалі стасункі контравыведкі ДБ і грамадзянаў іншымі словамі, але па сутнасьці ў тым самым духу, як і раней: «Контравыведка пры выкананьні сваёй місіі абапіраецца на дапамогу грамадзянаў Чэхаславакіі і замежнікаў, якія выказваюць ахвоту і маюць прычыны для супрацоўніцтва з контравыведкай». Дырэктыва захавала прынцып дзяленьня супрацоўнікаў контравыведкі на дзьве катэгорыі: тайныя супрацоўнікі і даверaныя асобы. Невялікая зьмена адбылася ў тым, што тычыцца выкарыстаньня тайных супрацоўнікаў як галоўнага сродку Дзяржаўнай бясьпекі «супраць падрыўной дзейнасьці замежных варожых выведных, ідэалягічных і эканамічных цэнтраў і груповак, іх мясцовых памагатых і астатніх унутраных ворагаў».

Асобныя катэгорыі тайных супрацоўнікаў не зьмяніліся, толькі **рэзыдэнт** па заслугах патрапіў на першае месца, перад агентам. Рэзыдэнтам акрамя былога надзейнага службоўца Камітэту нацыянальнай бясьпекі цяпер мог стаць таксама салдат унутраных войскаў, які працуе на цывільнай працы. Задачы тайнага супрацоўніка **агента** пашырыліся за кошт пошуку і выкрыцьця заходніх «манаполіяў, арганізацыяў і цэнтраў», якія пранікаюць у важныя камуністычныя арганізацыі (в), ён сам «пранікае ў гаспадарчыя групоўкі і інстытуцыі капіталістычных дзяржаваў і манаполіяў з мэтай выкрыцьця іх намераў падарваць ці нэгатыўна паўплываць на эканоміку Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі ці перашкодзіць інтэграцыі краін Савету эканамічнай узаемадапамогі» (д); дапамагае пры ахове «ўзброеных сілаў Варшаўскай дамовы» (е),

выконвае канкрэтныя заданьні таксама і «па інфарматарскай праверцы асобаў» (ё) і, «згодна з усталяваным парадкам, на гэтае [варожае] асяродзьдзе аказвае пазытыўны ўплыў» (ж, і). Прызначэньне заданьняў **даверaным асобам** было пашырана толькі на пункт е): «зьвяртаць увагу кіраўніцтва на недахопы пры ахове засакрэчаных аб'ектаў і на зьявы, якія сыгналізуюць пра пагрозу ці рассакрэчваньне сакрэтных зьвестак». Як і раней, даверaныя асобы ўносіліся ў «сьпіс», які вёў камандзір падразьдзяленьня контравыведнага фармаваньня і рэгістраваўся ў дадатку да «асабістай справы распрацоўванай асобы».

Што да **кансьпіратыўных кватэраў**, то, у адрозьненьне ад пачатку сямідзясятых, да новай дырэктывы была дададзеная цікавая інфармацыя: «Атрыманьне КК ад нацыянальных камітэтаў забясьпечвае ў Празе жыльлёвае аддзяленьне фэдэральнага Міністэрства ўнутраных справаў, а ў краях адпаведныя жыльлёвыя органы краёвых адміністрацыяў Корпусу нацыянальнай бясьпекі, якія павінны абмеркаваць пытаньні выдзяленьня кватэры з кампэтэнтнымі дзяржаўнымі органамі і перадаць КК пасьля вырашэньня ўсіх фармальнасьцяў карыстальнікам».

Таксама пытаньне выхоўваньня тайных супрацоўнікаў было пашыранае на адзін пункт: кіроўны орган «мусіць рэагаваць на няправільныя палітычныя погляды і пазыцыю тайнага супрацоўніка і адказваць на ўсе яго пытаньні зь веданьнем справы. Асаблівую ўвагу трэба надаваць тым тайным супрацоўнікам, якія працуюць з замежнікамі ці з асобамі з шэрагаў антысавецкіх, апартуністычных і іншых варожых элемэнтаў». Частата асабістых кантактаў з агентурай у пэрыяд незапатрабаванасьці тайнага супрацоўніка была зьніжаная да адной сустрэчы на тры месяцы.

Да таго ж былі сфармуляваныя наступныя «асноўныя правілы», якія тычыліся «рэалізацыі прынцыпаў кансьпірацыі ў працы з тайнымі супрацоўнікамі:

а) пры сустрэчы з тайным супрацоўнікам як на ЗК, так і на КК, а таксама ў іншых месцах неабходна прытрымлівацца прынцыпаў найстражэйшай сакрэтнасьці і не дапускаць

стэрэатыпнасьці пры арганізацыі сустрэчаў (не прызначаць на той самы дзень і гадзіну);

б) выпрацоўваць і правяраць жывучасьць легендаў, пад прыкрыцьцём якіх тайныя супрацоўнікі прыходзяць на месца сустрэчы;

в) знаёміць тайных супрацоўнікаў з фактамі і дачыненьнямі толькі ў маштабе, мінімальна неабходным для выкананьня заданьня;

г) рэглямэнтаваць паводзіны тайных супрацоўнікаў у апрацоўваным асяродзьдзі пры кантакце з варожымі асобамі. Пры выкананьні заданьняў дбаць пра тое, каб паводзіны тайных супрацоўнікаў рабілі як мага больш натуральнае ўражаньне;

д) дбаць пра тое, каб тайны супрацоўнік пісаў данясеньні непасрэдна падчас сустрэчы з кіроўным працаўніком, і мінімальна абмежаваць прынясеньне гатовых данясеньняў. У такіх выпадках прасачыць, ці вытрымаў тайны супрацоўнік усе прынцыпы кансьпірацыі;

е) пры выдзяленьні падарункаў і ўзнагарод заўсёды неабходна папярэдне ўзважыць, ці здолее тайны супрацоўнік праўдападобна растлумачыць дома членам сям'і, на працы або людзям са свайго атачэньня паходжаньне падарунка ці значнай фінансавай узнагароды;

ё) пры аказаньні дапамогі ці паслуг тайнаму супрацоўніку заўсёды мець падрыхтаваную прыдатную легенду;

ж) прытрымлівацца прынцыпу, каб у фармаваньнях контравыведкі тайных супрацоўнікаў ведаў толькі той працаўнік, які імі непасрэдна кіруе, адпаведны вышэйшы камандзір, а ў асаблівых выпадках толькі тыя органы, якія ў сыстэме кіроўных паўнамоцтваў маюць права знаёміцца з матэрыяламі тайнага супрацоўніка і зь яго данясеньнямі;

з) ва ўсіх матэрыялах, акрамя мэмарандуму, тайны супрацоўнік згадваецца толькі пад псэўданімам з нумарам асабістай

справы, і не прыводзяцца ніякія зьвесткі, якія б маглі прывесьці да рассакрэчваньня тайнага супрацоўніка перад пабочнымі асобамі;

і) забараняецца дэкансьпіраваць аднаго тайнага супрацоўніка перад другім, акрамя выпадкаў, апісаных у гэтай дырэктыве (праца з рэзыдэнтамі альбо выключныя асаблівыя выпадкі, якія тычацца пытаньня сувязі ці спэцыяльных інфарматарскіх камбінацыяў, калі наступае так званая аднабаковая ці двухбаковая дэшыфрацыя)».

У канцы васьмідзясятых гадоў кіраўніцтва фэдэральнага Міністэрства ўнутраных справаў імкнулася рэагаваць на зьмены грамадзкай, а тым самым і апэратыўнай сытуацыі, і загадала сваім цэнтральным фармаваньням Дзяржаўнай бясьпекі выпрацаваць новыя дырэктывы. Аднак да лістапада 1989 году ніводная зь іх не была прынятая, гэта тычыцца і дырэктываў аб працы з агентурнай сеткай, якія нас цікавяць. Дырэктыва аб агентурна-апэратыўнай дзейнасьці контравыведных падразьдзяленьняў ДБ з 1978 году хоць і была фармальна адмененая ў рамках «Распараджэньня міністра ўнутраных справаў ЧСФР» № 15/1991 ад 28 чэрвеня 1991 году, але фактычна перастала дзейнічаць толькі пры ліквідацыі ДБ у сярэдзіне лютага 1990 году альбо пасьля распаду яе агентурнай сеткі, які пачаўся яшчэ ў сьнежні 1989 году.

Пераклад Юліі Сматрычэнкі
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/11/22
[image]

ПЁТРА РУДКОЎСКІ
філёзаф і багаслоў, сталы аўтар «ARCHE».

Пётра Рудкоўскі
Наколькі навуковы сацыялягічны праект Дуркгайма-Кацука?

Кацук М.
Калі ж ён злачынца, дык насамперш трэба крычаць: «Ратуйце!» // ARCHE. 2005. № 6.
[2] Фрагмэнты абмеркаваньня аналізу Міколы Кацука «Міты беларускай сацыялёгіі» // ARCHE. 2005. № 6.
[3] ARCHE. 2006. № 1–2.

Старажытныя філёзафы-дыялектыкі выпрацавалі трохэтапную канцэпцыю разумаваньня. Разумаваньне пачынаецца ад *апорыі* - усьведамленьня і пастаноўкі праблемы. Затым наступае этап *дыяпорыі* - пробныя спосабы разьвязаньня гэтай праблемы, а заканчваецца разумаваньне *эўпорыяй* - зьяўленьнем кансэнсусу наконт аптымальнага вырашэньня пэўнай праблемы.

* * *

Калі я прасочваў сацыялягічна-мэтадалягічную дыскусію, запачаткаваную «Мітамі беларускай сацыялёгіі» Міколы Кацука, дык склалася ўражаньне, што «калектыўнае разумаваньне», якое мела месца на старонках «ARCHE», сайце «belintellectuals» і іншых інтэрнэт-форумах, таксама адбылося трохэтапна, толькі ў адваротным парадку. «Міты...» спадара Кацука мелі характар *эўпорыі*. Яго артыкул закончыўся эліптычным выразам: «Калі ўмець». Зыходзячы з кантэксту,

прачытваю гэты выраз наступным чынам: *існуюць аптымальныя спосабы вырашэньня шэрагу сацыялягічных праблемаў* і *існуе пэўнае мноства навукоўцаў, якія спасьціглі гэтыя спосабы*. Палеміка паміж Дракахрустам і Кацуком у «ARCHE»[1], і дыскусія на сайце «belintellectuals», перадрукаваная ў «ARCHE»[2], мела ўжо характар *дыяпорыі* - зьявіліся рознагалосьсі вакол шэрагу «вырашаных» на папярэднім этапе справаў, а закончылася ўсё *апорыяй*, пастаўленай Аленай Гапавай у «Мітах пра міты беларускай сацыялёгіі»[3] вуснамі Паўла Севярынца: «Калі адкажам на ўсе вясковыя пытаньні так, каб іх і глыбінка пачула...»

У тым, што грэцкі парадак разумаваньня ў гэтым выпадку явіўся ў «перавернутым» выглядзе, няма нічога благога. З пункту гледжаньня навуковага поступу гэта і добра, што інтэлектуальныя пошукі не заканчваюцца на эўпорыі. Эўпорыя - гэта насамрэч не разьвязка ўсіх праблемаў з пэўнага абсягу, а момант зьяўленьня шэрагу новых праблемаў альбо новых спосабаў артыкуляцыі і вырашэньня старых праблемаў. Старажытная трохэтапная канцэпцыя разумаваньня ў мадэрнізаванай Попэрам вэрсіі становіцца чатырохэтапнай:

P-1 → TS → EE → P-2,

дзе P-1 - пачатковая праблема, TS (*trial solution*) - пробнае разьвязаньне праблемы, EE (*error elimination*) - распазнаньне і выключэньне памылак, P-2 - новая праблема альбо «новая якасьць» старой праблемы. (Усе чатыры сымбалі варта інтэрпрэтаваць як мноствы: P-1 - гэта зазвычай не адна праблема, а група праблемаў, пад TS зазвычай хаваецца некалькі пробных разьвязаньняў праблемаў P-1, суадносна, павінна быць для кожнага вырашэньня ўласная працэдура выключэньня памылак, а кожная з гэтых працэдур адкрывае ў выніку новыя праблемы.)

Так сталася і ў выпадку згаданай дыскусіі. Працу «Міты...» Кацука можна аднесьці да TS. Яна была адказам на P-1, пэўныя праблемы ў галіне сацыялёгіі ў беларускім навуковым полі. TS спарадзіла ў сваю чаргу крытыку і спробы элімінацыі магчымых памылак (адпаведнік EE), а ў выніку зьявілася група новых праблемаў P-2, якія патрабуюць далейшых

дасьледаваньняў.

Паўстае, аднак, пытаньне: *як ацаніць кожны з гэтых этапаў*? Бо пастаноўка праблемы Р-1 ня можа быць адвольная, пробныя разьвязаньні (TS) павінны адпавядаць пэўным стандартам, а працэдура элімінацыі памылак (EE) прадугледжвае існаваньне якогась крытэру, паводле якога будзем адрозьніваць памылку ад не-памылкі. Кажучы гэта, ужо бачу скептычную ўсьмешку некаторых адмыслоўцаў, каторыя, пачуўшы мною сказанае, заявяць: няма чагосьці такога, як крытэрыялёгія навуковага пазнаньня. Існуюць толькі ўладныя мэханізмы, якія функцыянуюць унутры сацыяльнай групы, якая завецца «навукоўцамі», і ад іх залежыць валідызацыя пэўнага вырашэньня.

Што ж, спосабы ануляваньня пастаўленага мною пытаньня «Як ацаніць?» існуюць не ад сёньня і не ад учора. Найбольш папулярным спосабам ануляваньня ёсьць выкарыстоўваньне інстытуцыяналісцкіх дэфініцыяў. У аднаго прафэсара псыхалёгіі, які шмат гадоў займаўся дасьледаваньнем узроўню інтэлекту прадстаўнікоў пэўных сацыяльных групаў, запыталіся: «А што такое інтэлект?» Ягоны адказ абмежаваўся да сьцьвярджэньня: «Гэта якраз тое, узровень чаго я спрабую ўстанавіць у дачыненьні да дадзеных групаў». Сам спадар Кацук падчас дыскусіі са мной у «Жывым Журнале» падаў такую дэфініцыю прафэсіяналізму: «Ёсьць самае простае разуменьне «прафэсіяналізму» - калі хтось гэтай справай зарабляе на жыцьцё». А каб канчаткова выбіць з маёй галавы ўсякія магчымыя ілюзіі, строга дадаў: «А разумець прафэсіяналізм як узорнае валоданьне - гэта, прабачце, дзіцячы садок»[4]. Ну, калі так, дык хацелася б па-дзіцячы спытацца: ці пагодзімся мы з тым, што Гарлахвацкі і Чарнавус зь вядомай камэдыі К. Крапівы ў аспэкце прафэсіяналізму нічым ня розьняцца? Абодва зарабляюць на жыцьцё, працуючы ў сваёй прафэсіі, дык чаму літаратурныя крытыкі першага называюць не іначай, як прайдзісьветам, а другога ацэньваюць як сумленнага навукоўца-прафэсіянала? Гэта таксама ілюзія? Мне здаецца, што ўсё ж ёсьць *рэальная* розьніца паміж Гарлахвацкім і Чарнавусам, і што ўсякія інстытуцыяналісцкія дэфініцыі - даволі танны і малавартасны прадукт.

Заданьнем гэтае працы будзе разважыць магчымасьці мэтанавуковай крытэрыялёгіі, але такой, якая б дазваляла ацэнцы работы навукоўца пазьбягаць інстытуцыянальнага, з аднаго бок, сацыялягісцкіх аргумэнтаў, якіх было багата ў ходзе згаданай дыскусіі. Маю намер займацца *першым этапам* дыскусіі. Хачу паглядзець, якія праблемы хаваюцца пад зыходнай праблемай: аўтаномія сацыялёгіі і незалежнасьць сацыёляга. А гэтых праблемаў - процьма. Адразу зазначу, што аналіз будзе няпоўны. Ён будзе *матэрыяльна* няпоўны, бо ўсебаковы аналіз праблематыкі, узьнятай у часе дыскусіі, намнога большага абсягу, які будзе ўзяты пад разгляд мною. Будзе таксама *фармальна* няпоўны, бо ўсебаковы аналіз усіх праблемаў, патрабаваў бы намнога большай працы. А праблемы, якія, на маю думку, «хаваюцца» пад пазначанай вышэй зыходнай праблемай, наступныя: праблема «вызваленьня» сацыялёгіі (ад філязофіі), праблема навуковае базы, то бок «сацыяльнае фактаў», і роля ўва ўсім гэтым Эміля Дуркгайма.

1. КОМПЛЕКС (НЕ)ЗАЛЕЖНАСЬЦІ АД ФІЛЯЗОФІІ

Учитель танцев: Вы, сударь, сказали, что искусство фехтования выше, чем танцы?
Учитель фехтования: Сказал.
Учитель музыки: И выше, чем музыка и театр?
Учитель фехтования: Выше.
Учитель танцев: Это хамство, сударь.
Учитель фехтования: Напротив, это вы - дурак.

Михаил Булгаков.
Полоумный Журден.

Праект аўтаномнай, незалежнай сацыялёгіі, заяўлены Міколам Кацуком на самым пачатку яго артыкулу «Міты...», прадугледжвае між іншым вызваленьне ад філязофіі. «Сацыялёгія наагул, пачынаючы з комтаўскага «Курсу пазытыўнай філязофіі», становіцца магчымай толькі пры разрыве зь філязофскай устаноўкай», - піша аўтар, а затым расказвае пра непамыснае становішча сацыялёгіі ў савецкія

1. Каб
мэтанавуковай
ацэнцы
бок,
згаданай
дыскусіі.
першым этапам
(Р-1)
дыскусіі.
зыходнай
сацыёляга.
аналіз
праблематыкі,
абсяг,
фармальна
патрабаваў
маю думку,
праблемай,
філязофіі),
фактаў»,
1. КОМПЛЕКС (НЕ)ЗАЛЕЖНАСЬЦІ АД ФІЛЯЗОФІІ

Учитель танцев: Вы, сударь, сказали, что искусство фехтования выше, чем танцы?
Учитель фехтования: Сказал.
Учитель музыки: И выше, чем музыка и театр?
Учитель фехтования: Выше.
Учитель танцев: Это хамство, сударь.
Учитель фехтования: Напротив, это вы - дурак.

Михаил Булгаков.
Полоумный Журден.

Праект аўтаномнай, незалежнай сацыялёгіі, заяўлены Міколам Кацуком на самым пачатку яго артыкулу «Міты...», прадугледжвае між іншым вызваленьне ад філязофіі. «Сацыялёгія наагул, пачынаючы з комтаўскага «Курсу пазытыўнай філязофіі», становіцца магчымай толькі пры разрыве зь філязофскай устаноўкай», - піша аўтар, а затым расказвае пра непамыснае становішча сацыялёгіі ў савецкія

часы, калі гэтая навука бытавала ўвесь час у цяні філязофіі: «*Сацыёляг быў убудаваны ў сыстэму на ўзроўні тэхнічнага памочніка філёзафа і/альбо адміністратара*«.

Рысуючы праект сацыялёгіі, вольнай ад філязофіі, Кацук зьвяртаецца да аднаго з клясыкаў сацыялягічнай думкі, Эміля Дуркгайма. У тэксьце «Тыпы навуковай рацыянальнасьці і тэарэтыка-мэтадалягічныя ўстаноўкі сацыялёгіі Э. Дуркгайма»[5] чытаем: «Праектыўная, практычная скіраванасьць сацыялёгіі супрацьпастаўляецца філязафічнай ведзе дзеля веды; таму сацыялёгія «ня вырачана заставацца галіною агульнае філязофіі, што яна здольная шчыльна судакранацца з канкрэтнымі фактамі і не ператварацца пры гэтым у проста практыкаваньне з галіны эрудыцыі». Тое, якое вялікае значэньне Мікола Кацук надае гэтаму выказваньню Дуркгайма, відаць з таго, што ў адказ на тэзу Паўла Баркоўскага пра «сацыялягічную прасякнутасьць філязофіяй», той абмежаваўся толькі да *argumentum ex auctoritate*: папросту пакінуў без камэнтара тую ж цытату, якую пазьней знаходзім у ягоных «Тыпах навуковай рацыянальнасьці...» (сацыялёгія «ня вырачана заставацца галіною агульнай філязофіі»), ня рупячыся пра тое, каб разважыць, ці «прасякнутасьць філязофіяй» і «быцьцё галіной агульнай філязофіі» адно і тое ж, ці не. Ніхто зь фізыкаў або матэматыкаў, бадай, не пярэчыць, што квантавая фізыка ці мэтаматэматыка прасякнуты філязофіяй, але ніхто ня кажа пры гэтым, што фізыка ці матыматыка - галіны агульнай філязофіі.

5 Sociologia.by

Ня менш цікавы далейшы ход дыскусіі на гэтую тэму. Пасьля таго, як Баркоўскі, не здаючыся, прыкмеціў, што прынамсі «на ўзроўні мэтарэфлексіі ты ўжо ня будзеш сацыёлягам, а абываталем ці філёзафам, як пашанцуе», зьявіўся гэткі адказ Кацука: «Шаноўны Павал! Ты зразумеў усё дакладна. Я табе разумную рэч скажу, толькі ты не крыўдуй. Ты зразумеў усё дакладна, але ж - як філёзаф». Пазьнейшыя даволі шырокія развагі прысьвечаны эксплікацыі сказанага, дзеля чаго нават створана адпаведная фармалізацыя: «Пазначым філязофію як Ф, а сацыялёгію як С. Тады твая мапа будзе наступная - Ф і Ф (С), а мая - С і С (Ф). Такім чынам, ёсьць філязофія і філязофскія ўяўленьні аб сацыялёгіі і сацыялёгія і

сацыялягічныя ўяўленьні аб філязофіі». І што нам дае гэты вывад?

Спачатку адзначым, чаго не дае. Не дае адказу на пытаньне Баркоўскага, якім чынам магчымая мэтарэфлексія над сацыялёгіяй і валіднасьцю сацыялягічных мэтадаў без прыняцьця філязафічнае пазыцыі. Гэтую заўвагу Кацук папросту абмінае пры дапамозе адпачатна прынятай інстытуцыяналісцкай пазыцыі: «Ты зразумеў усё дакладна, але - як філёзаф. Патрабаваць чагосьці іншага - немагчыма».

А што тычыцца пытаньня, што вывад Кацука *дае*, дык дае ён інфармацыю пра вызнаваную ім *анталёгію сацыяльнага асяродзьдзя* (АСА). Сутнасьць гэтае анталёгіі зводзіцца да наступнага: калі x належыць да асяродзьдзя A, то яго індывідуальнае мысьленьне дэтэрмінавана калектыўным мысьленьнем гэтага асяродзьдзя. Гэтую анталёгію можна паказаць наступным чынам:

АСА: $\forall\, x\, (x \in A) \rightarrow [\mathrm{M}(A) \gg \mathrm{M}(x)]$,

дзе знак «≫» абазначае стасунак дэтэрмінацыі (папярэднік дэтэрмінуе наступнік), а «М» - мысьленьне. Цяпер, маючы перад вачыма фармалізацыю вызнаванай Кацуком анталёгіі, можна разважыць яе валіднасьць.

Сур'ёзныя засьцярогі выклікае правы бок імплікацыі, дзе фігуруе сымбаль «М(A)». Як ідэнтыфікаваць дэсыгнат «М(A)»? Што такое «калектыўнае мысьленьне»? Ну так, паважаны Дуркгайм таксама карыстаецца падобнай катэгорыяй («калектыўная сьвядомасьць»), але спасылка на аўтарытэт зьяўляецца даволі слабым аргумэнтам. Катэгорыя калектыўнага мысьленьня, гэтаксама як і катэгорыя калектыўнай сьвядомасьці, зьяўляецца праблемным паняткам. Я не кажу, што бессэнсоўным, але яна патрабуе выясьненьня, асабліва тады, калі ўтварае фундамэнт сацыялягічнай анталёгіі. Дастаткова паставіць пад сумнеў існаваньне чагосьці такога, як «калектыўнае мысьленьне», каб імплікацыя АСА страціла сваю абавязальную сілу. Бо калі анталягічны статус М(A) - няясны, то тады правы бок імплікацыі можа атрымаць вартасьць ня большую, чым $\frac{1}{2}$. А калі так, то, прымаючы, што

левы бок праўдзівы, атрымліваем гэткі стасунак: 1 → ½. Той, хто знаёмы з элемэнтамі лёгікі, ведае, што ў такім выпадку вартасьць усяе імплікацыі будзе ½. Такім чынам, вартасьць прынятай Кацуком анталёгіі сацыяльнага асяродзьдзя трэба падаць так: *можа-праўдзівая-можа-непраўдзівая*.

Але давайце прымем, што камусьці ўдалося праясьніць панятак калектыўнага мысьленьня і што існуюць эфэктыўныя спосабы ідэнтыфікацыі дэсыгнату M(*A*). Ня ведаю, ці на практыцы гэта камусь удалося, але маем права прынамсі тэарэтычна прыняць такую магчымасьць. Толькі гэтага надалей будзе недастаткова, каб праваму боку імплікацыі прызнаць вартасьць 1. Бо нават калі і прымем рэфэрэнцыйнасьць M(*A*), дык асобна трэба даказаць яшчэ, што паміж M(*A*) і M(*x*) існуе стасунак дэтэрмінацыі. А гэта азначае пераход да комплексу новых філязафічных праблемаў...

Я ня буду на гэтым месцы паглыбляцца ў анталягічныя разважаньні над рэальнасьцю/фікцыйнасьцю такога быцьця, як калектыўнае мысьленьне, ня буду таксама разважаць праблему дэтэрмінацыі. Адзначу толькі, што *за сацыялягісцкай пазыцыяй Міколы Кацука хаваюцца даволі моцныя анталягічныя, то бок, філязафічныя ўстаноўкі*. Дадам, што гэта зусім не «нявінныя» ўстаноўкі, а такія, якія сутнасна абумоўліваюць кшталт сацыялёгіі. А калі так, то яны патрабуюць грунтоўнай экспэртызы і праверкі на якасьць. А калі так, то сацыёляг мусіць альбо сам стацца філёзафам (гэта магчыма), альбо запрасіць да супрацоўніцтва філёзафа *ex professione*.

Можна, канечне ж, у імя непакоры і аўтаноміі сваёй дысцыпліны заявіць, што са згаданымі тэзамі сацыёляг справіцца цалкам аўтаномна, г. зн. не выходзячы са скуры сацыёляга і без дапамогі з боку філёзафа (мабыць, дзеля гэтага і існуе адмысловая дысцыпліна пад назовам «сацыялёгія сацыялёгіі»). Можна спаслацца на аўтарытэт Дуркгайма, маўляў, і ён прымаў такую ж анталёгію. Можна, урэшце, ужыць яшчэ раз той прыём, што быў выкарыстаны ў дачыненьні да Баркоўскага, і заявіць, што тэза Рудкоўскага пра абумоўленасьць сацыялягістычнай пазыцыі Кацука пэўнай анталёгіяй ёсьць выключна «бачаньнем філёзафа», якое

неабавязковае для сацыёляга. У крайнім выпадку можна «замкнуць» дыскусію пры дапамозе слаўнай Лятаравай тэзы пра «неперакладальнасьць ідыёмаў», маўляў, філёзаф і сацыёляг карыстаюцца ўласнымі ідыёмамі і таму ня могуць адзін аднаго зразумець.

Ніхто, канечне ж, ня можа забараніць навукоўцу заняць пазначаную вышэй пазыцыю. Але ніхто таксама ня можа забараніць нам паставіцца крытычна да такой пазыцыі. Цьверджу, што запачаткаваньне «сацыялёгіі сацыялёгіі» не вырашае праблемы гетэраноміі сацыялёгіі на ўзроўні мэтарэфлексіі. Бо што значыць «сацыялёгія сацыялёгіі»? Гэта значыць, што сацыялёгія першага ўзроўню становіцца прадметам вывучэньня сацыялёгіі другога ўзроўню. Гэтым двум узроўням сацыялёгіі адпавядаюць два ўзроўні мовы ў лягічных сыстэмах Тарскага, Карнапа і Расэля: *object language*, прадметная мова, званая таксама *primary language*, мова першай ступені, якая адносіцца да вонкавага, экстралінгвістычнага сьвету, супрацьпастаўлена «мэтамове», аб'ектам якой зьяўляюцца лінгвістычныя аб'екты. Тэарэтычна існуе бясконцае мноства гэтых узроўняў, бо для кожнага n-узроўню мовы існуе мэтаўзровень $n+1$. Існуе, аднак, з часоў позьняга Сярэднявечча прынцып, што сказ p ня можа адносіцца да самога сябе, г. зн. ня можа належаць адначасова да n-узроўню і да $n+1$. (Забарона прызнаваць аўтарэфэрэнцыйнасьць сказаў прадыктавана практыкай. Калі праігнаруем гэты прынцып, то можым сутыкнуцца з праблемай вызначэньня лягічнай вартасьці такога сказу: «Тое, што напісана ў гэтым сказе, ёсьць фальшам».)

Лічу, што гэты прынцып можна і трэба расьцягнуць на дыскурсы і навукі. Гэтаксама, як сказ ня можа рэфлектаваць сам сябе, так ня могуць самі сябе рэфлектаваць цэлыя дыскурсы. Калі хтось займае да сацыялёгіі крытычную паставу, то ня можа ў працэсе праверкі мэтадаў карыстацца мэтадамі, валіднасьць якіх зьяўляецца аб'ектам дасьледаваньняў! Я ня цьверджу пры гэтым, што «сацыялёгія сацыялёгіі» ні ў якім сэнсе немагчымая. Яна магчымая і мае вялікае значэньне пры ўмове, што ўспрымаецца як частка шырэйшай дысцыпліны, а менавіта - сацыялёгіі навукі. Гэтаксама, як магчымай

зьяўляецца гісторыя навукі (у рамках яе - гісторыя матэматыкі, гісторыя фізыкі, гісторыя філязофіі, гісторыя гісторыі і г. д.), так магчымай ёсьць сацыялёгія навукі, адным са спэцыфічных аб'ектаў дасьледаваньняў якой можа стацца сама сацыялёгія. Але так разуметая сацыялёгія сацыялёгіі не павінна блытацца з крытэрыялягічнай рэфлексіяй над дасьледніцкай практыкай сацыёлягаў, бо гэта апошняя прадугледжвае заангажаваньне філязафічнага інструмэнтару. *Сацыялягічная рэфлексія над сацыялёгіяй можа спадарожнічаць крытэрыялягічнай рэфлексіі*, але ня можа яе замяняць.

І тут крытычны сацыёляг, магчыма, увойдзе ў слова і рашуча заявіць: сацыялёгія сацыялёгіі *можа* замяніць філязафічную крытэрыялёгію. Магчыма, сацыёляг зноў спашлецца на дуркгаймаўскія «Régles...» і яшчэ раз падкрэсьліць, што сацыялёгія «*ня вырачана заставацца галіною агульнай філязофіі*«. У такім выпадку нам прыйдзецца выявіць у яго чарговую *філязафічную* ўстаноўку, якая завецца *экстэрналізмам*. Згодна зь ёй, навука разьвіваецца ня водле якойсьці ўласнай лёгікі, а выключна пад уплывам вонкавых чыньнікаў (гістарычна-культурнага кантэксту, палітычных і эканамічных умоваў, наяўнасьці сродкаў камунікацыі і г. д.), якія і ёсьць аб'ектам сацыялягічных дасьледаваньняў. Толькі пры прыняцьці такой устаноўкі становіцца магчымай рэдукцыя мэтасацыялёгіі да сацыялёгіі сацыялёгіі.

Зноў жа, ня буду на гэтым месцы разважаць правамоцнасьць гэтае опцыі і аналізаваць яе магчымыя перавагі або недавагі ў стасунку да канкурэнцыйнай опцыі, *інтэрналізму*. Абедзьве опцыі мелі і маюць багата аўтарытэтных прыхільнікаў і абедзьве, несумнеўна, маюць права на існаваньне. На гэтым месцы маёй мэтай ёсьць паказаць нешта іншае: сацыёляг, які захацеў бы рэдукаваць мэтарэфлексію над сацыялёгіяй толькі да «сацыялёгіі сацыялёгіі», мусіў бы тым самым прызнаць, што зьяўляецца спавядальнікам *аднае зь філязафічных опцыяў*, а менавіта экстэрналізму.

Каб пазьбегнуць магчымых непаразуменьняў, удакладню, у якім сэнсе лічу сацыялёгію сацыялёгіі немагчымай, у якім сэнсе - магчымай і ў якім сэнсе - філязафічна абумоўленай.

Немагчымай лічу ў *якасьці крытэрыялёгіі*, рэфлексіі над спосабамі праверкі валіднасьці сацыялягічных тэзаў і тэорыяў. Магчымай лічу ў *якасьці часткі сацыялёгіі навукі* як апісальнай дысцыпліны. Але так разуметая сацыялёгія сацыялёгіі не зьяўляецца крытэрыялёгіяй. Філязафічна абумоўленай лічу сацыялёгію сацыялёгіі тады, калі яна наўпрост ці ўскосна прасоўвае тэзу, што сацыялягічная мэтарэфлексія павінна абмежавацца да апісаньня гістарычна-культурных, палітычных ды інстытуцыйных абумоўленасьцяў.

У любым выпадку сацыялёгія сацыялёгіі патрабуе якогась філязафічнага падмурку.

Ці гэтая «непазьбежнасьць філязофіі» зьяўляецца пракляцьцем ці благаслаўленьнем? Вядома ж, пракляцьцем, але толькі для тых, хто прывык паўсюль бачыць «прагу ўлады» ці, выкарыстоўваючы тэрмін П'ера Бурд'ё, *libido dominandi*. Калі філёзаф узяўся даказваць «непазьбежнасьць філязофіі», значыць, хаваецца за гэтым якісь прыватны або групавы інтарэс. Ну, можна на гэтым месцы яшчэ раз зьвярнуцца да аўтарытэту Бурд'ё і заявіць, што калі і хаваецца за ўсім гэтым якісь інтарэс, дык гэтым інтарэсам ёсьць папросту *libido sciendi*, але наўрад ці гэты аргумэнт спрацуе, дарма што сярод беларускіх сацыёлягаў Бурд'ё, як здаецца, карыстаецца папулярнасьцю. Як бы там ні было, прапаную - у процівагу «сацыялягічнай» мапе спадара Кацука - сваю «філязафічную» мапу, на базе якой можна будзе выпрацаваць якуюсь мадэль супрацоўніцтва філёзафа і навукоўца. (Тут мушу ўдакладніць слова «сваю». Гэтая «мапа» не зусім мая, бо яна створана на базе лягічных і эпістэмалягічных дасьледаваньняў працаўнікоў Інстытуту філязофіі Ягелёнскага ўнівэрсытэту, зь якімі мне даводзілася пазнаёміцца падчас лекцыяў і сэмінараў.)

[image] Сьвет, у якім мы жывем, повен загадкаў і неспадзевак. Ён багаты, складаны і разнастайны. Дзеля таго, каб *павялічыць шанцы* для чалавечага розуму ўзяць пад увагу як мага большы абсяг рэчаіснасьці, існуе *анталёгія*, рэфлексія над усім існым - ці то патэнцыйна, ці актуальна. Таму аб'ектам анталягічных штудыяў зьяўляецца *ўсё*. Гэтае «ўсё» трэба браць усур'ёз, бо анталёгія займаецца усім, што хаця б на момант становіцца

інтэнцыянальным карэлятам чалавечай сьвядомасьці. Згодна з Майнонгам, такім карэлятам могуць быць натуральныя саматычныя прадметы (камяні, плянэты, жывыя арганізмы), матэрыяльныя артэфакты (крэслы, сталы, дамы), аб'ектывы (сказы-суджэньні, станы рэчаў), дэзыдэратывы (прагненьні, памкненьні, жаданьні), дыгнітатывы (справядлівасьць, праўда, дабро, прыгажосьць), магчымыя аб'екты (залатая гара, іншаплянэтнікі), інтэнцыянальныя артэфакты (вершы, навуковыя канцэпцыі, мастацкія творы), а нават спрэчныя аб'екты (квадратнае кола).

Унутры анталёгіі бытуюць, аднак, тры дысцыпліны, якія, застаючыся часткай анталёгіі, характарызуюцца пэўнай аўтаноміяй. Гэта фэнамэналёгія, мэтафізыка і навука. Фэнамэналёгія мае дачыненьне з тым-што-явіцца сьвядомасьці ў наглядным пазнаньні (*Anschauungen*). «Тое-што-явіцца» ня трэба атаясамліваць са «зьявай», бо зьява зазвычай насычана далёка пасунутай інтэрпрэтацыяй. Напр. беспрацоўе можа быць для сацыялёгіі зьявай, але ня можа яно быць аб'ектам фэнамэналёгіі, бо тут, згодна з пастулятам Гусэрля, можна ўзяць пад увагу тое-што-явіцца *і толькі ў тых межах, у якіх явіцца ў наглядным пазнаньні*. А «беспрацоўя» ў наглядным пазнаньні не назіраем! Мэтафізыка займаецца тым, што *актуальна існуе*. Яна зазвычай перакрыжоўваецца з фэнамэналёгіяй (хоць можна ўявіць і такія сыстэмы, у якіх яны будуць выключаць адна адну альбо супадаць адна з адной), г. зн. існуе *абсяг аб'ектаў, якія явяцца ў наглядным пазнаньні* (НП) і *існуюць актуальна* (ІА). Калі хтось прымае, што НП = ІА, то тады мэтафізыка зьяўляецца фэнамэналёгіяй і наадварот, а калі прымае, што НП $\supset \subset$ ІА, то гэта значыць, што гэтыя дзьве дысцыпліны існуюць цалкам незалежна адна ад адной (не перакрыжоўваюцца). І, нарэшце, «трэці райх» у гэтай мадэлі: навука.

Навука працуе на тым абсягу рэчаіснасьці, дзе грунт даволі цьвёрды, а прылады працы праверaныя на эфэктыўнасьць. Навука ў пэўных абсягах сутыкаецца з мэтафізыкай і фэнамэналёгіяй, бо мае дачыненьне і з такімі аб'ектамі, якія явяцца ў наглядным пазнаньні, і з такімі, якія існуюць актуальна. Але ня ўсе аб'екты навукі існуюць актуальна і ня ўсе

явяцца ў наглядным пазнаньні. Навука мае дачыненьне, напрыклад, з тэарэтычнымі суцьцямі (*theoretical entities*) - тэорыямі, гіпотэзамі, дапушчэньнямі, ідэямі - актуальнасьць існаваньня якіх многімі адмаўляецца. Ну, а згаданае «беспрацоўе» ёсьць прыкладам аб'екту, што зьяўляецца аб'ектам навукі, але не зьяўляецца аб'ектам фэнамэналёгіі.

Пры дапамозе гэтае «мапы» можам паспрабаваць устанавіць, якая роля антоляга (то бок філёзафа) у Каралеўстве Пазнаньня. Насамперш трэба выразна сказаць, што эра быцьця філязофіі «маткай навук» скончылася. Навукі набылі дастатковую самастойнасьць, каб працаваць на сваім абсягу без пратэкцыі з боку філязофіі. Для філязофіі засталіся «балотныя абсягі», тыя абсягі рэчаіснасьці, якія не паддаюцца (пакуль што) асвойваньню пры дапамозе навуковых мэтадаў. Працуючы на гэтых балотных абсягах, філязофія нястомна займаецца пытаньнем: а пры дапамозе якіх сродкаў (мэтадаў) гэтыя абсягі маглі б быць асвоены навукай? І тады, калі знаходзіць гэтыя сродкі-мэтады, уручае іх навукоўцам, а сама адыходзіць далей, на новыя абсягі... *Філязофія працуе на карысьць аўтаноміі і эмансыпацыі спэцыяльных навук.*

Але абсяг, на якім працуюць навукоўцы, таксама месцамі бывае «балоцістым». Тыповым праблемным момантам у галіне фізыкі зьяўляецца мікракосмас (напр. пытаньне, ці мы *назіраем* электрон, ці *спараджаем* яго пры дапамозе дасьледніцкай апаратуры), у галіне біялёгіі - праблема зьяўленьня жыцьця на Зямлі, у матэматыцы - спосаб існаваньня матэматычных аб'ектаў (напр. лічбы - рэальныя аб'екты ці мэнтальныя канструкты?), у псыхалёгіі - спосаб пазнаваньня «нябачных» аб'ектаў, як пераканаьні, жаданьні, матывы, ну а ў сацыялёгіі - «сацыяльныя факты». І цяпер можам зразумець ролю філязофіі і філёзафаў у навуковым асяродзьдзі. Філёзаф - гэта ня пан і не буржуй, які хоча прыўласьціць сродкі пазнавальнай вытворчасьці і пакінуць іншым падпарадкавальныя функцыі. Філёзаф - гэта свайго роду сантэхнік, выканальнік «чорнай работы», каторы зьяўляецца на навуковым абсягу толькі там і толькі тады, калі навуковыя прылады ў пэўны момант становяцца нефункцыянальнымі, работа стаіць на месцы, а навуковец разгублена чэша галаву.

Зрэшты, ня варта чакаць, пакуль навуковец пачне часаць галаву. Варта рэагаваць ужо тады, калі відаць, што «нешта ня так» з навуковымі інструмэнтамі, якімі ўзброіўся навуковец і што ў «прадукцыйным цыклі» назіраюцца перабоі. Перакананьнем, што «нешта ня так» і абумоўлена мая рэакцыя на згаданую сацыялягічную дыскусію.

2. САЦЫЯЛЁГІЯ ЯК НАВУКА. ПРАЕКТ ДУРКГАЙМА

Панкрас: Что за гам? Что за содом? Мне кажется, что здесь избивают человека? (...)
Учитель фехтования (плача): Они меня поколотили. (...)
Панкрас: Спокойствие. Прежде всего, сударь, измените вашу манеру выражаться. Вы должны сказать: мне кажется, что меня поколотили.

Михаил Булгаков.
Полоумный Журден.

Поруч з вызваленьнем ад філязофіі праект незалежнай сацыялёгіі прадугледжвае падпарадкаваньне сацыяльных навук «агульнай лёгіцы разьвіцьця навукі наагул». «На этапе зараджэньня навукі, - падкрэсьлівае Мікола Кацук у «Тыпах навуковай рацыянальнасьці...», - найбольшае значэньне мае аб'ектна-канстытуцыйная функцыя, паколькі яна вызначае далейшую лёгіку разьвіцьця пазнаньня». У чым заключаецца гэтая функцыя? У гэтым тэксьце знаходзім адно толькі цытату зь Мішэля Фуко, зь якой даведваемся, што аб'ектна-канстытуцыйная функцыя - гэта адна з функцыяў дыскурсу, дзякуючы якой ён (дыскурс) «устанаўлівае пэўныя абсягі, «у якіх могуць узьнікаць дадзеныя аб'екты і ўстанаўліваць дадзеныя адносіны». Што ж, трохі малавата інфармацыі пра функцыю, роля якой аж такая вялікая (вызначэньне далейшай лёгікі разьвіцьця пазнаньня).

2.1. Што такое «навука»? That's question...

Каб лепш зразумець сутнасьць «аб'ектна-канстытуцыйнай» функцыі, прыйшлося пакапацца ў іншым (даволі гермэтычным) тэксьце Кацука «Дыскурс, прыціснуты да сьценкі (Роздум пра

«ленінскую дыялектыку і мэтафізыку пазытывізму»)»[6]. Там у адной са спасылак знаходзіцца невялічкае паясьненьне цікавай для нас «функцыі дыскурсу»: «Інакш кажучы, дыскурс явіцца як практыка азначваньня, фармаваньня ўласных рэчаісных або ўяўленых аб'ектаў, якія могуць або ня могуць атрымаць навуковы статус».

З усяго гэтага мы даведаліся, што:

1) для пэўнага (а можа, кожнага?) дыскурсу Д уласьціва *ўстанаўліваньне* пэўнага мноства абсягаў М (*a-1, a-2, … , a-n*);

2) у гэтых абсягах (разумею: унутры іх) *могуць* узьнікаць *дадзеныя* аб'екты і ўстанаўлівацца *дадзеныя* адносіны.

Выдзеленыя *курсівам* словы асабліва патрабуюць выясьненьня. На жаль, не знаходзім выясьненьня таго, што значыць «*могуць* узьнікаць аб'екты» (калі «могуць», значыць іх узьніканьне абумоўлена, а калі абумоўлена, то чым?) і што значыць «дадзеныя» (напатканыя? адвольна ўстаноўленыя?). Бяз гэтых даакрэсьленьняў цяжка зразумець мэсыдж сказанага.

Але ёсьць «выясьненьне» *ўстанаўліваньня*:

3) існуе пэўная функцыя Ф, званая «аб'ектна-канстытуцыйнай»;

4) функцыі Ф прыпісваецца «найбольшае значэньне» ў справе запачаткаваньня навукі Н;

5) функцыя Ф: а) мае здольнасьць вызначаць далейшую лёгіку разьвіцьця пазнаньня; б) менавіта яна хавае ў сабе тую «сілу», дзякуючы якой дыскурс Д аказваецца здольным устанаўліваць тыя абсягі, пра якія была гаворка ў (1) і (2);

Намінацыя «аб'ектна-канстытуцыйная» анічога не праясьняе, толькі сыгналізуе «пакліканьне» функцыі («устанаўліваньне»), якое ўсьцяж застаецца загадкай. Зварот «найбольшае значэньне» належыць да экспрэсіўнае, а не апісальна-выясьняльнае мовы, таму зноў жа нічога не праясьняе. Нічога больш дакладнага пра «ўстанаўліваньне» не даведваемся з (5)

пункту.

Застаецца нам паспрабаваць расшыфраваць «аб'ектна-канстытуцыйную функцыю» пры дапамозе кантэксту:

6) дыскурс Д явіцца як практыка азначваньня, фармаваньня ўласных рэчаісных або ўяўленых аб'ектаў...

Ну так, магу пагадзіцца з тым, што «азначваньне» часьцяком можна разумець як «фармаваньне» аб'ектаў. Тое, што «значачы» аб'ект, нейкім чынам яго «фармую», зьяўляецца ад часоў Канта прадметам даволі сталага кансэнсусу сярод філёзафаў, хоць атаясамліваньне «азначваньне = фармаваньне» і небеспраблемнае. Але не магу зразумець сэнсу ўвядзеньня ў гэтым кантэксьце падзелу на «рэчаісныя» і «ўяўленыя» аб'екты. Калі, *значачы, фармую* аб'екты, то яны папросту маюць *ўмоўна-рэчаісны* характар і на гэтым усё. Хіба што аўтар меў на ўвазе фармаваньне не аб'ектаў, а фармаваньне *стасунку* да аб'ектаў (стасунку да аб'екту *як* да рэчаіснага або фармаваньне стасунку да аб'екту *як* да ўяўленага), але тады значыць, што ён нязграбна перадаў сваю ідэю.

Ня буду дадаваць, што ані (6), ані зварот «могуць або ня могуць атрымаць навуковы статус» ніяк не дапамагаюць нам зразумець сэнсу загадкавай функцыі і не дазваляюць адкрыць таямніцу «ўзьніканьня аб'ектаў і стасункаў».

Шчыра кажучы, трохі шкода было займаць час і ўвагу чытача гэтай аналітычнай пэдантэрыяй. Цалкам верагодна, што праведзены вышэй аналіз для многіх будзе ня дужа цікавы і, што горш, ён не такі і важны для асноўнае нашай тэмы. Але яго правядзеньне было прадыктавана: 1) прадбачаньнем закіду, што «агульная лёгіка разьвіцьця навукі», якую меў на ўвазе спадар Кацук, мною ня ўзята пад увагу (або незразуметая, або няправільна зразуметая). Дык вось, хацелася паказаць, што на разуменьне гэтае лёгікі я прысьвяціў паўдня ўласнага часу, забраў дзесьці 5 хвілінаў часу чытача і «змарнаваў» амаль цэлую старонку часопісу; 2) жаданьнем паказаць, што мова Фуко і Бадрыяра, якую можна назваць «мовай філязафічнай паэтыкі», а якой часам карыстаецца Кацук - гэта *гермэтычная* мова. «Гермэтычная» - ня значыць, што заганная. Я цаню Фуко і

Бадрыяра, гэтаксама як Гайдэгера, Дэрыду ці Лятара (таксама прадстаўнікоў «філязафічнай паэтыкі») як фармавальнікаў філязафічнае інтуіцыі. Але ня думаю, што іх мова адпаведная для крытычна-аналітычных тэкстаў, калі патрэбна аптымальная дакладнасьць і яснасьць у выказваньнях. Мова ж Фуко і Бадрыяра апэлюе перадусім да інтуіцыі і ўяўленьня, а гэта, з аднаго боку, фактары «пашырэньня гарызонтаў», але, з другога - «фактары замазваньня контураў», вытворцы расплывістых аб'ектаў... Калі хтось любой цаной хоча «пашырыць» (ці, можа, «паглыбіць») гарызонты, павінен падбаць пра распрацоўку такой паняткавай апаратуры, якая дасьць магчымасьць іншым *крытычна ацаніць* гэтае «пашырэньне».

Хоць нам (можа, толькі *мне*) так і не ўдалося зразумець сутнасьць «аб'ектна-канстытуцыйнай» функцыі дыскурсу, ведаем усё ж, што *сацыялёгія падпарадкавана агульнай лёгіцы разьвіцьця навукі*. Незалежна ад таго, ці гэтая «лёгіка» прадугледжвае адмоўнае ці дадатнае стаўленьне да клясычнай парадыгмы навуковай рацыянальнасьці, яе, гэтую парадыгму, трэба ўзяць пад увагу, бо яна ўтварае галоўны выходны пункт для разуменьня сацыялёгіі як навукі.

Гэтую парадыгму можна апісаць пры дапамозе схемы Опэнгаўза-Хэмпэля (O-X):

O-X:	C-1, L-1,	C-2, ... , L-2, ... ,	C-k L-r
	E		

дзе C-1, C-2, ... , C-k - *initial conditions*, апісаньне пачатковых умоваў (напр. сказ: «Вада знаходзіцца ў халадзільніку. Тэмпэратура ў халадзільніку -5° C»), L-1, L-2, ... , L-r - *universal laws*, універсальныя законы (напр. «Вада замярзае пры тэмпэратуры ніжэй за 0° C») і E - *explanandum*, факт, які патрабуе выясьненьня («Вада замерзла»). Згодна з гэтаю парадыгмай, навуковае выясьненьне ёсьць ня чым іншым, як насычэньнем каньюнкцыі

(C-1, C-2, ... , C-k) ∧ (L-1, L-2, ... , L-r),

званай *explanans*, для пэўнага факту Е. Формула дзейнічае і ў адваротным парадку: ведаючы пачатковыя ўмовы і адпаведны(я) закон(ы) можна дэдукаваць сказы, якія будуць сьцьвярджаць выступаньне пэўных фактаў. Гэта так званы прынцып зваротнасьці выясьненьня і прадказваньня.

Мэтанавуковая схема Опэнгаўза-Хэмпэля мае сваё адлюстраваньне ў вядомым «прынцыпе фальсыфікацыянізму» Карла Попэра (калі кажу пра «адлюстраваньне», дык ня маю на ўвазе «запазычаньня», бо фальсыфікацыянізм Попэра паўстаў значна раней ад схемы Опэнгаўза-Хэмпэля). Схематычна прынцып фальсыфікацыянізму (СФ) Попэра выглядае наступным чынам:

СФ: [(Т → о) ∧ (¬о)] → (¬Т)

Тэорыя (або гіпотэза, або дапушчэньне) Т можа быць сьмелая, нечаканая, рэвалюцыйная. Гэта нават добра, калі яна будзе такая, бо «сьмелая» тэорыя зазвычай інфармацыйна насычаная, а інфармацыйнасьць - гэта якраз тое, што патрэбна ў навуцы. Але яна павінна быць так сфармулявана, каб яе можна было праверыць. А праверыць яе можна будзе тады, калі зь яе можна будзе дэдукаваць сьцьвярджальныя сказы, праўдзівасьць або непраўдзівасьць каторых можна дастаткова лёгка ўстанавіць.

Зварот «дастаткова лёгка ўстанавіць» патрабуе тлумачэньняў. Насамперш будзе карысным зразумець, у якіх выпадках праўдзівасьць дэдукавальнага сказу «дастаткова цяжка ўстанавіць». Вось прыклад. У кніжцы аднаго доктара сацыяльных навук чытаю: «Уся ЛЕВАЯ МАСА ІДЗЕ НА ВЕЧНЫ СУД, бо не хацела заўважыць патрэбаў простага чалавека». Трэба прызнаць, што гіпотэза надзвычай сьмелая і нечаканая. Але ці ўдасца нам выдэдукаваць з гэтай гіпотэзы клясу сказаў, праўдзівасьць якіх будзе дастаткова лёгка ўстанавіць? Адзінае, што ўдаецца выдэдукаваць, гэта наступнае: «*Х* прытрымліваецца левых поглядаў» (пачатковая ўмова) і «Ён ідзе ў пекла» (пастуляваны факт). Для таго, каб тэзу прызнаць фальсыфікавальнай, трэба, каб існавала магчымасьць сьцьвердзіць, што існуе такі *х*, які прытрымліваецца левых поглядаў, але не ідзе ў пекла. А гэта пераўзыходзіць межы магчымага. Гэта прыклад, калі «дастаткова цяжка», нават

немагчыма паразумецца наконт праўдзівасьці дэдукаваных з тэорыі сказаў.

Сымбаль «o» абазначае *observational proposition*, сказ, які можа быць праверaны шляхам назіраньня. Прыкладам «назіральнага сказу» можа быць: «У часа-прасторавым абсягу *k* знаходзіцца чорная варона», які дэдукуецца з магчымай тэорыі: «Усе вароны - чорныя». Гэтая тэорыя зьяўляецца фальсыфікавальнай, паколькі мы можам бязь цяжкасьцяў уявіць такі стан рэчаў: «У часа-прасторавым абсягу *k* знаходзіцца белая варона», і ведаем, як яго праверыць. Гэты стан рэчаў выконвае функцыю *патэнцыйнага фальсыфікатара* гэтай тэорыі.

Мадэль навукі Опэнгаўза-Хэмпэля і зьвязаная зь ёю попэраўская працэдура праверкі навуковых тэорыяў уяўляюць сабой «ідэальную форму» навукі. Яе трэба разумець як *рэгулятарную* ідэю. Хоць вядома, што на 100 % навуковыя тэорыі зазвычай не адпавядаюць гэтаму ідэалу, то ўсё ж яго існаваньне як узорнай структуры, да якой навуковая тэорыя павінна набліжацца, дазваляе арыентаваць і арганізоўваць навуковую практыку. Як вакол мадэлі О-Х, так і вакол фальсыфікацыянізму Попэра вяліся шматлікія дыскусіі і зьяўляліся розныя спробы іх карэгаваньня, якія мелі на мэце больш «урэальніць» іх, зрабіць больш функцыянальнымі. У гэтай працы абмяжуюся толькі да згадкі пра крытычныя заўвагі, сфармуляваныя Квайнам адносна фальсыфікацыянізму Попэра. Натхнёны тэзамі Духэма, ён слушна заўважыў, што *ніякая тэорыя не правяраецца ізалявана* ад іншых тэорыяў і пераканаьняў. Усякай тэорыі спадарожнічае дадатковая веда. Такім чынам, попэраўская схема фальсыфікацыянізму павінна набыць больш складаную форму:

СФ': $[(TS \rightarrow o) \wedge (\neg o)] \rightarrow [(\neg T) \vee (\neg S)]$,

дзе «S» сымбалізуе веду, якая спадарожнічае гэтай тэорыі.

Лічу, што мадэль Опэнгаўза-Хэмпэля-Попэра ў вэрсіі Духэма-Квайна дастаткова функцыянальная ў якасьці ўзорнай мадэлі, якую можна выкарыстоўваць для праверкі дыскурсаў, якія прэтэндуюць на званьне «навуковых». Магчыма, ня ўсе

пагодзяцца з гэтым, гэта іх права. Але ў такім выпадку на іх ляжыць абавязак падаць уласную мадэль, пры дапамозе якой можна эфэктыўна тэставаць навуковыя тэорыі. Пакуль няма перад намі альтэрнатыўнай мадэлі, прапаную ацаніць сацыялягічны праект Дуркгайма-Кацука ў аспэкце яго адпаведнасьці навуковай парадыгме Опэнгаўза-Хэмпэля-Попэра.

Вярхоўнай ідэяй гэтай парадыгмы ёсьць *інтэрсуб'ектыўная правяральнасьць*. Сутнасьць гэтай ідэі ў наступным: у прынцыпе кожная дарослая асоба, пры наяўнасьці жаданьня і адпаведнага пазнаўчага інструмэнтару павінна мець *магчымасьць праверыць* тое, да чаго навуковец пераконвае. Гэтым самым ідэя інтэрсуб'ектыўнай правяральнасьці супрацьпастаўляецца ўсякага роду дагматызмам, аўтарытарызмам, эзатэрызмам, містыцызмам, упапізмам, эстэтызмам, гнастыцызмам і г. д., якія могуць «уварвацца» ў навуковую практыку. Калі спадар Кацук кажа, што «фізык альбо матэматык валодаюць манапольнымі правамі на выказваньні аб фізычным ці матэматычным сьвеце», то гэта выклікае пэўнае занепакаеньне і падазрэньне: ці раптам ня месьціцца ён дзесь у традыцыі гнастыцызму ці эзатэрызму? Занепакаеньне яшчэ больш узрастае, калі ў «Тыпах навуковай рацыянальнасьці...» знаходжу ідэю «фармаваньня «таямніцы» сацыялягічнае веды і яе прымяненьня», запазычаную, канечне ж, ад Дуркгайма. Фармаваньне «таямніцы» зьяўляецца спосабам супрацьпаставіцца штодзённай, «даксычнай» ведзе аб грамадзтве, якая для Дуркгайма - як падкрэсьлівае Кацук - уяўляла «найбольшую небясьпеку для сацыялёгіі».

Страх Дуркгайма перад «інфэкцыяй» з боку *common sense* у значнай ступені іррацыянальны. Назіраньні простага чалавека за жыцьцём грамадзтва (асабліва бліжэйшага асяродзьдзя) могуць быць часам больш трапныя, чым назіраньні сацыёляга. У любым выпадку, навуковец нічога ня страціць, а хутчэй атрымае карысьць, калі будзе слухаць і браць пад увагу меркаваньні шараговых людзей-неспэцыялістаў. Так, напрыклад, заоляг-спэцыяліст можа шмат цікавага для сябе даведацца пра лісаў ад паляўнічага, псыхоляг ад чалавека з багатым жыцьцёвым досьведам, тэоляг ад глыбока веруючага

чалавека і г. д. Сацыёляг тут не выключэньне. Пры гэтым варта памятаць, што багатая *паняткавая сетка*, якая ёсьць у галаве навукоўца, апрача свайго «плюсу» мае таксама ўласьцівы сабе «мінус», яна, з аднаго боку, павялічвае яго пазнавальныя магчымасьці, але, з другога боку, *можа абмяжоўваць* яго пазнавальны гарызонт, часам яна прымушае глядзець на сьвет скрозь прызму навуковых катэгорыяў і - і такое бывае! - «навуковых забабонаў». А што тычыцца стасунку навуковай веды да веды *common sense*, дык першая павінна супрацьпастаўляцца другой не як «таемнае» - «паўсюдна даступнаму», а як «крытычнае» - «дагматычнаму». Заданьнем навукоўца ёсьць не «фармаваньне «таямніцы», а элімінацыя «дагматычнага налёту», якога багата ў штодзённай «даксычнай» ведзе. А вось ад ідэі «фармаваньня «таямніцы» павявае злым духам гнастыцкага эзатэрызму.

Інтэрсуб'ектыўная правяральнасьць будзе магчымая тады, калі нам удасца паразумецца наконт «навуковай базы». Традыцыйна гэтай базай лічыліся *факты*. Некаторыя аналітычныя філёзафы нават выдумалі цікавую мянушку для фактаў: *truth-makers*, што можна перакласьці як «праўдатворцы». Факты - гэта тое, дзякуючы чаму сьцьвярджальныя сказы (*judgments*) набываюць лягічную вартасьць (праўду або фальш). Калі Попэр прадугледжвае ў сваёй схеме фальсыфікацыянізму правяральнасьць тэорыі пры дапамозе базавых сказаў, то мае на ўвазе перадусім магчымасьць суаднясеньня гэтых сказаў з *фактамі*.

Адначасна ж не сакрэт, што «факты» заўжды былі (і ёсьць) праблемным паняткам як для філёзафаў, так і навукоўцаў. Гісторыя дыскусіі вакол «фактаў» багатая і, магчыма, цікавая, але рэканструяваць яе тут ня будзем. Нас будзе цікавіць разуменьне «факту» ў сацыялягічным сэнсе, а канкрэтна ў тым сэнсе, у якім разумеў яго Дуркгайм, разумее Мікола Кацук і шэраг іншых сацыёлягаў. Але перад тым, як пачнем разважаць праблематыку фактаў (у пункце 2.3), мусім разважыць больш фундамэнтальную для дуркгаймаўскай сацыялёгіі катэгорыю - «сацыяльнае».

2.2. Таямніца «сацыяльнага»

Станаўленьне сацыялёгіі як навукі - прыкмячае Кацук - цесна зьвязана з узростам ролі індустрыяльнай капіталістычнай вытворчасьці, трансфармацыяй у палітычнай сфэры і разьвіцьцём прыродазнаўчых навук. Некаторыя праекты сацыялёгіі прадугледжвалі максымальнае ўпадабненьне гэтае дысцыпліны да ўзору *Naturwissenschaften*. Кацук пералічвае гэтыя праекты: сацыяльная фізыка, мэханіка, геаграфічны кірунак, біялягізм у выглядзе арганіцызму і сацыял-дарвінізму, псыхалягічны кірунак і дадае: «яны толькі пазначалі праблематыку і зьяўляліся спасылкамі і гістарычнымі ўмовамі пераходу да дысцыплінарнае формы арганізацыі сацыяльнага пазнаньня - сацыялёгіі». І «толькі Дуркгайм са сваім патрабаваньнем «выясьняць сацыяльнае праз сацыяльнае» - паклаў асновы самастойнае сацыяльнай навукі».

Такім чынам, *аўтаномія сацыяльнага* гарантуе *аўтаномію сацыялёгіі як навукі*. У такім выпадку важна выясьніць, што такое «сацыяльнае».

У тэксьце «Тыпы навуковай рацыянальнасьці...» Кацука, які зьяўляецца прэзэнтацыяй поглядаў Дуркгайма на сацыялёгію, удалося знайсьці шэсьць інтэрпрэтантаў сацыяльнага:

А) сацыяльнае → ідэальнае;
Б) сацыяльнае → культура;
В) сацыяльнае → дыскурсіўнае;
Г) сацыяльнае → вонкавае ў стасунку да індывіда;
Д) сацыяльнае → прымусовае;
Е) сацыяльнае → калектыўнае, звыш-ындывідуальнае.

Першае, што ў зьвязку з гэтым трэба адзначыць, гэта тое, што шэсьць характарыстык «сацыяльнага» рашуча замнога, каб магчы ўспрымаць «сацыяльнае» як *адназначны* тэрмін. Можам дзеля экспэрымэнту прыняць, што «сацыяльнае» - гэта адназначны тэрмін. Гэта азначала б, што ўсе пералічаныя (А-Е) характарыстыкі зьяўляюцца іманэнтнымі рысамі адной і той жа зьявы (сацыяльнага). А калі (А-Е) - гэта іманэнтныя рысы сацыяльнага, тады мусіць быць праўдзіваю імплікацыя (назавем яе *гіпатэзай адназначнасьці тэрміну «сацыяльнае»* - ГАС):

ГАС: Сац → (А ∧ Б ∧ В ∧ Г ∧ Д ∧ Е),

гэта значыць, што заўсёды, калі маем дачыненьне з сацыяльным, маем дачыненьне з усімі шасьцю аспэктамі (А-Е) *адначасова.* Дастаткова знайсьці казус, калі адзін з кампанэнтаў каньюнкцыі (А ∧ Б ∧ В ∧ Г ∧ Д ∧ Е) будзе фальшывым, каб сьцьвердзіць, што ўвесь правы бок імплікацыі фальшывы. А тады ўся імплікацыя будзе фальшывай згодна з прынцыпам: (1 → 0) → 0, які зьяўляецца аксіёмай клясычнага рахунку сказаў.

Цьверджу, што імплікацыю (ГАС) немагчыма абараніць. Калі, прыкладам, «дыскурсіўнае» Дуркгайм характарызуе як «ідэю, якая дзейнічае праз індывіда», а «калектыўнае» як «ананімнае ідэальнае надындывідуальнае ўтварэньне», больш таго, як «духоўную рэальнасьць», то трэба прызнаць, што тут маем дачыненьне хутчэй зь *дзьвюма рознымі зьявамі*, якія трэба разглядаць асобна, чым з двума аспэктамі аднае і тае ж зьявы. Магчыма, Мікола Кацук, які пастулюе (і слушна) *працэсуальны* падыход да сацыяльнай рэчаіснасьці, сьцьвердзіць, што дыскурсіўнае і калектыўнае - гэта сапраўды два аспэкты адной і той жа зьявы, паколькі ідэя, якая спачатку дзейнічае праз індывіда, у пэўны момант «унезалежніваецца» і становіцца чымсьці ананімным і надындывідуальным. Але «працэсуальная» інтэрпрэтацыя ня вырашыла б праблемы. Бо ў такім выпадку сацыяльнае набывае папросту *тэмпаральную рознасьць*: калі ў момант t маем дачыненьне зь зьявай *x*, а ў момант *t-1* са зьявай *y*, то *мусім прызнаць рознасьць* гэтых зьяваў, нават калі прымаем генэтычную залежнасьць паміж імі.

Сацыяльнае - гэта мнагазначны тэрмін. Калі гаворым пра калектыўныя ўяўленьні, напр. уяўленьні пра Амэрыку як ворага або Расею як ворага, то маем на ўвазе *іншы тып* сацыяльнага, чым тады, калі гаворым пра праграму мадэрнізацыі эканомікі. Інакш трэба ўспрымаць ідэалёгіі ці маральныя каноны, а інакш рэлігійныя пакланеньні, а яшчэ інакш юрыдычны кодэкс або фінансавую сыстэму. Такім чынам, гіпотэза (ГАС) павінна быць заменена новай, па-мойму, больш адэкватнай *гіпотэзай мнагазначнасьці тэрміну «сацыяльнае»* (ГМС):

ГМС: Сац → (А ∨ Б ∨ В ∨ Г ∨ Д ∨ Е).

У гэтым выпадку дастаткова, каб адзін з кампанэнтаў

каньюнктыўнай альтэрнатывы (А ∨ Б ∨ В ∨ Г ∨ Д ∨ Е) быў праўдзівы, каб уся імплікацыя была праўдзівай. Але гэткая «лібэралізаваная» канцэпцыя сацыяльнага адкрывае перад намі *мноства значэньняў*, якія могуць вязацца з тэрмінам «сацыяльнае». Калі кіравацца лёгікай формулы (ГМС), то можна налічыць ажно 41 значэньне, якія будуць прадуктам усіх магчымых камбінацыяў гэтых шасьці (А-Е) элемэнтаў.

Мнагазначнасьць можна заўважыць і ў выпадку паасобных характарыстык. Напрыклад, «прымусовасьць» можа быць рознаю. Думаю, спадар Кацук пагодзіцца, што *coercitive action* па-іншаму функцыянуе ў арміі, па-іншаму ў Акадэміі навук, а яшчэ па-іншаму ў асяродзьдзі «ARCHE».

Варта ўвагі, што ў тэксьце «Калі ж ён злачынца...» Кацук менавіта пры дапамозе катэгорыі «прымусу» растлумачвае фэномэн дыскусіі, запачаткаванай яго тэкстам «Міты...». «Тэкст мусіць быць па магчымасьці сэнсацыйны ці, сама меней, злабадзённы, а таксама ён павінен быць зразумелы пастаяннай аўдыторыі», - гэтак «з сацыялягічнага пункту гледжаньня», Кацук тлумачыць факт напісаньня такога, а ня іншага тэксту, выбар такой, а ня іншай аргумэнтацыі. Шчыра кажучы, я, як чытач «ARCHE», аддаў бы перавагу тэкстам, якія былі б хай сабе *менш сэнсацыйныя*, але напісанымі *без прымусу* з боку такой ці іншай рэдактарскай палітыкі. І што больш, прымаю (можа, наіўна?), што яна, гэтая рэдактарская палітыка, фактычна бярэ пад увагу густы і запатрабаваньні такіх, як я, і дазваляе сваім аўтарам публікаваць тэксты *з пачуцьцём свабоды*. (Пры гэтым ня трэба блытаць «актуальнасьць» і «сэнсацыйнасьць», «публіцыстычны талент» і «публіцыстычны папулізм».) Ну, тут спадар Кацук, магчыма, зьвернецца да славутай бадрыяраўскай катэгорыі *сымулякрум* і адзначыць, што адным з заданьняў рэдактарскай палітыкі ёсьць якраз *сымуляваньне* свабоды слова на старонках свайго часопісу, бо «ілюзія свабоды» ўплывае станоўча на попыт, але *на самай справе* мы ўсе - уключаючы Кацука і мяне - ахвяры нябачнага, але ўсюдыіснага Прымусу. А калі так, то катэгорыя прымусу ў сацыялягічным дыскурсе, бадай, ня розьніцца ад катэгорыі абсалютнага духу ў мэтафізычнай сыстэме Гэгеля.

Дык што тады: сацыялёгія - гэта навука ці мэтафізыка?

Аўгуст Комт, якога Дуркгайм вельмі паважаў і менаваў нават «бацькам сацыялёгіі», дзеля разьмежаваньня навукі і мэтафізыкі прадугледжваў крытэр «перабываньня ў сфэры фактаў». Пазытыўная навука мае дачыненьне з фактамі, прычым *вонкавымі* фактамі, а мэтафізыка займаецца бясплоднымі спэкуляцыямі над адцягненымі існасьцямі. Дуркгайм, чые погляды сфармаваліся пад канец XIX ст., калі ў Францыі - дзякуючы нястомнаму прапагандысту камтызму Эміля Літрэ - ідэі Комта фармавалі інтэлектуальны этас «прагрэсіўных» навукоўцаў, быў пастаўлены перад неабходнасьцю задэкляраваць сваё стаўленьне да фактаў. Ну і што мог тады зрабіць амбітны навуковец, калі ў паветры вісела «наканаваньне»: скажы, якое тваё стаўленьне да фактаў, а я скажу, які ты навуковец? І Дуркгайм на два пазытывісцкія пытаньні адказаў пазытыўна: так, мая навука мае дачыненьне з *фактамі*. Так, мая навука займаецца *вонкавымі* фактамі...

2.3. «Рэчы», «факты» і «артэфакты»

Спадар Кацук, рэфэруючы погляды Дуркгайма, сьцьвярджае:

Вырашыць пастаўленыя задачы Дуркгайм намагаецца пры дапамозе маніфэставанага ім сацыялягічнага мэтаду. (...) Асноўнымі тэзамі гэтага мэтаду, як вядома, зьяўляюцца:

1. Сацыяльныя факты павінны разглядацца як рэчы.

2. Сацыяльныя факты павінны разглядацца як нешта вонкавае што да індывіда.

3. Сацыяльныя факты надзелены прымусовай сілай.

Прыкладамі сацыяльных фактаў могуць быць «устаноўленыя вераваньні альбо звычаі», якія характарызуюцца пэўнай арганізаванасьцю (структураю), напрыклад, маральныя правілы і фінансавыя сыстэмы альбо «сацыяльныя трэнды» [течения], дзеяньне якіх заснавана на пэўнай афэктыўнай уцягненасьці ў

калектыўнію ілюзію».

Калі зазірнем у тэкст самога Дуркгайма, то знойдзем гэткую дэфініцыю сацыяльнага факту:

Гэта ўсялякі спосаб дзеяньня, замацаваны або не, здольны да прымусовага вонкавага ўзьдзеяньня на індывіда, або інакш: такі, які явіцца ў дадзеным грамадзтве як паўсюдны, які характарызуецца самастойнай экзыстэнцыяй, незалежнай ад яго паасобных праяваў[7].

Пакуль што інфармацыі дастаткова, каб на яе базе зрабіць уступны нарыс праблематыкі. Праблематыку зручней раскрываць пры дапамозе канкрэтных прыкладаў. Вось перад мной ляжыць зборнік экзамэнацыйных тэстаў на 2006 год па ліцэйскім прадмеце «Wiedza o społeczeństwie» (адпавядае нашага грамадазнаўства), зацьверджаны Міністэрствам адукацыі Польскай Рэспублікі. Знаходжу там між іншым такое заданьне:

Пасьля прачытаньня тэксту выпішыце нумары сказаў, у якіх адлюстраваны факты, а таксама нумары сказаў, у якіх адлюстраваны меркаваньні.

1) Купляючы крадзенае, парушаеш дзесяць прыказаньняў;

2) Як паказвае статыстыка Галоўнай управы паліцыі, дзьве траціны злачынстваў у Польшчы - гэта дробныя крадзяжы;

3) Гэтых крадзяжоў мы найболей баімся;

4) Мы баімся за сваё здароўе і жыцьцё, бо крадзеж становіцца ўсё больш прымітыўны і брутальны…

Сказы, у якіх адлюстраваныя факты - паводле ўкладальнікаў тэсту, - пазначаныя нумарамі 1 і 2, няправільны адказ - 3 і 4. Запытайма, *чаму* першыя два сказы прызнаны сказамі аб фактах? Прааналізуйма першы сказ: «*Купляючы крадзенае, парушаеш дзесяць прыказаньняў*«. Па-першае, (1) у лягічным пляне ёсьць умоўным сказам, які мае форму $p \rightarrow q$, а гэта

[7] Цытата паводле выдання: Durkheim Emile. Zasady metody socjologicznej. Warszawa, 1968. S. 42.

значыць, называе пэўны *гіпатэтычны*, а *не фактычны* стан. Па-другое, калі (1) ёсьць імплікацыяй, то гэта значыць, што мы насамрэч маем дачыненьне з *двума* сказамі, а не з адным. Ёсьць папярэднік (*купляючы крадзенае*) і наступнік (*парушаеш Дэкалёг*). Запытайма цяпер, *што* можа адпавядаць кожнаму з гэтых двух сказаў, інакш кажучы, якая «рэч» стаіць за кожным з гэтых сказаў?

Мабыць, адразу можна сказаць, што *няма шанцаў сьцьвердзіць* «парушэньне» *як «вонкавы» факт*. У якасьці «вонкавага» можам сьцьвердзіць хіба што наяўнасьць кнігі (напр. Бібліі), у якой можам прачытаць на мове *L* выраз: «Не крадзі». Можам сьцьвердзіць, што якісь чалавек *X* пры дапамозе драбіны залазіць цераз акно ў чыюсьці хату і выносіць адтуль нейкія рэчы, але ўсьцяж *не назіраем «парушэньня дзесяці прыказаньняў» як нечага вонкавага*! Дык якім чынам сьцьвярджаем «факт», што *X парушае дзесяць прыказаньняў*? Мы робім гэта шляхам «накладваньня» пэўнае нормы на пэўную падзею, гэта значыць, спалучаем *апісаньне («X залез у чужы дом і вынес адтуль пэўныя рэчы)* з *нормай («Не крадзі»)*, а затым *робім выснову*, што «*X парушыў норму n*«. Але гэтая выснова - «*X* парушыў норму *n*« - ні ў якім разе не зьяўляецца фактам назіраньня, а толькі *мэнтальным канструктам*, які паўстаў у выніку спалучэньня апісаньня і нормы!

А што зь першым сказам імплікацыі (1)? Ці пагодзімся з тым, што сказ «*X купляе крадзеную рэч*« ёсьць фактам? Калі адкажам дадатна, то мусім тады прызнаць, што маем дачыненьне з асаблівага тыпу «фактам». Па-першае, *ня бачым* таго, што рэч, якую купляе *X*, - крадзеная. Сказ, пра які вядзецца гаворка, ёсьць насамрэч *справаздачай аб нашай ведзе*, а не справаздачай аб факце. Інфармуем толькі аб тым, што мы маем веду, што гэтая рэч была ўкрадзена. У штодзённым жыцьці гэтая веда часьцяком абапіраецца на падазрэньні і дапушчэньні, але пакіньма ўбаку практыку штодзённага жыцьця і запытайма, якой магла б быць *ідэальная сытуацыя*, у якой мы маглі б сьцьвердзіць: «Так, вось я *назіраў* крадзеж», гэта значыць: «Тое, што *X* украў такую й такую рэч у месцы *l*, а гадзіне *t*, *ёсьць фактам*«.

Мой адказ будзе гэткі: калі пагаджаемся апэраваць Дуркгаймавым разуменьнем факту, г. зн. факту як нечага вонкавага што да індывіда, то мусім прызнаць, што *немагчыма ўявіць нават «ідэальнай сытуацыі», у якой можна было б сьцьвердзіць крадзеж як факт.* Сказ «*Х* украў...» зьмяшчае ў сабе *маральную кваліфікацыю* пэўнага дзеяньня. Ці сказы, якія зьмяшчаюць у сабе маральную кваліфікацыю, могуць успрымацца як сказы аб *вонкавых* фактах? Гэта праблема асэнсоваўлася як аналітычнымі філёзафамі, так і некаторымі этыкамі. У маім артыкуле «Натура ці канвэнцыя. Пытаньне пра фундамэнт этыкі і права» (Праўнік. 2005. Кастрычнік) у пункце 2.1 можна знайсьці больш падрабязную характарыстыку гэтай праблемы. На гэтым месцы абмяжуюся толькі падагульняльнай тэзай, што калі жадаем пакінуць у сацыялёгіі катэгорыю факту, то мусім прызнаць, што яны маюць *ня вонкавую*, як таго жадаў Дуркгайм, а *вонкава-ўнутраную* прыроду! Сьцьвярджаючы «факт» у сфэры сацыяльнага, мы сьвярджаем ня толькі (а лепш: *ня столькі*) сукупнасьць жэстаў, мімікі ды гукаў, колькі *інтэнцыі, памкненьні, чаканьні, калькуляцыі* пэўных індывідаў. А гэта ніяк *ня вонкавыя* фэномэны. Яны толькі праяўляюцца праз вонкавае.

Талкат Парсанз, адзін з дасьледнікаў думкі Дуркгайма, кажа пра «тры фазы» разьвіцьця панятку «сацыяльны факт» у Дуркгайма. Першай фазай было разуменьне СФ як «вонкавасьці» (*exteriority*), г. зн. «дадзенасьці эмпірычнага існаваньня» (*the givenness of empirical existence*), як гэта ёсьць у выпадку фізычнага асяродзьдзя. Другой фазай было разуменьне СФ як «прымусу» (*constraint*), г. зн. як эфэкту нарматыўнага права, спалучанага з пэўнымі санкцыямі. І, нарэшце, трэцяй фазай было разуменьне СФ як «маральнага аўтарытэту» *інтэрналізаваных* каштоўнасьцяў ды нормаў, які пры дапамозе пачуцьця віны падштурхоўвае да выкананьня гэтых нормаў[8].

Гэткая інтэрпрэтацыя Дуркгаймавых поглядаў, здаецца, адрозьніваецца ад інтэрпрэтацыі Кацука. Тэкст апошняга стварае ўражаньне, што Дуркгайм трактаваў сацыяльны факт яе нешта, што ёсьць *адначасова* «рэччу», «чымсьці вонкавым» і «прымусовым». А калі прымем оптыку Парсанза, то

[8] Гл. International Encyclopedia of the Social Sciences / Ed. by D. Sills. Vol. 14. New York: Macmillan, 1968. P. 399–400.

атрымліваецца, што маем дачыненьне папросту з *эвалюцыяй* разуменьня сацыяльнага факту і што на розных этапах сваёй навуковай дзейнасьці Дуркгайм па-рознаму гэтыя факты разумеў. І калі ў першай фазе сацыяльны факт быў для яго сапраўды нечым вонкавым, то ў трэцяй рабіўся амаль цалкам *унутраным*! Калі меркаваньне Парсанза трапнае, то выходзіць, што Дуркгаймаў «сацыяльны факт» з трэцяе фазы быў антыцыпацыяй фройдаўскай канцэпцыі «супэрэга» і фромаўскай катэгорыі «аўтарытарнага сумленьня». Гэта адкрывае дуркгаймаўскаму «факту» новыя гермэнэўтычныя прасторы, што ніяк не спрыяе яго праясьненьню.

Editor David L. Sills Vol. IV. The Macmillan Company & The Free Press, 1968. P. 315.

Інтэрпрэтацыя Парсанза дазваляе таксама гіпатэтычна рэкунструяваць пэўныя ўплывы, пад якімі Дуркгайм мог быць у паасобных «фазах». У першай фазе, хутчэй за ўсё, далі аб сабе знаць ня толькі ўплывы Конта, але і Брунэ ды Відаля дэ ля Бляш, прадстаўнікоў г. зв. «геаграфічнага кірунку» ў сацыялёгіі, які, поруч зь біялягічным арганіцызмам Спэнсэра, успрымаўся ў тыя часы як «найбольш пазытывісцкі». У другой фазе мог наступіць пэўны адыход ад пазытывісцкага крэда на карысьць нэакантыянскіх ідэяў, якія ў тыя часы ў Францыі прэзэнтаваў Шарль Ляшэлье, а якога Дуркгайм ведаў і цаніў. А ў трэцяй фазе, хутчэй за ўсё, даў аб сабе знаць «дэман псыхалягізму», які ўварваўся ў яго сацыялягічны праект. У маладосьці Дуркгайм быў энтузіястам Вільгельма Вундта, і цалкам магчыма, што гэтаксама, як Вундт пад старасьць з простага псыхоляга ператварыўся ў сацыяльнага псыхоляга, так Дуркгайм пад старасьць са звычайнага сацыёляга ператварыўся ў «псыхасацыёляга».

Я не зьяўляюся дасканалым знаўцам Дуркгайма, тым ня менш, здабытых інфармацыяў на тэму сацыяльнага факту ў яго разуменьні, думаю, дастаткова, каб зрабіць пэўныя высновы.

1. Дуркгаймаўскі «сацыяльны факт» - гэта *няясны, невыразны* і *неадназначны* тэрмін. «Няясны», бо ня мае ўстойлівай канатацыі. Ён можа быць асацыяваны і з чыста вонкавым «асяродзьдзем», і з чыста ўнутраным «маральным аўтарытэтам». «Невыразны», бо невядома, як адрозьніць абсяг аб’ектаў, якія падпадаюць пад тэрмін «сацыяльнага факту», ад

абсягу аб’ектаў, якія пад яго не падпадаюць. (Гм, бадай, адзіны спосаб адрозьніць - спытацца ў сацыёляга-манапаліста...) «Неадназначны» - бо, па-першае, «сацыяльны факт» убірае ў сябе ўсю мнагазначнасьць тэрміну «сацыяльнае», пра што была гаворка ў 2.2, а па-другое, на гэтую мнагазначнасьць накладваюцца яшчэ тры сэнсы «сацыяльнага факту», адзначаныя Парсанзам.

2. Калі «сацыяльны факт» - няясны, невыразны і неадназначны, то ён ня можа ўтвараць «навуковую базу», прадугледжаную ў парадыгме навуковай рацыянальнасьці Опэнгаўза-Хэмпэля-Попэра. А калі навуковая база неакрэсьленая, то спосаб правяраньня сацыялягічных тэорыяў стаіць пад вялікім пытальнікам. А калі навука не прадугледжвае мэтадаў тэставаньня тэорыяў, гэта значыць, што яна застаецца абсягам мэтафізычных спэкуляцыяў (у лепшым выпадку) альбо суцэльнага валюнтарызму (у горшым выпадку), альбо інструмэнтам палітычных сілаў (у найгоршым выпадку).

3. На падставе (1) і (2) раблю выснову, што *навуковы статус сацыялёгіі ў вэрсіі Дуркгайма застаецца адкрытым пытаньнем*.

3. «ПРАБЛЕМАЦЭНТРЫЗМ» VERSUS «ТЭХНАЦЭНТРЫЗМ»

Вучоных многа. Дык давайце падумаем.

Аляксандар Лукашэнка

Праект Дуркгайма паўстаў у пэўную эпоху і фармаваўся ў пэўнай інтэлектуальнай атмасфэры. Ня цьверджу - як сьцьвердзілі б самі Дуркгайм і Кацук - што гэтая эпоха і гэтая атмасфэра маюць характар «вонкавых фактаў» і што пад «прымусам» гэтых «фактаў» паўстала такая, а ня іншая сацыялёгія. Сіла эпохі і асяродзьдзя заўсёды адносная. У канчатковым пляне гэта мы, вольныя асобы, можам падпарадкавацца альбо не гэтым надындывідуальным фактарам. І я веру, што сам Дуркгайм захаваў у пэўнай ступені інтэлектуальную незалежнасьць, хоць не магу не адзначыць наяўнасьці «канфармісцкага» складніка ў ягонай онтасацыялёгіі. І што больш, лічу, што гэты «канфармісцкі»

складнік у яго канцэпцыі пераважае.

Я ўжо згадваў пра праўдападобныя ўплывы Конта, дэ ля Бляша, Ляшэлье і Вунтда на канцэпцыю сацыяльных фактаў Дуркгайма. Думаю, што ўплывы Конта на Дуркгаймаву онтасацыялёгію намнога больш глыбейшыя. Успрыманьне соцыюму як нечага надындывідульнага, арганічнага і вонкавага што да індывіда надта ж ужо нагадвае Вялікую Істоту (*le Grand Etre*) Аўгуста Комта, а канцэпт «калектыўнай сьвядомасьці» зьяўляецца - паводле Парсанза - адлюстраваньнем канцэпту «кансэнсусу» ў Комта, які ў сваю чаргу ёсьць адлюстраваньнем «агульнае волі» (*volonté général*) Русо. Дуркгайм, такім чынам, зьяўляецца спадкаемцам пэўнае мэтафізыкі, і няцяжка здагадацца, *якой* мэтафізыкі. *Grand Etre* ды *volonté général* - гэта вярхоўныя ідэі *калектывісцкай, халістычнай* ды *дэтэрмінісцкай* мэтафізыкі. «У калектыўных уяўленьнях месьціцца якаясь сіла, свайго роду маральная перавага, здольная навязацца паасобным розумам», - пісаў Дуркгайм у «Элемэнтарных формах рэлігійнага жыцьця».

У XIX ст. у Францыі змагаліся паміж сабой дзьве значныя філязафічныя школы: «старая» сьпірытуалісцкая на чале з Кузэнам і «маладая» пазытывісцкая на чале з Комтам. Здаецца, што з Комтам сталася прыкладна тое, што сталася з Марксам у Нямеччыне: гэтаксама, як Маркс, змагаючыся з ідэалізмам Гэгеля, заставаўся ў сваім мысьленьні гэгельянцам, так Комт, змагаючыся са сьпірытуаламі, сам у пэўным сэнсе стаў «сьпірытуалам». Яго ідэя Чалавецтва як Вялікай Істоты, а таксама падпарадкаваная Ёй рэлігія (г. зн. навука) разам са сьвятарамі і прарокамі (г. зн. навукоўцамі) мае ня тое што мэтафізычныя, а яскрава рэлігійныя рысы. Нельга забываць, што поруч са сьпірытуалісцкім і пазытывісцкім трэндам у філязофіі ў Францыі быў даволі моцны рэакцыйна-кансэрватыўны інтэлектуальны рух, у аснове якога ляжалі ідэі дэ Мэстра і Банальда, для якіх індывідуалізм і лібэралізм уявіўся як сьмяротная пагроза для грамадзтва, а дэмакратыя як нейкае непаразуменьне. Успрыманьне Дуркгаймам сацыяльнага як вонкава-прымусовай і незалежнай ад індывіда існасьці дазваляе падазраваць наяўнасьць у яго онтасацыялёгіі сьпірытуалісцкіх, рэакцыйна-кансэрватыўных і

антылібэральных складнікаў.

Чарговая праблема - гэта «натуралізм» Дуркгайма. Спадар Кацук у «Сацыялёгіі беларускай ідэі»[9] выразіў

абурэньне з нагоды тэзы пра Дуркгайма як натуралістаў, якая вандруе з падручніка ў падручнік. У прадмове да другога выдання «Сацыялягічнага мэтаду» Дуркгайм піша: «Падчас таго, як мы выразна казалі і ўсяк паўтаралі, што сацыяльнае жыцьцё цалкам складаецца з уяўленьняў, нас абвінавацілі ў выключэньні з сацыялёгіі псыхічнага элемэнту».

[9] ARCHE, 2006, № 5.

Па-першае, трэба ўзяць пад увагу неадназначнасьць і эвалюцыйнасьць Дуркгаймавых поглядаў. У гэтым мы маглі пераканацца падчас аналізу ягоных «сацыяльных фактаў». Па-другое, «натуралістам» можна стаць двума спосабамі. Першы спосаб - «рэдукцыянісцкі», другі - «індукцыянісцкі». Першы палягае ў рэдукаваньні мэнтальнага да біхевіяральнага, псыхічнага да фізычнага, духоўнага да матэрыяльнага і г. д. Тут трэба адзначыць, што рэдукцыянізм вельмі неаднародны, ёсьць шмат яго вэрсіяў, ад крайняга цераз памяркоўны да слабага. Думаю, што Дуркгайма нельга ўпікнуць у якім-кольвечы рэдукцыянізьме, нават слабым. Але ёсьць іншы спосаб стаць натуралістам: *можна прызнаваць аўтаномію мэнтальнага, псыхічнага, духоўнага, але трактаваць іх па-натуралісцку*! Праблема такой «натуралізацыі рэчаіснасьці» ўсплыла падчас дыскусіяў вакол «натуральнага права» ў этыцы і правазнаўстве[10]. «Натуральнае права» - водле этычных кансэрватараў - «упісана ў чалавечую прыроду». Калі «ўпісана ў чалавечую прыроду», значыць, немагчыма яго зьмяніць. Толькі вось гісторыя паказвае, што «нязьменнае права» цягам гісторыі ўсё ж зьмянялася. У канчатковым пляне цяжка знайсьці іншую дэфініцыю для «натуральнага права», як толькі такую, што гэта «права, якога нельга крытыкаваць».

Падыход Дуркгайма да сацыяльнага нагадвае падыход этычных кансэрватараў да натуральнага права. Праўда, сацыяльнае для яго не нязьменнае, яно можа зьмяняцца і фармавацца, яно працэсуальнае. Тым ня менш, прадугледжанае Дуркгаймам стаўленьне індывіда да сацыяльнага такое ж, што і стаўленьне індывіда да натуральнага права, прадугледжанае этычнымі

[10] Гл. цыт. вышэй *«Натуральнае права» ці «права чалавека»...».*

канцэпцыі Дуркгайма. Гл. *Socjologia Durkheima*. Ed. H. Mamzer. Warszawa, 1980, s. 213.

[11] Цыт. па: *Durkheim E. Les formes élémentaires de la vie religieuse. Le système totémique en Australie*. Paris, 1990, p. 8.

[12] Там самае, с. 240.

Цыгарэта - гэта сацыяльны факт. Дуркгайм - *Durkheim E. Les règles de la méthode sociologique*. Paris, 1988, p. 1-14. Гл. таксама: *Durkheim E. Socjologia i filozofia*. Warszawa, 1999, s. 213). «Сацыяльныя факты» - гэта ня толькі тытунь, але і ацэнкі акварыуму, да якіх рыбка можа наблізіцца, але празь якія - дарма што празрыстыя! - прайсьці так і ня здолее. Рыбка - калі хоча - можа таўчыся галовой аб гэтую празрыстую сьценку, але ў выніку ёй нічога не застанецца, як толькі завярнуцца і гойсаць у *дадзенай* прасторы. Ці яна, гэтая прастора, утульная ці не, адпаведная ці не - на гэта рыбка ўжо аніякага ўплыву ня мае... Соцыюм - гэта наканаваньне для індывіда, гэтаксама як акварыюм - наканаваньне для рыбкі. Вось такая сумная выснова прыходзіць пасьля знаёмства з Дуркгаймавай «сацыялёгіяй».

У позьняй працы Дуркгайма «Элемэнтарныя формы рэлігійнага жыцьця» можна заўважыць спробу аслабіць калектывісцкі складнік сваёй онтасацыялёгіі. Там ён падкрэсьлівае, што «няма грамадзтва безь людзей, грамадзтва можа існаваць у сьвядомасьці індывідаў і толькі дзякуючы ім»[11], а нават: «Грамадзтва існуе ў індывідах і толькі ў іх»[12]. Можа, дзякуючы гэтым фрагмэнтам, аматарам і пасьлядоўнікам Дуркгайма ўдалося б надаць некалектывісцкую інтэрпрэтацыю поглядам свайго настаўніка. Але думаю, што гэта было б крайне цяжка. У той самай працы сустракаем (чарговы раз) супрацьстаўленьне індывідуальнага сацыяльнаму і тлумачэньне яго ў катэгорыях апазыцыі *profanum - sacrum*. Сацыяльнае - гэта тое, што сталае, санкцыяванае, сьвятое, агульнае, а парадак у грамадзтве прадугледжвае падпарадкаваньне сацыяльнаму *sacrum*.

Онтасацыялёгію Дуркгайма можна называць натуралісцкай (у сэнсе індукцыйнага натуралізму), а можна называць і антынатуралісцкай (у сэнсе нон-рэдукцыянізму) - гэта ня мае вялікага значэньня. Значэньне мае тое, што гэтая онтасацыялёгія прадугледжвае *наканавальніцтва, падпарадкаваньне вонкаваму прымусу* і *сакралізацыю* грамадзкага парадку. Такую канцэпцыю лічу заганнай і непрымальнай у сваёй аснове.

* * *

Якая практычная выснова з усяго гэтага? Згодна з

сацыялягісцкай устаноўкай усю маю крытыку Дуркгайма трэба было б разглядаць як *сымуляцыю рацыянальнай крытыкі*, за якой хаваецца жаданьне аслабіць пазыцыі «дуркгаймістаў», а можа нават пазыцыі ўсіх сацыёлягаў разам узятых. Незалежна ад таго, якія матывы будуць мне прыпісаны, хачу выразна падкрэсьліць, што мэтай маёй крытыкі *ёсьць не падрыванье рэпутацыі сацыёлягаў* і не жаданьне пазбавіць працы і заробку пасьлядоўнікаў Дуркгайма, а якраз наадварот - *паказаць, што яны, сацыёлягі, вельмі патрэбныя*, што перад імі - *шмат* працы і што ім у сувязі з гэтым неабходна забясьпечыць аптымальныя матэрыяльныя і псыхалягічныя варункі працы! Хоць канцэпцыю Дуркгайма я назваў «непрымальнай у сваёй аснове», то ўсё ж лічу, ёсьць сэнс паспрабаваць пераасэнсаваць канцэпцыю Дуркгайма і, магчыма, «перастварыць» яе, надаць ёй крытычную форму. Гэта заданьне для сацыёлягаў-дуркгаймістаў.

Другая выснова - антыінстытуцыяналісцкая. Усьлед за Попэравым сьцьверджаньнем *poverty of historicism* можна высунуць аналягічнае: *poverty of institutionalism*. Інстытуцыяналісцкі мэтад інтэрпрэтацыі поглядаў (сваіх і чужых) - гэта марны і бясплодны мэтад. Разважаньні тыпу: «*X* напісаў/сказаў *p*, бо ён *мусіў* гэтак напісаць/сказаць», а «*мусіў*, таму што належыць да інстытуту/асяродзьдзя/партыі/опцыі *M*« - анічога нам у пазнавальным пляне *не даюць*. Больш таго, зьяўленьне такога тыпу «разумаваньняў» нельга нават растлумачыць «попытам». Такія разважаньні нецікавыя, бо яны базуюцца на просьценькай філязофіі, а ў прынцыпе зводзяцца да ўменьня адрозьніваць інтэлектуальныя асяродкі і ператвараць іх у «сацыяльныя факты». Ані попытам, ані цікавасьцю нельга растлумачыць іх зьяўленьне. Зьяўленьне інстытуцыяналісцкіх аргумэнтаў можна растлумачыць хіба што «інэрцыяй мысьленьня», якая засталася нам у спадчыну з савецкіх часоў. Бо гэта савецкія ідэолягі навучылі навукоўцаў ацэньваць тэорыі і аргумэнты перадусім праз прызму «*хто* напісаў/сказаў». Больш таго, яны прышчапілі перакананьне, што іншай мэтанавуковай крытэрыялёгіі як толькі гэтая («наш» - «ня-наш») не існуе...

Але калі б заганнасьць інстытуцыяналісцкіх аргумэнтаў

зводзілася толькі да іхнай мэтадалягічнай бясплоднасьці і нецікавасьці, то, можа, і ня варта было б аж так непакоіцца імі. Але мэтадалягічны інстытуцыяналізм - гэта таксама вяртаньне дагматызму і аўтарытарызму ў навуку. Магчыма, інстытуцыяналістам здаецца, што, пераймаючы Куна і Фаерабэнда ды насьледуючы цьмяны стыль Бадрыяра, Дэрыды ці Лятара, яны явяцца больш «прагрэсіўнымі». Можа, нэапазытывізм са сваім патрабаваньнем вэрыфікацыі або крытычны рацыяналізм са сваёй «аб'ектыўнай праўдай» лічацца імі наіўнымі і безнадзейна адсталымі кірункамі. Магчыма, аналітычная філязофія са сваёй павышанай адчувальнасьцю на яснасьць і акрэсьленасьць у выказваньнях бачыцца імі як бастыён «лёгацэнтрычнай ерасі», якую трэба адкінуць у імя постмадэрнісцкай артадоксіі. Толькі пры ўсім гэтым яны не заўважаюць, што насамрэч явяцца не прагрэсістамі, а рэпрэзэнтантамі сярэднявечнага (у адмоўным сэнсе гэтага слова) мэтаду. Бо згодна з «манапалісцкай» канцэпцыяй навукі, сучасны навуковец у прынцыпе нічым ня розьніцца ад сярэднявечнага інквізытара, каторы ў адказ на пытаньне: «*Чаму* гэта праўда?» - кажа: «Бо *мы* так лічым». «Бо *мы* так лічым» - дакладна гэтак адказваюць гіпатэтычны матэматык і фізык Міколы Кацука, дакладна гэтак - трэба меркаваць - павінны адказваць сацыёлягі, псыхолягі, палітолягі...

Інстытуцыяналісцкія аргумэнты ня толькі мэтадалягічна бясплодныя, нецікавыя і па сваёй сутнасьці аўтарытарныя, але таксама шкодныя для навуковага прагрэсу як такога. Згадваны ўжо прыклад Гарлахвацкага даволі павучальны: калі мы пагодзімся з мэтадалягічнымі інстытуцыяналістамі, то тым самым легітымізуем рознага тыпу «гарлахвацкіх» у якасьці «манапалістаў» у пэўным абсягу веды. У жыцьці можа быць зусім іначай, чым у камэдыі: апошнім будзе сьмяяцца не Чарнавус, а менавіта Гарлахвацкі...

У Вялікабрытаніі ёсьць супольнасьць вызнаўцаў погляду, што Зямля - плоская, і што тэза аб «кругласьці» Зямлі - неверагоднае махлярства. Уявім цяпер сытуацыю, у якой прадстаўнікі такога погляду займаюць (подступам ці гвалтам) катэдры астраноміі ў галоўных унівэрсытэтах сьвету... Гэты прыклад, канечне ж, контрафактычны, але карыстаючыся

магчымасьцю, якую дае сэмантыка магчымых сусьветаў, запрашаю мэнтальна перанесьціся ў такі магчымы сьвет *W*, які нічым ня розьніцца ад нашага сьвету, а толькі тым, што ў выніку спэцыфічнага разьвіцьця палітычных падзеяў на міжнароднай арэне ўсе стратэгічныя цэнтры астранамічных дасьледаваньняў сталі належаць менавіта вызнаўцам «плоскага кшталту» нашай плянэты. Згодна з «манапалісцкай» канцэпцыяй навукі (якая знаходзіцца ў цеснай сувязі з мэтадалягічным інстытуцыяналізмам), у сьвеце *W* мы ўсе, шараговыя неастраномы, павінны дружна ківаць галавой і паўтараць: «Ну так, сапраўды, Зямля - плоская». І нічога ня зробіш, бо ж гэта будзе найноўшая (то бок, найбольш прагрэсіўная) парадыгма астранамічнай навукі. Застанецца толькі цярпліва чакаць чарговай «навуковай рэвалюцыі» і зьмены парадыгмы, калі зноў вернецца мода на «круглы кшталт» у астраноміі. Хоць усё роўна ніколі не вядома, ці новарэвалюцыйная супольнасьць астраномаў вернецца да ідэі «круглага кшталту», ці захоча ўстанавіць нешта больш арыгінальнае, напр. ісьціну аб квадратным кшталце нашай плянэты...

* * *

Дзеля яснасьці зазначу, што не зьяўляюся радыкальным праціўнікам Кунавых «рэвалюцыяў» і не адкідваю *en bloc* - як ужо раней зазначыў - майстроў «цьмянага стылю». Не лічу таксама аналітычную філязофію, нэапазытывізм ці крытычны рацыяналізм, «панацэяй», тым больш, што яны ўжо і не існуюць у «чыстым» выглядзе. Пастулюю адно толькі *крытычнае прачытваньне* і тых, і гэтых філязофіяў.

Кун і Фаерабэнд належаць да гэтак званага *дэскрыпцыяністычнага* кірунку ў мэтадалёгіі (у процівагу *прэскрыпцыянісцкім* мэтадалёгіям, рэпрэзэнтаваным нэапазытывістамі або крытычнымі рацыяналістамі). Іх працы задуманы як спроба абагульненай *апісальнай характарыстыкі* навуковай практыкі. Наколькі гэтае апісаньне трапнае, гэта ўжо іншая справа. Але праблема ў тым, што канцэпцыі Куна ды Фаерабэнда некаторымі ўспрымаюцца як *нарматыўныя характарыстыкі* навуковай практыкі, адбываецца непажаданая

фузія *таго, што ёсьць*, і *таго, што павінна быць* (зьмешваньне мэтадалягічнага *the «is»* і *the «ought»*). У выніку, пасьлядоўнікі Куна лічаць сваёй «нормай» альбо ўсьведамленьне сваёй залежнасьці ад існай парадыгмы, альбо зьдзяйсьненьне рэвалюцыі. Ну, а ў выпадку пасьлядоўнікаў Фаерабэнда нават такая норма адпадае: ім застаецца хіба што распрацоўваць новыя (найлепш максымальна цьмяныя) навуковыя жаргоны, каб чарговы раз пераканацца ў тым, што *everything goes*. «Анархізм і філязафічны дадаізм» - гэтак акрэсьлівае мэтадалягічную пазыцыю Фаерабэнда Адам Хмялеўскі, і гэтае акрэсьленьне мне падаецца даволі трапным.

Зыгмунд Гайдук - выбітны польскі філёзаф-мэтадоляг - выказаў вельмі важную мэта-мэтадалягічную думку наконт усякіх прэскрыпцыянісцкіх і дэскрыпцыянісцкіх мэтадалёгіяў. Дэскрыпцыянісцкія характарыстыкі навуковай практыкі заўжды «насычаны пэўнай мэтадалёгіяй», г. зн. дасьледнік, які спрабуе даць абагульненае апісаньне навуковай практыкі, робіць гэта з пазыцыі пэўнай *загадзя прынятай* мэтадалёгіі (*methodology-ladeness thesis*). Прэскрыпцыянісцкія мэтадалёгіі, у сваю чаргу, заўсёды «насычаны» рэфлексіяй над навуковай практыкай, якая зьяўлялася цягам гісторыі (*history-ladeness thesis*)[13]. Усьведамленьне гэтай заканамернасьці важна для крытычнае ацэнкі прапанаваных нам мэтадалёгіяў. Прыкладам, у выпадку Куна ці Фаерабэнда мы можам пытацца, наколькі іх дэскрыпцыянісцкія канцэпцыі навукі абумоўлены іх уласнымі мэтадалягічнымі ўстаноўкамі.

* * *

Іншы польскі мэтадоляг-сацыёлаг Пётар Штомпка [13] Гл. Hajduk, Z[illegible] ad[illegible]. Tadeuszowi Kotarbińskiemu, Łódź 1995.
прадугледжве «трохузроўневую» характарыстыку дасьледу, які прэтэндуе быць навуковым[14]. На першым узроўні бярэцца пад увагу найбольш агульныя прынцыпы навуковага мэтадаро лёгіка навуковага выясьненьня, прадказваньня і канструяваньня. На другім узроўні - патрабаваньні інтэрсуб'ектыўнасьці, фальсыфікавальнасьці, працэдуры тэставаньня і крытэрыі адбору спаміж канкурэнцыйных тэорыяў. Трэці ўзровень - «тэхнічны» - сукупнасьць сродкаў і спосабаў здабываньня «фактаў» (альбо «артэфактаў»). Для фізыкі ці біялёгіі Tadeusz Kotarbiński, Kontrowersyjne zagadnienia dydaktyki filozofii, Łódź 1995.

могуць быць мікраскопы, цыклятроны, экспэрымэнтальныя лябараторыі і г. д., для псыхалёгіі - вольныя ці плянаваныя назіраньні, экспэрымэнты, эмпатыя, інтраспэкцыя і г. д.; для сацыялёгіі - апытаньні, інтэрвію, матэматычна-аналітычная апаратура апрацоўкі статыстычных зьвестак і г. д.

Мадэль прафэсара Штомпкі дазваляе даакрэсьліць мэту і прадмет праведзенага мною аналізу-крытыкі ў гэтым артыкуле. Аналіз узятага пад увагу праекту сацыялёгіі тычыўся перадусім «верхніх», больш унівэрсальных узроўняў. «Тэхнічны» ўзровень я абмінуў, бо маёй мэтай было паказаць, што сацыялёгія ў дуркгаймаўскай вэрсіі - гэта адзін з мэтафізычных праектаў. Незалежна ад таго, ці высока, ці невысока мы ацэнім гэты праект, мусім прызнаць, што ён знаходзіцца на прэнавуковым этапе разьвіцьця. Але «мэтафізычны этап» разьвіцьця гэтай дысцыпліны па-свойму каштоўны. *Мэтафізыка актывізуе і арганізуе нашы пазнавальныя здольнасьці*. Мэтафізычнае афармленьне нашай пазнавальнай практыкі, хоць і менш вартаснае, чым навуковае афармленьне, то ўсё ж больш вартаснае, чым адсутнасьць якога-кольвек афармленьня (як гэта ёсьць у штодзённым пазнаваньні рэчаіснасьці), а неаформленае, выпадковае пазнаньне ў сваю чаргу больш вартаснае, чым адсутнасьць якога-кольвек пазнаньня.

Функцыя мэтафізычнага праекту палягае між іншым у *стымуляваньні дасьледніцкай практыкі на тэхнічным узроўні*. Дасьледнік можа шэраг важных і праўдзівых рэчаў адкрыць, кіруючыся чыста мэтафізычнымі інтуіцыямі. (У свой час мэтафізычная тэза Пітагора аб існаваньні патаемнай сувязі між лічбамі і касьмічным ладам падштурхнула Капэрніка да фармуляваньня рэвалюцыйнай у гісторыі навукі геліяцэнтрычнай тэорыі.)

Дрэнна, аднак, тады, калі тэхнічны ўзровень навуковай практыкі пачынае абсалютызавацца. Па-мойму, гэта якраз і адбылося падчас палемікі вакол «Мітаў...». Цытаваны ўжо Штомпка адрозьнівае дзьве магчымыя пазыцыі ў навуковым дасьледаваньні: «праблемацэнтрызм» і «тэхнацэнтрызм». Першая прадугледжвае залежнасьць выбару тэхнічных прыёмаў і мэтадаў ад характару праблемы, якую неабходна разьвязаць

14 Гл. Sztompka Piotr. *Sociological Dilemmas*. New York, 1979. P. 72–73.

альбо праясьніць, а другая - залежнасьць выбару праблемы ад наяўных і прызнаных «найлепшымі» тэхнічных прыёмаў. Чытаючы тэксты спадара Кацука і спадарыні Гапавай, так да канца і ня мог зразумець, ці *questio disputata* заключаецца ў пытаньні: 1) *які адсотак жанчын галасуе за Лукашэнку?* ці ў пытаньні: 2) *уплыў «полу» на галасаваньне - непасрэдны ці апасродкаваны?* ці: 3) *чаму жаночы электарат Лукашэнкі колькасна большы за мужчынскі электарат?* ці: 4) *якія фактары абумоўліваюць тое, што Лукашэнка наагул мае электарат* (незалежна, мужчынскі ці жаночы)*?*

Усе гэтыя пытаньні-праблемы разглядаліся ўсуцэл, і цяжка было зразумець, ці, прыкладам, прамаваны Кацуком «дыскрымінантны аналіз» пакліканы вырашаць усе чатыры праблемы, ці некаторыя, ці якуюсь адну зь іх. У мяне замала матэрыялаў і ведаў, каб кампэтэнтна ацаніць абсяг стасавальнасьці гэтага мэтаду, таму абмяжуюся адно толькі да асьцярожнай заўвагі, што прынамсі ў выпадку некаторых пытаньняў (асабліва (3) і (4) больш адэкватным падаецца мэтад Алены Гапавай, які можна лічыць разнавіднасьцю «інтэрпрэтатыўнага разуменьня» (*interpretative understanding*). Дыскрымінантны аналіз належыць да квантыфікатыўнага разраду мэтадаў, а ў выпадку пытаньняў тыпу: «*чаму* маем дачыненьне зь зьявай *х?*« альбо: «*якія фактары* абумоўліваюць зьяву *у*?» патрэбны хутчэй за ўсё кваліфікатыўныя мэтады, прынамсі, у якасьці дапаўненьня (альбо нават і карэкцыі) квантыфікатыўных. Сацыяльная сфэра - гэта сфэра мноства адкрытых магчымасьцяў, яна характарызуецца індэтэрмінізмам, дынамізмам і працэсуальнасьцю. А раз так, то нават найбольш дасканалыя матэматычныя тэхналёгіі ня могуць прадугледзець усіх магчымых фактараў і абумоўленьняў. Больш за тое, вынікі, атрыманыя шляхам стасаваньня квантыфікатыўных мэтадаў зазвычай «інфармацыйна ўбогія». Гляньма: што асаблівага нам дае інфармацыя, што *адукацыя* ёсьць істотным (альбо адным з істотных) фактарам, які рэальна ўплывае на галасаваньне за ці супраць Лукашэнкі? Нават калі і прымем гэтую тэзу як 100-працэнтова праўдзівую, то ўсё ж асаблівай пазнавальнай сатысфакцыі яна нам хіба не прынясе. Алена Гапава прапануе тут больш багатую і больш інфармацыйна насычаную карціну

сацыяльных рэаліяў. Можна, канечне ж, спрачацца, наколькі гэтая карціна адэкватная, але, думаю, нельга, ваюючы «дыскрымінантным аналізам», адкідваць «з парогу» інтэрпрэтатыўны падыход апанэнткі, тым больш, што спадар Кацук і сам часта змушаны інтуіцыйна інтэрпрэтаваць тыя ці іншыя зьвесткі.

Мэтад *intepretative understanding* у сацыялёгіі нагадвае мэтад эмпатыі ў псыхалёгіі. Абодва мэтады - неэмпірычныя і неаналітычныя (некаторыя кажуць: квазіэмпірычныя і квазіаналітычныя), адсюль іх контравэрсійны характар. Адначасна ж, як мне падаецца, без эмпатыі і без інтэрпрэтатыўнага разуменьня немагчымай была б паўнавартасная псыхалёгія ці сацыялёгія. Акцэптацыя такога тыпу мэтадаў, пераважна абапертых на інтуіцыі, прадыктавана «праблемацэнтрычным» падыходам да навуковых дасьледаваньняў, бо спэцыфіка праблемаў, зь якімі часьцяком маюць дачыненьне гэтыя дысцыпліны, патрабуе між іншым і такіх мэтадаў. Таму больш рацыянальнай была б крытычная дыскусія з выясьняльнай гіпотэзай Алены Гапавай («за Лукашэнку галасуе кляса»), а не стасаваньне злоснай іроніі ў адказ на спробу растлумачыць катэгорыю сацыяльнага полу пры дапамозе забаўнай, але трапнай заўвагі, што «посуд ня мыюць палавымі органамі».

* * *

Навука – гэта разьвязваньне праблемаў, якія ставіць перад намі жыцьцё, і ў гэтым пляне яна явіцца як *экзыстэнцыяльная* прыгода. Навука - гэта стала ўдасканальваная спроба разьвязваньня *нашых* праблемаў.

«Праблемацэнтрычную» навуку (а таксама філязофію, мэтафізыку, прэфілязофію) супрацьпастаўляю крытыкаваным ужо інстытуцыяналісцкім, «манапалісцкім» і «тэхнацэнтрычным» тэндэнцыям у навуцы (а таксама ў філязофіі, мэтафізыцы, прэфілязофіі). Калі кагосьці сапраўды цікавіць разьвязваньне якойсьці праблемы, то ён, сутыкнуўшыся з чыёйсьці прапановай вырашэньня гэтай праблемы, ня будзе яе ацэньваць праз прызму *хто* прапануе, а толькі праз прызму *што* прапануе. Для «праблемацэнтрычна»

арыентаванага навукоўца няма вялікай розьніцы, ці ў руцэ ў яго працы Інстытуту сацыялёгіі НАН, ці справаздачы НІСЭПД, ці публікацыі гендэр-дасьледнікаў з ЭГУ, ці, урэшце, ідэалягічныя падручнікі Акадэміі кіраваньня пры прэзыдэнту. Ён ня будзе прадузята выключаць, што славутая *particula veri* (часьцінка праўды) можа прысутнічаць у *кожным* з гэтых дыскурсаў, уключаючы нават афіцыйна-ідэалягічны.
[image]
[image]

№ 7-8 (47-48) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/11/26
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 7-8 (47-48) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image] [image] 2006

Пачатак • Цалкам Форум • "крытыка • эсэістыка • аналітыка • палеміка • **літаратура**

[image] [image] [image]

Андрэй Хадановіч Оптыка. Новыя вершы

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ паэт, вядомы далёка за межамі Беларусі. Сёлета ва Ўроцлаве ў выдавецтве «Kolegium Europy Wschodniej» выйшла яго кніга паэзіі «Swęto Nowego Rocku». У анатацыі да яе польскі пісьменьнік Павал Гюле пісаў: «У яго творах чытач знойдзе як вельмі асабістую іронію і

COMMEDIA

У якім коле
Дантавага Пекла
пакутуюць выпівохі,

што напярэдадні зьмешвалі
паўсалодкае віно зь півам
і не пасьпелі раскаяцца перад сьмерцю?

Якраз у гэтым коле
мы й прачнуліся зранку,
хоць фармальна вакол нас

была Польшча,
горад Wrociaw
і гатэль «Wodnik».

Веснавое сонейка крыху зьменшыла пакуты,
аднак ня вы́клікала жаданьня

размаўляць тэрцынамі.

Ранішняя кава перанесла нас у Лімб –
на правах рэдкіх паганцаў
(у сэнсе, найлепшых язычнікаў),

а можа, нават няхрышчаных немаўлятаў?
(Бачылі б вы інфантыльную фізіяномію
маладога паэта насупраць!)

Узыходжаньне ўгору па Дантавай лесьвіцы
працягвалася –
і вось мы ўжо ў гатэльным Чыстцы:

фінская саўна, басэйн,
тэлевізар, більярд –
і ўсё абсалютна бясплатна.

Хто ведае, як далёка ў Рай
мы перанесьліся б,
калі б ня скончыліся гатэльныя содні?

Пана з рэцэпцыі, што забраў нашыя ключы,
звалі Пятром;
але мы не зьвярнулі ўвагі

на яго бэджык, сядаючы ў таксоўку.

CELA EST BEAU, COMME DE LA PROSE

Магчыма, яшчэ не яна –
не сярэдзіна,
не экватар,
але ўсё далей на поўдзень
з памяркоўна-кантынэнтальнай
падлеткавай графаманіі
на атручаную тэрыторыю
графаманіі для дарослых,
прыўкраснай, як рыфма да ружы
ў чужой мове;

аўтарскае
пачуцьце
гумару,
насычаныя
паэтычныя
вобразы,
якія
запамінаюцца
надоўга
пасьля
прачытаньня
вершаў
(напрыклад,
Эўрыдыка ў
менскім
мэтро), а
таксама
прафільтраваны
празь
літаратурную
пачуцьцевасьць
вобраз
сучаснай
Беларусі:
дзіўнай
сумесі
інтэрнэт-
чату з
калгасным
сьвятам у
гонар пана
прэзыдэнта».

у канцэрагенныя тропікі
прафэсійнага спорту,
чые правілы забараняюць кантакт,
і ты на мяжы фолу
здабываеш чарговыя тры пункты,
трапна кінуўшы ў кош
для сьмецьця
скамечаны чарнавік –

сынопсіс нашага раману,
які пасьля дажыве,
дагуляе,
дапіша
нейкі, даруйце, нэгр.
Наўрад ці літаратурны.

ОПТЫКА

З раніцы мыю вочы,
забыўшы зьняць акуляры,
якіх зусім не адчуваў
у сьне,
апроч адной хвіліны –

калі ты ўжо зьняла
бікіні
і яшчэ не надзела
звычайнага станіка,

а я ўжо зьняў
цёмныя акуляры
і яшчэ не надзеў
звычайных –

для ніцавокіх люнатыкаў,
што адлюстроўваюцца
у сваіх шкельцах,
як у люстэрку
задняга агляду,

а таму ня могуць
падглядаць за табой.

І ты трымала мяне за руку,
пераключаючы сны
і не даючы мне
выпадаць на паваротах.

А пасьля
перавысіла хуткасьць
і адчыніла дзьверку,
і я вываліўся
зь легкавіка твайго сну –

у адных акулярах,
дзе яшчэ не астыла
тваё апошняе
адлюстраваньне.

1:50

Штэмпэлі паштарак
грукаюць рытмічна,
як барабаны падчас карнавалу,
і ты амаль ня чуеш яе,
нават на вуліцы.

Тэлефонная картка –
недакладная карта яе голасу
ў маштабе 1:50.

(Адрэналіну ў крыві
хапіла роўна на пяцьдзясят імпульсаў,
якія цякуць
разам з кроплямі дажджу.)

А ты –
з пляшкай піва,
пад парасонам,
нібы партатыўная кавярня,

зь якой ужо ніхто нікуды не пазвоніць, –

перабіраеш пяць дзясяткаў нумароў
зь ейным голасам,
пяцьдзясят тэлефонных адзінак,
гартаючы дзіцячы бэстсэлер,
недакладную карту сваёй памяці
ў маштабе 1:50.

ДЗІЦЯЧАЯ ЧЫГУНКА

С. Ж.

Вершы
прыбываюць на тваю станцыю,
як цягнік Люм'ераў,

як першы
нямы,
чорна-белы кінэматограф.

І ты мусіш тлумачыць фільм,
дагаворваць,
казаць каляровыя словы,
складаць субтытры радкоў.

А кіно –
гукавое даўно:
каляровая рыфма
гучыць непрыстойна.

І ўся надзея на мову,
незразумелую тут
без субтытраў.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/11/26
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 7-8 (47-48) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

рэфлексіі

[image]-[image]2006

"пдст выбары • "крытыка • эсэістыка • аналітыка • палеміка • **рэцэнзіі**

[image] [image] [image] **ЗМІЦЕР СМАЛЯКОЎ**

Зміцер Смалякоў Мысленне інтэлектуальных пенсіянераў вывучае філязофію ў БДУ.

Акудовіч, Валянцін. *Дыялогі з Богам: суплёт інтэлігібельных рэфлексій.*– Мінск: Логвінаў, 2006.

У новай кнізе Валянціна Акудовіча «Дыялогі з Богам» сабраныя творы, пэўная частка якіх друкавалася раней. Але яна радыкальна розніцца ад дзвюх сваіх папярэдніц. Мы даўно прызвычаіліся, што эсэістычнасць зрабілася «фірмовым знакам», своеасаблівым таўром ягонага пісьма. Аднак у «Дыялогах з Богам» Акудовіч відавочна здрадзіў мысленню дзеля прыгожага пісьменства. Падобнага ад «апошняга мысляра краіны» мала хто чакаў.

Кожнае эсэ прасякнутае не столькі мысленнем, колькі літаратурай. Мова кнігі, бадай, нагадвае чароўны сінтэз местачковай гаворкі і філасофскіх тэрмінаў. «Дыялогі з Богам» – гэта хутчэй меркаванні местачковага інтэлектуала па «набалелых пытаннях», чым эманацыя метафізічнага розуму.

Што ж змусіла аўтара гэтак «знізіць планку»? Калі ў сваіх ранейшых кнігах Акудовіч відавочна арыентаваўся на

інтэлектуальны дыскурс, здумляючыся над метафізікай быцця, то «Дыялогі з Богам» – хутчэй даніна беларускамоўнаму асяродку з яго досыць невысокімі інтэлектуальнымі патрабаваннямі. Чытанне «Дыялогаў з Богам» абуджае настальгію па савецкай мінуўшчыне ці часах адраджэння. Спалучэнне местачковай гаворкі з філасофскай тэрміналогіяй дапаўняецца жанравай эклектычнасцю (тут і показкі, і эсэ, і лірыка). Гэта нешта новае для В. Акудовіча, але ў той жа час надзвычай яму блізкае. Гэта дыскурс, у якім існуе беларуская культура. Дыскурс, змешчаны на старонкі кнігі, адбітак нашай культурнай сітуацыі.

«Дыялогі з Богам» – падборка мастацкіх тэкстаў, гэткіх звыклых для беларускамоўнага асяродку. Асяродку літаратурацэнтрычнага. Асяродку, звабленага прыгожым пісьменствам. Асяродку, які прагне сумнеўнага мастацтва – нечага сярэдняга паміж Васілём Быкавым і Янкам Купалам.

У «Дыялогах з Богам» мысленне прысутнічае адно як фон, на якім В. Акудовіч стварае сваю рэчаіснасць. Для прыхільнікаў ягонай ранейшай творчасці гэткі ход выглядае як здрада – здрада мысленню. Але разам з тым, у кнізе ёсць і пэўная праўда, сапраўднасць быцця, не асвечанага мысленнем. Тут добра і ўтульна. Прастора мыслення – бясконцая, адкрытая усім «скразнякам часу». І Акудовіч вырашае адгарадзіць, абмежаваць свой «лапік быцця» сценамі роднай гаворкі, а каб хоць нечым яго запоўніць, ён прыносіць «простыя словы, простыя рэчы», родныя сімвалы і асацыяцыі, стэрэатыпы і хімеры.

Звяртае на сябе ўвагу падкрэслены фалацэнтрызм, асабліва калі гаворка ідзе пра Бацькаўшчыну, Беларусь, Краіну і меліярацыю. Рафінаваныя літаратурныя метафары («край здзічэлых эйдасаў», да прыкладу) ужываюцца хутчэй дзеля красамоўства, чым выяўляюць сутнасць. Па прачытанні застаецца толькі настальгічны настрой, сугучны агульнаму тону сучаснай беларускай літаратуры. «Дыялогі з Богам» не ўздымаюць сутнасных пытанняў, не прапануюць новых канцэптуальных метафар – гэта чыста мастацкі тэкст, створаны для спажыўцоў літаратуры.

Тэкст дзеля самога тэксту, твор дзеля самога твору – вось
Хадановіч А. Андрэй
Уводзіны ў Курапаты // ARCHE. 2006. № 2.
ARCHE 2006 № 2.
Уводзіны ў Курапаты
Уводзіны ў Курапаты
Уводзіны ў Курапаты

Усе згадкі рэдактара «ARCHE» пра «набалелыя пытанні»[4] выглядаюць у гэтым рэчышчы таксама гульнёй. Паэтыка «набалелых пытанняў» няма – ёсць толькі дыскурс, які спараджае ўлада. Дыскурс падначальвае сабе ўсё. Ён падначальваў «ARCHE» ня ў меншай ступені, чым «Советскую Белоруссию». Ён нараджаецца ўладай, а потым рэпрадукуецца ў розных галінах культуры. На кані і пад музыку ўлятае ў праграму тэлевізійных навінаў альбо крадком, праз чорны ход запаўзае ў свядомасць беларускіх інтэлектуалаў[5].

Напрыклад, дыялогі з Богам Валянціна Акудовіча цудоўным чынам ладзяцца ўсё роўна пад Бога:

*для пакрыса пачаў збіраць да кучы ўсё (часам ужо і друкаванае ў папярэдніх кнігах), што нагадвала мне пра тую бурапенную пару (беларускае адраджэнне канца XX ст. – **З. С.**)...*[6]

Гэта значыць, тое, што прамінула, адышло ў нябыт, яшчэ сядзіць у культурнай прасторы і цвеліць душу сваёй інертнасцю. Мысленне спадара Акудовіча даўно пайшло наперад, недзе далёка пакінуўшы сучасную беларускую літаратуру, бо яна – нашае ўчора.

Аднак ад паноўнага дыскурсу немагчыма збегчы – хіба толькі што перачытаць старыя кнігі Валянціна Акудовіча. І хоць бы для сябе перамяніць парадыгму актуалій. А сучасны культурны дыскурс апанавалі пенсіянеры – не ўзроставыя, а інтэлектуальныя. Менавіта таму сучасную культурную сітуацыю можна назваць хіба што «паміж нябытам і нішто».

«Дыялогі з Богам» значна прайграюць папярэднім кнігам В. Акудовіча ў шчырасці. Тое, што здавалася шчырым гадоў дзесяць таму, цяпер выглядае хутчэй гульнёй. Мысленне як працэс знікла са старонак гэтай кнігі. Мысленне як фон засталося, і гэта лепшае, што тут ёсць.

[image]

[image]

---

4 Гл.: Рудкоўскі Пётр. Ад ідэалістычнасці да саборнасці // ARCHE. 2005. № 1–2.

5 Інтэрвію Валера Булгакава радыё «Свабода».

6 Акудовіч В. Дыялогі з Богам: Эцюдзі і вытрымкі. Мінск: Логвінаў, 2006. С. 191.

4 Прастору Ніва. 2006. № 19.

5 Маецца на ўвазе Макс Жбанкоў, які апошнім часам займаецца аналізам «рэвалюцыйнай сітуацыі» (круглы стол «Ідэалёгія спажывецтва і палітычнага бандытызму» // ARCHE. 2005. № 5). Ці Богам Акудовіча ён выбудаваў?

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/11/26
[image]

Дранько-Майсюк, Леанід. *Нэрвовы раман* // Дзеяслоў. № 15. 2005.
Дранько-Майсюк, Леанід. *Хлопчык і яго бацькі* // Дзеяслоў. № 19. 2005.

Вядомы беларускі літаратар Леанід Дранько-Майсюк сёлета стаў ляўрэатам «Залатога апострафа» – штогадовай прэміі часопісу «Дзеяслоў». Ён быў названы найлепшым празаікам мінулага году. У 2004 г. «дзеяслоўцы» ўганаравалі твор буйной жанравай формы (раман Людмілы Рублеўскай «Золата забытых магілаў»), у гэтым адзначылі два апавяданьні. Гэта не азначае, што раманаў у Беларусі больш ня пішуць, проста чытачы і крытыкі «Дзеяслова» не хварэюць на «літаратурную гігантаманію». Але ж чаму ўсё-ткі «Залаты апостраф» далі за два празаічныя творы? Можа быць, іх нешта яднае?

Апавяданьне «Нэрвовы раман» – пра вызваленьне ад любоўнай жарсьці і вяртаньне да творчасьці, паэзіі. Калі б Дранько-Майсюк засяродзіўся толькі на гэтым, твор, безумоўна, атрымаўся б. Аднак аўтар спрабуе адлюстраваць у невялікім

мастацкім тэксьце і іншыя тэмы: шлях Беларусі ў Эўропу, рэлігія ў жыцьці грамадзтва, псыхалёгія заможных і інш. Роздуму, арыгінальнага погляду на іх няма, ёсьць толькі жменя няўдалых афарызмаў і эмацыйных воклічаў, накшталт «грошы – гэта паэзія багатых» ці «Цяпер толькі й чуеш: у Эўропу! У Эўропу! Але, калі сур'ёзна, то з чым жа мы туды прыйдзем? З эмоцыямі, нараканьнямі і бясконцымі крыўдамі?! Што мы можам там прапанаваць істотнага?!.». Гэтыя фразы раскіданыя па тэксьце немаведама для чаго (аўтар, відаць, спадзяваўся, што яны ўзыдуць, як жытнёвыя зярняткі), іншым разам не зьвязаныя зь сюжэтам, а таму адцягваюць увагу чытачоў. Цэльнага аповеду не атрымліваецца – адна толькі няўцямнасьць, парывістасьць. Можа быць, аўтар да гэтага і не імкнуўся, бо галоўны пэрсанаж стомлены каханьнем, жанчынай, ён нэрвуецца, кепска пачуваецца. Ёсьць адкуль узяцца разбэрсанасьці ў думках, словах, учынках…

На жаль, тэма донжуанства і донкіхоцтва, у якой Дранько-Майсюк лічыцца абазнаным, у «Нэрвовым рамане» выглядае ізаляванай, не далучанай да асноўнай сюжэтнай лініі. Героі – самі па сабе, думкі аўтара – ім наўздагон:

…ёсьць проста мужчыны і дасканалыя мужчыны. Першыя – донжуаны, другія – донкіхоты. Каб стаць дасканалым, мужчына павінен пераадолець у сабе донжуана. Шлях сапраўднага мужчыны – гэта шлях ад донжуана да донкіхота, а не наадварот.

Гэтая тэорыя пакідае галоўнага пэрсанажа раўнадушным – жанчыны яго наагул пачалі раздражняць, ён хоча пабыць на самоце. Але аўтару ў апавяданьні гэтыя тэарэтычныя выкладкі для нечага спатрэбіліся.

А калісьці ў адным са сваіх вершаў са зборніка «Тут» (1990) Дранько-Майсюк аптымістычна заяўляў: «Усё – падман, усё – падман, // І толькі не падман – каханьне! // Я напісаць хачу раман // Пра абяцаньне-спадзяваньне». І цьвёрда абяцаў: «Я напішу, я напішу // Ня проста добра, а выдатна, // Але ж я вас не ўзварушу // Ні першай сцэнай, ні астатняй». «Узварушыць»

сапраўды не атрымалася – ня толькі каханую, але і чытача. «Нэрвовы раман» – празаічнае ўвасабленьне дадзенага паэтам пятнаццаць гадоў таму абяцаньня – не атрымаўся. І ў прамым (як мастацкі твор), і ў «літаратурным» (паміж героямі) сэнсе.

Іншае апавяданьне Дранька-Майсюка, адзначанае «Дзеясловам», – «Хлопчык і яго бацькі» – быццам напісана ня ім, а другім аўтарам. Там, у «Нэрвовым рамане», – мітусьня і няўпэўненасьць, неба, зацягнутае хмарамі, тут – спакой і раўнавага, сонечнасьць. Героі першага апавяданьня сьпяшаюцца жыць і адчуваць, аўтар не пасьпявае за імі (вось у чым загана!), а пэрсанажы другога, наадварот, не нэрвуюцца, не мітусяцца, кожнае іх слова ўзважанае, прасякнутае сэнсам, і аўтар жыве (менавіта жыве!) між імі як свой, як крэўны, дыхаючы «на поўныя грудзі». Можа, яны, героі апавяданьня «Хлопчык і яго бацькі», пачуваюцца так упэўнена, таму што яны – вяскоўцы, іх лад жыцьця прадвызначаны і непарушны, а аўтару так лёгка, таму што ён фактычна апісвае сваю сям'ю і дзяцінства? Кажу так, бо заканамерна правесьці паралелі між гэтым творам, з аднаго боку, і такімі вершамі Дранька-Майсюка, як «Гарышча», «Пыл праз хату жануць пастухі…», «Комін», «Проза радасьці», – з другога. Шмат супольных рысаў, дэталяў, аднак самае галоўнае – вобразы бацькоў, іх аўра, словы, учынкі. Вось герой верша «Проза радасьці» вяртаецца з гораду дахаты і бачыць, спыніўшыся ля весьнічкаў у вечаровым паўзмроку, што «на ганку перад грушаю сядзяць бацькі», чуе іх гаману. Бацька з асалодаю паліць, нясьпешна абмяркоўвае з маці надзённыя справы (ня словы тут галоўныя, а інтанацыі, фон!). У апавяданьні «Хлопчык і яго бацькі», дзе тая ж адзіная груша на падворку і тата хлопчыка гэтак жа шмат курыць, той жа нешматслоўна-манумэнтальны дыялёг пра гаспадарку:

— І калі падлогу на кухні зробім? – гледзячы на агонь, нібыта сама ў сябе пытаецца Маці.

Наструніўшыся, Бацька на тое кажа:

— Зробім… Паедзем, прадамо свае кветкі, заробім і зробім! І ня толькі падлогу, усё зробім!

— Гэта нешта нялюдзкае, калі надоўга пакідаеш сваю хату і свой гарод!

— Мусіш пакідаць! – зноў закурыўшы, Бацька бярэцца за ланцужкі насьценнага гадзіньніка.

Па ўсёй хаце (два пакоі і кухня) бяжыць, разьліваецца мякка-супакойны шургат – шурггг, і яшчэ раз, толькі трохі карацей – шург.

У адрозьненьне ад «Нэрвовага раману», галоўная ідэя якога (творчасьць – вышэй за ўсё) амаль нябачная пад кучай друзу, у «Хлопчыку і яго бацьках» нішто не замінае любавацца прыгажосьцю – аўтар знайшоў адказы на хвалюючыя пытаньні жыцьця, зьвярнуўшыся да свайго дзяцінства. І, не саромеючыся, не выдумляючы, не дадаючы лішняга, здолеў аднавіць яго. У выніку гэтага сымбалічнага «вяртаньня» быў створаны якасны мастацкі тэкст. Дабрыня і сям'я – вось што ўратуе сьвет, кажа Дранько-Майсюк. Праблемам рэлігіі, веры, як і ў «Нэрвовым рамане», аўтар прысьвячае тут шмат увагі. Аднак куды падзеліся ранейшыя шаблённасьць, дыдактычнасьць?

Вось Настаўнік (раней ён быў сьвятаром) апавядае хлопчыку пра Боскае пакараньне фараона і ягонага народу, і хлопчык, у хату якога праз паводку наплыла-напаўзла незьлічоная колькасьць жабаў, роспачна ўдзыхае: «Мусіць, і мяне Гаспод пакараў!»

Вось малеча ідзе па вёсцы і бачыць, што сяляне дрэнна абыходзяцца з жывымі істотамі (Каваль б'е каня, бо ён не даецца; Гаспадар аддае на бойню карову, таму што яна ўцякае са статку; Дзядзька паліць пацука), і думае: «Не, я так рабіць ня буду!»

Вось бацькі хлопчыка рыхтуюцца да ад'езду: маці сьвятой вадой кропіць хату і гаспадарчыя пабудовы, бацька варожыць, каб даведацца, ці будзе шчасьлівым няблізкае падарожжа ў заробкі.

І ўсё гэта прамоўлена пісьменьнікам так важна, так кранальна, намалявана з такім літаратурным майстэрствам, што

разумееш: беларускія пісьменьнікі, якія нарадзіліся ў вёсках альбо мястэчках, а потым перабраліся на сталае жыцьцё ў горад, у сталіцу, яшчэ ня хутка здолеюць пісаць урбаністычную прозу. Яны сотнямі нябачных нітак зьнітаваныя са сваёй радзімай, і таму насьценны гадзіньнік у бацькоўскай хаце ў Давыд-Гарадку дасюль значыць для Дранька-Майсюка значна больш, чым старыя адрасы Менску, якія ён спрабуе апісаць у «Нэрвовым рамане». Пісьменьнік уяўляе сваіх бацькоў – там, далёка-далёка, яны сядзяць пад грушай, чакаюць сына, думаюць пра будзённае. Малюнак жывы, шматколерны, дэталёвы, і ўсе думкі, памкненьні літаратара, увесь ён імкнецца туды, на радзіму. А Менск… Менск не выкрышталізоўваецца ва ўяўленьні пісьменьніка-вяскоўца, застаецца *terra incognita*. Як пісаць пра яго, як яго палюбіць, зразумець – невядома. Аўтар спрабуе апавесьці гісторыю пра дачыненьні з разумнай, ганарлівай і эмацыянальнай спадарыняй Эл, гісторыю, якая разгортваецца сярод казіно і пляцаў. Паралельна насычае тэкст згадкамі пра Купалу, Галчыньскага і Чарэнца, развагамі пра характар беларускай жанчыны, пра тое, што Эвангельле мусіць перамагчы царкву і г. д., карацей, сапраўды жадае напісаць інтэлектуальны раман, цікавы сучасьнікам-гараджанам, аднак зьбіваецца, нэрвуецца, бо выходзіць па-мастацку квола, непераканаўча, і ён адчувае гэта. А гадзіньнік у роднай хаце дагэтуль цікае, адлічвае гадзіны, вёска плыве ў часе і прасторы, набліжаецца, а не аддаляецца, і – не адпускае…

Выбар «Дзеяслова» мне падаецца правільным: толькі азнаёміўшыся зь бездапаможным «Нэрвовым раманам», можна зразумець прыгажосьць апавяданьня «Хлопчык і яго бацькі», якое пераканаўча сьведчыць: тэма вёскі па-ранейшаму займае цэнтральнае месца ў нацыянальнай літаратуры. Беларускі пісьменьнік сталага веку дагэтуль выпадае з гарадзкога жыцьця, бо ягонае сэрца «там, дзе зацішак, спакой» (так называлася апавяданьне Міхася Стральцова, герой якога, інжынэр-плянавік, «зьбягае» ў адпачынак, каб наведаць родную вёску). Таму, ці трэба нэрвавацца?
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 7-8 (47-48) - 2006

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/11/26
[image]